ВЯЧАСЛАЎ ШВЕД

# *Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.*

*Гродзенская губерня*



ВЯЧАСЛАЎ
ШВЕД

# РЭКВІЕМ ПАЎСТАНЦАМ 1863 – 1864 гг.
## (ГРОДЗЕНСКАЯ ГУБЕРНЯ)

Мінск
«Альфа-кніга»
2017

УДК 94(476)«1863/1864»
ББК 63.3(4Беи)51
Ш34

Рэцэнзенты:
Аляксандр Радзюк, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(Гродзенскі дзяржаўны сельскагаспадарчы ўніверсітэт)

Падбор ілюстрацый – Андрэй Вашкевіч і Вячаслаў Швед

Генеральны спонсар выдання кнігі – Прыватнае прадпрыемства па аказанні паслуг **“Majstar Web Programming Services”**

**Швед, В.В.**
Ш34 Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг. : (Гродзенская губерня) / Вячаслаў Швед. – Мінск : Альфа-кніга, 2017. – 312 с.

ISBN 978-985-7143-25-2

Дадзеная кніга з’яўляецца рэквіемам студзеньскім паўстанцам Гродзенскага паўстанцкага ваяводства, якое ўключала сённяшнія Гродзеншчыну, Брэстчыну, Беласточчыну. Нарысы апавядаюць пра ўдзельнікаў маніфестацыйнага перыяду 1861–1862 гг., распаўсюджвальнікаў газеты “Мужыцкая праўда”, сяброў падпольнай Гродзенскай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі, камандзіраў партызанскага руху і гродзенскіх паўстанцаў-гімназістаў, памочнікаў паўстанцаў, дэпартаваных са спаленых шляхецкіх ваколіц і вёсак. У кнізе прыводзяцца спісы партызанскіх атрадаў і страчаных паўстанцаў. Асобныя нарысы прысвечаны Кастусю Каліноўскаму (“чырвонаму”) і Віктару Старжынскаму (“беламу”). Пазначаны месцы, звязаныя з паўстанцамі.

Кніга адрасавана ўсім, хто цікавіцца грамадска-палітычным жыццём Беларусі, а таксама мінулым былой Гарадзеншчыны.

**УДК 94(476)«1863/1864»**
**ББК 63.3(4Беи)51**

**ISBN 978-985-7143-25-2**

© Швед, В. В. 2017
© Афармленне.
ТАА «Альфа-кніга», 2017

## Змест

GLORIA VICTIS ........ 5
«...УРАД ДЛЯ НАРОДА» ........ 6
«КАРОЛЬ ЛІТВЫ» ........ 53
«ЛІТОЎСКІ ВЕЛАПОЛЬСКІ»: ВІКТАР СТАРЖЫНСКІ ........ 62
«ПРАЧЫТАЙ І БУДЗЕШ УСЁ ВЕДАЦЬ» ........ 73
УДЗЕЛЬНІКІ ПЕРАДПАЎСТАНЦКАГА (МАНІФЕСТАЦЫЙНАГА) РУХУ ........ 86
“КРОЎ, ЯКАЯ ЛЬЕЦЦА ЗА НЁМАНАМ, ЗАКЛІКАЕ І НАС ДА ЗБРОІ!” ........ 108
ПАЎСТАНЦЫ ГРОДЗЕНСКАЙ ГІМНАЗІІ ........ 160
ПАМОЧНІКІ ПАЎСТАНЦАЎ ........ 172
ДЭПАРТАВАНЫЯ СА ШЛЯХЕЦКІХ ВАКОЛІЦ У «АДДАЛЕНЫЯ ГУБЕРНІ РАСІІ» ........ 221
ГРОДЗЕНСКІЯ АДРАСЫ ПАЎСТАНЦАЎ ........ 238
ПАСЛЯСЛОЎЕ ........ 275
ДАДАТКІ ........ 277



53

Braty maje, mużyki rodnyje.
Z pad szubienicy maskouskoj
pryjchodzić mnie da was pisaci,
i może raz astatni. Horko
pakinuć ziemielku radnuju
i Ciebie, darahi moj narodzie.
Hrudzi zastohnuć, zabolić
serce, — no nie żal zhinuć za
twaju praudu. —
Pryjmi narodzie pa szczyrasci
maje słowo predsmiert-
noje, bo jeno jak z taho świeta
tolko zla twaho dabra
napisano. —
Niemasz ~~Narodzie~~ Bratki bolszaho szczas-
cia na hetom swieci, jak kali

*«Лісты з-пад шыбеніцы»*
*К. Каліноўскага*

*Калі забуду іх,*
*Ты, Божа на небе,*
*Забудзь пра мяне.*
*А. Міцкевіч.*

# GLORIA VICTIS

*(Уступ)*

"Gloria Victis" («Слава пераможаным») — так Эліза Ажэшка назвала цыкл навэл, у якім расказала пра паўстанцаў 1863-1864 гг. Пісьменніца адчувала пачуццё глыбокай пашаны да традыцый 1863 г., шанавала дэмакратычныя запаветы паўстання і пісала пра яго герояў: «Не зняволеныя гэта былі на аркане перавагі цягнутыя да бою, а добраахвотныя ахвярнікі высокіх алтароў. Са святлом ідэі ў галавах, з агнём любові ў сэрцах, галовы і сэрца неслі высока. Былі моцныя, смелыя, актыўныя і, ці паверыш, пры́ткі вецер? — былі шчаслівыя»[1].

Героі маёй кнігі былі шчаслівымі людзьмі. Нягледзячы на тое, што хтосьці з іх быў «белы», а хтосьці «чырвоны», яны сумесна змагаліся за вызваленне Радзімы, адраджэнне Польшчы і Літвы-Беларусі.

Не атрымалася: слаба ўзброеныя партызанскія (паўстанцкія) атрады, нягледзячы на мужнасць і народную падтрымку, не змаглі (і не маглі) перамагчы перавышаючую колькасцю і ўзброенасцю ўрадавую армію. Многія з паўстанцаў паплаціліся за любоў да вольнасці і незалежнасці жыццём і лёсам. Але яны аказалі значны ўплыў на далейшае палітычнае і культурнае жыццё Беларусі.

Народам варта не забываць сваіх Герояў. Памяць аб іх не павінна затухаць. Таму задачай аўтара было вярнуць забытых і адшукаць у крыніцах невядомыя прозвішчы студзеньскіх паўстанцаў. Імі аўтар лічыць і сяброў Гродзенскай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі, і ўдзельнікаў маніфестацый 1861-1862 гг., і партызанаў, і іх памочнікаў, і распаўсюджвальнікаў «Мужыцкай праўды». Усе яны заслугоўваюць на рэквіем. Слава пераможаным!

---

1 Orzeszkowa E. Opowiadania. – Warszawa: Czytelnik, 1967. – S. 257.

# «...УРАД ДЛЯ НАРОДА»

## *(сябры Гродзенскай ваяводскай рэвалюцыйнай арганізацыі)*



*З. Серакоўскі*

Стварэнне Гродзенскай ваяводскай рэвалюцыйнай арганізацыі трэба звязваць з расійскім і польскім рэвалюцыйным рухам. Да лета 1861 г. у Расійскай імперыі пад уплывам М. Чарнышэўскага і М. Дабралюбава завяршылася станаўленне патаемнага таварыства «Зямля і воля». Ідэйныя сувязі яно мела з выдаўцамі «Колокола» А.І. Герцэнам і М.П. Агаровым. Варта прывесці словы апошняга: «...Патаемныя таварыствы, маючыя мэтай ператварэнне імперыі рабства ў саюз самакіравання, натуральна з'явяцца па абласцях і будуць імкнуцца да аб'яднання»[2]. Другая рэвалюцыйная арганізацыя ўзнікла ў Пецярбурзе пад кіраўніцтвам З. Серакоўскага і Я. Дамброўскага (у яе ўваходзілі браты Каліноўскія). Яна была звязана з першай і таксама прапагандавала ідэю рэвалюцыйнага саюза прыгнечаных народаў.

Гродзенская ваяводская рэвалюцыйная арганізацыя стваралася ва ўмовах узмацнення на Гродзеншчыне сялянскага руху пасля палавіністай і рабаўніцкай адмены прыгоннага права. Лютаўскія падзеі 1861 г. у Варшаве таксама звязаны з рэформай 1861 г. Яна не тычылася Каралеўства Польскага (там ужо не было прыгонных), але тут сялянскае пытанне не было вырашана канчаткова — патрэбна было адмяніць феадальна-абшчынныя павіннасці і надзяліць сялян зямлёй. 27 лютага варшаўскія рэвалюцыйныя гурткі правялі дэманстрацыю з мэтай аказання ціску на сяброў Земляробчага таварыства (пасяджэнні якога адбываліся з 21.02), якія не збіраліся адмаўляцца ад прыгонніцкіх метадаў эксплуатацыі.

Менавіта пасля расстрэла варшаўскіх дэманстрантаў (забіта 5 чалавек і некалькі дзясяткаў паранена) у Сакулцы, у доме Урублеўскага, сустрэліся В. Урублеўскі, Э. Заблоцкі, К. Каліноўскі, С. Сангін, ксёндз Я.-І. Казлоўскі. Заблоцкі на следстве сведчыў,

2 Огарёв Н.П. Избранные социально-политические и философские произведения. – Т. 1. – М., 1952. – С. 539.

што размова ішла пра варшаўскія падзеі, Каліноўскі і Урублеўскі сказалі яму, што хутка павінна быць створана «арганізацыя народнага польскага ўрада па ўсёй Літве», і прапанавалі яму прыняць у ёй удзел. У «Выписке, составленной в канцылярии Временного Полевого Аудиториата при Штабе Виленского военного Округа...», у даце заснавання арганізацыі «в 1862 году» лічба «2» алоўкам закрэслена і выпраўлена на лічбу «1» з указаннем на сход у доме Урублеўскага[3].

Сільвестровіч у сваіх паказаннях называў іншую дату — другая палова 1862 г. У «Конфирмации о лицах Гродненской революционной организации» гаворыцца наступнае: «Са справы відаць, што спробы да фарміравання рэвалюцыйнай арганізацыі па Гродзенскай губерні былі яшчэ ў пачатку 1861 г., затым у другой палове 1862 г., калі рэвалюцыйная прэса распаўсюдзіла звесткі пра ўладкаванне арганізацыі ў Царстве Польскім, ізноў былі адноўлены спробы да ўладкавання такой самай арганізацыі ў Гродзенскай губерні. Да гэтага часу трэба аднесці прызначэнне ў ёй для кіравання рэвалюцыйнымі справамі пад назвай камісара студэнта Канстанціна Каліноўскага, заняўшага пазней пасаду ўпаўнаважанага камісара ўсёй Літвы і ўжо пакаранага»[4].

**Тэрытарыяльна-адміністрацыйная структура** падпольнай арганізацыі ў Польшчы, Літве і Беларусі ўтваралася згодна з Статутам Агатона Гіллера (ліпень 1862 г.): ваяводства — ваявода, павет — павятовы, акруга — акруговы, сотня — сотнік, дзясятка — дзясяцкі. У Літве, Беларусі, як пісаў Оскар Авейдэ, «усе свае намаганні звярталі выключна на ўсталяванне галоўных ваяводскіх органаў», не стваралі дзясяткі, а для ўзмацнення прапаганды сярод сялян арганізоўвалі «начальнікаў прыходаў»[5]. Свае начальнікі былі ў мястэчках (не абавязкова), ваяводскіх гарадах (Гродне, Вільні, Мінску, Коўне) і ў паветах.

Спачатку (верагодна, з канца лютага 1861 г.) падзялілі Гродзенскае ваяводства на дзве часткі: Гродзенскі, Ваўкавыскі і Слонімскі паветы; Сакольскі, Беластоцкі; Брэсцкі, Кобрынскі і Пружанскі. Ваявода быў адзін, меў 2 памочнікаў[6]. Рассылалі паперы з ваявод-

3 ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917, ч. 1, а. 143.

4 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2887, а. 4 адв.-5 адв.; ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 28 адв., 47 адв.; с. 21, а. 304.

5 Авейде О. Показания и записки о польском восстании 1863 года. – М., 1961. – С. 451-453, 487; НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 10 адв.); Jabłoński H. Struktura cywilniej organizacji prowincjonalniej w Królewstwie Polskim // Przegląd Historyczny. 1938. – T. 34, cz. 2. – S. 472.

6 Jodkowski J. Rok 1863 w powiecie Grodzienskim (notatki i uzupelnienia) // Echo Grodzienski. – 1923. – № 17. – S. 3.

скага бюро Геніўша па ўсіх паветах. З пачатку паўстання, прыкладна з сакавіка 1863 г., падзялілі Гродзенскае ваяводства на тры часткі: Гродзенскі, Ваўкавыскі і Слонімскі паветы ўзначаліў намеснік ваяводскага камісара Э. Заблоцкі; Сакольскі, Беластоцкі і Бельскі падпарадкавалі В. Урублеўскаму; Брэсцкі, Кобрынскі і Пружанскі падначалілі цывільнаму ваяводзе Гафмайстру. Верагодна, з адыходам Урублеўскага з паўстанцкім атрадам у лясы (жнівень 1863 г.) адбыліся чарговыя змены: Гродзенскі, Ваўкавыскі, Слонімскі, Сакольскі і Беластоцкі паветы склалі Паўночнае ваяводства (яго ўзначальваў Заблоцкі, а затым Сільвестровіч); Брэсцкі, Кобрынскі, Пружанскі і Бельскі паветы склалі Паўднёвае ваяводства (тут ваяводам быў Гафмайстар)[7].

**Функцыі чыноўнікаў — кіраўнікоў ваяводскай арганізацыі:**

Цывільны ваявода спачатку быў адзіны на губерню, а потым да яго дадалі двух памочнікаў у сувязі з тым, што адбыўся падзел губерні на дзве часткі. Па сутнасці, яны ўсе дзейнічалі самастойна і падпарадкоўваліся толькі ўрадаваму камісару. Пры ваяводзе існавала ваяводскае бюро. Ваявода ажыццяўляў рэвізію паўстанцкіх атрадаў, распараджаўся іх дзеяннямі, назіраў за дзейнасцю чыноўнікаў падпольнай арганізацыі, рабіў распараджэнні па ваяводстве ў выкананні загадаў органаў кіравання паўстаннем і сваіх асабістых, прызначаў на пасады павятовых, начальнікаў прыходаў і патрабаваў ад іх справаздачы.

Начальнікі гарадоў займаліся зборам сродкаў на паўстанне, шукалі годных людзей і адпраўлялі іх у партызанскія атрады, сачылі за паводзінамі насельніцтва, уладаў і ўрадавых войск. Ім былі падпарадкаваны жаночыя гарадскія камітэты апекі паўстанцаў, якія мелі мэтай далучыць да паўстання жанчын.

Дзейнасць павятовых (паветаў, было іх тады ў Гродзенскай губерні дзевяць) ажыццяўлялася згодна з Інструкцыяй Літоўскага правінцыяльнага камітэта (Інструкцыяй для павятовых). Паводле яе павятовыя выконвалі загады ваяводскага і падавалі яму рапарт аб стане павета. Яны павінны былі ўтрымліваць павятовую касу і ўзмацняць сродкамі галоўную касу Камітэта, збіраць праз акруговых падатак з асобаў, якія належалі да арганізацыі, збіраць асоб-

7 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 103); ЛДГА, ф. 1248, воп. 1, с. 1320, ч. 2, а. 397; Ковкель И.И. Гродненская революционно-демократическая организация // Гродно: энцикл. справочник: БелСЭ, 1989. – С. 158-159; Бикулич В.Б. Революционная организация восстания 1863-1864 гг. в Литве и Белоруссии: автореферат диссертации. – Вильнюс: ИН АН Лит. ССР, 1973. – С. 18.

ную складку на зброю, падтрымліваць сувязь з акруговымі не менш аднаго раза ў тыдзень, арганізоўваць тайную паліцыю ў павеце, шукаць сабе здольных памочнікаў[8].

Павятовыя мелі наступных памочнікаў — акруговых начальнікаў і 3-5 рэферэнтаў, які займаліся даручанымі справамі. Інструкцыя для акруговых начальнікаў утрымлівала 21 пункт, у якіх пералічваліся іх абавязкі. Акруговы кіраваў парафіяльнымі і гміннымі начальнікамі, прымаў ад іх прысягу на поўнае падпарадкаванне і захаванне таямніцы, сачыў за выкананнем імі абавязкаў (весці рэвалюцыйную прапаганду, рыхтаваць і вывучаць зброю, збіраць падаткі), атрымліваў ад іх падатковыя грошы, падтрымліваў сувязь з падначаленымі не менш аднаго раза ў тыдзень[9].

Вайсковы рэферэнт вербаваў людзей у атрады, збіраў зброю, харчаванне, вопратку і ўсё іншае, што было патрэбна паўстанцам. Касір займаўся прыёмам сабраных грошай на паўстанцкую справу, рабіў фінансавыя справаздачы. Рэферэнт апекі турбаваўся пра параненых, збіраў бялізну для партызанскіх атрадаў, апякаў сем'і бедных паўстанцаў або ўдоў. Рэферэнт камунікацыі ўладкоўваў зносіны па павеце і станцыі перадачы рэвалюцыйнай карэспандэнцыі. Напрыклад, яны існавалі ў маёнтку Калбасіна, адкуль карэспандэнцыя ішла ў Ваўкавыскі і Сакольскі паветы; а таксама ў Навасёлках памешчыка У. Спірыдовіча.

Акруговых, напрыклад, у Гродзенскім павеце, было пяць, адпаведна 5 станам: Індурскі, Лунненскі, Крынскі, Азёрскі, Скідзельскі. Парафіяльныя начальнікі былі падпарадкаваны павятовым і займаліся тым самым, што і яны, але толькі ў межах сваёй парафіі.

Урадавы ваяводскі камісар павінен быў пастаянна сачыць за мясцовай рэвалюцыйнай адміністрацыяй, выкананнем яе рашэнняў, дакладаць аб яе дзеяннях у ЛПК і ЦНК[10].

Каля 20 студзеня (5.02) 1863 г. ЛПК выдала «Інструкцыю для ваенных начальнікаў, ваяводскіх і павятовых» і «Паўстанцкую інструкцыю». Камітэт заклікаў падняць узровень паўстанцкай агітацыі, заклікаць у атрады сялян і неадкладна праводзіць аграрную рэформу. Камандзіры партызанскіх атрадаў абавязваліся караць смерцю «найбольш злосных прыгнятальнікаў сялян...».

---

8 Каліноўскі К. За нашую вольнасць. Творы, дакументы / Уклад. прадм., пасл. і камент. Г. Кісялёва . – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1999. – С. 91-93.

9 Каліноўскі К. За нашую вольнасць… – С. 93-94.

10 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 504, а. 1-9; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 10 адв.-13 адв., 42 адв., 43 адв.

**У абавязкі начальніка Гродна і Гродзенскага цывільнага ваяводы ўваходзілі:**

- даводзіць да ведама партызанскіх атрадаў аб руху расійскіх войскаў і пра ўсё, што робіцца ў горадзе і губерні;
- выдаваць атэстаты (характарыстыкі) аб паводзінах і здольнасцях асоб, якіх адпраўлялі ў атрад;
- распараджацца фінансавымі сродкамі;
- аддаваць загады асобам, якія належалі да рэвалюцыйнай арганізацыі;
- ва ўсім садзейнічаць паўстанцам[11].
- Каля 28 кастрычніка 1862 г. ЛПК выдаў дзве інструкцыі: «Для павятовых начальнікаў» і «Для акруговых начальнікаў». У іх былі вызначаны абавязкі гэтых чыноўнікаў. Начальнік павета (павятовы) павінен быў:
- атрымліваць загады ад ваяводскага ці яго памочніка і ім жа падаваць рапарты пра стан павета (пра колькасць чальцоў арганізацыі, іх дзейнасць, стан павятовай касы, нацыянальны настрой і баявы дух усіх саслоўяў, колькасць і якасць зброі, урадавыя распараджэнні, перасліеды і рух войска, дзейнасць асобаў, якія не належаць да арганізацыі, пра сувязь з арміяй);
- утрымліваць павятовую касу, узмацняць сродкамі (збіраць праз акруговых падаткі ад асобаў, якія належаць да арганізацыі, а таксама складкі ад тых, хто не належыць да арганізацыі), збіраць асобныя складкі на набыццё зброі і весці дакладны рахунак;
- прызначаць акруговых і падтрымліваць з імі сувязь не менш аднаго раза ў тыдзень, прымаць ад іх рапарты;
- адшукваць здольных людзей для адпраўкі ў партызанскія атрады, сабе памочнікаў, памочнікаў для выканання паліцэйскіх абавязкаў;
- збіраць ці купляць вопратку, абутак, харчаванне, зброю і г.д.; патрабаваць таго самага ад сваіх падначаленых па арганізацыі[12].

Важную ролю надавалі чыноўнікі падпольнай арганізацыі канспірацыі. У Інструкцыях ЛПК для павятовых і акруговых начальнікаў (каля 28 кастрычніка 1862 г.) у пункце II гаварылася, што павятовыя ад акруговых, а акруговыя ад парафіяльных і гмінных начальнікаў, дзясятнікаў і сотнікаў павінны прыняць прысягу «на поўнае падпарадкаванне і захаванне таямніцы як на свабодзе,

11 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 7.

12 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 8; Каліноўскі К. За нашую вольнасць… – С. 91-93.

так і ў турме»[13]. Дзейнічала правіла: першы не ведае трэцяга. Многія чальцы арганізацыі, калі іх на допытах у следчых камісіях прасілі назваць іншых, адгаворваліся няведаннем менавіта з гэтай прычыны. Напрыклад, І.І. Геніўш казаў на следстве: «Хто быў начальнікамі паветаў і іншых месцаў рэвалюцыйнай партыі, мне невядома, таму што прынята было, каб аб гэтым не ведалі падначаленыя...» Не ведалі ўсіх чальцоў і кіраўнікі. Напрыклад, Ражанскі на следстве назваў некаторыя імёны, а потым адзначыў, што прозвішчы іншых не ведае, бо асабіста з імі незнаёмы ці наогул ніколі не бачыў[14].

Улады Гродзенскай ваяводскай рэвалюцыйнай арганізацыі падпарадкоўваліся з восені 1861 г. да кастрычніка 1862 г. Камітэту руху, які ў гэтым месяцы рэарганізаваўся ў Літоўскі правінцыяльны камітэт у Вільні (ЛПК, па Авейдэ, «не раней жніўня месяца 1862 г.»). 27.02 (11.03) 1863 г. ЛПК абвясціў сябе Часовым правінцыяльным урадам Літвы і Беларусі. З прыходам да ўлады «белых» 11 сакавіка 1863 г. ЛПК быў пераўтвораны ў Літоўскае выканаўчае аддзяленне, якое кіравалася правінцыямі Літвы», а з 14 (26).06.1863 г. па жнівень 1864 г. існаваў як Выканаўчы аддзел Літвы[15]. На допыце 30.01.1864 г. К. Каліноўскі паказаў, што па невядомых яму прычынах Гродзенская губерня па кіраванні адышла ад Літвы да Варшаўскага камітэта[16].

У Камітэт руху ўваходзілі Канстанцін Каліноўскі, Зыгмунт Чаховіч, Эдмунд Вярыга, Ян Козел-Паклеўскі, Баляслаў Длускі, Антоні Залезскі, Нестар дэ Лоранс, Людвік Звярждоўскі. З першай паловы лістапада 1862 г. да пачатку сакавіка 1863 г. чальцамі ЛПК былі: Эдмунд Вярыга, Сігізмунд Чаховіч, Канстанцін Каліноўскі, Ахілес Банольдзі, Якаў Казэла, Баляслаў Длускі. З пачаткам паўстання чальцамі выканаўчага аддзялення сталі: Якаў Гейштар, Аляксандр Аскерка, Францішак Далеўскі, Антон Яленскі, Уладзімір Малахоўскі. Пасля значных арыштаў у маі 1863 г. (у Вільні з'явіўся Мураўёў) кіруючае ядро папоўнілі: А.О. Авейдэ, Юзэф Каліноўскі, К. Каліноўскі, сакратаром стаў Фелікс Зянковіч, з былых засталіся Малахоўскі і Гейштар[17].

---

13 Каліноўскі К. За нашую вольнасць. Творы, дакументы / уклад, прадм., паслясл. і камент. Г. Кісялёва. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1999. – 464 с.

14 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 101 адв.; Rozanski F. Z wojewodstwa grodzienskiego: czterdziesta rocznice powstania styczniowego. 1863-1864. – Lwow, 1903. – S. 396.

15 Бикулич В.Б. Революционная организация восстания восстания 1863-1864 гг. в Литве и Белоруссии. – Вильнюс: Центральная биб-ка АН Лит. ССР, 1973. – С. 11, 14-15, 18, 23.

16 Каліноўскі К. За нашую вольнасць. – С. 132.

17 Авейде О. Показания и записки… – С. 487, 522, 542, 616; Giejsztor J. Pamietnik iz lat 1857-1865. – T. 2. – Wilno, 1913. – S. 327-328.



Э. Вярыга



Б. Длускі



Ф. Далеўскі



Я. Гейштар

Віленскае кіраўніцтва ўзгадняла сваю дзейнасць з Цэнтральным нацыянальным камітэтам (ЦНК) у Варшаве, які кіраваў паўстаннем у Польшчы, Літве і Беларусі. Прадстаўнік ЦНК быў у складзе віленскага кіраўніцтва (Нестар Дзюлёран). Але ў час, калі пры ўладзе былі «чырвоныя» на чале з К. Каліноўскім, яны праяўлялі сепаратызм у адносінах да ЦНК: пра гэта сведчыла назва органа («літоўскі»), грошы, якія збіраліся на Літве і Беларусі, заставаліся на месцы і выкарыстоўваліся на свае патрэбы. ЦНК вымушаны быў прызнаць самастойнасць ЛПК. Вось што пісаў Станіслаў Ажэшка, начальнік рэвалюцыйнай паліцыі ў Вільні: «...З дня беспарадкаў у краі стварыўся Літоўскі камітэт, які спачатку мала залежаў ад Варшаўскага. Пазней, набыўшы большую сувязь з Варшаўскім камітэтам, ён перайменаваны ў «Аддзел, кіруючы Літвой» («Wydzial zarzadzajacy prowicjami Litwy»), а затым, трапіўшы ў большую залежнасць, атрымаў назву «Аддзел выканаўчы на Літве» («Wydzial wukonawczy na Litwie»), пад якой і існаваў апошні час»[18].

О. Авэйдэ пісаў, што Мураўёў у маі 1863 г. «ушчэнт разбіў кволую літоўскую адміністрацыю, шляхецкія чыноўнікі ў панічным страху кідалі справы, хавалі ў зямлю пячаткі, не паведаміўшы нават пра гэтае сваё начальства»[19]. Але намаганнямі Кастуся Каліноўскага літоўскае кіраўніцтва аднавілася. Гродзенская ваяводская рэвалюцыйная арганізацыя перастала існаваць зімой 1864 г. Па дадзеных даследчыка Ежы Краскоўскага, яна налічвала каля 300 чалавек[20]. Для дазнання арыштаваных паўстанцаў былі створаны дзве Гродзенскія губернскія ваенна-следчыя камісіі па палітыч-

18 Каліноўскі К. За нашую вольнасць… – С. 188.

19 Авейде О. Показания и записки… – С. 542.

20 Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ), ф. 104, с. 77, а. 4.

ных справах. Яны супрацоўнічалі з падобнымі камісіямі іншых губерняў. Ад дзейнасці следчых камісій засталіся ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі і Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве дакументы і матэрыялы, на падставе якіх мы склалі свае біяграмы чальцоў Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі. Падобнага да гэтага часу зроблена не было.

Звернем увагу на сацыяльны склад Гродзенскай ваяводскай рэвалюцыйнай арганізацыі. Каліноўскі і яго паплечнікі папаўнялі свае шэрагі перш за ўсё за кошт разначыннай інтэлігенцыі (вясковыя настаўнікі, валасныя пісары, студэнты, чыноўнікі і г.д.). Каліноўскі гаварыў Э. Заблоцкаму, што хацеў бы, каб у арганізацыі «было болей людзей аднаго з ім стану, гэта значыць, якія б не належалі да класа памешчыкаў, інакш апошнія забяруць уладу ў свае рукі»[21]. Адпаведна, і погляды чальцоў былі рэвалюцыйна-дэмакратычныя («чырвоныя»): падрыхтоўка мас да народнай рэвалюцыі з мэтай звяржэння самадзяржаўя, дасягненне нацыянальнай самастойнасці і ліквідацыя прыгонніцтва[22].

Пачуцці, якія перажывалі ніжэйпералічаныя асобы, перадае Сільвестровіч: «...Но состояние почти болезненное, полное блестящих надежд, вместе с тем стыд отказаться, наконец должен сознаться, это и польщение моему самолюбию, которое, увы!, часто мною руководило, всё это решило меня принять (намінацыю на начальніка Гродзенскага павета. — В.Ш.)»[23].

**АБРЭМБСКІ ЛЮДАМІР (ЛЮБАМІР) ПАЎЛАВІЧ**, 43 гады ў 1864 г., ураджэнец м. Дзярэчын Слонімскага павета, маці — Францішка з Багушэвічаў. Скончыў Свіслацкую гімназію. Працу пачаў у кастрычніку 1840 г. у Гродзенскай гарадавой паліцыі. З красавіка 1841 г. пераведзены ў Гродзенскую палату дзяржаўных маёмасцяў. Заслужыў знак «15 гадоў бездакорнай службы», тытулярны дарадца. Жанаты, меў 2 сыноў і 1 дачку. Быў касірам рэвалюцыйнай арганізацыі Гродзенскага ваяводства з чэрвеня па кастрычнік 1863 г. (пасля Багаткі). Прызнаўся ў гэтым перад следчай камісіяй: на кватэры ў Мілеўскага ў чэрвені 1863 г. знаходзіліся, акрамя названых, Э. Заблоцкі і Каліноўскі, які, менавіта, і настойваў на прызначэнні А. касірам як чалавека сумленнага. А. згадзіўся з умовай, што будзе

21 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 48; Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг. – М., 1964. – С. 491.

22 Rozanski F. Z wojewodstwa grodzienskiego // W czterdziestą rocznicę powstania styczniowego, 18663-1903. – Lwów, 1903. – S. 396.

23 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 30.

кантактаваць толькі з Заблоцкім і толькі весці разлікі. За ўвесь час праз яго рукі прайшло звыш 10 тысяч рублёў. Быў арыштаваны 12 лістапада 1863 г. пад час вобыску ў палаце дзяржаўных маёмасцяў, калі знайшлі рэчы і паперы «возмутительного содержания». Сядзеў у Гродзенскай турме. Быў прысуджаны да катаржных прац у капальнях на 5 гадоў (спачатку да 8) (было «мнение» расстраляць). Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі. «По признанию неспособным к ношению оков 15 апреля 1866 г. заключён в Тобольскую тюрьму, откуда сослан в Восточную Сибирь». З 09.08.1876 г. жыў у Ядрыне Казанскай губерні на забеспячэнні казны. 18 студзеня 1879 г. выехаў на жыхарства ў Гродна (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 12 адв.; ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10, 47 адв., 113, 117; с. 1, а. 49, 72-74, 547 адв., 553 адв., 566; с. 4, а. 21; Электронны рэсурс: narod.ru|1864|Ssilka-kazan.html. — Дата доступа: 20.01.2013; Паўлаў В. Удзельнікі паўстання 1863 г. у ссылцы ў Казанскай губерні // ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 248).

**АЖЭШКА СТАНІСЛАЎ**, студэнт Пецярбургскага ўніверсітэта, кур’ер рэвалюцыйнай арганізацыі. Арыштаваны ў Бельску ў жніўні 1863 г. і дастаўлены ў Беласток, а затым у Гродна. Сядзеў у турме, а 24 жніўня адпраўлены ў Вільна. Знойдзеныя пры арэшце лісты давалі падставу меркаваць, што А. быў пасярэднікам паміж Э. Заблоцкім і В.-К. Каліноўскім. (Кайрыс А. Злавіць Каліноўскага... // Горад Святога Губерта: альманах локальной истории. — Вып. VII. — Гродна: Гродзенская бібліятэка, 2013. — С. 121).

**АЖЭШКА ФЛАРЫЯН ФЕЛІКСАВІЧ** (1833, па іншых дадзеных, 1835 г., Людвінава — 1905 г., Томск), малодшы брат Пятра і швагер Элізы Ажэшкі. Скончыў гімназію ў Мітаве, Пецярбургскую медыцынска-хірургічную акадэмію. Пасля яе заканчэння ў 1861 г. вяртаецца ў Кобрынскі павет і займаецца прыватнай урачэбнай практыкай, дапамагае Элізе ў школе, якую яна заснавала для сялянскіх дзяцей. Чалец Кобрынскай рэвалюцыйнай арганізацыі. Заклікаў шляхту да паўстання, стварыў запасы зброі і боепрыпасаў у маёнтку малодшага брата Браніслава Оўзічы (цяпер вёска ў Іванаўскім раёне). Уступіў у партызанскі атрад Траўгута, удзельнічаў у баявых



*Ф. Ажэшка*

дзеяннях і лячыў параненых. 5.07.1863 г. быў арыштаваны. У 1864 г. па канфірмацыі гродзенскага ваеннага губернатара быў пазбаўлены ўсіх правоў і сасланы ў Томскую губерню пад нагляд паліцыі. Быў вызвалены ў 1871 г., а праз год яму дазволілі паступіць на дзяржаўную службу па медыцынскай частцы (даслужыўся да чына калежскага дарадцы). Удзельнічаў у ліквідацыі эпідэміі халеры ў Томску ў 1871 г., з 1873 г. быў урачом Томскай духоўнай семінарыі, з 1883 г. — урачом Томскага духоўнага вучылішча. 10.10.1879 г. А. быў вызвалены ад абмежаванняў па службе і мог атрымліваць узнагароды за выслугу гадоў. У 1884 г. атрымаў ордэн св. Станіслава III ступені, у 1886 г. адмовіўся ад наступнага ордэна на карысць 1000 руб., у 1889 г. узнагароджаны ордэнам св. Ганны III ступені. Дом Ажэшкі быў адным з цэнтраў культурнага жыцця томскіх палякаў (Ігнатовіч Ф.І. Ажэшка Фларыян / Ф.І. Ігнатовіч // ЭГБ. — Т. 1. — Мн.: БелЭн, 1993. — С. 65; Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гг. на Гарадзеншчыне. — Гродна: ЮрСаПрынт, 2013. — С. 95—102; Ханевич В. Участники Январского восстания и их потомки в истории г. Томска // Powstanie Styczniowe. 1863—1864. Walka i uczestnicy. Represje i wygnanie. Historiografia i tradycja. — Kielce, 2005. — С. 141-143).

**АКІНЧЫЦ АЛЯКСАНДР ВОСІПАВІЧ** (каля 1839—?) — вольна практыкуючы ўрач у Слонімскім і Пружанскім паветах. У рэвалюцыйнай арганізацыі быў акруговым начальнікам. У паўстанцкім атрадзе быў урачом. Сасланы ў Расію адміністрацыйным парадкам. З Сібіры збег у маі 1865 г. і эміграваў за мяжу (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 9 адв.; Русско-польские революционные связи: материалы и документы. — Т. II. — С. 467, 698).

**АЛДАКОЎСКІ НАПАЛЕОН ПАЎЛАВІЧ**, 38 гадоў, нарадзіўся ў маёнтку Суботка Бельскага павета, вучыўся ў Беластоцкай гімназіі, у 1846 г. пачаў вайсковую службу ў коннай лёгкай батарэі № 4. За 8 гадоў заслужыў медаль і выйшаў у адстаўку паручнікам. Меў свой маёнтак Тылвіца ў Беластоцкім павеце (разам з сялянскімі надзеламі 2050 дзесяцін). Арыштаваны ў красавіку 1864 г. і пасаджаны ў муры паезуіцкага касцёла. Па паказаннях Э. Заблоцкага (гл.), Урублеўскага (гл.), Сільвярстовіча (гл.), рэвалюцыйны начальнік Беластоцкага павета (павятовы). Нягледзячы на гэта, пад час следства А. не прызнаўся ў тым, што займаў названую пасаду. У маі 1864 г. яшчэ знаходзіўся пад арыштам у Гродзенскай следчай камісіі. Прыгавораны да расстрэлу, але пазней быў паз-

баўлены палітычных правоў і высланы на жыхарства ў Томскую губерню, маёмасць падлягала канфіскацыі (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 12 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 64 адв. — 65; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10, 411-413; с. 1, а. 537 адв., 552 адв.; Jodkowski J. Sylwety z roku 1863 // Echo Grodzienski. — 1923. — № 160. — S. 3).

**АЛЕНДСКІ ЮЛІЯН КСАВЕР'ЕВІЧ**, нарадзіўся ў маёнтку Паўловічы Сакольскага павета ў 1837 г. Вучыўся ў Беластоцкай гімназіі, Варшаўскім шляхецкім інстытуце, Грыніёнскім агранамічным інстытуце (Францыя) і Парыжскай Сарбоне. Выконваў абавязкі міравога пасярэдніка Мінскага павета, а перад паўстаннем — сакратара графа Келлера, дырэктара ўрадавай камісіі ўнутраных спраў Каралеўства Польскага. Дваранін Ю. Эйсымонт данёс следчай камісіі, што А. кіраваў акруговымі і зборшчыкамі падаткаў у рэвалюцыйнай арганізацыі Сакольскага павета. Пад час вобыска ў яго знайшлі газету «Мужыцкая праўда», якую прынесла пакаёўка Марыяна Альшэўская. У садзе маёнтка знайшлі рэвалюцыйныя паперы ад ваяводы і акруговага начальніка. Пакінуты ў падазрэнні і сасланы на жыхарства ў Табольскую губерню (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 13; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 76-77 адв.; с. 2, а. 391-394, 402; с. 1, а. 563; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917, ч. 1, а. 123).

**АНДРЖЭЙКАВІЧ ГЕЛЕНА** з Кярсноўскіх, член Гродзенскага павятовага жаночага камітэта (або камітэта апекі) (гл. Ромер). Захавала для нашчадкаў верш Ц. Цэханоўскага «Падзяка Полькам». Памерла ў Друскеніках у красавіку 1922 г. (Jodkowski J. Rok 1863... (notatki i uzupelnienie) // Echo Grodzienski. — 1923. — № 17. — S. 3).

**АНДРЖЭЙКАВІЧ ТАДЭВУШ УЛАДЗІСЛАВАВІЧ**, у 1863 г. 18 гадоў, дваранін, меў маёнтак Стары Двор Гродзенскага павета непадзельна са сваімі сваякамі. Падазраваўся ў прыняцці намінацыі на камісара паўстанцаў Ваўкавыскага павета (у аднаго з параненых паўстанцаў знайшлі афіцыйную паперу, у якой гаварылася, што А. з'явіцца ў атрадзе). На следстве гаварыў, што не атрымліваў намінацыі, а калі такая прапанова была б, дык адмовіўся бы. Сядзеў з 24 верасня ў асобным доме ў Ваўкавыску, з 14 ліпеня 1864 г. — у Гродзенскім астрозе. Ад суда і арышта вызвалены, маёнтак ад сяквестра вызвалены. Ён аказаўся пляменнікам высокапастаўленага саноўніка МЗС Баварыі Бенігсена. Па даручэнні ка-

раля ваенны міністр Баварыі Брандт пісаў галаве МЗС Расіі князю А.М. Гарчакову, той — генерал-губернатару Мураўёву, а апошні — гродзенскаму губернатару графу Бобрынскаму. У выніку Андржэйкавіч быў пакінуты на месцы жыхарства пад наглядам паліцыі і «благонадёжным поручительстве». Сяквестр быў зняты (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 12 адв.; воп. 3, с. 4, а. 70 адв.-71; с. 1, а. 551 адв., 563; ф. 1, воп. 13, с. 1399, а. 125 адв.; воп. 34, с. 3590, а. 24-25 адв.).

**АСТРАМЕНЦКІ ЛЕЎ КАНСТАНЦІНАВІЧ**, 29 гадоў, памешчык Сакольскага павета, маёнтак Ласосна. У рэвалюцыйнай арганізацыі акруговы начальнік Сакольскага павета. Пад час дапросаў усяляк адмаўляўся ад гэтага, спасылаючыся на паклёп з боку рэвалюцыянераў, якія наўмысна хочуць узвесці паклёп на яго і шурына Алендскага (гл.), бо яны не хацелі прымаць удзел у паўстанні. Быў пад следствам Сакольскай следчай камісіі з 23 снежня, пад арыштам знаходзіўся ў Сакулцы. Суд, не маючы дастатковых доказаў, вырашыў «оставить в подозрении» і выслаць на жыхарства пад нагляд паліцыі ў Аланецкую губерню, маёнтак ад канфіскацыі быў вызвалены з выплатай 10 % збора (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 12 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11 адв., 399-408; с. 1, а. 85 адв., 549, 557; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917, ч. 1, а. 122).

**БАГАТКА ФРАНЦ ФАМІЧ**, 46 гадоў, скончыў невядомы нам універсітэт, былы асэсар Гродзенскай крымінальнай палаты, затым губернскі страпчы і калежскі сакратар Гродзенскага прыказа грамадскай апекі. Меў пад Гродна маёнтак Котра (арандаваў яго Ціт Чачот). Быў сакратаром і касірам у Гродзенскай дабрачыннай арганізацыі, дзейнасць якой была дазволена губернатарам. Жыў у доме Мірыновіча. У Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі займаў пасады рэферэнта апекі і касіра Гродзенскага паўстанцкага ваяводства да Л. Абрэмскага (чэрвень 1863 г.). Быў зняты з пасады з прычыны недакладнасцяў у вядзенні разлікаў збіраемых грошай. Высланы следчай камісіяй у Тамбоўскую губерню ў жніўні 1863 г. 24.02.1864 г. памёр ад чахоткі. Яго маёмасць была секвестравана. Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11, 114 адв., 165 адв., 206, 213-21 адв.; с. 4, а. 1-2, 21, 29; воп. 1, с. 40, а. 182 адв., 206 адв.).

**БАГАТКА ЮЗЭФА (ЮЗЭФІНА) АЛАІЗАЎНА**, 42 гады ў 1863 г., народжаная ў Цэльшэўскім павеце Ковенскай губерні, жонка гродзенскага чыноўніка, удзельніка рэвалюцыйнай арганізацыі Ф. Багаткі. Была апекуном у Гродзенскай дабрачыннай арганізацыі, дзейнасць якой была дазволена губернатарам Шпеерам. Чалец рэвалюцыйнага жаночага камітэта (або камітэта апекі) па Гродна з абавязкамі збіраць ад памешчыц, якія жывуць у горадзе, унёскі, сачыць за шыццём бялізны паўстанцам, дапамагаць сем'ям паўстанцаў. 14(26).04.1864 г. была арыштавана, у доме адбыўся вобыск. Сама ні ў чым не прызналася, а абвінавацелі (Э. Заблоцкі і С. Урублеўскі) растлумачылі, што ведаюць пра яе дзейнасць толькі па чутках. Вызвалена ад адказнасці, секвестр зняты, адпраўлена на месца жыхарства пад строгі паліцэйскі нагляд. У кастрычніку 1863 г. атрымала білет на выезд у Тамбоўскую губерню да сасланага мужа. Прывезла яго астанкі на радзіму пасля яго смерці. Мела дачку Марыю 19 гадоў (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а., а. 7 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 12, 206, 213-216; с. 1, а. 555; с. 4, а. 2, 20 адв.-21, 29).

**БАРТНОЎСКІ ФРАНЦ**, сакратар Брэсцкага магістрата, быў зборшчыкам грошай па Брэсцкім павеце. Быў арыштаваны і знаходзіўся пад следствам (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 10 адв.-11).

**БАЯРОЎСКІ АДАМ (АДОЛЬФ) ЦЭЛЯСФОРАВІЧ**, 40 гадоў у 1864 г., скончыў Свіслацкую гімназію ў 1845 г. і стаў чыноўнікам Гродзенскага губернскага праўлення, адкуль яго перамясцілі ў канцылярыю гродзенскага губернскага пракурора, апошняе месца працы — сталаначальнік Гродзенскага павятовага паліцэйскага ўпраўлення. Калежскі сакратар, жанаты, меў 4 дзяцей. Быў пры рэвалюцыйным начальніку Гродзенскага павета Я. Каменскім (сваім сябрам па гімназіі). Б. не прызнаўся да гэтага, але сказаў следчым, што меў кантакты з Заблоцкім, які даручыў яму сачыць за дзяўчынай Войнавай, якая скупляла харчаванне для палітычных арыштантаў, а таксама паведамляць пра дзеянні мясцовых грамадзянскіх і вайсковых уладаў супраць паўстанцаў. Гэтыя функцыі ён выконваў з чэрвеня па верасень 1863 г. (да арышта Заблоцкага) з прычыны цяжкага фінансавага становішча. Арыштаваны. Пад следствам сядзеў у мурах Кармяліцкага касцёла ў Гродне. На следстве выказаў згоду прыняць праваслаўе (гэта змякчала пакаранне). Прыгавораны да пасялення ў аддаленых месцах Сібіры

(Енісейскую губерню), але суд прасіў аб змякчэнні пакарання за «чистосердечное сознание». Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а., а. 7 адв.; ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11 адв., 170-175; с. 1, а. 30-34; с. 1, а. 84 адв., 548, 554 адв.; с. 4, а. 67-67 адв.; воп. 1, с. 40, а. 216; Jodkowski J. Sylwety z roku 1863 // Echo Grodzienski. — 1926. — № 8. — S. 3).

**БРІЭРЭ ДЭ МАРТЭРЭ УЛАДЗІСЛАЎ АЛЯКСАНДРАВІЧ**, 24 гады, нарадзіўся ў Гродзенскай губерні, вучыўся ў Гродзенскай гімназіі і Маскоўскім універсітэце, у 1864 г. жыў пры бацьках у Гродне, быў вольна практыкуючым урачом. У пачатку чэрвеня 1863 г. у кватэры хворага Мілевіча быў запрошаны Э. Заблоцкім да перапіскі папер. Так ён стаў перапісчыкам у рэвалюцыйным ваяводскім бюро І. Геніўша і займаўся гэтай справай на працягу паўтары месяцаў. У сакавіку 1864 г. быў арыштаваны. Пазбаўлены дваранскага звання, маёмасць падлягала канфіскацыі. Прыгавораны да пасялення ў менш аддаленыя часткі Сібіры, але суд прасіў аб змякчэнні пакарання (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а., а. 8; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11, 110; с. 1, а. 19-23, 98-104, 553; Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1923. — № 160. — S. 3).

**БУЛГАРЫН ЛЕАН**, сын Ваўкавыскага памешчыка, быў прызначаны ўрадавым камісарам Ваўкавыскага павета. Забіты пад час бою (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 9 адв.).

**БУРЖЫНСКІ МІРАСЛАЎ БЕРНАРДАВІЧ** (?, Мінская губ. — ?), вучыўся ў Мінскай гімназіі на факультэце матэматычных і натуральных навук Маскоўскага ўніверсітэта і на медыцынскім факультэце Дэрпцкага ўніверсітэта. Апошні скончыў са ступенню доктара медыцыны. Падазраваўся ў выкананні пасады касіра Брэсцкага і Кобрынскага паветаў. Арыштаваны 15(27).12.1863 г. Знаходзіўся пад следствам (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 11; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 1320, ч. 1, а. 588-590 адв.).

**БЯЛАКОЗ (БЯЛАКОС) АДОЛЬФ СЦЯПАНАВІЧ** (каля 1828-1863 гг.), з дваран Ваўкавыскага павета, нарадзіўся ў маёнтку Лешна. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі. Працаваў у Гродзенскай грамадзянскай палаце, меў чын калежскага рэгістратара.

Атрымаў бронзавы медаль у памяць аб Крымскай вайне. Пазней быў настаўнікам музыкі ў Беластоку. Актыўны памочнік Б. Шварца ў стварэнні арганізацыі ў Беластоку ў 1861-1862 гг. Па паказаннях Э. Заблоцкага, выконваў абавязкі рэвалюцыйнага начальніка Беластока. Пад час следства не прызнаў сваёй віны. Высланы з прычыны палітычнай неблаганадзейнасці ў Арэнбургскую губерню (па іншых дадзеных, у Пермскую ці Табольскую губерню). Па шляху ў ссылку скончыў жыццё самагубствам (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а., а. 8 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 63 адв. — 64; с. 2, а. 12 адв.; с. 1, а. 86, 549; воп. 1, с. 40, а. 229; Авейде О. Показания и записки о польском восстании 1863 года. — М., 1961. — С. 625; Революционная Россия и революционная Польша (вторая половина XIX в.). — М.: Наука, 1967. — С. 43).


*Ю. Вайсятыч*

**ВАЙСЯТЫЧ ЮЗЭФ (ВОСІП) ЦІТАВІЧ**, дваранін, паходзіў з вянгерскай сям'і Каралеўства Польскага, Радомскай губерні, 44 гады, вучыўся ў Радомскай гімназіі, аграном, кіраўнік маёнтка памешчыцы Дзяконскай Краснік Гродзенскай губерні. У сярэдзіне 1863 г. пераехаў на жыхарства ў маёнтак Газна Бельскага павета. Ад Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў атрымаў срэбны медаль за пчалярства і пахвальны ліст за якасныя жыта і пшаніцу. Жанаты з 1848 г., дзяцей не меў. У рэвалюцыйнай арганізацыі выконваў ролю вайсковага рэферэнта Гродзенскага павета. Бацька Вайсятыча на следстве паказаў, што да сына прыязджалі Завістоўскі, Рэдых, Камінскі, Радавіцкі. Арыштаваны ў красавіку 1864 г. У сваёй дзейнасці В. не прызнаўся, а следства не знайшло доказаў яго віны. Спачатку быў прыгавораны да расстрэла, але пакаранне яму змякчылі — да 10 гадоў катаржных прац, маёмасць падлягала канфіскацыі. Ссылку адбываў у Іркуцку, адкуль вярнуўся па амністыі Аляксандра III. Займаўся сельскай гаспадаркай як кіраўнік маёнтка генеральшы Кіцкай. Быў жанаты на Кушлуўне з Беластоцкага ўезда (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а., а. 8 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 44 адв. — 45 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 155-155 адв. 4; с. 1, а. 554; Jodkowski J. Rok 1863 w powiece... // Echo Grodzienski. — 1923. — № 34. — S. 3).

**ВІЛЬЧЭЎСКІ ВАЛЕРЫЯН АНТОНАВІЧ** (26.04.1835 г., в. Сенна Навагрудскага павета — 28.05.1916 г., Варшава), нара-

дзіўся ў Навагрудскім павеце Мінскай губерні, дваранін. Вучыўся ў Кіеўскім універсітэце Св. Уладзіміра (скончыў у 1862 г.). Быў вольна практыкуючым урачом у Слоніме. Выконваў абавязкі начальніка г. Слоніма. Быў урачом у партызанскім атрадзе Лукашэвіча, прымаў удзел у бітвах пад Міхалінам, Мілавідамі, ва ўрочышчы Бярозавае балота. Трапіў у палон. У жніўні 1863 г. арыштаваны, а ў верасні высланы на жыхарства ў г. Уфу Арэнбургскай губерні як палітычна неблаганадзейны. Праз 10 месяцаў быў ізноў накіраваны ў Гродна на допыты. Другі раз быў высланы ў Енісейскую губерню, а затым — у Мінусінск. У 1869 г. яму дазволілі перасяліцца ў Спаск Тамбоўскай губерні. У 1879 г. пакінуў Сібір і пасяліўся ў польскім горадзе Калішы, дзе займаўся медыцынскай практыкай. Публікаваў навуковыя працы па медыцыне, быў адным з арганізатараў таварыства ўрачоў (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 54 адв. — 55; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 12; с. 1, а. 551; воп. 1, с. 40, а. 226; Грицкевич В.П. С факелом Гиппократа: Из истории белорусской медицины. — Мн.: Наука и техника, 1987. — С. 194; Игнатович Ф.И. Врачи Слонимщины — участники восстания 1863 года // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў. 1252-2002. — Слонім: Слонімская друкарня, 2002. — С. 209, 211).

**ГАФМАЙСТАР (ГОФМЭЙСТЭР) АПАЛОН ПАЎЛАВІЧ** (1825 г., Брэст, па іншых дадзеных, Шастакова — 1.07.1890 г., Кракаў), памешчык Брэсцкага павета маёнтка Шастакова. Пасля атрымання хатняй адукацыі вучыўся ў Варшаўскай гімназіі і Берлінскім універсітэце. Адстаўны афіцэр, удзельнік так званай «справы Рэра» ў 1846 г., калі замежныя эмісары спрабавалі арганізаваць новае паўстанне на тэрыторыі Беларусі. Сасланы на 7 гадоў у арыштанцкія роты Орскай крэпасці ў Арэнбургскай губерні. Вярнуўся дадому ў 1857 г., пасяліўся ў маёнтку Шастакова, яшчэ да 1861 г. вызваліў сваіх сялян ад прыгоннага права. У лютым 1863 г. з сямействам выехаў у Брэст-Літоўск. Ізноў уключыўся ў рэвалюцыйную дзейнасць. У красавіку 1863 г. сустрэўся ў Брэсце з камісарам Народнага ўрада Чарноцкім (Каліноўскім), пасля чаго стаў гродзенскім ваяводам, адказным за Брэсцкі, Кобрынскі і Пружанскі паветы. Праз некалькі дзён сустракаўся ў Беластоку з Каліноўскім, Урублеўскім, Духінскім. Затым паехаў у Гродна да Э. Заблоцкага, якому адвёз пячатку з надпісам «Начальнік Гродзенскага ваяводства». Недзе ад жніўня 1863 г. (у гэты час вярнуўся на жыхарства ў маёнтак) — ваявода 4 паветаў паўднёвай часткі Гродзенскага ваяводства (да названых трох дадаўся Бельскі павет). Дваравыя людзі паказалі, што часта

выязджаў у Брэст, а да яго ў Шастакова прыязджаў Швыкоўскі. Да следства прыцягвалі і жонку Гелену (Алаізу). У лютым 1864 г. узяў пашпарт на выезд у Маскву для вырашэння фамільных спраў адносна раздзела маёмасці пасля памерлай швагеркі. Праездам быў у Пецярбургу, што засведчыў на следстве У.-І.Л. Пасяніцкі. У красавіку 1864 г. быў арыштаваны ў Старай Русе Наўгародскай губерні, спачатку даваў паказанні ў 1-й Гродзенскай следчай камісіі, а ў ліпені — у Віленскай камісіі. У лістападзе 1864 г. перададзены ваенна-палявому суду, які прыгаварыў яго да расстрэла. Маёнтак канфіскаваны (514 дзесяцін ворнай зямлі, млын, карчма). Смяротнае пакаранне замянілі ссылкай на катаргу ва Усоль. У 1868 г. па царскаму маніфесту накіраваны на пасяленне ў Іркуцк. Займаўся тут навучаннем музыцы. Дзякуючы намаганням нейкага замежніка атрымаў эміграцыйны пашпарт без права вяртання ў Расію. Прыкладна ў 1873 г. пасяліўся ў Галіцыі — спачатку ў Бродах, затым у Кракаве, дзе і памёр (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10 адв.-11, 49 адв.; ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 19, 25-26; с. 40 а, а. 48-76, 80, 96 адв.; с. 21, а. 29; ф. 23, воп. 1, с. 372; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 1320, ч. 2, а. 44, 52, 54, 55, 155-156, 306 адв.; Госцеў А.П., Швед В.В. Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116-1990 гг.). — Гродна: ГАА БФК, 1993. — С. 151).

**ГЕНІЎШ ІГНАЦІ ІГНАЦЬЕВІЧ**, 43 гады, сваяк А. Талочкі (гл.), чыноўнік Гродзенскай казённай палаты, калежскі асэсар. Жыў на кватэры ў доме Арона Пундзіка. Са студзеня 1863 г. быў перапісчыкам рэвалюцыйных папер і загадваў карэспандэнцыяй пры ваяводскіх Э. Заблоцкім і Ст. Сільвестровічы (начальнік ваяводскага бюро). На гэтую пасаду яго прызначылі Сангін і В.-К. Каліноўскі ў заезным доме каля кляштара на вуліцы Маставой у Гродне. Напісаў дзве ўлёткі да падпарадкаваных ваяводству воласцей аб неабходнасці выкарыстаць усе сродкі, каб выканаць распараджэнні Віленскага камітэта. Арыштаваны 29 сакавіка і ў красавіку 1864 г. высланы да віленскага каменданта. Прыгавораны ваенным судом да высылкі ў Сібір на катаржныя працы на заводах на 6 гадоў з пазбаўленнем дваранскіх прывілеяў і правоў (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10 адв.-11, 48 адв., 56, 122; с. 1, а. 48 адв., 52, 100-104, 361 адв.; с. 4, а. 22-23).

**ГЛІНДЗІЧ МЕЧЫСЛАЎ ВОСІПАВІЧ** (1836 г., Грушкі, 15 км ад Ліпска Аўгустоўскай губерні — 9.09.1916 г., па іншых дадзеных, пасля 1880 г., Краснае, 6 км ад Ліпска). У 1859 г.

з адзнакай скончыў медыцынскі факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. Працаваў вольна практыкуючым урачом у Ваўкавыскім павеце, дзе меў, па словах Пансэта дэ Сандона, «вялікую практыку». У лютым 1862 г. прызначаны на пасаду павятовага ўрача. У Гродзенскай ваяводскай арганізацыі быў ваўкавыскім павятовым начальнікам. Ад следства хаваўся, верагодна, у першай палове чэрвеня 1863 г., калі гаварыў Пансэту дэ Сандону, што едзе ў Маскву для здачы экзамена на хірурга і каб адвезці брата ва ўніверсітэт. На самай справе ўступіў у паўстанцкі атрад К. Раматоўскага. Удзельнічаў у баях на тэрыторыі Ваўкавыскага, Гродзенскага і Аўгустоўскага паветаў. Выконваў абавязкі ўрача і ваяваў са зброяй у руках. Пасля бітвы пад Стшэльцавізнай збіраў рэшткі атрада і далучыўся да атрада А. Клімкевіча. Ваенна-следчай камісіяй не адшуканы, аддадзены ваеннаму суду завочна і прыгавораны да расстрэла, маёмасць падлягала канфіскацыі. Эміграваў у Францыю. Пасля перападрыхтоўкі і здачы экзамена стаў працаваць урачом у Парыжы. У 1880 г. абараніў доктарскую дысертацыю. У 1890 г. прыняў падданства Францыі. Да смерці працаваў урачом у г. Куілы пад Парыжам (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 49 — 49 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10, 11 адв.; с. 1, а. 414, 511, 512, 564; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917, ч. 1, а. 117 адв.; Игнатович Ф.И. Медики — участники восстания 1863 года и их судьба // Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсу людзей. — Ваўкавыск: Ваўкав. узбуйн. друкарня, 1997. — С. 135, 137; Zielinski St. Bitwy i potyczki 1863-1864. Na podstawe materialyw drukowanych rękopisemnych Muzeum Narodowego w Rapperswilu. — Rapperswil, 1930. — S. 263).

**ГЛУХОЎСКІ АНТОН**, аднадворац, кіраўнік маёнтка А. БагуслаўскайКівацічы Пружанскага ўезда. Выконваў ролю рэферэнта пры акруговым Уластоўскім, ажыццяўляў сувязь з суседнім акруговым і павятовым Гродзенскі ваенна-палявы суд прыгаварыў да расстрэла (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40 а, а. 286; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 1320, ч. 1, а. 32, 44, 98 адв., 237 адв.).

**ГРЫНЯВІЦКІ ЯН ФЛАРЫЯНАВІЧ** (па інш. — ВАЙЦЭХАВІЧ), 42 гады ў 1863 г., з дваран Гродзенскай губерні, маёнтак Грыніцы ў Сакольскім павеце. Выпускнік Маскоўскага ўніверсітэта, тытулярны дарадца, міравы пасярэднік у Сакольскім павеце. Перад паўстаннем спяваў патрыятычныя гімны ў касцёле м. Сідры. Рэвалюцыйны вайсковы начальнік Сакольскага павета

пасля В. Урублеўскага (гл.). Дастаўляў у паўстанцкія атрады харчаванне, пісаў прадпісанні свайму акруговаму начальніку, параіў валасному старшыні Янарчуку не падаваць адрас на імя імператара, бо могуць павесіць (верагодна, паўстанцы). Быў арыштаваны ў ліпені 1863 г. Не прызнаў сваёй віны, нягледзячы на сведчанні Э. Заблоцкага (гл.), Ст. Сільвястровіча (гл.). Спачатку прыгавораны да расстрэла, а пазней пазбаўлены правоў і прывілеяў стану і высланы ў Сібір на катаржную працу на 12 гадоў у Томскую губерню. Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 59-60; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10, 11 адв., 71, 379-382 адв.; с. 1, а. 552 адв.; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917 б., а. 180-181, 195, 200; Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1923. — № 166. — S. 3).

**ДАШКЕВІЧ КОНРАД МІХАЙЛАВІЧ**, дваранін Гродзенскай губерні і павета, 29 гадоў. Пасля заканчэння Варшаўскай гімназіі напісаў працу аб развіцці бурачна-цукровай прамысловасці, за якую атрымаў срэбны медаль. Затым вучыўся на курсе аграноміі ў Каралеўскай акадэміі г. Гогенгейма Віртэмбергскага Каралеўства. Пэўны час пражыў у дзядзькі Р. Дашкевіча ў Бельскім павеце, а ў ліпені 1862 г. узяў у арэнду маёнтак П. Дашкевіча Гуркі Гродзенскай губерні. У рэвалюцыйнай арганізацыі выконваў абавязкі Крынскага акруговага начальніка ў Гродзенскім павеце. У сваёй дзейнасці В. не прызнаўся, а следства не знайшло доказаў яго віны (але паказаў, што ведае і бывае ў Солтана, Ромера, Завістоўскага, Чацвярцінскага, а гэтыя асобы звязаны з рэвалюцыйнай арганізацыяй). Пад следстваў сядзеў у мурах Кармяліцкага кляштара. Прыгавораны да катаржных прац на 8 гадоў у Томскай губерні. Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а., а. 9 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 47 адв.; ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 18 адв., 166 адв., 244-248; с. 1, а. 548, 555 адв.; воп. 1, с. 40, а. 143-146; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917, ч. 1, а. 118; Jodkowski J. Sylwety z roku 1863 // Echo Grodzienski. — 1926. — № 8).

**ДЗЯКОНСКІ**, пленіпатэнт, акруговы Гродзенскага павета пры Сільвястровічы (Jodkowski J. Rok 1863 w powece... — № 34).

**ЖАЛКОЎСКІ ЎЛАДЗІСЛАЎ ЛЮДВІГАВІЧ** (каля 1837 г. — ?), дваранін, скончыў Гродзенскую гімназію, з 1856 па 1860 г. быў вольным слухачом Кіеўскага ўніверсітэта. У сувязі з хваробай вярнуўся ў Гродна і паступіў на працу чыноўнікам (губернскі сакратар) канцылярыі гродзенскага ваеннага губернатара. Спачатку ў арганізацыі быў памочнікам Цэханоўскага, а потым рэвалюцыйным начальнікам Гродна пасля Ю. Руткоўскага (гл.). Рабіў закупкі вопраткі і абутку для паўстанцаў. Магчыма, Ж. атрымаў перад арыштам апошняга пячатку начальніка горада і знішчыў яе, выкінуўшы ў прыбіральню каля кватэры Руткоўскага (гл.). Арыштаваны 31.03.1864 г. У сваёй дзейнасці на апошняй пасадзе не прызнаўся. Жыў у Гродне па вул. Купецкай, у доме брыгітак. Прыгавораны да катаржных прац на 8 гадоў у Сібіры і канфіскацыі маёмасці (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11, 189, 191, 193; с. 1, а. 554 адв.; с. 4, а. 30-31, 34; воп. 1, с. 40, а. 157).

**ЖУКОЎСКІ МІХАІЛ СЯМЁНАВІЧ**, памешчык Пружанскага павета, 44 гады, народжаны ў маёнтку Блудзен. Вучыўся ў Пружанскім павятовым вучылішчы. Быў папячыцелем магазінаў, пружанскім павятовым начальнікам, прызначыў на акруговага А. Я. Уластоўскага. Арыштаваны 22 ці 23 верасня (4 ці 5 кастрычніка) 1863 г. Гродзенскі ваенна-палявы суд пакінуў «у падазрэнні» (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40 а, а. 275, 277 адв., 284 адв.-285; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 1320, ч. 1, а. 112, 126, 237).

**ЗАБЛОЦКІ БАЛЯСЛАЎ-ЮЛІ КАРЛАВІЧ** (14.07.1834 г., м. Крожы Ковенскай губерні — 27.01.1904 г., Гродна), родны брат Эразма Заблоцкага. Закончыў Лідскае 5-класнае вучылішча, Гродзенскую гімназію і Маскоўскі ўніверсітэт (са ступенню павятовага лекара, 1860 г.). Пісаў патрыятычныя вершы. У 1861 г. пад час свята Божага Цела раскідваў у Брыгіцкім і Бернардзінскім касцёлах «листки возмутительного содержания». Ягоная кватэра стала падпольнай яўкай, куды прыходзілі пад выглядам пацыентаў. 25 верасня 1863 г. ваенным начальнікам паветаў загадвалася арыштаваць доктара Заблоцкага. Ужо 26.09 гэта было зроблена. З. не прызнаўся, што займаў пасаду камісара Гродзенскага ваяводства пасля арышта брата, і сказаў, што не ведае, хто ім быў. Пад час вобыску ў яго знайшлі толькі забароненую кнігу «Заўвагі на сачыненне «Аб жыццёвых ісцінах польскага народа»». Станіслаў Ажэшка сведчыў у Віленскай следчай камісіі, што прывёз ад Каліноўскага доктару Заблоцкаму ліст, адрасаваны камісару ваяводства

ад Выканаўчага аддзела на Літве. Прыгаворам Віленскага ваеннага суда высланы на жыхарства ва ўнутраныя расійскія губерні. Пасля царскай амністыі, у 1868 г., пераехаў на жыхарства ў Польскае Каралеўства. Па дарозе яму дазволілі спыніцца на адзін месяц у Гродне для сустрэчы з мамай. Дазвол вярнуцца ў Гродна атрымаў, відаць, у 1889 г., калі пачаў працаваць прыватна практыкуючым урачом. Узгадваецца ў «Расійскіх медыцынскіх спісах» і «Памятных кніжках Гродзенскай губерні» да 1905 г. Памёр 15(27).01.1904 г., захаваны на каталіцкіх могілках Гродна (Игнатович Ф.И. Гродненский врач Б.К. Заблоцкий — участник восстания 1863-1864 гг. // Медицина на рубеже веков: к 100-летию Первой мировой войны: сб. материалов. — Гродно: ГрГМУ, 2014. — С. 171-175; НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 6, а. 20, 21, 24, 46; с. 1, а. 45-46, 145-146 адв., 148, 362 адв.).

**ЗАБЛОЦКІ ЭРАЗМ КАРЛАВІЧ**, псеўданім Медыёр (1830 ці 1831 г.?, Вільна — не раней 1884 г.). Скончыў Лідскае павятовае вучылішча, Гродзенскую гімназію (пасведчанне аб заканчэнні і дазволе на чын XIV класа ад 7.08.1848 г.). Пісар першага разрада, а затым бухгалтар будаўнічай і дарожнай камісіі Гродзенскага губернскага праўлення. У 1860 г. у Друскеніках (хварэў падучай) пазнаёміўся з В. Урублеўскім. У 1861 г. быў запрошаны ім у Саколку, дзе адбылося абмеркаванне стварэння Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі «Народнага польскага ўрада». З лета 1862 г. — памочнік Гафмайстра, ваявода паўночнай часткі Гродзенскага ваяводства (Гродзенскі, Ваўкавыскі, Слонімскі паветы). У сакавіку 1863 г. прымаў удзел у жалобных набажэнствах, а з ліпеня да верасня 1863 г. — камісар ваяводства. У маі 1863 г. разам з В.-К. Каліноўскім рабіў агляд органаў паўстанцкай улады ў Слонімскім і Ваўкавыскім паветах з мэтай навядзення парадку ў патаемнай арганізацыі. 2.06.1863 г. быў з Каліноўскім у лагеры пад Мілавідамі, дзе правялі агляд войска. Арыштаваны ў пачатку верасня (па іншых дадзеных, 24 кастрычніка) 1863 г. і прыгавораны ў 1864 г. ваенным судом да расстрэла. Пазней прыгавор змякчылі да 15 гадоў катаргі. Па сведчаннях сваякоў, у 1884 г. яшчэ жыў. Меў жонку Гелену Вальта-Скжыдлеўскую, сына Рафала, тры дачкі (Аўгуста, Казіміра, Гелена) (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10; с. 1, а. 35, 49, 384; с. 4, а. 16 адв.; Игнатович Ф.И. Гродненский врач Б.К. Заблоцкий — участник восстания 1863-1864 гг.; Революционный подъём в Литве и Белоруссии... — С. 151; Komar J. Grodzienskie manifestacje przed powstaniem styczniowym // Przegliod Historyczny.

Т. 51. — 1960. — S. 119; Kozlowski E. Zapomnia newspomnienia. — Warszawa, 1981. — S. 491).

**ЗАВІСТОЎСКІ ЛЮЦЫЯН ДАМІНІКАВІЧ**, 31 год у 1864 г., дваранін Гродзенскай губерні. Чатыры гады быў на службе ў Сакольскага прадвадзіцеля дваранства, з 1859 г. — адстаўны калежскі рэгістратар, кіраваў маёнткам Алекшыцы і справамі свайго дзядзькі І.С. Завістоўскага, які жыў у Варшаве. Пры Сільвястровічы быў рэферэнтам камунікацый, стварыў станцыю для перадачы рэвалюцыйнай карэспандэнцыі (быў звязаны з Гліндзічам з Ваўкавыска, Э. Заблоцкім, Сільвястровічам і Камінскім з Гродна), у чым прызнаўся на допыце (заяўляў, што яго прымусілі пагрозамі). Заняў гэтую пасаду па прапанове адстаўнога капітана Ст. Завістоўскага, гараднічага м. Зэльва. У маі 1863 г. прымаў у Алекшыцах К. Каліноўскага і Э. Заблоцкага, якія інспектавалі арганізацыю. 18.10.1863 г. арыштаваны. Прыгавораны да ссылкі на пасяленне ў аддаленыя месцы Сібіры, але суд прасіў аб змякчэнні пакарання за «чистосердечное сознание». Было «мнение» выслаць на катаржныя працы на 8 гадоў, але тэрмін склаў толькі 4 гады. Маёмасць падлягала канфіскацыі. Відаць, быў сасланы ў Томскую губерню, адкуль збег праз 2 гады (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а., а. 9 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 41 — 41 адв.; с. 2, а. 147-153, 165 адв.; с. 1, а. 553 адв.; ф. 3, воп. 1, с. 8, а. 47 адв., 78 адв.; с. 40, а. 6 адв.; Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў на Гродзеншчыне. — Гродна: ЮрСаПрынт, 2013. — С. 72).

**КАЗЛОЎСКІ ЯН ІГНАЦІЙ**, нарадзіўся каля 1832 г. у Лідскім павеце, паходзіў з прыгонных сялян. Вучыўся ў Беластоцкай гімназіі і Віленскай духоўнай семінарыі. Служыў у Ялаўскім касцёле, быў вікарным Індурскага касцёла (1861—14.01.1864 гг.), затым адміністратарам Роскага прыходскага касцёла. Супрацоўнічаў з Віленскай археалагічнай камісіяй. Разам з В.-К. Каліноўскім распаўсюджваў «Мужыцкую праўду» на Бераставіччыне і Свіслаччыне, будучы адным з кіраўнікоў патаемнай рэвалюцыйнай арганізацыі ў Вялікай Бераставіцы. Прысутнічаў на сходзе ў Сакулцы, пад час якога быў пакладзены пачатак Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі. Выказаў згоду прывесці Э. Заблоцкага да прысягі. Ад следства схаваўся, аддадзены ваеннаму суду завочна і прыгавораны да расстрэла. Пасля паўстання склаў з сябе духоўны сан і працаваў настаўнікам у рускіх губернях. У 1882 г. быў калежскім асэсарам, працаваў на Доне ў Вусць-Мядзведзіцкай мужчын-

скай гімназіі (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 1931, 2949; ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 414; Памяць. Бераставіцкі раён. — С. 75; Гостев А.П. Швед В.В. Кронон... — С. 171; Кісялёў Г. Разам з вялікім Кастусём // Бел. мова і літ-ра. — 1982. — № 2. — С. 48-49; Кісялёў Г. З думай пра Беларусь: Даследаванні і знаходкі з гісторыі беларскай літаратуры і рэвалюцыйнага руху другой паловы XIX стагоддзя. — Мн.: Беларусь, 1966. — С. 118, каментар).

**КАЛІНОЎСКІ ВІКЕНЦІЙ КАНСТАНЦІН СЯМЁНАВІЧ** (мянушкі Макарэвіч, Хайноўскі, Хамут, Хамовіч, Хамуціўс 1-ы, Чарноўскі, Чарноцкі, Ігнаці Вітажэнец) (2.02.1838 г., м. Мастаўляны Гродзенскай губерні — 22.03.1864 г., Вільна). Скончыў Свіслацкую прагімназію ў 1855 г., накіраваўся ў Маскоўскі ўніверсітэт з пасведчаннем аб беднасці. У канцы ліпеня 1856 г. разам з братам Віктарам пераехаў у Пецярбург. У час вучобы на юрыдычным факультэце Пецярбургскага ўніверсітэта (тут працаваў Каліноўскі Бальтазар, магчыма, сваяк К.) быў звязаны праз Віктара і Б. Каліноўскага з гуртком З. Серакоўскага — Я. Дамброўскага (з 1858 г.), разам з братам вывучаў гісторыю і права Беларусі і Літвы (працавалі з дакументамі і літаратурай у Публічнай бібліятэцы; мелі сваю бібліятэку на гэтую тэматыку), выконваў грамадскія абавязкі бібліятэкара ў студэнцкім таварыскім коле («Агуле»), які аб'ядноўваў студэнтаў — выхадцаў з Польшчы, Літвы, Беларусі, Украіны. Пасля заканчэння ўніверсітэта са ступенню кандыдата навук права (1860 г.) вярнуўся ў Якушоўку Ваўкавыскага павета, дзе бацька напалову з жонкай (дзявочае прозвішча Лазарэвіч) меў маёнтак у 220 дзесяцін. Дапамагаў па гаспадарцы, але, пасварыўшыся з мачахай, паехаў, па словах С.С. Каліноўскага, у Гродна шукаць службу. 69У пачатку 1861 г. падаў прашэнне аб прыёме на працу ў Вільні, але не быў прыняты. Стаў прафесійным рэвалюцыянерам: вясной 1861 г. пачаў ствараць Гродзенскую ваяводскую арганізацыю, праз год стала выходзіць «Мужыцкая праўда». Восенню 1861 г. увайшоў у склад Камітэта руху ў Вільні, а з кастрычніка 1862 г. па сакавік 1863 г. быў старшынёй Літоўскага правінцыяльнага камітэта (у гэты час перайшоў на нелегальнае становішча). Пасля пераварота «белых» падаў ад імя сваіх прыхільнікаў пратэст, у якім гаварылася, што яны пратэстуюць супраць «перадачы кіраўніцтва ў рукі контррэвалюцыянераў» і «скідваюць з сябе ўсю адказнасць перад будучым за ўсе памылкі і ўсе страты і няшчасці, якія прынясе супраціўна духу і тэндэнцыі паўстання кіраўніцтва Літоўскай справай». «Белыя» прыцягнулі Каліноўскага да суду,

але потым спынілі следства, прымірыліся з ім. Каліноўскі часова быў памочнікам начальніка Вільні А. Аскеркі, а ў канцы сакавіка 1863 г. атрымаў мандат на пасаду ўрадавага камісара Гродзенскага ваяводства (пад прозвішчам Чарнецкі). Падтрымліваў сувязь з аднадумцамі ў Вільні (Малахоўскім, Віслаўхам), часам прыязджаў да іх. Каля 21.06.1863 г. стаў кіраўніком аддзялення ўнутраных спраў Аддзела, кіруючага правінцыямі Літвы. У пачатку верасня атрымаў паўнамоцтвы ўрадавага камісара ў Літве і Беларусі. Выступаў за падрыхтоўку народнай (сялянскай) рэвалюцыі, раздачу ўсёй зямлі сялянам, самастойнасць Беларусі. Як кіраўнік «чырвоных» на Літве і Беларусі праяўляў сепаратызм у адносінах да Варшаўскага цэнтральнага камітэта, бараніў незалежнасць гістарычнай Літвы ад Варшавы. Падтрымліваў сумесную барацьбу палякаў, літоўцаў і беларусаў супраць расійскага самаўладдзя. Царскія ўлады пачалі пошук К. пасля распаўсюджвання «Мужыцкай праўды» ў в. Шайнякі ў кастрычніку 1862 г. Быў затрыманы з-за здрады В. Парфіяновіча 9 лютага 1864 г. у казённым гімназічным будынку ў Вільні, дзе жыў пад прозвішчам «Вітажэнец». Зняволены ў будынку былога Дамініканскага кляштара. Супрацоўнік Мураўёва А. Масолаў пісаў, што К. першы дзень «толькі кусаў вусны і без ахвоты адказваў на пытанні», пазней ён напісаў на добрай рускай мове «цікавыя разважанні аб адносінах рускай улады да польскага насельніцтва заходняга краю, у якіх, між іншым, выказаў думку аб хісткасці сучасных урадавых дзеянняў і поўную агіду да рускіх чыноўнікаў, якія прыбылі ў край». У паказаннях следчым гаварыў толькі пра сябе, а калі называў прозвішчы іншых паўстанцаў, дык толькі тыя, пра якіх ведаў, што забітыя ці выехалі ў эміграцыю. Выдаўца газет на польскай мове «Голас з Літвы», «Харугва свабоды» (орган Літоўскага правінцыйнага камітэта), аўтар «Ліста з-пад шыбеніцы», верша «Марысенька, чарнаброва галубка мая». Яму прыпісваюць аўтарства зварота «Да мужыкоў зямлі Польскай». 14 сакавіка 1864 г. прыгавораны да расстрэла, а 16.03 рашэннем Палявога аўдытарыята — да павешання. Наступным днём Мураўёў канфармаваў прыгавор. 22 сакавіка К. павешаны на гандлёвай плошчы Лукішкі ў Вільні. Спачатку быў пахаваны на месцы пакарання, а пазней цела перанеслі ў крэпасць на гары Гедыміна (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 336-337; с. 3, а. 46, с. 6, а. 18-19, 26, 27, 29; Кісялёў Г. Героі і музы: гісторыка-літаратурныя нарысы. — Мн.: Маст. літ-ра, 1982. — С. 102-104, 110, 123, 128; Кісялёў Г. З думаю... — С. 146-147, 180-181; Лушчыцкі І.Н. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палове XIX ст. — Мн., 1958. — С. 171-249; Мосолов А.Н. Вилен-

ские очерки. 1863-1865 (Муравьёвское время). — СПб., 1898. — С. 125-126); Нікалаеў М. Браты Каліноўскія і Публічная бібліятэка // ЛіМ. — 1985. — С. 14; Ратч В. Сведения о польском мятеже 1863 года в Северо-Западной России. Т. 1. — Вильно, 1867. — С. 104, 182; Пантелеев Л.Ф. Воспоминания. — М., 1958. — С. 190, 209, 210, 817; Смирнов А.Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. — М.: Изд-во АН СССР, 1963. — С. 171-172, 375; Шалькевич В. Библиотека братьев Калиновских // Нёман. — 1997. — № 7. — С. 214; Шалкевіч В. Вікенці Канстанцін Каліноўскі // Славутыя імёны Бацькаўшчыны: зборнік. — Вып. 2. — Мн.: БФК, 2003. — С. 209-211; Groniowski K. Kalinowski Baltazar // Polski slownik biograficzny. — T. XI. — Wroclaw, Warszawa, Krakow. — S. 454; Ochmanski J. Historia Litwy. — Wroclaw, Warszawa, Krakow, 1967. — C. 175-180; Rostworowski E. Kalinowski Wincenty Konstanty // Polski slownik biograficzny. — T. XI. — Wroclaw, Warszawa, Krakow. — S. 460-462).

**КАЛУПАЙЛА ЧАСЛАЎ**, адстаўны паручнік, жыхар Ваўкавыскага павета, у рэвалюцыйнай арганізацыі выконваў абавязкі вайсковага рэферэнта Ваўкавыскага павета. Ад следства схаваўся і не адшуканы, аддадзены ваеннаму суду завочна і прыгавораны да катаржных прац у капальнях на 20 гадоў (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 48 адв. — 49; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11 адв.; с. 1, а. 414, 564 адв.).

**КАЛУПАЙЛА ФЕРДЫНАНД ІГНАЦЬЕВІЧ**, 35 гадоў, скончыў Свіслацкую гімназію, служыў канцылярскім чыноўнікам у Гродзенскім дэпутацкім сходзе, тытулярны дарадца (1863 г.), памешчык Ваўкавыскага павета (Красная Груда, Свенцыцы, Тартак). Быў рэферэнтам касы (касірам) пры рэвалюцыйным начальніку Ваўкавыскага павета. У сваёй дзейнасці не прызнаўся, а следства не знайшло доказаў яго віны. Пакінуты судом «в подозрении», аддадзены на даручальніцтва пад паліцэйскі нагляд. Секвестр зняты, але трэба было заплаціць 800 рублёў штрафу (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а., а. 10; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 50 адв.-51; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11 адв., 322-324; с. 1, а. 556; воп. 1, с. 40 а, а. 23 адв.).

**КАМЕНЬСКІ (КАМІНСКІ) ЯН ЮЗЭФАВІЧ**, 36 гадоў, нарадзіўся ў маёнтку Каменка Беластоцкага павета, памешчык. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі і Маскоўскім універсітэце. Быў міравым пасярэднікам пад час правядзення рэформы 1861 г.,

працаваў у канцылярыі дваранскага сходу, калежскі сакратар. Жанаты, меў дзяцей і непадзелены з трыма сёстрамі маёнтак (Міневічы Гродзенскага павета). Спачатку ў паўстанні быў Лунненскім акруговым начальнікам і рэферэнтам надзялення сялян зямлёй, затым начальнікам Гродзенскага павета пасля Сільвястровіча (гл.). Дапамагаў атраду Лянкевіча харчаваннем і зброяй. Селянін з атрада Эйтміновіча паказаў, што К. прывозіў у атрад канфедэраткі, а паўстанцу Полю даў каня. Арыштаваны 12 чэрвеня 1863 г. і 25 верасня сасланы ў Стэрлітамак Арэнбургскай губерні за падачу прашэння на звальненне з пасады міравога пасярэдніка[24]. Выкліканы ў Гродна ў следчую камісію для дачы паказанняў. Ва ўдзеле ў рэвалюцыйнай арганізацыі не прызнаўся, прыгавораны да расстрэла. Сасланы на 12 гадоў у Омскую губерню. 6/7 частак маёнтка Міневічы падвяргаліся ў 1864 г. секвестру, але, паводле маніфеста ад 13.05.1871 г., правы стану былі вернуты Каменьскаму, а высачайшым загадам ад 11.05.1873 г., 3.02 і 1.03.1874 г. маёнтак быў вызвалены ад канфіскацыі. Пастановай Гродзенскай палаты цывільнага і крымінальнага суда ад 8.06.1876 г. ён перададзены ў спадчыну дачкам Каменьскага (Яніне і Станіславе), якія былі ўведзены ў валоданне судовым прыставам Гродзенскага акруговага суда 8.10.1886 г. Каменьскі вярнуўся з ссылкі ў 1887 г. і жыў у Міневічах. У 1890 г. паверaны С. Нагорскі дамогся зняцця забароны на маёмасць. Памёр у 1896 г. і пахаваны ў Лунне. Пра яго піша Ажэшка ў рамане «Над Нёманам» (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10-11, 16, 165 адв., 174 адв., 176; с. 1, а. 547, 552 адв.; с. 4, а. 37; ф. 2, воп. 21, с. 1156, а. 1, 7, 10-12; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917, ч. 1, а. 120; Jodkowski J. Rok 1863 w powiecie Grodzienskim (notatki i uzupelnienia) // Echo Grodzienski. — 1923. — № 17. — S. 3).



*Ян Каменскі, уладальнік Мінявічаў, у вопратцы катаржніка*

---

24 Гэта быў масавы дэманстрацыйны крок патрыятычнай шляхты.

**КАНАРЖЭЎСКІ**, памешчык Беластоцкай губерні, адстаўны паручнік Вялікалуцкага пяхотнага палка, у рэвалюцыйнай арганізацыі быў памочнікам начальніка Беластоцкага павета. Збег з яго ў ліпені 1863 г. і, па дадзеных гродзенскага губернатара генерал-маёра Скварцова, быў арыштаваны ў Аўгустоўскай губерні (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 89-89 адв.; Авейде О. Показания и записки... — С. 475).

**КАНАТКЕВІЧ ЯН**, кіраўнік маёнтка графіні Красінскай у Брэсцкім павеце, рэвалюцыйны начальнік павета, у жніўні 1863 г. выехаў у Варшаву (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40 а, а. 107).

**ЛЕБЯДЗІНСКІ АНТОН ІВАНАВІЧ**, 44 гады, нарадзіўся ў м. Харошча Беластоцкага павета Гродзенскай губерні. Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце, служыў у Бесарабскай вобласці. Атрымаў бронзавы медаль у памяць аб Крымскай вайне. Калежскі асэсар, сакольскі гарадавы ўрач, меў у Саколцы драўляны дом. Касір і зборшчык грошай па Сакольскаму павету, затым рэвалюцыйны начальнік Саколкі (па словах Заблоцкага). 24 чэрвеня 1863 г. арыштаваны і 27.06 высланы на жыхарства ў Валагодскую губерню за палітычную неблаганадзейнасць. Затым быў вернуты ў Гродна для дачы паказанняў у следчай камісіі. Абвінавачванні Э. Заблоцкага (гл.) не прызнаў, а следства не знайшло іншых доказаў яго віны. Быў сасланы ў Томскую губерню (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 11 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 58 — 58 адв.; с. 2, а. 11 адв.; с. 1, а. 8 адв.; с. 1, а. 85, 551; воп. 1, с. 40, а. 204-205; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917, ч. 1, а. 121).

**ЛЯСКОЎСКІ ІГНАЦІЙ ЯЦКАВІЧ**, 49 гадоў, нарадзіўся ў маёнтку Дзераўна Кобрынскага павета, вучыўся ў Свіслацкай гімназіі, адкуль у 1836 г. паступіў на працу ў канцылярыю Гродзенскага дваранскага дэпутацкага схода, даслужыўся да чына калежскага асэсара, быў міравым пасярэднікам Ваўкавыскага павета (да закрыцця міравых з'ездаў 6.06.1863 г.). Перад паўстаннем служыў засядацелем Гродзенскага крымінальнага суда, тытулярны дарадца. Меў цёмна-бронзавы медаль у памяць аб Крымскай вайне. Памешчык, меў ленны і вотчынны маёнтак (3000 дзесяцін, 200 душ) Ятвеск Ваўкавыскага павета. У рэвалюцыйнай арганізацыі выконваў абавязкі парафіяльнага начальніка Ваўкавыскага павета. Дакладваў Духінскаму і Кабылінскаму пра рух царскіх вой-

скаў, дастаўляў паўстанцам правіянт і бялізну, выказаў ідэю нападу на канцылярыю ляснічага Ворана, што і было зроблена. У яго спыняліся ў сакавіку-красавіку 1863 г. В.-К. Каліноўскі і Э. Заблоцкі. Арыштаваны ў жніўні 1863 г. У сваёй дзейнасці не прызнаўся, а следства не знайшло доказаў яго віны. «Пакінуты ў падазрэнні» і высланы на жыхарства ў Табольскую губерню пад нагляд паліцыі, маёнтак ад секвестра вызвалены з аплатай 10 % збора (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 11; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 52—55 адв.; с. 2, а. 338-342 адв.; с. 1, а. 559 адв.; Памятная книжка Гродненской губернии на 1860 г. — Гродна, 1869. — С. 41).

**МАКРЖЭЦКІ А.І.**, слонімскі гарадавы ўрач. Адзін з ініцыятараў і кіраўнікоў створанага ў Слоніме самадзейнага тэатра і нелегальнай бібліятэкі, памяшканні якой выкарыстоўваліся паўстанцкай арганізацыяй. Быў арыштаваны ў 1863 г., звольнены з дзяржаўнай службы. Па рашэнню вайсковага суда разам з жонкай быў сасланы на жыхарства ў Пермскую губерню (Игнатович Ф.И. Врачи Слонимщины — участники восстания 1863 г. // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў. 1252-2002. — Слонім: Слонімская друкарня, 2002. — С. 209).

**МАЛАХОЎСКАЯ ТЭАФІЛІЯ**, памешчыца (маёнтак мужа Мацэ). Выконвала ролю «акрэнговай дамы» (чалец жаночага камітэта) у Пружанскім павеце. Гродзенскі ваенна-палявы суд прыгаварыў да пасялення ў далёкіх месцах Сібіры (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40 а, а. 287; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 1320, ч. 1, а. 99, 237 адв.).

**МАРАЗОЎСКІ**, зборшчык грошай у Бельскім павеце. Сасланы ў Расію адміністрацыйным парадкам (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 8 адв.-9).

**МАРКЕВІЧ ІОСІФ ІВАНАВІЧ**, 30 гадоў, ураджэнец Гродзенскай губерні, вучыўся ў Віленскай гімназіі і Маскоўскім універсітэце, дзе атрымаў ступень доктара медыцыны. З лістапада 1860 г. — урач Гродзенскага акруговага шпіталя. У рэвалюцыйнай арганізацыі быў зборшчыкам падаткаў у Гродзенскім павеце. Жыў на вул. Гараднічанскай у доме Стоцкага. Арыштаваны і сасланы ў Пермь, але вывезены ў Шадрынск. Пасля атрымання дазволу на вяртанне ў край жыў у Варшаве. З 1878 г. актыўна ўдзельнічаў у арганізацыі курортнага лячэння ў Друскеніках. Быў ганаровым сябрам

Варшаўскага таварыства ўрачоў. Памёр у Варшаве 28.01.1923 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11; с. 1, а. 25-28; с. 1, а. 84 адв.; Jodkowski J. Sylwety z roku 1863 // Echo Grodzienski. — 1926. — № 8).



*І. Мілевіч*

**МІЛЕВІЧ ІЛЬДЭФОНС ЮР'ЕВІЧ**, дваранін Віленскай губерні, 29 гадоў у 1864 г., нарадзіўся ў Віленскай губерні і павеце, вучыўся ў Віленскай гімназіі, пасля заканчэння якой скончыў пры ёй поўны курс навук у землямерскіх класах. Каля двух гадоў служыў у таварыстве Адэса-Кіева-Курскай чыгункі. У 1860 г. быў прызначаны казённым землямерам для люстрацыйных спраў у Гродзенскай губерні. У жніўні 1860 г. прыехаў у Гродна з Пецярбурга з рэкамендацыйным лістом ад М. Цэханоўскага (якога ведаў праз Віктара Каліноўскага). Звярнуўся да яго брата Цялесціна (гл.), пазнаёміўся з братамі Заблоцкімі (гл.), сустрэўся ў канцы 1861 г. з В. К. Каліноўскім. Потым да снежня 1861 г. па справах службы землямера (чыноўнік люстратар) жыў у вёсках Гродзенскага павета. Да пачатку мая 1862 г. жыў у Гродне (па вул. Дамініканскай, у доме насупраць гімназіі, у двух пакоях на другім паверсе, дом Фукса), затым з мая па снежань 1862 г. працаваў і жыў у Брэсцкім павеце. Апынуўшыся ў Гродне, «был вовлечён общим противоправительственным настроением». У яго кватэры знаходзілася рэвалюцыйнае ваяводскае бюро. З ліпеня 1863 г. быў у адстаўцы і пасяліўся ў Вільні. З Вікенціем Канстанцінам Каліноўскім (відаць, ён яго менавіта так называе па-пецярбургску) М. сустракаўся ў Гродне ў канцы 1861 г., а на Раство 1862 г. ездзіў да яго ў Вільню. З красавіка 1863 г. быў перапісчыкам рэвалюцыйных папер пры ваяводскім начальніку Э. Заблоцкім, а з верасня — пры камісары Літвы Каліноўскім (у гэты час М. жыў у сваіх бацькоў у Вільні). З 25.01.1864 г. знаходзіўся пад следствам Гродзенскай следчай камісіі. М. Мураўёў «чыста інтуітыўна адгадаў у арыштаваным Мілевічу аднаго з кіраўнікоў рэвалюцыйнай арганізацыі краю» (П. Чарэвін). Сасланы на катаржныя працы на 6 гадоў (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11 адв., 68-70, 83-84, 167, 192; с. 1, а. 1-4, 191-193 адв.; с. 3, а. 148; воп. 1, с. 40, а. 85 адв.; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 594, а. 20, 25; Ігнатоўскі У. 1863 год

на Беларуси: нарыс падзей. Менск: Бел. Эн, 1930.— С. 229; Чарэвін П. Паўночна-Заходні край (Успаміны) // Спадчына. — 1998. — № 3. — С. 42).

**МІХАЙЛОЎСКІ УЛАДЗІСЛАЎ**, памешчык Бельскага і Беластоцкага паветаў, падазраваўся ў заняцці пасады начальніка Беластоцкага павета. Схаваўся за мяжой (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 8 адв.-9).

**МУШЫНСКІ ЮЗЭФ**, дваранін Ваўкавыскага павета, сакратар міравога пасярэдніка, спачатку рэвалюцыйны начальнік г. Ваўкавыска, затым — ваўкавыскі павятовы начальнік. Ад следства схаваўся і не адшуканы, аддадзены ваеннаму суду завочна і прыгавораны да расстрэла (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 48 адв.-49; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11 адв.; с. 1, а. 414, 564).

**ПАКУБЯТА ПЁТР ПЯТРОВІЧ**, ураджэнец Гродна, у 1864 г. меў 30 гадоў, дваранін Гродзенскай губерні і павета. Дзяржаўную службу пачаў у Гродзенскім дваранскім дэпутацкім сходзе. Праз тры гады паступіў на службу ў Гродзенскую грамадзянскую палату, дзе працаваў да 1858 г. Заслужыў бронзавы медаль у памяць аб Крымскай вайне і чын губернскага сакратара. Пасля адстаўкі жыў у маёнтку Забалаць пад Гродна, якое належала, акрамя яго, яшчэ брату і 3 сёстрам. Выконваў абавязкі азёрскага акруговага начальніка ў Гродзенскім павеце. У пачатку верасня 1863 г. быў арыштаваны і ў пачатку кастрычніка 1863 г. высланы на жыхарства ў Арэнбургскую губерню (павятовы горад Белябек) як палітычна неблаганадзейны. 27 мая 1864 г. высланы ў Гродна па патрабаванню следчай камісіі. На следстве і судзе сваю віну не прызнаў. Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі. Памёр у ссылцы Арэнбургскай губерні ў 1874 г. (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 46 адв. — 47; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 165 адв.; с. 1, а. 548 адв.; воп. 1, с. 40, а. 152, 154; Jodkowski J. Notatki i uzupelnienia z r. 1863 // Echo Grodzienski. — 1923. — № 17. — S. 3).

**ПАНСЭТДЭ-САНДОН САБЕСЛАЎ ВОСІПАВІЧ** (1832 г., Мінск — 28.05.1864 г., Табольск), сын швейцарца, які застаўся пасля вайны 1812 г. у Беларусі і ажаніўся на дваранцы Беластоцкага павета Феліцыяне Эйсмант. Адукацыю атрымаў у Гродзенскай гім-

назіі і Кіеўскім універсітэце св. Уладзіміра (медыцынскі факультэт). У Харкаве вытрымаў экзамены і атрымаў ступень лекара. Пэўны час чакаў вакансіі (у тым ліку і ў Гродне, дзе пазнаёміўся з братамі Заблоцкімі праз мужа сястры Макарэвіча). 16.07.1859 г. быў прызначаны ваўкавыскім акруговым урачом Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў. Пасаду рэвалюцыйнага начальніка Ваўкавыскага павета заняў пасля М. Гліндзіча. У ноч з 14 на 15.06.1863 г. быў арыштаваны і ў лістападзе 1863 г. Віленскай ваенна-следчай камісіяй сасланы на жыхарства ў павятовы г. Нараўчат Пензенскай губерні як палітычна неблаганадзейны. Пасля 8 месяцаў, 3 ці 4 ліпеня 1964 г., быў выкліканы на допыт у Гродзенскую следчую камісію. У сваёй дзейнасці В. не прызнаўся, а следства не знайшло доказаў яго віны і вырашыла «оставить в подозрении». Сасланы пад нагляд паліцыі ў Табольскую губерню (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 13 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 49 адв.-50 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11 адв.; с. 1, а. 86, 510-512, 557 адв.; Игнатович Ф.И. Медики — участники восстания 1863 года и их судьба // Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсу людзей. — Ваўкавыск: Ваўкав. узбуйн. друкарня, 1997. — С. 135, 137).

**ПЯНЬКОЎСКІ ЛЮДВІК ДАМІНІКАВІЧ**, 35 гадоў, нарадзіўся ў маёнтку Сутна Бельскага павета. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі (скончыў у 1848 г.), Горы-Горацкім аграрным інстытуце (1851 г.) і Дэрпцкім універсітэце ў 1852-1856 гг. (атрымаў ступень кандыдата дыпламатычных навук). У 1856-1857 гг. жыў у малодшага брата Леана. Затым перасяліўся ў радавы маёнтак Долабава для кіравання ім. Быў з чэрвеня 1861 г. па чэрвень 1863 г. міравым пасярэднікам Бельскага павета. Рэвалюцыйны начальнік Бельскага павета (павятовы), быў пасля Гафмайстра ваяводам паўднёвай часткі Гродзенскага ваяводства. 26.09.1863 г. арыштаваны, 4 месяцы знаходзіўся ў Бельскім астрозе і 3 месяцы пад наглядам паліцыі. Высланы ў Расію па канфірмацыі (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11; с. 1, а. 8 адв.; воп. 1, с. 40, а. 51-51 адв.; с. 40 а., а. 82-95).

**ПІСАНКА ТАМАШ**, чыноўнік чыгункі на станцыі Лапы ў Беластоцкім павеце. Выконваў ролю сувязнога паміж Шварцэ (у той час ён быў у Варшаве) і Беластоцкай арганізацыяй (Авейде О. Показания и записки. — С. 475).

**РАЖАНСКІ ФЕЛІКС** (? — пасля 1903 г.), у дзяцінстве знаходзіўся пад апякунствам графа Касакоўскага. Каморнік (землямер)

з Вялікай Бераставіцы. Чалец Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі з 1861 г., паплечнік і блізкі сябар В.-К. Каліноўскага. У 1863 г. быў кіраўніком маёнтка Геранімаўка Беластоцкага павета. Пісаў вершы на беларускай мове. Адзін з выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў «Мужыцкай праўды». У 1863 г. — паўстанец атрада В. Урублеўскага, для партызан якога ствараў патрыятычныя песні. Пасля паражэння паўстання жыў у эміграцыі (Кракаў). Пакінуў успаміны «Z wojewodstwa grodzienskiego» (W czterdziesta rocznica powstania stycznowego. 1863-1864. — Lwow, 1903. — S. 396-400). Аўтар паўстанцкіх песень на беларускай мове «Гэй-га разам хлопцы...», «Ах ты, мая чарнаброва...». Магчыма, яго аўтарству належаць «Пісьмо ад Яська-гаспадара да мужыкоў зямлі Польскай» і «Песні на Божы час» (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 450, 563 адв.; Кісялёў Г. Радаводнае дрэва... — С. 35; Кісялёў Г. Здарэнне з Яськам-гаспадаром // Ён жа. Смак беларушчыны. — Мінск: Лімарыўс, 2013. — С. 408).

**РОМЕР СЕВЯРЫН АЛЯКСАНДРАВІЧ**, 44 гады ў 1864 г., нарадзіўся ў Губінцы Гродзенскага павета, з дваран Курляндскай губерні, скончыў Віленскую гімназію. З 1846 г. служыў у коннаводстве Віленскай губерні, меў ордэн Св. Ганны 3-й ступені, калежскі асэсар. Жанаты, дзяцей не меў. Правадыр дваранства Гродзенскага павета, рэвалюцыйны касір і рэферэнт казны. У яго гатэлі ў Гродне па вул. Дамініканскай (цяпер Савецкая) у красавіку ці маі 1862 г. адбыўся сход чальцоў Гродзенскай арганізацыі па раскладцы падаткаў на памешчыкаў пад кіраўніцтвам С. Солтана (гл.). 1(13) красавіка 1864 г. у кватэры Ромера (у гатэлі) адбыўся вобыск, пад час якога знайшлі лісты на польскай мове, рэвальвер з прыналежнасцямі да яго, штуцэр і шпагу. У гэты ж дзень вобыск адбыўся ў маёнтку Ромера Губінка, знайшлі рэвальвер амерыканскай сістэмы з 20 зарадамі. У ноч з 1(13) на 2(14).04 былі арыштаваны Ромер і яго жонка і адвезены ў Гродзенскі турэмны замак (у езуіцкіх мурах). Прыгавораны да катаржных прац на 10 гадоў. Пазней Ромер быў высланы разам з жонкай у Табольскую губерню, дзе знаходзіўся прыкладна да 1867-1869 гг., калі выехалі ў Цвярскую губерню. Маёнтак і гродзенскі дом па вул. Дамініканскай секвестраваны, але вернуты па аплаце 10% збору.



*Магіла С. Ромера ў Лішкаве*

Цікава, што ў 1870 г. МУС даслала просьбу да гродзенскага губернатара аб атрыманні ад Р. 30 руб. за пажалаваны яму 7(19).08 ордэн Св. Станіслава 2-й ступені. Віленскі генерал-губернатар пісаў гродзенскаму губернатару, што выдачу ордэна стрымаў М.М. Мураўёў, але Р. не пазбаўлены права на атрыманне ордэна, а таму канцылярыя высылае знакі для «выдачи по принадлежности». У той час Р. жыў у Пскове (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 239, 339-340, 354 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 12, 42, 124-135 адв.; с. 1, а. 265 адв., 553 адв.; ф. 23, воп. 1, с. 373, а. 2; 372, а. 117 адв.; Электронны рэсурс: narod.ru|1864|Ssilka-ZapSib.html. — Дата доступа: 15.01.2013).

**РОМЕР ТЭАДОРА ФАДЗЕЕЎНА**, жонка Северына Ромера, 43 гады ў 1864 г., нарадзілася ў маёнтку Аўсянішкі Троцкага павета Віленскай губерні (дзявочае прозвішча Матушэвіч), старшыня Гродзенскага павятовага жаночага камітэта (або Камітэта апекі) з абавязкамі збіраць ад памешчыц, якія жывуць у горадзе, унёскі (было сабрана каля 400-500 рублёў), сачыць за шыццём бялізны паўстанцам, дапамагаць бедным сем'ям, з якіх дзеці пайшлі ў паўстанцкі атрад, падаваць справаздачы аб збіраемых сумах грошай. У сваіх паказаннях адмовілася ад таго, што выконвала функцыі старшыні. Саслана ў Казанскую губерню, але пераканала суд, каб выслалі разам з мужам у Табольскую губерню (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 39 — 40 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 12, 55, 123 адв., 159-159 адв.; с. 1, а. 132; Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 173. — S. 3).

**РУТКОЎСКІ ЮЗЭФ ЮЗЭФАВІЧ (ІОСІФ ІОСІФАВІЧ)**, дваранін, 33 гады, нарадзіўся ў м. Ражанка Лідскага павета. Скончыў Гродзенскую гімназію ў 1849 г. Дзяржаўную службу пачаў у Гродзенскай палаце грамадзянскага суда, атрымаў бронзавы медаль у памяць аб Крымскай вайне 1853-1856 гг. З 1862 г. працаваў пакаёвым наглядальнікам Гродзенскага шляхетнага пансіёна, калежскі сакратар. Рэвалюцыйны начальнік Гродна пасля арышта Цэханоўскага (30.07.1863 г.). Да гэтага ён быў ягоным памочнікам, захоўваў паўстанцкія грошы і выдаваў ваяводскаму, дапамагаў яму рыхтаваць паперы. Жыў у Пабернардзінскім кляштары, уваход са двара. Арыштаваны 15 верасня 1863 г. і 19 кастрычніка высланы ў Пермскую губерню, дзе знаходзіўся пад паліцэйскім наглядам у г. Ахінску. Па патрабаванню гродзенскага губернатара вернуты ў губерню летам 1864 г. На следстве праявіў сябе «в упорном за-

пирательстве». Прыгавораны да расстрэла, але па канфірмацыі — да 15 гадоў катаржных прац у Табольску. Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11, 47 адв., 167 адв., 190 адв., 203 адв.; с. 1, а. 84, 547, 552; воп. 1, с. 40, а. 147, 151; Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1923. — № 173. — S. 3; Буднік І. — С. 68).

**РЭДЫХ ЕМЯЛЬЯН (Эмільян, Эміл) ЮЗЭФАВІЧ**, 33 гады, з дваран м. Гомбіна Гостынскага павета Варшаўскай губерні. Вучыўся ў Плоцкай гімназіі і Агранамічным інстытуце ў Марымонце (пад Варшавай). Служыў кіраўніком маёнтка Свіслач Гродзенскай губерні памешчыка В. Пуслоўскага. У рэвалюцыйнай арганізацыі выконваў абавязкі індурскага акруговага начальніка. Супраць яго далі паказанні Сільвястровіч і Тржэцяк — першы прызначыў яго на пасаду, а другі вазіў яму карэспандэнцыю. Арыштаваны пад час вобыску на кватэры 5 красавіка 1864 г. Сядзеў у Гродзенскім турэмным замку. Віны сваёй не прызнаў, праявіў сябе «в упорном запирательстве». Прыгавораны да катаржных прац на 10 гадоў. Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 46 адв. — 47; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 165, 221-226, 362; с. 1, а. 538, 555).


*Двор Гродзенскай турмы*

**САВАШКЕВІЧ КАНСТАНЦІН ІВАНАВІЧ**, 40 гадоў, нарадзіўся ў в. Жыдомля Гродзенскага павета, выхоўваўся ў Супрасльскім павятовым для духоўных выхавальнікаў вучылішчы, пасля яго заканчэння ў 1840 г. паступіў у Літоўскую духоўную семінарыю. З прычыны хваробы ў 1846 г. быў звольнены з семінарыі і вызвалены ад духоўнага звання. Пачаў працаваць у Гродзенскім губернскім праўленні, дзе даслужыўся да пасады начальніка рэвізійнага стала і памочніка старшага сакратара і чына тытулярнага дарадцы. Меў 2 дачок і 2 сыноў ва ўзросце ад 1 да 9 гадоў. Абвінавачваўся па паказаннях Э. Заблоцкага ў тым, што быў агентам рэвалюцыйнага начальніка Гродна. Пры арышце (люты 1864 г.) у яго знайшлі спіс яўрэяў горада з пазначэннем 10 % збора (падазравалі, што на карысць паўстання). С. не прызнаў віны і сказаў, што З. яго

абгаварыў, выкарыстаўшы размовы пад час сумеснага знаходжання пад арыштам. Ваенна-палявым судом прыгавораны да высылкі на пасяленне ў аддаленыя месцы Сібіры (Томская губерня) (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 14; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 67 адв. — 68 адв.; с. 2, а. 11, адв. 219; с. 1, а. 555; Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1923. — № 174. — S. 3).

**САНГІН СТАНІСЛАЎ ЮЗЭФАТАВІЧ** (Восіпавіч) (псеўданім Маланка) (каля 1818 г., магчыма, на Беласточчыне — 15.02.1863 г., в. Рэчыца Пружанскага павета). Працаваў століначальнікам у Гродзенскім губернскім праўленні, прэтэндаваў на пасаду рэдактара «Гродненских губернских ведомостей». Затым працаваў піцейна-акцызным наглядальнікам у Бельскім павеце, калежскі асэсар. Пасля выхаду ў адстаўку працаваў кіраўніком маёнтка каля Сямяціч у Бельскім павеце. Супрацоўнічаў з Віленскай археалагічнай камісіяй. Друкаваўся ў віленскім друку на эканамічныя тэмы, збіраў экспанаты для Віленскага музея старажытнасцяў. Прысутнічаў у 1861 г. на сходзе ў Сакулцы, дзе быў пакладзены пачатак стварэння Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі. Прызначыў Геніўша начальнікам Гродзенскага паўстанцкага бюро. Дапамагаў выдаваць і распаўсюджваць «Мужыцкую праўду». Удзельнік паўстанцкага руху Ю. Такарэвіч гаварыў, што Сангін разам з В. Урублеўскім стаялі на чале «літоўскай партыі» і былі выразнікамі памкненняў беларускага народа. Высока ацэньваў ролю Сангіна ў выданні «Мужыцкай праўды» ўдзельнік руху і яго гісторык Б. Ліманоўскі. Сангін фарміраваў партызанскія атрады на сумежжы Беларусі і Польшчы, відаць, быў падваяводскім (намеснікам Урублеўскага). Удзельнічаў у баях пад Сямяцічамі (6-7.02.1863 г.), партызанскім рэйдзе Рагінскага на Пружаншчыну, дзе і загінуў каля фермы (хутара) Рэчыца (зараз Камянецкі раён). Магчыма, пахаваны там у брацкай магіле паўстанцаў. Аддадзены ваеннаму суду завочна і прыгавораны да расстрэла (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 384, 414, 563 адв.; Электронны рэсурс: narod.ru|1864|Spis-kalinovski.htm. — Дата доступа: 16.01.2013; Памятная книжка Гродненской губернии на 1860 г. — Гродна, 1869. — С. 32; Кісялёў Г. Разам з вялікім Кастусём // Беларуская мова і літаратура ў школе. — 1989. — № 2. — С. 48; Яго ж. Радаводнае дрэва... — С. 35-36; Яго ж. Смак Беларушчыны — С. 411, 412, 415, 417, 424, 425).

**СЕРЖПУТОЎСКІ ЮЗЭФАТ ЛЮДВІКАВІЧ**, 49 гадоў, вучыўся ў Слуцкай гімназіі, з 1834 г. — на дзяржаўнай грамадзянскай служ-

бе, з 1845 па 1848 г. — сакратар Гродзенскага губернскага праўлення, затым — чыноўнік па асобых даручэннях пры гродзенскім ваенным губернатары, з 1854 па 1856 г. — засядацель Гродзенскай палаты крымінальнага суда. Даслужыўся да чына надворнага дарадцы, быў узнагароджаны знакам бездакорнай службы за 15 гадоў і медалём у памяць аб вайне 1853-1856 гг. Меў набыты ў Сакольскім павеце маёнтак Юзэфатава (былы Храптоўцы). У рэвалюцыйнай арганізацыі быў рэферэнтам касы (касірам) Сакольскага павета, па паказаннях Э. Заблоцкага, які на вочнай стаўцы не прызнаў С. Не пацвердзіліся фактамі абвінавачванні С. двума сялянамі ў адпраўленні ў паўстанцкі атрад лакея суседняга памешчыка Імбры Нікадзіма. Следствам «пакінуты ў падазрэнні» і высланы на жыхарства ў Кастрамскую губерню пад строгі нагляд паліцыі, секвестр з маёнтка зняты з аплатай 10 % збора (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 15; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 62; с. 2, а. 11 адв., 386-388; с. 1, а. 558 адв.).

**СІЛЬВЯСТРОВІЧ СТАНІСЛАЎ ЯНАВІЧ** (31.01.1833 г., Гродзенская губерня, па іншых дадзеных, Віленская — 1910 г., Стшэльц, Валынь), вучыўся ў прыватным вучылішчы Мітавы і Дэрпцкім універсітэце (1850-1855 гг.), які скончыў са ступенню «сапраўднага студэнта». Памешчык, гаспадар маёнтка Гожа-Higher Гожа-Пералом. У дапаўстанцкі час вызначыўся тым, што збіраў складкі на помнік пяці забітым у Варшаве дэманстрантам. Спачатку быў акруговым у раёне Друскенік і Азёр да Скідзеля, а ў сакавіку 1863 г. стаў цывільным начальнікам Гродзенскага павета. На гэтай пасадзе збіраў грошы і шукаў людзей у будучыя паўстанцкія атрады. Калі рыхтаваўся выезд гродзенскіх гімназістаў у партызанскі атрад, прапанаваў свой маёнтак як месца збору. Падтрымліваў сувязі з начальнікам суседняга Аўгустоўскага павета А. Гансеўскім. Займаўся ўладкаваннем патаемных пошт па трактах ад Гродна ў Ваўкавыскі павет, у Аўгустоўскі да м. Сапацкін і праз Нёман да памешчыка Шамборскага. У чэрвені 1863 г. стаў ваяводскім на 4 паветы — Гродзенскі, Сакольскі, Ваўкавыскі і Слонімскі. Арыштаваны 11.08.1863 г., восем месяцаў правёў у Гродзенскай турме, пасля быў пераведзены ў Вільню ў Дамініканскую турму). Прыгавораны ваенным судом да расстрэла, пазней на 8 гадоў высланы на катаргу ў Сібір. Маёнтак Гожа канфіскаваны. 15.01.1866 г. прыбыў у Іркуцк. Згодна з царскім маніфестам ад красавіка гэтага года, С. скарацілі тэрмін напалову і ў маі выслалі на будову дарогі вакол возера Байкал. Падазроны ва ўдзеле ў забайкаль-

скім паўстанні, закаваны ў кайданы сядзеў у асобным аддзеле. У 1870 г. перанесены на пасяленне ў Мінусінскі павет Енісейскай губерні. Знаходзіўся пад наглядам з 10.10.1875 г. у Казанскай губерні (Ядрынск, цяпер Чувашыя). У лістападзе 1878 г. выехаў у Гродзенскую губерню на 4 месяцы па справах маёнтка. 15.01.1883 г. вызвалены ад паліцэйскага нагляду. 20.03.1883 г. выехаў у Валынскую губерню на 6 месяцаў (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10, 16, 38-44, 46; с. 1, а. 108-116 адв., 237, 244-247, 360 адв.; с. 4, а. 17, 18, 20; Trynkowski J. Dorpatczycy w powstaniu styczniowym // Powstanie Styczniowe. 1863—1864. Walka i uczestnicy... — S. 94; Электроны рэсурс: narod.ru|1864|Ssilka-kazan.html. — Дата доступа: 20.01.2013).



*Паўстанец у кандалах*

**СІМАНОВІЧ (СЫМАНОВІЧ) УЛАДЗІСЛАЎ ГЕНРЫХАВІЧ** (1832 г., Вільна — 22.09.1880 г., Чалябінск), дваранін Навагрудскага павета Мінскай губерні, скончыў Віленскую гімназію і Кіеўскі ўніверсітэт (1857 г.). Працаваў вольна практыкуючым урачом у Слоніме. З аднадумцамі стварыў у канцы 1850-х гг. самадзейны тэатр і нелегальную бібліятэку, памяшканні якіх выкарыстоўваліся паўстанцамі. У паўстанцкай арганізацыі выконваў абавязкі грамадзянскага начальніка Слонімскага павета. Пра гэта сведчыла папера, знойдзеная ў параненага паўстанца Жукоўскага з атрада Л. Нарбута. Арыштаваны 29.05.1863 г. У сваёй дзейнасці ў рэвалюцыйнай арганізацыі адмовіўся, прызнаўшыся ў зборы грошай для татар-пагарэльцаў у дабрачынных, а не рэвалюцыйных мэтах. Пасля допытаў у Гродзенскай следчай камісіі 10 чэрвеня 1863 г. пераведзены ў Віленскую, якая саслала яго на жыхарства ў Аханск пад Перм. Разам з ім паехала жонка Ганна і 5-гадовы сын Генрых. З Аханска С. хутка зноў прывезлі ў Гродна, дзе следчы камітэт ужо даведаўся аб яго ролі ў падпольнай арганізацыі. Цяпер яго прыгаварылі да 12 гадоў катаржных прац, якія ён адбываў на солеварным заводзе

ва Усолье-Іркуцкім. Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі. Пасля амністыі 1868 г. жыў у Шушанскай воласці Енісейскай губерні. У 1871 г. дамогся дазвола працаваць урачом і пераехаў у Чалябінск, дзе і памёр. Пасля гэтага жонка і дзеці вярнуліся ў Вільню (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 55-56; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 12; с. 1, а. 10 адв.; Грицкевич В.П. С факелом... — С. 194; Игнатович Ф. Из Сибири... — С. 3; Игнатович Ф.И. Врачи Слонимщины — участники восстания 1863 года // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў. 1252-2002. — Слонім: Слонімская друкарня, 2002. — С. 207-208, 210-211).

**СКАЧЫНСКІ МЕДАРД** (прозвішча Муха), памешчык Пружанскага павета. Выконваў ролю памочніка Пружанскага акруговага. Гродзенскі ваенна-палявы суд прыгаварыў да расстрэла (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40 а, а. 287 адв., 289 адв; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 1320, ч. 1, а. 98 адв., 237).

**СПІРЫДОВІЧ УЛАДЗІСЛАЎ РЫГОРАВІЧ**, дваранін, 30 гадоў, тытулярны дарадца, гаспадар маёнтка Навасёлкі Гродзенскага павета. У рэвалюцыйнай арганізацыі з красавіка 1863 г. выконваў ролю перадатчыка карэспандэнцыі ад Сільвястровіча да Л. Завістоўскага і наадварот. У маі 1863 г. прымаў у сваім маёнткуК. Каліноўскага і Э. Заблоцкага, якія інспектавалі арганізацыю. Быў арыштаваны ў красавіку 1864 г. У следчай камісіі прызнаўся. Прыгавораны да 10 гадоў пасялення ў аддаленых месцах Сібіры. З 1866 г. знаходзіўся ў Томску. Маёнтак быў канфіскаваны па канфірмацыі генерал-губернатара ад 12.11.1864 г. Жонка Зоф'я спрабавала не дапусціць гэтага, прад'явіўшы казне распіску мужа аб атрыманні ад яе 15 000 рублёў срэбрам пад заклад маёнтка (703 дзесяціны 400 сажаняў). Па купчай ад 19.01.1868 г. новым гаспадаром Навасёлак стаў рускі праваслаўны Еўграф Міканоравіч Курлаў. У 1926 г. спадчынніца Спірыдовіча Яніна Выганоўская збіралася судзіцца з Курлавымі з мэтай вярнуць маёнтак (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 286; с. 1, а. 540, 549 адв., 558 адв.; ДАГВ, ф. 104, воп. 1, с. 75, а. 1-3 адв.); Электронны рэсурс: narod.ru|1864|Ssilka-ZapSib.html. — Дата доступа: 15.01.2013).



Ю. Стравінскі

**СТРАВІНСКІ ЮЗЭФ (ІОСІФ) МАЎРЫКІЕВІЧ**, 47 гадоў, нарадзіўся ў г. Слоніме, адукацыю атрымаў у Свіслацкай гімназіі, да 1840 г. знаходзіўся на вайсковай службе, а потым да 1853 г. — штабс-ротмістр у адстаўцы. З 1853 г. служыў у паштовым ведамстве: калежскі асэсар, утрымліваў паштовыя станцыі на Маскоўска-Варшаўскай шашы. Узнагароджаны ордэнам Станіслава 3-й ступені (1856 г.), залатой табакеркай ад імператрыцы (1857 г.). Перад 1863 г. выйшаў у адстаўку і пасяліўся ў сваім маёнтку. Памешчык Слонімскага павета (маёнткі Саратаўшчызна і спадчыннае Рэпнічы), дзе пасля адмены прыгоннага права быў міравым пасярэднікам. Прызначаны В.К. Каліноўскім начальнікам Слонімскага павета пасля арышта У. Сімановіча (гл.). На следстве паказаў, што прыняў гэтую пасаду з-за боязі помсты з боку паўстанцаў, што не спачуваў узброенаму паўстанню, імкнуўся выехаць у цэнтральныя расійскія губерні (магчыма, да жонкі Анастасіі Сацінай, якая жыла ў Пецярбургу і якой ён пісаў у лістах пра гэтыя свае думкі), што ніводны яго служачы па станцыі не далучыўся да паўстанцаў. Віленскай следчай камісіі 27.05.1864 г. прапанаваў паказаць месца, дзе закапаў сваю пячатку. Заблоцкі і Сільвястровіч засведчылі, што ад С. не атрымлівалі ніякіх рапартаў і данясенняў. Прыгавораны ваенным судом да высылкі ў Сібір (Казань) на пасяленне з пазбаўленнем дваранскіх прывілеяў і правоў. Маёнткі былі спачатку секвестраваны ў 1864 г., але ў красавіку сяквестр знялі пасля аплаты 10 % збора. Тады ў Рэпнічах было 732 дзесяціны памешчыцкай зямлі, 19 кароў, 5 быкоў, у аброчныя артыкулы ўваходзілі фруктовы сад, карчма, вадзяны мукамольны млын (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 56—57 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10, 22 адв., 49 адв., 351-355; с. 1, а. 312-316 адв., 323, 361 адв.; воп. 1, с. 40, а. 254-263, ф. 23, воп. 1, с. 378, а. 5, 38 адв., 44 адв.-45 адв., 51-52, 57; с. 372, а. 87; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917 б., а. 376).

**ТАЛОЧКА АДОЛЬФ ІВАНАВІЧ**, зяць Геніўша (гл.), 30 гадоў у 1864 г., нарадзіўся ў Сакольскім павеце, урочышча Курылы, з дваран, вучыўся ў Сакольскім прыходскім вучылішчы. Працу пачаў у Сакольскім павятовым казначэйстве ў 1851 г., а з 1854 г. служыў у Гродзенскай казённай палаце, калежскі сакратар. Жыў на кватэры ў доме купца Фукса на Саборнай вуліцы ў Гродне. У рэвалюцыйную арганізацыю быў прыняты ў красавіку-маі 1863 г. на кватэры Э. Заблоцкага, дзе атрымаў пасаду памочніка ваяводскага (выконваў яе на працягу прыкладна 7-8 месяцаў). Пры арышце 29 сакавіка 1864 г. у яго знайшлі розныя рэвалюцыйныя паперы, дзённыя загады вайсковага начальніка Гродзенскага павета, забароненыя вершы, карту Польшчы, паштоўкі Гарыбальдзі, Лялевеля, Касцюшкі, Дамброўскага, Ягайлы. Гэта ўказвала на ягоныя погляды і даказвала ягоны ўдзел у Гродзенскім ваяводскім кіраванні. Ён захоўваў ваяводскую пячатку (у вазоне для кветак) і прыкладваў яе да інструкцыяў, якія адсылаліся па паветах, перапісваў паперы. Быў жанаты, меў 6-гадовую дачку і 4-гадовага сына. Прыгавораны да катаржных прац у крэпасці на 8 гадоў, але суд прасіў аб змякчэнні пакарання за «чистосердечное признание», маёнтак падлягаў канфіскацыі (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 15 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 24—25 адв., 75-76, 81-81 адв.; с. 1, а. 51; с. 1, а. 59, 92-97).

**ТАРАСОВІЧ (ТАРАСЕВІЧ) УЛАДЗІСЛАЎ ГЕРАНІМАВІЧ**, 38 гадоў, нарадзіўся ў Ваўкавыскім павеце ў сям'і дваран, вучыўся ў Маскоўскім універсітэце, але не скончыў яго з прычыны смерці бацькі (1847 г.). З 1852 па 1858 г. служыў пісарам у канцылярыі гродзенскага правадыра дваранства, атрымаў чыны калежскага рэгістратара і губернскага сакратара, узнагароджаны бронзавым медалём, быў міравым пасрэднікам у Ваўкавыскім павеце. Меў маёнтак Конна ў Ваўкавыскім павеце. У рэвалюцыйнай арганізацыі выконваў з красавіка 1863 г. па даручэнню Гліндзіча абавязкі рэферэнта апекі ў Ваўкавыскай рэвалюцыйнай арганізацыі: аддаў тузін кашуль і падштанікаў, 100 рублёў срэбрам, даваў ежу арыштаваным паўстанцам. На следстве паказаў, што рабіў гэта з прычыны пачуцця чалавекалюбства, і прадставіў факты свайго вернападданства — падтрымаў падачу адраса цару і дапамагаў пастаўкамі коней павятовай жандарскай камандзе. Быў абкладзены штрафам у 500 рублёў і сасланы ў Тамбоўскую губерню. Да жніўня 1868 г. маёнтак знаходзіўся ў секвестры (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 16; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 51—52, 325-331; с. 1, а. 514, 559; ф. 23, воп. 1, с. 372, а. 118 адв.; Jodkowski J. Rok 1863 // Echo Grodzienski. — 1923. — № 176. — S. 3).

**ТРАЎГУТ РАМУАЛЬД ЛЮДВІКАВІЧ** (16.01.1826 г., в. Шастакова Брэсцкага павета — 5.08.1864 г.), адстаўны палкоўнік, удзельнік Крымскай вайны (1853-1856 гг.). Пасля выхаду ў адстаўку жыў у маёнтку Востраў на Кобрыншчыне. Быў паўстанцкім начальнікам г. Кобрына. Ад следства схаваўся дзякуючы Э. Ажэшка, якая перавезла яго ў карэце ў Каралеўства Польскае (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 10; Электронны рэсурс: narod.ru|1864|Spis-kalinovski.htm. — Дата доступа: 16.01.2013). Гл. у нашай кнізе таксама нарыс пра вайскоўцаў.



*Р. Траўгут*

**УЛАСТОЎСКІ АЛЯКСАНДР ЯКАЎЛЕВІЧ**, мянушка «Окша», памешчык Пружанскага павета, 45 гадоў, з Антопаля. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі. З 1842 г. пачаў служыць у Гродзенскім губернскім праўленні, у 1854 г. выйшаў у адстаўку, служыў па выбарах дваранства Пружанскага павета на пасадзе папячыцеля вясковых запасных магазінаў. У 1862 г. выйшаў у адстаўку і жыў у сваім маёнтку Лышчыкі. Ківаціцкі[25] акруговы (12 двароў), атрымаўшы намінацыю ад М. Жукоўскага ў Пружанах. Адным з абавязкаў яго было збіранне грошай для паўстанцкай арганізацыі. Пад час вобыску 27.05(9.06) у Уластоўскага знайшлі шмат папер рэвалюцыйнага зместу: некалькі нумароў газет «Незалежнасць» і «Праўда», фінансавыя рахункі, паперы, замацаваныя пячаткай гродзенскага ваяводы, нататкі пружанскага павятовага, спісы асоб, якія давалі паўстанцам вопратку, бялізну, харчаванне, распіскі і г. д. Гродзенскі ваенна-палявы суд прыгаварыў да расстрэла (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40 а, а. 283-292; ЛДГА, ф. 1248, с. 1320, ч. 1, а. 10-24, 96-102, 237).

**УРУБЛЕЎСКІ ВАЛЕРЫ АНТОНІЕВІЧ** (15(27).12.1836 г., Жалудок Лідскага павета Віленскай губерні — 05.08.1908 г.). Уплыў на палітычнае выхаванне Валерыя аказаў ягоны дзядзька Яўстахій Урублеўскі, які, будучы студэнтам Кіеўскага ўніверсітэта, з'яўляўся сябрам патаемнага дэмакратычнага таварыства «Брацтва Кірыла і Мефодзія». Пасля вяртання з Сібіры Е. Урублеўскі жыў у Вільні, на кватэры яго Валеры зблізіўся з Л. Сыракомлей і З. Серакоўскім.

25 Ківацічы – маёнтак у Пружанскім павеце, належаў Алене Багуслаўскай.


*В. Урублеўскі*

Жонкай апошняга была Апалонія Далеўская, сястра ўдзельнікаў Саюза літоўскай моладзі. Скончыў Віленскі шляхецкі інстытут (1853 г.), Пецярбургскі лясны інстытут. Пад час вучобы пазнаёміўся з братамі Каліноўскімі. З 1857 г. працаваў памочнікам загадчыка, а з 26.01.1862 г. — начальнікам пісарска-егерскага вучылішча ў Сакулцы ў чыне паручніка. Жыў пры вучылішчы разам са сваякамі А. Гафмайстра (гл.) Гутакоўскімі. Спачатку быў паплечнікам Шварцэ ў Беластоцкай арганізацыі і ажыццяўляў сувязь яе з гродзенскім падполлем. Рэвалюцыйны начальнік Сакольскага павета, а потым да сакавіцкага пераварота «белых» у 1863 г. — вайсковы начальнік Гродзенскага ваяводства. Удзельнічаў у выданні і распаўсюджванні «Мужыцкай праўды», «Гутарак». Фарміраваў паўстанцкі атрад Сакольскага павета. Пасля прыбыцця ў Гродна Каліноўскага быў прызначаны начальнікам штаба паўстанцкіх сіл Гродзенскай губерні (гл. адпаведны нарыс). Прыгавораны завочна да расстрэла. Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі. У 1865 г. на страхе дома былога сакольскага егерскага вучылішча знайшлі паперы рэвалюцыйнага зместу. Пасля паражэння паўстання эміграваў у Францыю. Быў генералам Парыжскай Камуны. Атрымаў ад французскага ўрада пенсію. Астанкі яго захоўваюцца на знакамітых могілках Пэр-Лашэз (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11 адв., 39, 47 адв.; с. 1, а. 563 адв.; воп. 1, с. 40 а, а. 62; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, спр. 1240, а. 3-5; Кісялёў Г. Разам з вялікім Кастусём ... — С. 47-48; Zgożelski. — S. 18; Восстание в Литве и Белоруссии 1863 — 1864... — С. 383, 397; Революционная Россия и революционная Польша (вторая половина XIX в.). — М.: Наука, 1967. — С. 50).

**УРУБЛЕЎСКІ ЗЫГМУНД КАЗІМІРАВІЧ** (28.10.1845 г., Гродна — 19.04.1888 г.), вучыўся ў Гродзенскай гімназіі і Кіеўскім універсітэце (з верасня 1862 г. па першую палову лютага 1863 г. на фізіка-матэматычным факультэце). З прычыны адсутнасці фінансавых сродкаў вымушаны быў вярнуцца дадому, дзе вучыў матэматыцы сваіх малодшых братоў і сясцёр. Стрыечны брат Ст. Сільвястровіча. Арыштаваны 10 жніўня 1863 г. У Гродзенскай следчай камісіі не прызнаўся ва ўдзеле ў паўстанні. 29 красавіка 1864 г. паказаў у Віленскай следчай камісіі, што прыехаў з Кіева з намерам ваяваць са зброяй у руках у паўстанцкім атрадзе,

але стрыечны брат угаварыў застацца разам з ім. У паказаннях Ст. Сільвястровіча часта ўзгадваецца як перапісчык розных дакументаў і як пасярэднік у перадачы папер у Вільна і акруговым, павятовым начальнікам. З 5.07.1863 г. сядзеў у Гродзенскай турме. Прыгавораны ваенным судом да пазбаўлення дваранскіх прывілеяў і правоў, ссылкі на катаржную працу на заводах на 8 гадоў. 3.06.1867 г. прыбыў у Цывільск Казанскай губерні. У 1869 г. вярнуўся ў Варшаву. У 1874 г. у Мюнхене абараніў дысертацыю на ступень доктара філасофіі. Праславіўся як фізік, які ўпершыню вызначыў крытычныя тэмпературы вокісу вугляроду, кіслароду і азоту (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 25 адв.—26 адв.; с. 2, а. 44, 48 адв.; с. 1, а. 229, 248-250, 265-267 адв., 361; воп. 1, с. 40, а. 236-239; Паўлаў В. Удзельнікі паўстання. — С. 255; Мысліцелі і асветнікі Беларусі X—XIX стагоддзяў: энцыкл. даведнік. — Мн.: БелЭн, 1995. — С. 582).

**ЦЕРПІЛОЎСКІ УЛАДЗІСЛАЎ ІВАНАВІЧ**, 48 гадоў, не зацверджаны Герольдыяй дваранін, памешчык Сакольскага павета, меў там маёнтак Сцярпейка, міравы пасярэднік. У рэвалюцыйнай арганізацыі быў рэферэнтам касы (касірам) Сакольскага павета. Абвінавачаны селянінам Рябічкай у падбухторванні да ўдзелу ў паўстанні і цялесным пакаранні за адмову ў гэтым (пазней дом гэтага селяніна паўстанцы спалілі). Трое сялян сведчылі, што Ц. вёў з імі «падазроныя размовы», а пасля Вялікадня яму прывезлі 6 штаноў. Дваранін Янушкевіч казаў, што Ц. дастаўляў харчаванне ў атрад, дзе ён быў, пакінуў там свайго каня. Пры арышце знайшлі распіску, выдадзеную Ц. памешчыку Гансоўскаму ў атрыманні 160 рублёў срэбрам. Сваёй віны не прызнаў. Прыгавораны да 10 гадоў катаржных прац. Сасланы ў Томскую губерню. Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 16; ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 60 адв.-62; с. 2, а. 389-390; с. 1, а. 549 адв., 558).

**ЦЭХАНОЎСКІ ЦЯЛЕСЦІН МІХАЙЛАВІЧ** (1835 г., мястэчка Горлава Чавусаўскага павета Магілёўскай губерні — 28.12.1906 г., Іркуцк). Скончыў Магілёўскую гімназію і медыцынскі факультэт Маскоўскага ўніверсітэта ў 1857 г. Пад час вучобы з'яўляўся чальцом патаемнай студэнцкай арганізацыі «Огул», якая аб'ядноўвала моладзь Літвы, Беларусі і Польшчы. Пазнаёміўся з В.-К. Каліноўскім і яго братам Віктарам. Пасля заканчэння ўніверсітэта працаваў вольна практыкуючым урачом у Грод-



Ц. Цэханоўскі

не (побач, у сваім маёнтку Жыдомля, жыла яго маці). Стаў чальцом рэвалюцыйнай арганізацыі, быў заўважаны ў спевах гімнаў у Дамініканскім касцёле, у зборах грошай, удзеле ў дэманстрацыях і «провадах» былога гродзенскага губернатара Шпеера. Напісаў верш «Падзяка полькам», у якім падзякаваў жанчынам, якія не носяць квяцістыя спадніцы і зразумелі, што цяпер не час танцаваць з маскалямі, а больш прыгожа з малітвай і слязьмі аплакваць забітых у Варшаве. У сакавіку (ці студзені) — ліпені 1863 г. быў паўстанцкім начальнікам Гродна: збіраў і адпраўляў у партызанскія атрады людзей, перадаваў туды рэвалюцыйныя газеты «Час» і «Звесткі з поля бітвы», выдаваў распараджэнні па Гродна (напрыклад, заклікаў жанчын не насіць квяцістыя спадніцы). Адзін з кіраўнікоў паўстання Я. Гейштар ахарактарызаваў Ц. як «душу арганізацыі ў Гродне, каханым моладдзю, і на самай справе незвычайнай асобай». Удзельнік паўстання гісторык Т. Корзун пісаў, што Ц. быў «ідэалістам без матэрыяльных інтарэсаў, чалавекам вялікай працаздольнасці і сумленнасці». Арыштаваны 29.07.1863 г. пад час аказання медыцынскай дапамогі паўстанцу, сядзеў у мурах Дамініканскага кляштара. На следстве праявіў сябе «в упорном запирательстве»: сваёй віны ва ўдзеле ў рэвалюцыйнай арганізацыі не прызнаў і ад усяго адмаўляўся. Следчай Віленскай камісіяй асуджаны да расстрэла, замененага, дзякуючы намаганням брата Яна, на 15 гадоў катаржных прац, якія адбываў у Іркуцку (прыбыў 28.05.1865 г.). Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі. Адпраўлены 22.08.1865 г. у пасёлак Ліствінічны на будаўніцтва акруговага байкальскага паштовага тракту. 3.11.1866 г. пераведзены на Аляксандраўскі вінаробны завод, дзе стаў добраахвотна выконваць абавязкі турэмнага ўрача. 25.05.1868 г. царскім указам яго вызвалілі ад катаржных прац. У 1872 г. прызначаны штатным урачом Аляксандраўскай турмы, з яго былі знятыя кайданы. З 1883 г. дазволена вольнае пасяленне ў Іркуцку, дзе заняўся прыватнай практыкай, працаваў у амбулаторыі Чырвонага Крыжа. Стаў актыўным чальцом таварыства ўрачоў Заходняй Сібіры. Меў жонку з мясцовых казачак і 10 дзяцей. Памёр у Іркуцку. У 1930-х гг. у Гродне была вуліца Ц. (цяпер вул. Л. Талстога) (Ігнатовіч Ф. Вядомы ў Беларусі і ў Сібіры // Гродненская правда. — 1990. — 6 января; Игнатович Ф. Врач Целестин Михайлович Цехановский: повстанческий начальник Гродно и общественно-медицинский деятель

Сибири // Город Святого Губерта: альманах локальной истории. — Вып. 8 (2014). — Гродна, 2014. — С. 106-115; НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10, 184-186; с. 1, а. 49, 238-243 адв.; с. 4, а. 29-31; Грицкевич В. С факелом Гиппократа... — С. 193; Jodkowski J. Rok 1863 ...notatki...; Komar J.Grodzienskie manifestacje... — S. 119).

**ЧАПОВІЧ АНДРЭЙ**, 39 гадоў, ксёндз-пробашч Мастоўскай парафіі, спачатку быў Скідзельскім акруговым начальнікам, а потым, калі Э. Заблоцкі выконваў абавязкі ваяводскага камісара, стаў ягоным памочнікам (адказваў за Гродзенскі, Ваўкавыскі і Слонімскі паветы), ездзіў аднаўляць Ваўкавыскую арганізацыю пасля арыштаў яе былых чальцоў. Пазней знаходзіўся ў партызанскім атрадзе ў Аўгустоўскай губерні. Ад следства схаваўся і быў аддадзены суду завочна. Прыгавораны да расстрэла. Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 48; с. 2, а. 25, 49; 165 адв., с. 1, а. 564).

**ШВАРЦЭ БРАНІСЛАЎ АНТОНІЙ** (1834—1904 гг.), інжынер на чыгунцы Варшава-Пецярбург, рэвалюцыйны дэмакрат, арганізатар Беластоцкай рэвалюцыйнай арганізацыі. З ліпеня 1862 г. — чалец Цэнтральнага нацыянальнага камітэта, дзе адказваў за Плоцкае, Аўгустоўскае, Беластоцкае ваяводствы і ўсю Літву. Кіраваў выданнем падпольнай газеты «Рух» і ўсімі падпольнымі друкарнямі. У яго захоўваліся ўсе важныя паперы, бланкі і пячаткі ЦНК. Арыштаваны ў снежні 1862 г., прыгавораны да смяротнага пакарання, замененага на пажыццёвую ссылку. Высланы ў Пермскую губерню, але потым вернуты і пасаджаны на 7 гадоў у Шлісельбургскую крэпасць. Правёў 30 гадоў на катарзе і ў ссылцы. Напісаў успаміны «Сем год у Шлісельбургу» (Львоў, 1843; М., 1930), «Паказанні і нататкі аб польскім паўстанні 1863 г.» (М., 1961) (Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг. — М.: Наука, 1964. — С. 465, 689; Авейде О. Показания и записки... — С. 115, 122, 473, 656).

**ШВЫКОЎСКІ ВАЛЕНЦІЙ**, правадыр дваранства Пружанскага павета, узначальваў рэвалюцыйную арганізацыю павета, верагодна, да прызначэння Гафмайстра (жнівень 1863 г.). Аказваў фінансавую дапамогу паўстанцам. Маёнтак Пружана з хутарам Чадзень быў секвестраваны (НГАБ у Гродне, ф. 23, воп. 1, с. 372, а. 119 адв.).

**ШТАРК ЯН АНТОНІЕВІЧ** (1822 г., Камянец Літоўскі — ?), дваранін, вучыўся ў Свіслацкай гімназіі, чыноўнік губернскага праўлення, калежскі асэсар, 12 гадоў быў рэдактарам «Гродненских губернских ведомостей» і кіраваў губернскай друкарняй. У 1862 г. быў звольнены са службы і «заўважаны ў неблаганадзейнасці і падазронасці ў друкаванні ўзбуджаючых брашур». Сярод апошніх была, па паказаннях Адама Баяроўскага, «Мужыцкая праўда». На следстве супраць яго даў паказанні А. Талочка: «Ён адыгрываў нейкую ролю ў арганізацыі...», а Геніўш удакладніў, што той выкарыстоўваўся для «раз'ездаў і перадачы даручэнняў» (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 85; с. 1, а. 103 адв.). На думку Заблоцкага, Ш. быў звязаны з першым камісарам па Літве Дзю-Ларанам і потым у Брэсце знаходзіўся пры ваяводзе Гафмайстры. Штарк кантактаваў з цывільным паўстанцкім урадам Гродзенскага ваяводства і па яго распараджэнню раз'язджаў па Гродзенскай губерні. Першы раз быў арыштываны ў жніўні ці пачатку верасня 1863 г. за пражыванне без пашпарта ваеннага начальніка Бельска Барэйшы. Быў адпушчаны, пражываў у Нараве Бельскага павета, але 27.07(8.08).1864 г. ізноў быў арыштаваны і пасаджаны ў Гродзенскі астрог. Прыгавораны на жыхарства ў Томскай губерні пад строгім наглядам паліцыі (ЛДГА, ф. 1248, вып. 2, с. 917, т. 1, а. 34; с. 1240, а. 72; Кісялёў. З думаю. — С. 34; Jodkowski J. Rok 1863 wpowecie Grodzienskim // Echo Grodzienskie. — 1921. — № 175; НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2887, а. 65; ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 414, 564 адв.; воп. 1, с. 40, а. 38 адв., 46; ф. 1, воп. 13, с. 1399, а. 158 адв.; ЛДГА, ф. 1248, с. 1240, а. 2, 7, 30 а-36, 89 адв.).

**ЭЙСЫМОНТ (ЭЙСМАНТ) АДОЛЬФ СТАНІСЛАВАВІЧ**, 35 гадоў у 1864 г., дваранін Аўгустоўскага павета, арандатар маёнтка Кусцін у Сакольскім павеце, начальнік Сакольскага павета пасля Грынявіцкага (гл.). Пры арышце ў яго знайшлі ў шафе паміж вопраткай рэвалюцыйны цыркуляр «Что надо делать Войску?». Сільвестровіч паказаў, што Э. прывозіў да яго свае рапарты. Арыштаваны 25.01.1864 г. Сваёй віны не прызнаў, ад удзелу ў паўстанні адмаўляўся, нягледзячы на вочныя стаўкі. Прыгавораны ваенным судом да высылкі ў Сібір на катаржныя працы ў рудніках на 12 гадоў з пазбаўленнем дваранскіх прывілеяў і правоў (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 60-60 адв.; с. 2, а. 11 адв., 383-385; с. 1, а. 284 адв., 290).

**ЮНДЗІЛ ФРАНЦІШАК УЛАДЗІСЛАВАВІЧ** (1825 — 14.02.1865 гг.), нарадзіўся ў фальварку Югалін Слонімскага павета (цяпер Івацэвіцкі раён). Выхоўваўся пад уплывам сваіх дзядзькаў філаматаў Яна і Рафала, асуджаных пад нагляд паліцыі. Былы расійскі вайсковец (ротмістр) пасля адстаўкі ў 1858 г. пасяліўся ў Гродна, працаваў засядацелем ад дваранства ў Гродзенскай палаце грамадзянскага суда. Меў бронзавы медаль у памяць аб Крымскай вайне. Кватэра яго стала прытулкам для Каліноўскага і яго паплечнікаў. Быў на сходзе ў гатэлі Ромера, калі раскідвалі складкі з памешчыкаў Гродзенскага павета. У 1863 г. — паўстанцкі начальнік Слонімскага павета (даў на карысць паўстання 3000 рублёў срэбрам). Камандзір партызанскага атрада. У пачатку сакавіка 1864 г. выехаў у Францыю. Маёнтак секвестраваны. Лячыўся ў парыжскім шпіталі, дзе і памёр (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 112; ф. 23, воп. 1, с. 372, а. 119; Электронны рэсурс: rberascie. livejournal.com. — Дата доступа: 16.01.2013; Памятная книжка Гродненской губернии на 1860 г. — Гродна, 1869. — С. 43; Акудовіч Ц., Юрчык Д. Паўстанне 1863 года на Слонімшчыне // Город Святого Губерта: альманах локальной истории. — Вып. 8 (2014). — Гродна, 2014. — С. 121).

**ЯГАЛКОЎСКІ ЗАХАРЫЙ КУПРЫЯНАВІЧ** (1835 г., г. Гродна — ?). Вучыўся ў Слонімскім пяцікласным вучылішчы, па заканчэнні якога працаваў у Слонімскім павятовым судзе, а потым у Гродзенскай казённай палаце. Утрымліваў казённую ферму Ярнева ў Слонімскім павеце. У 1859 г. пакінуў службу і займаўся гаспадаркай у маёнтку Луконіца сваёй мацеры ў Слонімскім павеце. Быў знаёмы з сямействамі Стравінскіх, Радавіцкіх, Эйсьманаў, Ліпскіх. Па паказаннях Э. Заблоцкага, быў акруговым начальнікам Слонімскага павета, у яго ён начаваў з Каліноўскім пад час паездкі па аднаўленню арганізацыі пасля арыштаў, у маі 1863 г. Пазней Заблоцкі адмовіўся ад сваіх паказанняў. Сядзеў з 4 ліпеня 1864 г. у Гродзенскім астрозе, адкуль быў перавезены ў Вільна. Віленскім ваенным судом прыгавораны да ссылкі ў Пермскую губерню (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 62 адв.-63; с. 2, а. 34, 359-361; с. 1, а. 317-319, 376; ф. 3, оп. 1, с. 40, а. 6 адв.; ф. 1, воп. 13, с. 1399, а. 158 адв.; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917, ч. 1, а. 123).

# «КАРОЛЬ ЛІТВЫ»

## *(рэканструкцыя нацыянальных поглядаў Кастуся Каліноўскага)*

У паперах графа М.М. Мураўёва ёсць памятныя запіскі для дакладаў у Пецярбургу ў маі 1864 г. Сярод іх я знайшоў такі цікавы запіс: «Гаротная ідэя аб раз'яднанні народнасцяў у Расіі, увядзенні маларасійскага, беларускага і іншых дыялектаў ужо глыбока паглыбілася ў грамадскія погляды. Неабходна пакласці гэтаму цвёрдую перашкоду і загадаць міністру народнай адукацыі ў абавязак дзейнічаць у духу адзінства Расіі, не дапускаючы ва ўстановах адукацыі развіцця супрацьлеглых таму ідэй»[26].

Апалячаная шляхта Літвы і Беларусі не адмаўлялася ад свайго ліцвінскага патрыятызма, называла сябе не палякамі, а ліцвінамі. У «Літоўскім катэхізісе» гаварылася:

Пытанне: Ліцвін ці ты?

Адказ: Ліцвін па міласці бога.

П.: Хто ёсць ліцвін?

А.: Той, хто верыць у вольнасць і выконвае правы Статута.

П.: Без чаго ліцвін не можа жыць?

А.: Без вольнасці і еднасці з палякамі...

Ліцвінскі сепаратызм праяўляўся ў паўстаннях 1794 г. і 1830-1831 гг. З першай чвэрці XIX ст., а асабліва ў 1840-я гг., складваецца беларуская інтэлігенцыя, яна стварае і распаўсюджвае кнігі на яе роднай мове, вучэбнікі, календары, стварае сялянскія школы і г. д.: узгадаем Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлю, А. Вярыгу-Дарэўскага, В. Каратынскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Савіча, А. Г. Кіркора.

Погляд Кіркора на нацыянальнае пытанне перадае яго ліст ад 27.11 (9.12).1858 г. рэдактару пецярбургскай газеты «Русский дневник» П.І. Мельнікаву: «Ад душы і цалкам падзяляю вашы перакананні, за выключэннем аднаго слова, якое, можа быць, я не так зразумеў. Я гавару пра зліццё нацыянальнасцяў. Гэтая справа немагчымая і непатрэбная, бо несправядлівая. Наадварот, няхай рускі,

26 Из бумаг гр. М.Н. Муравьёва Виленского // Русский архив. – 1897. – № 11. – С. 389-394.


*Кастусь Каліноўскі*

паляк, чэх, славак і гэтак далей будзе адданы сваёй нацыянальнасці, але няхай палюбіць, няхай не цураецца і паважае нацыянальнасць усіх іншых родных, кроўных плямён. Адданы роднай веры, звычаям, мове — няхай бачыць заклад свайго благадзенства і сродак захавання сваёй нацыянальнасці ў непарушным саюзе з усімі братамі-славянамі; няхай асабістыя інтарэсы злучыць моцным і непарыўным ланцугом з інтарэсамі ўсяго славянскага света — тады толькі мы падрыхтуем шчаслівую будучыню і пакрочым наперад па шляху разумовага развіцця, сілы духа, і, як ведаць, што можа падрыхтаваць такое зліццё і ў іншых адносінах для карысці Расіі і іншых плямён, асабліва для бедных чэхаў. Я ў добрых адносінах з многімі з чэшскіх вучоных і з іх музеўмам. Вы не можаце ўявіць, як яны пакутуюць. Да! Шматпаважаны Павел Іванавіч, славянская ідэя вялікая і цудоўная, але трэба весці яе менавіта ў духу прымірэнчым, каб пасля векавых смут і трывог разумы супакоіліся, адрадзіліся любоў і братэрства. Дасягнуць гэтага можна толькі пры святой і глыбокай павазе веры, мовы і звычаяў кожнага племені, а не па праву моцнага, па большасці складаючаму племя...»[27].

Такім чынам, погляды Каліноўскага фарміраваліся ў той час, калі грамадства было падрыхтавана для ўспрымання іх. Праўда, прыгоннае сялянства яшчэ не дарасло да разумовых адносін да нацыянальнага пытання і нацыянальная самасвядомасць беларусаў была яшчэ слабой.

У 1856-1860 гг. Каліноўскі вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце. Гэта быў час пасля заканчэння прайгранай расійскім царызмам Крымскай вайны. Н.В. Шэлгуноў, характарызуючы сутнасць 1860-х гадоў у Расіі, пісаў: «Як толькі Крымская вайна скончылася і ўсе дыхнулі новым, больш вольным паветрам, усё, што было ў Расіі інтэлігентнага, з крайніх вярхоў да крайніх нізоў, пачало думаць, як яно яшчэ ніколі раней не думала. Думаць прымусіў Севастопаль, і ён жа абудзіў ва ўсіх крытычную думку, якая стала ўсеагульным здабыткам... Усе пачалі думаць і думаць у адным напрамку, у напрамку волі...»[28]. У студэнцкія гады Каліноўскі вывучаў юрыспрудэнцыю, эканоміку краіны, яе гісторыю і культуру

27 Революционная Россия и революционная Польша (вторая половина XIX в.). – М.: Наука, 1967. – С. 16.

28 Цыт. па: Лушчыцкі І.Н. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палове XIX ст. – Мінск: Выдавецтва БДУ, 1958. – С. 180.

для таго, каб знайсці шляхі барацьбы за вольнасць радзімы. Даследаваў гісторыю ВКЛ, калі працаваў у публічнай бібліятэцы разам з братам Віктарам. Напрыклад, вядомы каталог В. Каліноўскага калекцыі гісторыка прафесара Віленскага ўніверсітэта Ігната Анацэвіча (збора дакументаў па гісторыі ВКЛ), экзэмпляры якога цяпер знаходзяцца ў Ягелонскай бібліятэцы і Вроцлаўскім асалінеўме[29]. Цікава, ці Каліноўскія не стваралі план адраджэння ВКЛ?

У гэты час актывізавалася дзейнасць рэвалюцыйных разначынцаў, пад уплывам М.Г. Чарнышэўскага выдаецца «Современник», сярод студэнтаў узнікаюць гурткі. Студэнты, прыехаўшыя з Літвы і Беларусі, аб'ядноўваюцца ў зямляцтва (Агул), у якім ствараецца каса ўзаемадапамогі, кааператыўная бібліятэка. Каліноўскі становіцца яе бібліятэкарам, які па сутнасці выконваў ролю галавы гуртка. Даследчык Т.Ф. Фядосава, прааналізаваўшы архіўныя матэрыялы, піша: «Адным са спрэчных пытанняў у Агуле, у асноўным паміж «караняжамі» і літоўска-беларускай групай, было пытанне аб будучым палажэнні Літвы і Беларусі ў незалежнай Польшчы. Гэтае пытанне абмяркоўвалася з палякамі, якія вярталіся з ссылкі. Літоўска-беларуская група марыла аб саюзнай літоўскай рэспубліцы ў будучай вызваленай Польшчы, супраць чаго актыўна выступалі некаторыя «караняжы», але і сярод літоўска-беларускай групы былі іх прыхільнікі». 4 сакавіка 1862 г. на сходзе віленскай гміны Агула разглядалася прапанова «аб пераўтварэнні Літвы ў рускую правінцыю», верагодна, у выпадку перамогі ў Расіі дэмакратычнай рэвалюцыі[30].

Агул быў звязаны з рэвалюцыйнай арганізацыяй афіцэраў. Каліноўскі зблізіўся з яго кіраўніком Зыгмундам Серакоўскім. Біёграф Каліноўскага А. Смірноў піша, что ён быў сябрам афіцэрскай арганізацыі, але ў вядомых яе спісах прозвішча Каліноўскага ёсць толькі з імем Віктар[31]. Пецярбургская афіцэрская арганізацыя склалася восенню 1857 г. (гурток Серакоўскага-Дамброўскага). Адзін з кіраўнікоў паўстання 1863-1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі Зыгмунт Серакоўскі быў адным з выдатных дзеячоў партыі «чырвоных», звязаны з рускімі рэвалюцыйнымі дэмакратамі, у першую чаргу з М.Г. Чарнышэўскім (супрацоўнічаў у часопісе «Современник»),

29 Семянчук А.А. Калекцыя прафесара Ігната Анацэвіча ў "Пушкінскім доме" // Ігнат Анацэвіч: Жыццёвы шлях, педагагічная і навуковая спадчына. – Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы, 2008. – С. 56.

30 Федосова Т.Ф. Польские революционные организации в Москве. 60-е гг. XIX в. – М.: Наука, 1974. – С. 54-55.

31 Смирнов А. Кастусь Калиновский. – М.: Соцэкгиз, 1959. – С. 23; І.М. Лушчыцкі таксама сцвярджае, што Кастусь Каліноўскі быў сябрам гуртка (Указ. сач. – С. 183).

М.А. Дабралюбавым, А.І. Герцэнам. Серакоўскі — праціўнік нацыянальнага прыгнёту, прыхільнік сяброўства і згоды польскага і рускага народаў. У дакладной запісцы «Польскае пытанне», напісанай у снежні 1862 г.[32], ён пісаў, што яно можа быць вырашана шляхам аб'яднання вызваленай Польшчы з вольнай Расіяй на федэратыўных пачатках. «Саюз гэты павінен быць «як роўныя з роўнымі, як вольныя з вольнымі», іншымі словамі, польская і руская



*З. Серакоўскі*

народнасці павінны карыстацца цалкам аднолькавымі правамі — павінны мець цалкам аднолькавае, вольнае развіццё»[33].

Серакоўскі не разумеў, што Літва і Беларусь, Украіна маюць поўнае права на незалежнасць, ён адводзіў ім ролю звязуючага звяна паміж Польшчай і Расіяй: «Заходні край служыў бы натуральнай сувяззю Масквы з Варшавай, Вялікарасіі з Польшчай». Але Серакоўскі выказваўся за раўнапраўе беларусаў, украінцаў і літоўцаў у адносінах мовы, школьнай справы, веравызнання, прадстаўніцтва ў мясцовых установах. На польскай ці рускай (маларасійскай) мовах можна гаварыць на губернскіх і павятовых сходах, пры рашэнні судовых спраў, выкладанні ў навучальных установах. Кожны мае права спавядаць усходнюю або заходнюю веру, а ў змяшаных шлюбах вызначаць веру дзяцей па згодзе паміж бацькамі. Нараджэнцы заходніх губерняў маюць права без абмежаванняў займаць па сваіх здольнасцях адміністрацыйныя, судовыя і вучоныя пасады ў сваім краі[34].

Другі кіраўнік гуртка Я. Дамброўскі вучыўся ў Акадэміі генеральнага штаба, прапагандаваў ідэі руска-польскага рэвалюцыйнага саюза, з пачатку 1862 г. у Варшаве прызнаны кіраўнік «чырвоных». Сябраваў з А. Пацябнёй, які быў кіраўніком таварыства рускіх афіцэраў у Польшчы, знаходзіўся пад уплывам ідэй Чарнышэўскага і Герцэна.

32 "Запіска", магчыма, была адрэдагавана і перапісана набела пад час знаходжання Серакоўскага ў Варшаве і Вільні паміж 24 і 31 снежня 1862 г. (Русско-польские революционные связи… – С. 242). У гэты час Каліноўскі быў старшынёй Літоўскага правінцыяльнага камітэта.

33 Цыт. па: Ковальский Ю. Русская революционная демократия и январское восстание 1863 года в Польше. – М.: Иностранная литература, 1953. – С. 122.

34 Русско-польские революционные связи // Восстание 1863 года: мат. и док. – Т. 1. – М., 1963. – С. 237.

У Пецярбургскую афіцэрскую арганізацыю ўваходзілі Віктар Каліноўскі, Валеры Урублеўскі, Падлеўскі, Пётр Юндзіл, Людвіг Звяждоўскі, Уладзіслаў Касоўскі, з якімі Кастусь Каліноўскі быў знаёмы. Касоўскі пісаў у сваіх «Запісках»: «Большасць, у той час прасякнутая духам напаляонаўскай ідэі нацыянальнасці, выказвалася на карысць панславізма; федэрацыя славян была любімай марай большасці. Серакоўскі быў адным з тых, якія выразней іншых выказваліся на карысць панславізма. Самым заўзятым апанентам з'яўляўся звычайна Падлеўскі, які і чуць нічога не хацеў пра панславізм. Федэрацыю ён лічыў справай немагчымай, а паглынанне Расіяй усіх астатніх славян непазбежным, у тым, зразумела, выпадку, калі славяне не будуць старацца не мець агульных інтарэсаў з Расіяй»[35].

Сам Кастусь, верагодна, займаўся «распрацоўкай матэрыялаў гістарычных характараў славянскіх народнасцяў», як ён паказаў Віленскай следчай камісіі, гаворачы, чым займаўся ён пад прозвішчам «Ігнаці Вітажэнец», які вярнуўся з атрада Віслаўха[36]. У 1861 г. пры ўдзеле Каліноўскага і яго сяброў па ўніверсітэту ў Вільні быў створаны гурток Вікенція Віткоўскага, дзе абмяркоўваліся пытанні сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення, усталявання адносін паміж нацыямі[37].

На кватэры Я. Дамброўскага і Вараўскага ў Пецярбургу ў 1860-1861 гг. адбываліся **«літаратурныя вечарыны»**[38]. На іх бываў Віктар Каліноўскі[39], брат Кастуся, які меў вялікі ўплыў на малодшага брата. У вызначэнні Палявога аўдытарыята войск Варшаўскай ваеннай акругі гаварылася, што ў Дамброўскага і Вараўскага «сходы служылі месцам абмена думкамі для сяброў патаемнага таварыства, якое імкнулася да падрыхтоўкі польскага мецяжа; з другога боку, змест знойдзенага ў Дамброўскага ўрыўка ліста выявіў падазроныя зносіны Вараўскага з Жвірдоўскім і Далеўскім[40], якія, згодна з паказаннямі Міладоўскага і многімі іншымі

35 Дьяков В.А. Заметки Владислава Коссовского о петербургском подполье и польской эмиграции накануне восстания 1863 г. // Революционная Россия и революционная Польша (вторая половина XIX в.). – М.: Наука, 1967. – С. 399.

36 ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 280, а. 18.

37 Смирнов А. Кастусь Калиновский… – С. 27.

38 Адначасова адбываліся падобныя вечарыны ў Вільне, дзе іх арганізоўвалі Далеўскі і Звірждоўскі. Бываў тут і Серакоўскі (Русско-польские революционные связи: материалы и документы. – Т. I. – С. 327).

39 Яго імя зафіксавана ў ваенна-судовай справе аб "Літаратурных вечарынах", у спісе ваенна-палявога суда. Ён выконваў ролю трыдзясяцкага (Русско-польские революционные связи: материалы и документы. – Т. I. – С. 255, 317, 338).

40 Францыск Далеўскі – сябра Віленскага камітэта, дзе быў Каліноўскі, брат жонкі Серакоўскага.

абставінамі, маглі быць сябрамі Віленскага мяцежнага камітэта...»[41]. Гэта пацвярджае сувязі В. Каліноўскага з названымі асобамі.



*Магіла В. Каліноўскага*

Ягоны брат таксама ведаў пра гэтых людзей. У пачатку 1860 г. Вараўскі атрымаў ліст ад студэнта Кіеўскага ўніверсітэта У. Лабудзінскага, які запрашаў яго ўступіць у патаемнае таварыства, а каб даведацца аб напрамку і мэтах таварыства — схадзіць да Віктара Каліноўскага, які служыць пры Імператарскай Публічнай бібліятэцы. Каліноўскі сам «зайшоў да яго і расказаў аб існаванні тады ў розных месцах патаемных таварыстваў, якія маюць мэту аднаўлення старажытнай Польшчы». Прыняць канчатковае рашэнне дапамог Вараўскаму Серакоўскі[42].

Восенню 1861 г. Кастусь Каліноўскі ўваходзіць у склад Камітэта руху, які з лета 1862 г. будзе называцца Літоўскім правінцыйным камітэтам. Друкаванымі органамі камітэта былі «Харугва вольнасці» (на польскай мове) і «Мужыцкая праўда» (на беларускай мове). У першым нумары «Харугвы вольнасці» гаварылася аб неабходнасці злучыць сілы прыгнечаных народаў супраць рускага царызма, і тады «праклятая моц прыгнячэння, як туман перад сонцам, рассеецца»[43]. У «Мужыцкай праўдзе», першай беларускай газеце на беларускай мове, разглядаліся праблемы, якія распрацоўваліся рэвалюцыянерамі-дэмакратамі Расіі і Беларусі: ліквідацыя памешчыцкага землеўладання, самадзяржаўя, царскага бюракратычнага апарата, арганізацыя народнай сістэмы адукацыі на роднай мове (беларускай, літоўскай).

У верасні 1862 г. у Лондане адбываюцца перамовы. У іх удзельнічалі Агатон Гіллер, Уладзімір Мілёвіч з Украіны (прадстаўнікі правага крыла партыі «чырвоных», звязаныя таксама з «белымі») і Зыгмунт Падлеўскі (з «чырвоных»). З другога боку ў перамовах прынялі ўдзел Аляксандр Герцэн і Міхаіл Бакунін. На першым пасяджэнні Герцэн зачытаў свой адказ на ліст рускіх афіцэраў з Каралеўства Польскага.

Польскія дэлегаты зачыталі адкрыты ліст Цэнтральнага нацыя-

41 Русско-польские революционные связи: материалы и документы. – Т. I. – С 333.

42 Русско-польские революционные связи: материалы и документы. – Т. I. – С. 337.

43 Цыт. па: Смирнов А. Кастусь Калиновский… – С. 41.

нальнага камітэта да выдаўцоў «Колокола». У ім, між іншым, гаварылася: «Асноўная думка, з якой Польшча паўстае цяпер, дасканала прызнае права сялян на зямлю, якую апрацоўвае, і поўную самапраўнасць усякага народа вырашаць свой лёс... Мы былі пазбаўлены палітычнага існавання прымусова. Мы гэтага насілля ніколі не прызнавалі, не маглі і не можам прызнаваць. Таму мы не прызнаем ні новых межаў, ні ўрадаў, заснаваных на развалінах нашай свабоды. Для нас няма Польшчы падзеленай, для нас Польшча адзіная, тая, якая складаецца са злучэння Польшчы, Літвы і русінаў, без усялякай гегемоніі каго-небудзь з трох народаў. Зыходзячы з гэтай кропкі, мы імкнемся да аднаўлення Польшчы ў былых яе межах, пакідаючы права народам, у ёй жывучым, гэта значыць ліцвінам і русінам, поўную вольнасць заставацца ў саюзе з Польшчай або распараджацца сабой згодна з асабістай воляй...»[44]. Такой па сутнасці была праграмная дэкларацыя партыі «чырвоных» — арганізатараў паўстання. Герцэн настойліва рэкамендаваў ім у першую чаргу вырашаць сялянскае і нацыянальнае пытанні: «Калі ў Расіі на вашым сцягу не ўбачаць надзел зямлі і волю правінцыям, дык нашае спачуванне вам не прынясе ніякай карысці, а нас загубіць»[45].

У кастрычніку 1862 г. Кастусь Каліноўскі становіцца старшынёй Літоўскага правінцыйнага камітэта і ўзначальвае ў ім левую рэвалюцыйна-дэмакратычную плынь «чырвоных». З гэтага часу становіцца больш выразным сепаратызм літоўскага камітэта ў адносінах да ЦНК. Супярэчнасці паміж Вільняй і Варшавай назіраліся па аграрнаму і нацыянальнаму пытаннях: паплечнікі Каліноўскага рыхтавалі народную рэвалюцыю, а шляхецкія рэвалюцыянеры — антыцарскую змову. Абедзве сілы былі за рэвалюцыйны саюз з рускімі рэвалюцыянерамі супраць царызма, але другія, будучы дваранамі, не жадалі адмаўляцца ад сваіх маёнткаў на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Для Каліноўскага звяржэнне царызма і самадзяржаўя было пачаткам сацыяльных і нацыянальных пераўтварэнняў, а для польскіх саюзнікаў — канчаткам барацьбы. А таму іх інтарэсы не супадалі, і Літоўскі правінцыйны камітэт адстойваў сваю незалежную палітыку пры агульнай з палякамі паўстанцкай барацьбе з царызмам.

У лістападзе 1862 г. адбыліся цікавыя перамовы ў Пецярбургу. Падлеўскі атрымаў ад Герцэна рэкамендацыі і паехаў на сустрэ-

44 Русско-польские революционные связи // Восстание 1863 года: мат. и док. – Т. 1. – М., 1963. – С. 526-528.

45 Ковальский Ю. Русская революционная демократия и январское восстание 1863 года в Польше. – М.: Изд-во иностр. лит-ры, 1953. – С. 183.

чу з прадстаўнікамі нядаўна створанай арганізацыі «Зямля і воля». Ад яе Цэнтральнага камітэта ў перамовах удзельнічалі Аляксандр Сляпцоў і Мікалай Уцін. На пытанне апошніх, як арганізатары паўстання глядзяць на будучае Літвы, Беларусі і Украіны, Падлеўскі адказаў са спасылкай на вядомы нам ліст ЦНК да рэдактараў «Колокола» — пасля іх вызвалення насельніцтва гэтых зямель атрымае права шляхам плебісцыта вырашыць, аб'яднацца з Польшчай ці ўладкаваць свой лёс па-іншаму. «Зямля і воля» абяцала схіляць расійскі грамадскі погляд на бок паўстанцаў і ўзняць малы ўзброены рух на Доне, каб раз'яднаць урадавыя вайсковыя сілы[46].

У ліпені 1863 г. пасля барацьбы з групай Гейштара была аб'яўлена аўтаномія Літоўскага камітэта, заяўлена, што ён будзе выконваць толькі тыя загады варшаўскага Урада (Жонда), якія палічыць правільнымі і адпаведнымі канкрэтным умовам краю. У сваёй запісцы, складзенай пад час следства, адказнасць за паражэнне паўстання Каліноўскі ўскладаў на Урад. У запісцы, напісанай для следчага камітэта 28.02 (12.03).1864 г., Каліноўскі адзначыў, што пытанне аб дзяржаўным уладкаванні для яго залежыць ад больш важнага пытання — забеспячэння народнага шчасця. Ён заявіў, што з'яўляецца ворагам тых несправядлівых парадкаў, якія пазбаўляюць беларускі народ сваёй дзяржаўнасці і ўмоў для развіцця культуры. «...Я мог прыйсці да таго заключэння, — піша Каліноўскі, — што Расія хоча поўнага з сабой зліцця Літвы для дастаўлення шчасця тутэйшаму народу. Я не вораг шчасця народнага, не праціўнік і Расіі, калі яна дабра нам жадае, але вораг тых бедаў і няшчасцяў, якія наведваюць край наш няшчасны. А таму калі лёс нас ставіць у стан, што мы павінны парадніцца з Расіяй, я, для пазбаўлення лішніх ахвяраў пры спараджэнні новага часу і ладу грамадскага ў Літве, лічу са свайго боку абавязкам заявіць некалькі слоў у гэтых адносінах.

Хто лічыць, што Расія лёгкую ў гэтым можа мець задачу, той мяркуе павярхоўна, той сябе падманвае. Сетка, якая ахоплівае нас ва ўсіх класах і злучае з Польшчай, мае столькі асноў у традыцыях і нават у забабонах, што распусціць яе, знішчыць і ўтварыць што-небудзь новае, створае векавую, сістэматычную разумовую працу...»[47].

Падводзячы вынікі нашага даследавання, можна зрабіць наступныя высновы.

1. Ад рускіх рэвалюцыянераў-дэмакратаў Каліноўскі ўзяў пылаючую нянавісць да самаўладна-прыгоннага ладу і разуменне таго, што волю народу ніхто не падорыць, яе трэба зава-

46 Гл.: Ковальский Ю. Русская революционная демократия... – С. 207.
47 ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 280, а. 7.

явацъ рэвалюцыйным шляхам. Ідэі, выказаныя Каліноўскім у «Мужыцкай праўдзе», шмат у чым сугучныя ідэям рускіх рэвалюцыйных пракламацый і адозваў пачатку 1860-х гадоў.

2. Каліноўскі як галава Літоўскага камітэта, які прызнаваў верхавенства ЦНК, падтрымліваў адраджэнне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Для паўстанцаў ужо Лістападаўскага паўстання гэта азначала вольнае развіццё ўсіх народаў, якія насялялі фэдэрацыю дэмакратычных дзяржаў на прасторы паміж Чорным морам, Балтыкай, Одрай, Дняпром і Дунаем[48].
3. Каліноўскі як «чырвоны» павінен быў прызнаваць вольнае волевыяўленне саміх беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў. Інакш кажучы, прызнаваць права на самавызначэнне: альбо аддзяленне, альбо федэрацыя гэтых народаў з польскім ці рускім народам.
4. Каліноўскі падтрымліваў саюз беларускага, літоўскага, польскага і рускага народаў у барацьбе з царызмам, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.
5. У палітычных праграмах радыкальных дзеячоў і арганізацый польскага вызваленчага руху 1860-х гадоў сацыяльныя патрабаванні ставіліся вышэй за нацыянальныя. І гэта давала ім магчымасць супрацоўніцтва з рускімі рэвалюцыйнымі дэмакратамі, а таксама з прагрэсіўнымі сіламі ў літоўскім, беларускім і ўкраінскім рухах, на тэрыторыі якіх перапляталіся сацыяльныя, нацыянальныя і рэлігійныя супярэчнасці[49].

Хочацца прывесці цытату з твора раманіста Усевалада Крэстоўскага, з якога мы ўзялі назву дадзенага нарыса: «Але дарэмна бегаў Авейдэ на віленскія нямецкія могілкі для спатканняў і перамоваў з Каліноўскім. Гэты апошні не згаджаўся ні на што і заявіў, што яму няма справы да «Кароны», што Літва і Беларусь зусім асобная і самастойная дзяржава... У часе яго кіпучай дзейнасці і нават пасля арышту паміж... віленскім насельніцтвам, таксама як і на Жмудзі, доўгі час хадзілі цёмныя чуткі, што недзе, маўляў, у Вільне пражывае «Круль Літвы», які хоча «адхіліцца ад палякаў» і завесці «сваё ўласнае крулеўства»[50].

48 Польша на путях развития и утверждения капитализма. Конец XVIII – 60-е годы XIX в. – М.: Наука, 1984. – С. 230.

49 Гл.: Дьяков В.А. Маркс, Энгельс и Польша. Польская тема в творческом наследии основоположников научного коммунизма, их личные контакты с поляками. – М.: Наука, 1989. – С. 75-78.

50 Крестовский В. Собрание сочинений. – Т. 3. – СПб., 1899. – С. 560, 573-574.

# «ЛІТОЎСКІ ВЕЛАПОЛЬСКІ»: ВІКТАР СТАРЖЫНСКІ

Старжынскі Віктар-Вацлаў Мацвеевіч (1826 г., маёнтак Страбля Бельскага павета — 31.05.1882 г. ці 17.06.1882 г.), граф герба Ліс, памешчык Беластоцкага павета, дзе мае маёнтак Няводніца Наргілеўская (409 дзесяцін) і Бельскага павета маёнткі Доктарцы, Вікторжын, Страбля. Выконваў абавязкі губернскага правадыра дваранства (1861-1863 гг.)[51].

Вучыўся ў езуіцкім пансіёне ў Швейцарыі і Мюнхенскім універсітэце. Служыў у Расійскай арміі ў 1847-1850 гг.[52] Харужы Грабенскага казачага палка з Каўказскай лініі і Чарнаморыі. У сакавіку-красавіку 1850 г. знаходзіўся ў адпачынку ў маёнтку Страбля. У жніўні 1850 г. — ужо адстаўны сотнік. Атрымаў пашпарт на выезд у Каралеўства Польскае і выехаў у Варшаву на жыхарства[53]. Валуеў у сваім дзённіку ўзгадваў, што Старжынскі насіў срэбны Георгіеўскі крыж[54].

Напярэдадні паўстання Старжынскі распрацаваў праект закона аб наданні Паўночна-Заходняму краю асобнага адміністрацыйнага статуса (аўтаноміі). У сакавіку 1861 г. Старжынскі перадаў міністру ўнутраных спраў П.А. Валуеву і вайсковаму міністру, сябру Дзяржаўнай рады Д.А. Мілюціну запіску, у якой крытычна ацэньваў мерапрыемствы ўлады ў Літве і Беларусі і прапаноўваў для ўмацавання сувязяў паміж цэнтрам імперыі і яе ўскраінамі даць жыхарам Заходняга краю вызначаную самастойнасць, асабліва ў галіне адукацыі і грамадскага жыцця. У той час Валуеў і Мілюцін ніяк не адрэгавалі на запіску Старжынскага[55].

Магчыма, пра гэты праект ён хацеў пагаварыць з новым гродзенскім губернатарам у верасні 1861 г. А.М. Дрэнякіным. Але той не жадаў гаварыць на падобныя тэмы і пераводзіў размову на свае

51 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 253, а. 19; воп. 14, с. 286, а. 2, 9; с. 290, а. 39.

52 Кіселёў Г. Стажэнскі (Старжынскі) Віктар Вацлаў // ЭГБ. – Т. 6. – Кн. 1. – Мн.: БелЭн, 2001. – С. 395.

53 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, с. 1013, а. 1, 4, 7. Гісторык Файнгаўз сцвярджае, што Старжынскі быў высланы ў 1848 г. за нелегальную працу (Fajnhauz D. Sladami Wielopolskiego… – С. 241), а даследчык Шпопер піша, што С. вярнуўся ў 1858 г. пасля амністыі (Szpoper D. Pomiedzy caratemasnemo Rzczy pospolitej… – S. 84).

54 Дневник П.А. Валуева, министра внутренних дел. – М.: Изд-во АН СССР, 1961. Т. 1: 1861-1864 гг. – С. 325.

55 Комзолова А.А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху великих реформ. – М.: Наука, 2005. – С. 123.

дарожныя ўражанні. У адказ Старжынскі не прыйшоў на агульнае прадстаўленне чыноўнікаў губернатару. Цікава, што ў 1885 г. Дрэнякін даслаў у рэдакцыю часопіса «Русская старина» сваю нататку пра сустрэчы са Старжынскім. Яе не апублікавалі, бо напісана яна была дрэнна і не мела добрага фактычнага матэрыяла[56].



*В. Старжынскі*

У верасні 1861 г. Старжынскі падаў запіску генерал-губернатару Назімаву. Ён пісаў, што «меры строгасці маглі быць добрымі, калі б край быў заняты толькі на некаторы вызначаны час і ўсё пытанне заключалася бы ў тым, каб утрымаць яго ў пакоры да вядомага тэрміну». Старжынскі прапаноўваў вярнуць Літоўскі Статут, палепшыць становішча каталіцкага святарства, аднавіць Віленскі ўніверсітэт, на пасады ў органы кіравання краем прызначаць асобаў з мясцовых ураджэнцаў[57].



*Д. Мілюцін*

Міністр унутраных спраў П.А. Валуеў у сваім дзённіку пад датай 1(13).09.1861 г. запісаў: «Атрымаў цікавы ліст ад в.а. гродзенскага губернскага правадыра дваранства гр. Старжынскага. Ён з вялікай шчырасцю ўказвае, з аднаго боку, на памылкі і прыгнятаючыя дзеянні мясцовых уладаў, з другога, на пажаданні (у тэксце слова напісана па-французску. — В.Ш.) Літвы. Ён прама гаворыць, што край жадае быць далучаным да імперыі і да каралеўства, як раней ён быў далучаны да аднаго каралеўства; мець поўную свабоду сумлення, вярхоўны суд і ўніверсітэт у Вільні, права выкладаць, весці судовыя справы на сваёй мове і мець орган для выказвання сваіх пажаданняў (гэты сказ ад слова «край» напісаны па-французску. — В.Ш.). Ён у заключэнні прасіў, каб я каго-небудзь накіраваў у край або каго-небудзь адтуль выклікаў. Я даслаў яму па тэлеграфу, каб ён сам прыехаў у Пецярбург. Ліст яго ішоў доўга. Ён, магчыма, «перлюстраваны» на пошце»[58].

---

56 Славутинский С. Город Гродно и Гродненская губерния во время последнего польского мятежа (отрывок из воспоминаний) // Исторический вестник. – Т. XXXVII. – 1889. – С. 68; Штакельберг Ю.И. Архив

57 Штакельберг Ю.І. Архив "Русской старины"… – С. 305.

58 Дневник П.А. Валуева. – Т. 1… – С. 111.

4(16) і 6(18) верасня Старжынскі меў працяглыя размовы з міністрам унутраных спраў Валуевым, якія, па словах апошняга, «не прывялі да якога-небудзь станоўчага выніку». Але Старжынскаму далі зразумець, што частка пажаданняў не можа ажыццявіцца і што «перш чым чакаць якога-небудзь знака ўвагі ўрада да інтарэсаў мясцовага дваранства, яно павінна паказаць, што стаіць на баку ўрада, а не агітатараў»[59]. 11(23).12.1861 г. віленскі ваенны губернатар Назімаў сакрэтна піша гродзенскаму губернатару, каб ён часова не дазваляў беластоцкаму павятоваму правадыру дваранства Старжынскаму, які выконвае абавязкі губернскага правадыра, без дазвола ваеннага губернатара ад'язджаць у Пецярбург і Варшаву[60].

Старжынскі спрабаваў агітаваць сярод сялянства. В. Ратч у сваёй кнізе піша: «...Землеўладальнікі, якім граф Старжынскі даваў лозунгі, паўсюдна ўладкоўвалі вясковыя польскія школы, а бліжэйшы ягоны супрацоўнік Аляксандр Аскерка турбаваўся пра забеспячэнне іх прыгоднымі элементарнымі кніжкамі, у якіх памешчык маляваўся сябрам, дарадцам, апекуном і абаронцам сялянскага саслоўя»[61].

У канцы 1861 ці пачатку 1862 г. з дапамогай Валуева Старжынскі атрымаў магчымасць пагаварыць з Аляксандрам II. У адказ на словы Старжынскага аб «жаданнях краю, які на працягу пяці стагоддзяў быў звязаны з Польшчай і захаваў аб ёй самую ўдзячную памяць», імператар адказаў, што не трэба забываць, што Літва даўно ўжо ўключана ў склад Расіі. Незадаволены аўдыенцыяй Старжынскі напісаў і апублікаваў у Кракаве «Запіску аб патрабаваннях Літвы» (люты 1862 г.). Ён прапаноўваў стварыць у Вільні спецыяльную камісію з урадавых чыноўнікаў і прадстаўнікоў мясцовага дваранства, якая вырашыла б пытанне аднаўлення Літоўскага статута[62].

У красавіку 1862 г. Старжынскі піша запіску наступнага зместу.

1. Вярнуць Статут ВКЛ — верыфікацыю яго правядзе вышэйназваная камісія.
2. Прыняць меры для ліквідацыі дыскрымінацыі каталіцкага касцёла.

59 Дневник П.А. Валуева… – С. 113, 324.

60 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 88.

61 Ратч В. Сведения о польском мятеже 1863 г. в Северо-Западной России. – Т. 1. – Вильно, 1867. – С. 125.

62 Комзолова А.А. Политика самодержавия… – С. 123-124.

3. Адрадзіць Віленскую навучальную акругу і Віленскі ўніверсітэт.
4. Дапусціць большую колькасць ліцвінаў на пасады мясцовай адміністрацыі.
5. Зацвердзіць ужо падрыхтаваны Статут крэдытнага таварыства.
6. Склікаць шляхецкія сеймікі, забароненыя з увядзеннем ваеннага становішча[63].

У верасні 1862 г. на з'ездзе памешчыкаў у Вільні (ці 10-16.05 на Свентаянскіх кантрактах) быў абмеркаваны праект Старжынскага аб арганізацыі ў Літве крэдытнай установы. Там жа быў утвораны камітэт «белых», у які ўвайшоў Старжынскі[64]. На дваранскіх выбарах у Мінску, на думку віленскага генерал-губернатара, можа адбыцца хадайніцтва дваран аб далучэнні Мінскай губерні да Каралеўства (Царства) Польскага. Такое меркаванне Назімава было заснавана, між іншым, і на наступным: «План дзейнняў для будучых выбараў дастаўлены графам Віктарам Старжынскім з Парыжу ад польскай эміграцыі, якая знаходзіцца за мяжой. Звестка гэтая пацвярджаецца звесткамі, дастаўленымі мне з III аддзялення СЯІВК аб прадмеце паездкі графа Старжынскага ў Парыж, а таксама бесперапыннымі яго раз'ездамі ў апошні час па ўсіх пунктах паміж Варшавай, Гродна, Вільна і С.-Пецярбургам». Афіцыйна Старжынскі ездзіў у Парыж па заданню вялікага князя Канстанціна Мікалаевіча і маркіза А. Веляпольскага — наладзіць кантакт з польскай эміграцыяй, якая групавалася вакол князя У. Чартарыйскага, не афіцыйна — узгадніць план дзеянняў паміж польскай эміграцыяй і дваранствам заходніх губерняў пад час восеньскіх 1862 г. дваранскіх з'ездаў[65].

У снежні 1862 г. А.М. Гільдэбрант падаў запіску шэфу жандараў і III аддзялення В.А. Далгарукаву, у якой пісаў, што да партыі памяркоўных, якія маюць цесныя сувязі і пастаянныя кантакты з Варшавай, «належыць гродзенскі правадыр гр. Віктар Старжын-

---

63 Szpoper D. Pomiedzy caratemas nemo Rzczy pospolitej. Mysl polityczna i dzialalnosc konserwatystow polskich w guberniach zachodnich Cesarstwa Rosijskiego w latach 1855-1862. – Gdansk: Uniwersitet. Instytutprawa, 2003. – S. 110.

64 Революционный подъём в Литве и Белоруссии… – С. 164; Лясковский А.И. Литва и Белоруссия в восстании 1863 г. ( по новым архивным материалам). – Берлин: Арзамас, 1939. – С. 43.

65 Архивные материалы Муравьёвского музея, относящегося к польскому восстанию 1863-1864 гг. в пределах Северо-Западного края / сост. А.И. Миловидов. – Ч. 1 // Виленский временник. – Кн. VI. – С. 434; Комзолова А.А. Политика самодержавия… – С. 128.

скі, спалучаючы з нястрыманай дзейнасцю хітры розум і гарачы патрыятызм. Ён нядаўна быў у Парыжы, Варшаве, Пецярбурзе, Маскве і зноў паляцеў у Варшаву»[66]. Генерал-губернатар Назімаў атрымаў сведчанні, што Старжынскі меў кантакты з рэвалюцыйным польскім камітэтам, а таму прасіў міністра ўнутраных спраў зняць яго з пасады правадыра дваранства. Валуеў адказаў, што пасля размовы з шэфам жандараў ён не можа гэтага зрабіць, бо ведае, што Старжынскі выконваў асобае даручэнне Намесніка Каралеўства Польскага Вялікага князя Канстанціна Мікалаевіча. Валуеў у прыватным лісце да Назімава пісаў: «Падзяляючы погляд вашага высок-ва ў тым, што за графам Старжынскім небескарысна пастаяннае назіранне і што на яго, асабліва ў апошні час, нельга пакласціся безумоўна, я, аднак, не маю ніякіх дакладных фактаў, на якіх можна было бы заснаваць прамыя і афіцыйныя супраць яго меры. Відавочна, што ён прадвызначыў сябе ў Літоўскім краі, з некаторымі асаблівасцямі, значэнне маркіза Веляпольскага ў Каралеўстве. Некаторую нявызначанасць адносін да яго і некаторы працяг нявызначаных з яго боку чаканняў я нават лічу, на першы час, небескарыслівымі»[67].

Памочнік М. Мураўёва П. Чарэвін ва ўспамінах пісаў: «...Гэты мярзотнік не толькі беспакарана працягваў сваю злачынную дзейнасць, але і здолеў убіцца ў вышэйшы адміністрацыйны свет Пецярбургу, быў запрошаны ў Царскі двор і там даваў парады наконт дзеянняў, якія ўраду варта праводзіць у Заходнім краі»[68]. У канцы 1862 г. у Маскве адбыўся з’езд правадыроў дваранства з розных губерняў Расіі ў час знаходжання там імператара Аляксандра ІІ. Старжынскі быў там і падаў цару запіску, якая, па словах Валуева, «па свайму зместу вельмі падобная да ліста гр. Старжынскага да мяне, стаўшага прычынай яго выкліку ў Пецярбург у верасні 1861 г.». 20 ці 21 лістапада (2 ці 3 снежня) Старжынскі меў аўдыенцыю ў Аляксандра ІІ. Ён спрабаваў растлумачыць таму, што ў заходніх губернях ёсць кансерватыўнае «крыло» дваранства, якое лаяльна ставіцца да афіцыйнай улады і недаверліва да радыкальных напрамкаў у польскай палітычнай думцы[69].

Тады ж праз князя В.А. Далгарукава Старжынскі прадставіў цару запіску пра стан Заходняга краю. У ёй былі вызначаны тыя межы,

66 Революционный подъём в Литве и Белоруссии… – С. 148.

67 Лясковский А.И. Литва и Белоруссия… – С. 23-24; Архивные материалы Муравьёвского музея, относящегося к польскому восстанию 1863-1864 гг. в пределах Северо-Западного края / сост. А.И. Миловидов. – Ч. 1 // Виленский временник. – Кн. VI. – С. 162-164.

68 Чарэвін П. Паўночна-Заходні край (Успаміны) // Спадчына. – 1998. – № 3. – С. 31-32.

69 Дневник П.А. Валуева… – С. 324; Комзолова А.А. Политика самодержавия... – С. 124.

на якія гатова згадзіцца памяркоўнае крыло дваранства ў сваім кампрамісе з уладай, і ўмовы, на якіх гэты кампраміс магчымы:

- адказ Польшчы ад прэтэнзій на «літоўскія правінцыі» і прызнанне іх прыналежнасці да Расійскай імперыі;
- немагчымасць надання Заходняму краю больш ліберальных палітычных інстытутаў, чым тыя, якімі карыстаюцца ўнутраныя губерні Расіі;
- даць «палітычнаму народу» заходніх губерняў магчымасць развівацца на падставе сваёй прававой культуры, традыцый і вольнага выкарыстоўвання польскай мовы;
- правесці цыкл кансультацый урада з уплывовымі ў краі людзьмі;
- прызначаць на ўсе асноўныя пасады ў краі мясцовых ураджэнцаў;
- усталяванне «адміністрацыйнай уніі» Паўночна-Заходняга краю з Каралеўствам (Царствам) Польскім падобна Рэчы Паспалітай, калі ў «правінцыі» будзе прызнавацца ўлада цара і «дапускаецца існаванне польскага элемента»[70].

У маскоўскім мемарыяле Старжынскі лічыў, што «да часу, калі расійска-польскае пытанне не будзе вырашана радыкальна, Расія не будзе ў стане дасягнуць сапраўднага развіцця, а таксама так доўга, пакуль праблема не будзе справядліва вырашана, Расія не атрымае даверу ў сваіх славянскіх суседзяў, не будзе здольная распачаць нічога вялікага. Асвета, рэформы права, новыя правінцыйныя ўстановы не дадуць пасляховых пладоў, акрамя добрых праектаў. Дэмаралізацыя ўзрасце, паміж Расіяй і яе хвалебнай будучыняй заўсёды будзе стаяць прывід польскага народа, змучаны, вельмі слабы, каб перамагчы, але дастаткова моцны, каб стрымаць развіццё свайго непрыяцеля»[71].

А таму Старжынскі прапаноўваў расійскім уладам зрабіць палітычныя саступкі для літоўскіх губерняў, а не падлашчвацца да сялянства, каб не дайшло да разні, падобнай галіцыйскай 1846 г.:

- праводзіць кансультацыі з асобамі, якія карыстаюцца павагай літоўскага грамадства;
- · на пасады мясцовай адміністрацыі прызначаць людзей тутэйшага паходжання, якім мясцовыя праблемы блізкія;

70 Комзолова А.А. Политика самодержавия… – С. 124-125.
71 Цыт. па: Szoper D. Pomiedzy caratem a snem o Rzczypospolitej… – S. 546.

- дапусціць пэўную свабоду ў галіне адукацыі (аднавіць Віленскі ўніверсітэт), каб моладзь не ехала вучыцца ў заражаныя дэмакратычным рухам расійскія ўніверсітэты;
- развіваць грамадскія таварыствы рознага характару: сельскагаспадарчыя, крэдытныя, навуковыя, літаратурныя, банкі[72].

Аляксандр II уважліва прачытаў мемарыял Старжынскага і станоўча ставіўся да прапаноў аднаўлення інстытутаў, абяцаных Аляксандрам I, і неабходнасці пастаянных нарадаў з прадстаўнікамі дваранства заходніх губерняў. З Масквы Старжынскі паехаў з даручэннем цара прадставіць запіску намесніку Каралеўства Польскага Вялікаму князю Канстанціну Мікалаевічу. У дзённіку апошняга зафіксаваны некалькі сустрэч са Старжынскім у снежні 1862 і лютым 1863 г. 11(23).12.1862 г. адбылася доўгая размова «пра Літву і Польшчу», суразмоўцы разышліся задаволеныя адзін другім, 21.12.1862 г. (2.01.1863 г.) размаўлялі пра «нясмачны стан сялянскай справы ў Гродзенскай губерні»[73]. Канстанцін Мікалаевіч станоўча ставіўся да прадстаўлення аўтаноміі літоўскім губерням, звязваючы гэта з развіццём у Расійскай імперыі земскіх устаноў. Брату Аляксандру II ён пісаў пра Старжынскага: «Не трэба, аднак, забываць, што ён Паляк, хаця Паляк разважлівы. Разумее, што Літва ніколі не зможа вярнуцца да Польшчы, але жадае для Літвы большай правінцыйнай самадзейнасці. У гэтым аспекце яго чаканні могуць быць цалкам задаволены праз зацвярджэнне табой земскіх устаноў, а ён гэтае цалкам зразумеў»[74].

У студзені 1863 г. Старжынскі разам з гродзенскім павятовым правадыром дваранства князям Любецкім прад'явіў гродзенскаму губернатару Галлеру пратэст супраць забароны дваранству сабрацца на сход у Гродне (па забароне Назімава). За тыдзень да гэтага ў горад з'ехаліся каля 50 памешчыкаў губерні, сходы адбываліся ў дамах Старжынскага і Любецкага. Старжынскі сказаў Галлеру, што калі «памешчыкам нельга будзе прыязджаць у горад, дык ім не застанецца болей, як раздаць сялянам бясплатна зямлю, каб схіліць іх на свой бок»[75].

25 студзеня 1863 г. адбыўся экстраны з'езд прадстаўнікоў дваранства Літвы і Беларусі. Яго ініцыявала партыя «белых», бо «чырвоныя» з пачаткам паўстанцкага руху ў Каралеўстве пачалі актыўныя дзеянні і гэтым вырывалі ініцыятыву ў сваіх не-

72 Тамсама. – С. 547-548.
73 Комзолова А.А. Политика самодержавия… – С. 125, 130.
74 Szpoper D. Pomiedzy caratem a snem o Rzczypospolitej…. – S. 543.
75 Комзолова А.А. Политика самодержавия… – С. 130.

рашучых паплечнікаў. Галава камітэта «белых» Якуб Гейштар сутыкнуўся з канкурэнтам Старжынскім, які прэтэндаваў адыгрываць першую ролю ў Літве. Той меркаваў перанесці з'езд на сакавік, да якога вызначыцца больш выразны стан паўстання ў Каралеўстве Польскім. Гейштар перамог, і з'езд адбыўся. Для Старжынскага стала зразумелым, што кіраваць у Літве і Беларусі паўстаннем будзе камітэт на чале з Гейштарам, які аказаўся для памешчыкаў Віленскай і Ковенскай губерняў (якія перавагалі на з'ездзе) больш спрыяючай кандыдатурай. Старжынскі і яго паплечнік Плятар у камітэт не былі перавыбраны[76].



*Я. Гейштар*

9(21) сакавіка 1863 г. у знак нязгоды з царскай палітыкай Старжынскі выйшаў у адстаўку з пасады Беластоцкага правадыра дваранства, што справакавала шляхту да масавага зыходу з адміністрацыйных пасадаў[77]. Спачатку сталі падаваць прашэнні на звальненне павятовыя правадыры дваранства, затым міравыя пасярэднікі, іх прыкладам збіраліся скарыстацца міравыя суддзі. Гісторык Бранцаў адзначыў: «У гэтых прашэннях было выкарыстана шмат смелых выразаў супраць рускага ўрада; у некаторых з іх, між іншым, сказана было, што рускі ўрад падбухторвае сялян супраць памешчыкаў (намёк на напад раскольнікаў на віцебскіх памешчыкаў) і падрыхтоўвае галіцэйскую разню, а таму яны, міравыя пасярэднікі, правадыры дваранства і чыноўнікі, прызнаюць «непрыстойным» служыць такому ўраду, якім з'яўляецца расійскі»[78].

Назімаў у гэты час пісаў Валуеву: «Гэтая новага роду дэманстрацыя, арганізаваная Старжынскім, магчыма, мае мэтай узбудзіць у Еўропе агульнае незадавальненне нашым урадам, і не падлягае сумневу, што Старжынскі не затрымаецца давесці гэтым фактам, магчыма, шырокую галоснасць праз размяшчэнне гэтага факта ў розных замежных часопісах...»[79].

---

76 Лясковский А.И. Литва и Белоруссия… – С. 74-75.

77 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 1138, а. 114.

78 Брянцев П.Д. История литовского государства с древнейших времён. – Вильно, 1889. – С. 645.

79 Архивные материалы Муравьёвского музея, относящегося к польскому восстанию 1863-1864 гг. в пределах Северо-Западного края / сост. А.И. Миловидов. – Ч. 1 // Виленский временник. – Кн. VI. – С. 336.

16(28).03.1863 г. Старжынскі дасылае павятовым правадырам дваранства цыркулярны ліст. Тэкст яго захаваўся ў апублікаваных дакументах Мураўёўскага музея, друкаваўся ў «Газете Вялікага Княства Пазнаньскага» (1863. — № 73) і «Журнал дэбат» (1863. — 25.03). Старжынскі пісаў у лісце, што пададзеныя ім расійскай уладзе ў лютым і снежні 1862 г. праекты аб паляпшэнні эканамічнага стану Краю засталіся «без усялякага выніку для Літвы», што далейшая яго дзейнасць немагчыма пры тым накірунку, «які ўрадавыя ўлады прымаюць у цяперашніх падзеях, пры тых абразах, якія тычацца ўсяго польскага элемента ў Літве, а ў той час шляхам раскіданых сярод сялян заклікаў імкнуцца выклікаць сацыяльны пераварот, які ўсім нам пагражае..., і што арганічная праца, якая мае на мэце карысць і развіццё народнага багацця, цяпер немагчыма»[80].

Старжынскі папярэджваў правадыроў дваранства Гродзенскай губерні: «Кожнаму вядома, а таму і вам неварожая надзвычайная неабходнасць пераўтварэнняў і ўстаноў, без якіх Літва, сістэматычна ў развіцці вяртаемая назад і затрымліваемая, не можа імкнуцца да лепшай ці ніштаватай будучыні... Я на працягу двух мінулых гадоў імкнуўся прымірыць народ з урадам і спадзяваўся, што буду ў стане хадайнічаць аб такіх установах і пераўтварэннях, якія кожны, нават самых памяркоўных жаданняў грамадзянін, лічыць істотнымі і неабходнымі... Прыходжу да пераканання, што далейшае знаходжанне маё на пасадзе правадыра дваранства не магло б пагадзіцца далей з асабістай годнасцю Паляка... »[81].

18(30).03.1863 г. Назімаў пісаў гродзенскаму губернатару, што ў замежнай прэсе з'явіўся цыркулярны ліст Старжынскага да павятовых правадыроў дваранства, у якім ён тлумачыў прычыны, якія прымусілі яго адысці ў адстаўку, крытыкаваў «усталяваны ў заходніх губернях вобраз кіравання і абражаў урад»[82]. Назімаў патрабаваў, каб гродзенскі губернатар разабраўся з чуткамі пра злоўжыванні Старжынскага «пад час знаходжання маёнтка малалетніх графоў Красіцкіх у яго адміністрацыі». Старжынскага хацелі запалохаць эканамічным ціскам, адвесці яго ўвагу ад палітычнай дзейнасці, якая давала свой плён.

Генерал-губернатар тэлеграмай №38 з Вільні 20.03(01.04).1863г.

80 Архивные материалы Муравьёвского музея, относящегося к польскому восстанию 1863-1864 гг. в пределах Северо-Западного края / сост. А.И. Миловидов. – Ч. 1 // Виленский временник. – Кн. VI. – С. 328; Лясковский А.И. Литва и Белоруссия… – С. 24-25.

81 Райковский С.А. Польская молодёжь Западного края вмятеже 1861-1863 гг. // Русский вестник. – 1869. – Т. 79. – С. 527.

82 Комзолова А.А. Политика самодержавия… – С. 130.

даводзіў гродзенскаму губернатару: «Вследствие предложения Министра Внутренних Дел поручаю Вам объявить исправляющему должность Губернского Предводителя Графу Старжинскому, что впредь до разрешения ему воспрещён выезд из Гродно. Генерал Адъютант Назимов». Распіска Старжынскага ёсць у справе ад 12.(24).04.63. — абавязаўся не адлучацца[83].

В. Ратч у сваёй кнізе пісаў, што Старжынскі «турбаваўся дапамогай урада арганізаваць для Літвы яму падпарадкаваны двухтысячны атрад з карэнных палякаў»[84]. 20.05.1863 г. ужо Мураўёў загадвае гродзенскаму губернатару арыштаваць Старжынскага і даставіць яго ў Вільню да каменданта, зрабіць у кватэры яго дэтальны агляд (пяратрус) яго папер і «предосудительного содержания» паперы даслаць генерал-губернатару. Знайшлі 24.05 (5.06).1863 г. дубальтоўку, два рэвальверы і баявыя патроны. У гэты самы дзень пасажырскім цягнікам яго адправілі ў суправаджэнні жандарскага афіцэра ў Вільню. Сядзеў у Віленскай цытадэлі. «...Прыгавораны да смерці (чаго, аднак, ён не заслугоўваў і да чаго не быў бы прагавораны, каб у мураўёўскую эпоху не пераследаваліся асабліва ўсе палякі, меўшыя асабістыя са мной зносіны», — пісаў у дзённіку Валуеў[85].

У сваіх запісках М.М. Мураўёў пісаў, што не расстраляў Старжынскага толькі таму, што яму спачуваў вялікі князь Канстанцін Мікалаевіч. Прадухіліць забойства прасіў таксама міністр замежных спраў Англіі Дж. Расэль. У лістападзе 1863 г. Старжынскага прыгаварылі да года турмы ў Бабруйскай крэпасці і ссылцы ў Пермскую, а пазней у Варонежскую губерню. Людвік Юзэф Левандоўскі ўзгадваў, што ў арыштанскіх ротах у Варонежы быў граф Старжынскі з жонкай і двума сынамі[86].

14 ліпеня 1867 г. у сяле Багаяўленскім Зямлянскага павета Віктар Старжынскі даў падпіску прыставу 3-га стана ў тым, што яму «аб'яўлена копія з прапановы камандуючага войскамі ў паўночна-заходніх губернях генерал-ад'ютанта графа Баранава ад 4-га мінулага чэрвеня за № 1546 гродзенскаму губернатару аб невыключэнні мяне з ліку асоб, абавязаных прадаць свае маёнткі ў заходніх губернях да 10-га снежня гэтага года». У гэты час маёнткі Доктарцы і Віктаржын у Бельскім павеце былі па кантракту ў арэндзе ў падпалкоўніка Адама Смольскага (з 24.06.1865 г. па 1871 г.)[87].

83 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 253, а. 3, 6.

84 Ратч В. Сведения о польском мятеже 1863 года ...– С. 215.

85 Дневник П.А. Валуева... – С. 324.

86 Ostatnie slowa. Opowiadaniai wspomninia uczestnikow walki o wolnosc w roku 1863/64. – Lwow, 1913. – S. 103.

87 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 14, с. 286, а. 22; с. 290, а. 39.

У 1869-1875 гг. Старжынскі жыў у Галіцыі, потым у Пецярбургу[88]. Маёнтак яго быў канфіскаваны і перададзены князю Дзмітрыю Абаленскаму.

Такім быў лёс чалавека, які прадстаўляў сабой тую частку грамадства Літвы і Беларусі, якая ішла на пагадненне з расійскімі ўладамі ўзамен на шырокія палітычныя саступкі ў мясцовай аўтаноміі. Падкрэслім, што праекты прапаноўваліся Старжынскім у перадпаўстанцкі і паўстанцкі час (1861-1863 гг.), калі патрыятычныя сілы Польшчы, Літвы і Беларусі вялі барацьбу за незалежную Рэч Паспалітую.

## «ПРАЧЫТАЙ І БУДЗЕШ УСЁ ВЕДАЦЬ»

*(Распаўсюджвальнікі «Мужыцкай праўды»)*

У першым нумары «Мужыцкай праўды» Кастусь Каліноўскі пісаў: «Мінула ўжо тое, калі здавалася ўсім, што мужыцкая рука прыдатная толькі для сахі. Цяпер настаў такі час, што мы самі можам пісаць, і то пісаць такую праўду справядлівую, як Бог на небе. О, загрыміць наша праўда і, як маланка, пераляціць па свеце! Няхай пазнаюць, што мы можам не толькі карміць сваім хлебам, але яшчэ і вучыць сваёй мужыцкай праўды...»[89].

А была яна вось якая. У першым нумары (выйшаў каля сярэдзіны ліпеня 1862 г.) крытыкаваўся Маніфест цара ад 19 лютага 1861 г. (які адмяніў прыгонніцтва ў Расійскай імперыі) і сялянства заклікалася да аб'яднання ў барацьбе за зямлю і волю: «Возьмемся, дзецюкі, за рукі і будзем трымацца разам!.. Мужык, пакуль здужае трымаць касу і сякеру, бараніць свайго патрапіць і ў нікога ласкі прасіць не будзе»[90]. У працяг гэтага другі нумар (пачатак верасня 1862 г.) тлумачыў сялянам, што яны не павінны плаціць чынш панам і казне, павінны падтрымаць вызваленчую барацьбу супраць царызма: «...Але калі будзе вайна з маскалём за нашу вольнасць, то той час трэба ўсім ісці на вайну супраць маскаля[91]».

88 Кіселёў Г. Старжэнскі (Старжынскі) Віктар Вацлаў // ЭГБ. – Т. 6. – Кн. 1. – Мн.: БелЭн, 2001. – С. 395.

89 Каліноўскі К. За нашую вольнасць. Творы, дакументы / уклад., прадм., пасляcл. і камент. Г. Кісялёва. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1999. – С. 27.

90 Каліноўскі К. За нашую вольнасць… – С. 28.

91 Каліноўскі К. За нашую вольнасць… – С. 29.

У трэцім нумары (верасень 1862 г.) распавядаецца, якой павінна быць сапраўдная свабода: «Нам не маніхвестаў, а вольнасці патрэбна — і то вольнасці не такой, якую нам цар хоча даць, але якую мы самі, мужыкі, паміж сабой зробім». У чацвёртым нумары (кастрычнік 1862 г.) даецца паняцце аб дзяржаве і яе механізме, крытыкуюцца царскія суды і школа, робіцца выснова, »што глум, здзекі і несправядлівасць выходзіць ад самаго цара». Пяты нумар (лістапад 1862 г.) крытыкаваў царскую рэкрутчыну, шосты (снежань 1862 г.) выкрываў палітыку царызму па рэлігійных пытаннях[92].

Апошні, сёмы нумар, убачыў свет у чэрвені 1863 г. ва ўмовах паўстання. Ён заклікаў сялян далучацца да ўзброенай барацьбы: «Падумайце добра, ды, памаліўшыся Богу, станьма дружна разам за нашую вольнасць! Нас цар ужо не падмане — не падвядуць маскалі! Няма для іх у нашых сёлах ні вады, ні хлеба — для іх мы глухія і нямыя і нічога не бачылі і не чулі. А пакуль яшчэ пара, трэба нашым хлопцам спяшацца з віламі ды з косамі там, дзе дабіваюцца волі ды праўды — а мы, іх бацькі ды жонкі нашыя, сцерагці будзем ды ўведамляць, адкуль на іх цягне нячыста маскоўская сіла, да ад душы дапамагаць усялякімі спосабамі дзецюкам нашым, што за нас пойдуць біцца. — А будзе ў нас вольнасць, якой не было нашым дзядам ды бацькам»[93].

Газету «Мужыцкая праўда» выдавалі Кастусь Каліноўскі, Фелікс Ражанскі, Валеры Урублеўскі і Станіслаў Сангін. Першую скрыпку граў Каліноўскі, якому і належыць, як даказалі даследчыкі, псеўданім «Яська-гаспадар з-пад Вільні». Праўда, ёсць меркаванне, што мянушка з'яўляецца супольнай для ўсёй рэдакцыйнай калегіі[94]. Г. Кісялёў пісаў, што ў формуле псеўданіма закладзены вялікі сэнс: «Гаспадар — не проста селянін, а шанаваны ў вёсцы чалавек, са сваёй гаспадаркай, асобным дваром і зямельным надзелам, слова якога мела нямалую вагу для іншых вяскоўцаў. Семантыка слова магла выклікаць і дадатковыя глыбокія далёкасяжныя асацыяцыі (гаспадар, уладар, гаспадаром звалі Вялікага князя літоўскага). І Вільня — не проста горад, а спрадвечны цэнтр усяго рэгіёну, старажытная сталіца моцнай некалі дзяржавы. Тут стагоддзямі рабілася вялікая палітыка»[95]. Такі Яська — гаспадар з-пад Вільні, ды яшчэ адукаваны, кніжнік, які ведае гісторыю сваёй Баць-

92 Каліноўскі К. За нашую вольнасць… – С. 31-37.

93 Каліноўскі К. За нашую вольнасць… – С. 39.

94 Prasa tajna z lat 1861-1864. Cz. 1 / Red. Tomu S. Kieniewicz, J. Miller. – Wroclaw: PAN, 1966. – S. 318.

95 Гісторыя беларускай літаратуры XI-XIX стагоддзяў: у 2 т. Т. 2 – Новая літаратура: другая палова XVIII-XIX ст. – Мн.: Беларус. навука, 2010. – С. 323.

каўшчыны і ганарыцца ёю, мог сказаць важнае і патрэбнае дзецюкам[96] Беларусі-Літвы.

Газета стваралася ў форме ягоных маналогаў да сялян — жанр гутарак у той час быў папулярным сярод народных мас. «Слова Каліноўскага, — піша Г. Кісялёў, — трапяткое, жывое, мастацкія сродкі, фарбы, тропы разнастайныя: іронія, сарказм, рытарычнае пытанне, лексічна-інтанацыйны паўтор, трапнае параўнанне, паралелізм, фальклорная сімволіка (вобраз сяўбы і жніва як сімвал народнага паўстання), грубаваты народны жарт. Каліноўскі нібы любаваўся ўсімі адценнямі народнага слова, якое яшчэ не спазнала путаў граматыкі»[97].

Места выдання газеты дакладна невядома. У крыніцах і выданнях даследчыкаў указваюцца розныя месцы: Беласток, Гродна, Вільня, Мінск[98]. Гэта магла быць і Сакулка (цяпер у Польшчы), дзе кіраўніком пісарска-егерскага вучылішча працаваў Урублеўскі (ён добра ведаў мясцовыя лясы, ды і чыгунка праходзіла праз населены пункт). Можна меркаваць і пра Вялікую Бераставіцу, дзе працаваў Ражанскі і служыў ксёндз Ігнат Казлоўскі. Сёмы нумар мог быць надрукаваны ў Вільні, куды вярнуўся Каліноўскі з Гродзеншчыны. Гродзенскі губернатар 17.09.1862 г. пісаў міністру ўнутраных спраў: «...Узбуджальныя лісты (маецца на ўвазе «Мужыцкая праўда». — В.Ш.) з'яўляюцца выключна ў паветах Гродзенскай губерні, размеркаваных на памежжы Каралеўства Польскага. Таму трэба лічыць, што падобныя друкуюцца ў Каралеўстве і перасылаюцца адтуль чыгункай, кіраўніцтва якой складаецца выключна з польскіх эмігрантаў»[99].

Маскоўскі даследчык А. Смірноў лічыў, што тыраж «Мужыцкай праўды» дасягаў 3-4 тысяч экзэмпляраў, але Г. Кісялёў пісаў, што дадзеная лічба беспадстаўная і што тыраж «наўрад ці калі-небудзь перавышаў тысячу экзэмпляраў». Можа, не так важна, якім быў наклад газеты, а тое, што «рэвалюцыя загаварыла па-беларуску»[100].

Газета раздавалася для распаўсюджвання нізавым чальцам Гродзенскай ваяводскай рэвалюцыйнай арганізацыі і камандзірам партызанскіх атрадаў; яе прыбівалі на сцены дамоў, на брамы,

96 Дзецюкі – сяляне.

97 Гісторыя беларускай літаратуры XI-XIX стагоддзяў… – С. 322.

98 Смирнов А.Ф. "Мужицкая правда" // Восстание 1863 г. Русско-польские революционные связи 60-х гг. – М., 1960. – С. 48.

99 Fajnhauz. Prasa konspiracyjna powstania styczniowego na Litwe I Białorusi (1861-1864) // Rocznik Bałystocki. T. IV. – Białystok, 1963. – S. 72.

100 Смірноў А.Ф. Кастусь Каліноўскі ... – С. 84-86; Кісялёў Г. З думаю пра Беларусь. – Мн., 1966. – С. 14, 54.

слупы, прыдарожныя крыжы, дзверы касцёлаў і цэркваў; жандары знаходзілі газеты ў вясковых валасных канцылярыях; яе чыталі ў вясковых хатах і карчмах. Газета раскідвалася ў месцах найбольш людных: на палях, мастках плаціны, дарогах, вуліцах, каля капліц, пад хаты мясцовых начальнікаў (стараст, соцкіх, земскіх суддзяў).

Для распаўсюджвання газеты прыцягвалі чыноўнікаў Гродзенскай палаты дзяржаўных маёмасцяў, якія былі звязаны з казённымі сялянамі, мелі ў вёсках знаёмых валасных старшынь, пісараў, настаўнікаў вясковых вучылішчаў. Следчая камісія, рабіўшая 17(29).11.1863 г. вобыск у Гродзенскай палаце дзяржаўных маёмасцяў, знайшла «ў вялікай колькасці друкаваныя аркушы на польскай мове (канешне, беларускай. — В.Ш.) рэвалюцыйнай газеты № 3 і 5 пад назвай «Мужыцкая праўда»...»[101] У распаўсюджванні ўдзельнічалі таксама работнікі чыгункі, якія маглі перавозіць газету ў падвойных падлозе ці сценах вагонаў.

Каб данесці «Мужыцкую праўду» «Яські-гаспадара з-пад Вільні» да народа, былі патрэбны смелыя, часам адчайныя, аддадзеныя справе вызвалення і свабоды людзі. Пра іх нашыя біяграмы.

**АЛЬШЭЎСКАЯ МАР'ЯНА ЦІМАФЕЕЎНА**, сялянка маёнтка Паўловічы Сакольскага павета, дзяўчына 17 гадоў. Пакаёўка памешчыка Ю. Алендскага прынесла «Мужыцкую праўду», а распаўсюджвалі дваравым Казімір Стрэмашук і Тамаш Спіжэўскі (Сняжэўскі). Узяла на стале ў пані сваёй. Прыгаворана да турэмнага зняволення на 1 год і потым да высылкі на жыхарства ва ўнутраныя расійскія губерні пад нагляд паліцыі (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 13; ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 540 адв., 550 адв., 560).

**АЛЬШЭЎСКІ ЦІМАФЕЙ**, бацька Мар'яны, 54 гады. Па даручэнні дачкі хадзіў забіраць рэвалюцыйную паперу ад селяніна Сняжэўскага. Прыгавораны да пазбаўлення асабістых і нададзеных яму правоў і прывілеяў і да службы ў арыштанскіх ротах грамадзянскага ведамства на 1 год. Зямельны ўчастак у ваколіцы Альшэва-Рыболты быў канфіскаваны (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 13; ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 540 адв., 550 адв., 560; ф. 23, воп. 1, с. 372, а. 122 адв.).

**БАГУШЭВІЧ ФРАНЦІШАК БЕНЯДЗІКТ КАЗІМІРАВІЧ**, 9(21).03.1840 г., фальварак Свіраны Віленскага павета —

101 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 1146, а. 1.

15(28).04.1900 г., Кушляны Ашмянскага павета. У гады вучобы ў Віленскай гімназіі блізка кантактаваў з Цітам Далеўскім — будучым паплечнікам Каліноўскага і Сігізмундам Мінейка — вайсковым Ашмянскага павета ў 1863 г. Прымаў удзел у восеньскіх хваляваннях студэнтаў Пецярбургскага ўніверсітэта ў 1861 г.: адмовіўся прыняць матрыкулы (заліковую кніжку), дзе былі надрукаваны новыя правілы для ўніверсітэтаў. Быў выключаны з універсітэта і адправіўся дамоў у канцы 1861 г. У 1861-1862 гг., відаць, належаў да левага крыла таварыства «Піянтковічаў», якое дзейнічала ў Ашмянскім павеце. Чытаў сялянам «Мужыцкую праўду». У 1863 г. уступіў у паўстанцкія шэрагі (быў у атрадзе С. Мінейкі ў Ашмянскім павеце, потым К. Ясевіча, Г. Чахавіча) або ў Лідскім павеце ў атрадзе Парадоўскага («Астрогі»). Прайшоў шлях да Аўгустоўскай губерні. Паранены ў нагу, ён знайшоў гасціннасць і клапатлівыя адносіны ў доме Крушэўскіх. Менавіта яны дапамаглі яму вярнуцца ў Вільню. Потым Б. з'ехаў на Украіну (Кісялёў Г. Ад Чачота да Багушэвіча. Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. — Мн.: Навука і тэхніка, 1993. — С. 236, 238; Роўба Н. «Паэт Белай Русі».— С. 289).



*Ф. Багушэвіч*

**ГАРЧАК ІОСІФ (ЮЗЭФ)**, католік, 26 гадоў у 1863 г. У Санкт-Пецярбурзе быў членам польска-літоўска-беларускага студэнцкага «Агула» («Таварыства»). 8 тыдняў адсядзеў у Кранштацкай крэпасці за ўдзел у студзеньскіх хваляваннях 1861 г. Потым быў высланы на радзіму ў Скраблякі (цяпер Адэльскі с/с) пад нагляд паліцыі. Тут ён меў участак зямлі, але гаспадаркай не займаўся, раз'язджаў на вёсках, запрашаў да сябе сялян і заклікаў да бунту, «раздаваў карткі падбухторваючага зместу пад назвай «Мужыцкая праўда», дапамагаў хаваць К. Станкевіча (гл.). Следчая камісія

не змагла даказаць віну Г., але ўсё роўна выслала яго ў Пермскую губерню (Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг. — С. 485-486, 488-489; Кісялёў Г. З думаю... — С. 25).

**ГЕЛІЧ (ГАЛІЧ) МОІСЕЙ (МАІСЕЙ)**, селянін в. Бярозаўка, знайшоў паміж сцеблямі жыта загарнутую ў паперу і перавязаную крыжападобна газету «Мужыцкая праўда» № 1. Гэта самы першы з вядомых фактаў распаўсюджвання газеты (Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг. // Восстание 1863 г.: материалы и документы. — М.: Наука, 1964. — С. 472-473).

**ГУРСКІ РЫГОР**, селянін з в. Вайноўцы Сакольскага павета. Яго ў доме Ігнація Маркевіча падбухторвалі ў студзені 1863 г. да ўдзелу ў паўстанні. Распаўсюджваў газету ў Мінкаўцах (Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг... — С. 486).

**ЗЯНЦЮК (ЗІНЧУК) МІХАСЬ**, селянін в. Хомікі Сакольскага павета. Непісьменны, але, праслухаўшы «Мужыцкую праўду», «пераняў напісанае ў ёй» і чытаў іншым сялянам напамяць. Быў касінерам у паўстанцкім атрадзе. Удзельнічаў у падпале хаты даносчыка Рабічкі. Следчая камісія адправіла яго радавым у амурскія батальёны. Па амністыі 1868 г. мог вярнуцца на радзіму, але мясцовыя ўлады адмовілі хадайніцтва сваякоў і аднавяскоўцаў (Кісялёў Г. З думаю... — С. 26, 28).

**КАЗЛОЎСКІ ЯН ІГНАЦІЙ**, ксёндз, вікарны Індурскага касцёла (1861 — 14.01.1864 гг.). Распаўсюджваў «Мужыцкую праўду» на Бераставіччыне і Свіслаччыне, будучы адным з кіраўнікоў патаемнай рэвалюцыйнай арганізацыі ў Вялікай Бераставіцы (Памяць: Гіст.-дакум. Хроніка Бераставіцкага раёна. — Мн.: БЕЛТА, 1999. — С. 75; Госцеў А. П., Швед В.В. Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116-1990 гг.). — Гродна: НВК «Пергамент», 1993. — С. 171).

**КАЛІНОЎСКІ ВІКЕНЦІ-КАНСТАНЦІН** (Яська-гаспадар з-пад Вільні). Не толькі выдаваў, рэдагаваў, пісаў артыкулы ў газету, але і сам распаўсюджваў яе. 27 кастрычніка 1862 г. прыстаў 2-га стану Слонімскага павета Агацін даносіў гродзенскаму губернатару, што «...7 числа этого октября месяца, в 5 часов после полудня, проезжий, ехавший почтовым трактом через деревню Шейняки[102]

102 Шэйпякі, цяпер Шэйпічы – вёска ў Косаўскім раёне Брэсцкай вобласці.

в город Волковыск на паре почтовых лошадей, выбрасывал скрутки бумаг на дорогу, и указанные крестьяне, поднимая их, обращались к грамотным своим собратьям прочитать... Возвращался я на Рожанскую почтовую станцию и по собранным мной сведениям выявил, что проезжим пассажиром был, как видно из книги, в 5 часов выехавшим, некто дворянин Викенци Калиновский.., который возвращался из г. Слонима в г. Волковыск...». Яшчэ ён быў у Ружанах, Падароску, а з Ваўкавыска паехаў у Гродна. К. раскідваў 3-ці нумар «Мужыцкай праўды» (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 138-141 адв.; с. 6, а. 1, 13, 15; Лушчыцкі І.Н. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палове XIX ст. — Мн.: Выд-ва БДУ, 1958. — С. 193).

**КЛІМАШЭЎСКІ ІОСІФ**, вандроўны хатні настаўнік. Паходзіў з Вільні. У 1854 г. з'явіўся ў Кушлянах і навучаў дзяцей дробных уладальнікаў (у тым ліку Казіміра Багушэвіча). Праз 5 гадоў пераехаў настаўнічаць у Жупраны. Перад паўстаннем жыў у млынара і карчмара Гофлака. «Мужыцкую праўду» адтрымаў ад А. Ясевіча і чытаў (№ 5) сялянам. Хадзіў у лес да паўстанцаў. Памёр у турме ў студзені 1864 г. Перад смерцю заявіў ваеннаму начальніку Ашмянскага павета палкоўніку Каладзееву, што ўсё жыццё вучыў дзяцей ненавідзець царскі ўрад (Кісялёў Г. Сейбіты вечнага: артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў і дзеячоў рэвалюцыйнага руху 1863 года.- Мн.: Медысон, 2009. — С. 300-301).

**МАЛАХОЎСКІ УЛАДЗІСЛАЎ** (каля 1830-1900 гг.), афіцэр корпуса шляхоў зносін. Адчайны і рызыкоўны чалавек. У Вільні быў паўстанцкім начальнікам горада і ўлетку 1863 г. разам з Каліноўскім падрыхтаваў пераварот у рэвалюцыйнай арганізацыі — быў утвораны «чырвоны ўрад». У Пецярбурзе наладжваў сувязі з «Зямлёй і воляй». Мог быць, як лічаць лінгвісты, выдаўцом № 7 «Мужыцкай праўды», які мовай адрозніваецца ад іншых нумароў і падрыхтаваны кімсьці з прадстаўнікоў паўднёвай (окаючай) гаворкі. М. родам з Кобрыншчыны (Кісялёў Г. Родам... — С. 51).

**МАРКЕВІЧ ІГНАЦІЙ**, селянін, у доме якога, па паказаннях дзяўчыны, якая служыла ў яго, жыў Станкевіч (гл.), заходзіў Зянцюк (гл.). Захоўваў на страсе і распаўсюджваў «Мужыцкую праўду». У доме збіраліся сяляне, якім чыталі газету (Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг... — С. 488).

**РАЖАНСКІ ФЕЛІКС**, дапамагаў Каліноўскаму ў выданні газеты і яе распаўсюджванні. Пераапранаўся ў вопратку мясцовых жыхароў і ездзіў па вёсках, размаўляў з вяскоўцамі, перадаваў «Мужыцкую праўду» і тлумачыў сялянам, на якім баку трэба змагацца, дзе і як шукаць вызвалення ад прыгнёту. У сваіх успамінах «З Гродзенскага ваяводства» Ражанскі пісаў: «Каліноўскі і Ражанскі ў пэўныя перыяды часу з поспехам рабілі пешыя падарожжы па шырокім краі пад розным абліччам, выкарыстоўваючы асабістыя сувязі, пашыралі свае выданні і вучылі, як і дзе трэба шукаць вызвалення ад прыгнёту» (Смирнов А.Ф. «Мужыцкая праўда» // Восстание 1863 г. и русско-польские революционные связи 60-х годов. — М.: АН СССР, 1960 — С. 52; Шалькевич В.Ф. Кастусь Калиновский : Страницы биографии. — Минск: Университетское, 1988. — С. 161; Rozanski F. Z Wojewodstwa Grodzienskiego... — S. 396-397).

**САНГІН СТАНІСЛАЎ ЮЗЭФАТАВІЧ** (каля 1818—15.02.1863 гг., в. Рэчыца Пружанскага павета). Піцейна-акцызны наглядальнік у Бельскім павеце, калежскі асэсар (гл. таксама нарыс пра Гродзенскую рэвалюцыйную арганізацыю). Дапамагаў выдаваць і распаўсюджваць «Мужыцкую праўду» (гл. Штарк).

**СЕРПУЧЭЎСКІ (СЕРКУЧЭЎСКІ)**, пісар Гарнастаевіцкай воласці (цяпер Свіслацкі раён), пражываў у м. Свіслач, чытаў старшыне названай воласці Антонію Асвейну і сялянам у валасным праўленні «Мужыцкую праўду». 13 (25).05.1863 г. выконваў абавязкі гродзенскага губернатара, загадаў Ваўкавыскаму вайсковаму начальніку адшукаць яго і аддаць пад суд. С. быў добра знаёмы з Каліноўскім, бо разам з ім вучыўся ў Свіслацкай гімназіі (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 186, а. 2; Кісялёў Г. З думаю... — С. 30).

**СІНКЕВІЧ РАМУАЛЬД**, калежскі сакратар Гродзенскай палаты дзяржаўных маёмасцяў. У яго шафе, у гаспадарчым аддзяленні, знайшлі 37 экзэмпляраў «Мужыцкай праўды» № 3 і 5. Сасланы ў Томскую губерню (Кісялёў Г. З думаю... — С. 49, 50).

**СПІЖЭЎСКІ ТАМАШ (ЦІМАФЕЙ)**, селянін з маёнтка Паўлавічы Сакольскага павета Юліяна Алендскага. «Пісьмо ад Яські-гаспадара з-пад Вільні да мужыкоў зямлі Польскай» дала яму Мар'яна Альшэўская. Сам ён непісьменны, даваў чытаць яе Дамініку Кічуку (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 13;

ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 540 адв., 550 адв., 560; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917 б., а. 53-54).

**СТАНКЕВІЧ КАНСТАНЦІН**, селянін Красніцкай воласці (цяпер Алекшыцкі с/с Бераставіцкага раёна). Раздаваў сялянам сваёй і іншых вёсак «Мужыцкую праўду», аб чым пісалася ў рапарце жандара свайму шэфу ў Санкт-Пецярбург ад 7.02.1863 г. (Памяць. Бераставіцкі раён... — С. 75).

**СТАНКЕВІЧ КАЗІМІР**, казённы селянін з в. Вайнавец. Прапаганду вёў ужо з вясны 1862 г. Распаўсюджваў газету ў Сакольскім павеце. «Я маю для вас падарунак, — гаварыў ён сялянам, — прачытайце ці дайце прачытаць і будзеце ведаць наконт паншчыны, можаце пакінуць яе сабе, такіх асобнікаў у мяне ёсць больш за сотню». У хаце селяніна Маркевіча, дзе жыў С., збіраліся па начах сяляне. Ён чытаў «Мужыцкую праўду», звяртаўся з газетай да моладзі. Разам з іншымі паўстанцамі праз некалькі дзён пасля пакарання Цюхны ўдзельнічаў у падпальванні хаты даносчыка І. Рабічкі (Кісялёў Г. З думаю... — С. 24, 27; Смірноў А.Ф. «Мужыцкая праўда». — С. 50; Гродно: энцикл. справочник. — С. 280).

**СТРЭМАШУК КАЗІМІР СЦЯПАНАВІЧ**, селянін в. Ліцвінак Сакольскага павета Гродзенскай губерні, 32 гады, каталік. Чытаў газету дваравым людзям маёнтка Паўлавічы Сакольскага павета Юліяна Алендскага. «Ліст ад Яські-гаспадара з-пад Вільні» паказваў яму Ц. Спіжэўскі ў карчме Мялешкаўцах. На следстве паказаў, што атрыманыя ад Марціна Бляхара з Агароднікаў паперы аддаў у Кузніцы расійскаму капітану (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 13; ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 540 адв., 550 адв., 560; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917 б., а. 34 адв.-35 адв., 52-52 адв.).

**УРУБЛЕЎСКІ ВАЛЕРЫ (ВАЛЕРЫЯН)**. Station Станіслаў Гершынскі напісаў брашуру «Генерал Валеры Урублеўскі» і выдаў яе пры жыцці апошняга. Абапіраючыся на ўспаміны свайго героя, ён піша, што той ездзіў па начах раскідваць нумары газеты па сялянскіх палетках. Урублеўскі распаўсюджваў газету таксама праз сваіх лясніччых. У. быў паплечнікам Каліноўскага, і пры яго ўдзеле выдаваліся пэўныя нумары газеты. Пра гэта піша Адам Станкевіч у брашуры «Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення» са слоў адваката Тадэвуша Урублеўскага, роднага дзядзькі паўстанца (Кі-

сялёў Г. З думаю... — С. 22; Лушчыцкі І.Н. — С. 193; Станкевіч А. З богам да Беларусі: збор твораў. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008. — С. 166).

**ЦЮХНА МАЦВЕЙ (МАЦЕЙ)** (каля 1819 — 6.06.1863 гг., Сакулка). Часоваабавязаны селянін з в. Вайнаўцы. Прыходзіў у хату Маркевіча на пасяджэнні, дзе бываў і Гарчак (гл.). Следчая камісія, якая працавала ў м. Адэльск, засведчыла, што ён распаўсюджваў газету ў Сакольскім павеце, гаворачы «Прачытай і будзеш усё ведаць», заклікаў сялян ісці ў паўстанцкі атрад, раіў ім «зрабіць змову і не даваць рэкрутаў». Арыштаваны ў студзені 1863 г., аддадзены ваенна-палявому суду і публічна расстраляны ў Сакулцы 6.06.1863 г. А 1(13).08.1863 г. аб пакаранні Ц. паведаміў чытачам герцэнаўскі «Колокол» (Кісялёў Г. З думаю... — С. 24, 27; Шалькевич В.Ф. Кастусь Калиновский: страницы биографии. — Мн.: Университетское, 1988. — С. 161; Революционный подъем в Литве и Белоруссии. — С. 487).

**ЧАРАПУШКА АНТОН**, часоваабавязаны селянін м. Сідры Сакольскага павета. Знайшоў газету ў пачатку жніўня 1862 г. на двух мастах Сідржанскай плаціны (па 2 экзэмпляры на кожным месце). Два экзэмпляры перадаў пісару Гарасімовічу Макаўлянскага валаснога праўлення, якое ў той час размяшчалася ў яго хаце, адзін — селяніну мястэчка Восіпу Парчэўскаму, а чацвёрты знік. Нейкі экзэмпляр трапіў да арганіста мясцовага касцёла (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 188-188 адв.).

**ШТАРК ЯН АНТОНІЕВІЧ** (гл. таксама нарыс пра Гродзенскую рэвалюцыйную арганізацыю). Рэдактар «Гродненских губернских ведомостей», арыштаваны, на кватэры адбыўся вобыск — падазрэнне на тое, што ён друкуе «Мужыцкую праўду». Ш. казаў, што «калі быў я наглядальнікам друкарні, мелася меркаванне, што друкую бунтарскія брашуры. Усё можа быць, але для гэтага рэдактара газеты патрэбны прэсар і наборшчык, а я не майстар да гэтага механізма». На следстве паказаў, што ведае Сангіна з 1843 г. па службе ў губернскім праўленні і па суперніцтву на пасаду. У 1863 г. ізноў падазраваны ва ўдзеле ў паўстанцкай арганізацыі: быў у кантактах з цывільнымі паўстанцкім урадам Гродзенскай губерні і па яго распараджэнню раз'язджаў па ёй. Сасланы на жыхарства ў Томскую губерню пад строгі нагляд паліцыі (ЛДГА,

ф. 1248, воп. 2, спр. 1240, а. 31-35, 67 адв.-74) (Кісялёў Г. З думаю... — С. 34; Jodkowski J. Rok 1863 w powecie Grodzienskim // Echo Grodzienskie. — 1923. — № 175).

**ЯРОЦКІ АНТОН**, 62 гады, гаспадар Грандзіч. Засядацель Гродзенскага зямельнага суда Лясота данёс у паліцыю, што ў в. Грандзічы ён знайшоў у мешчаніна г. Гродна Яроцкага «Мужыцкую праўду» № 2. Газету знайшоў у жніўні 1862 г. пры ўездзе ў вёску з боку Гродна Мікалай Таўрэль. Памешчык Філарэтаў у сваім данясенні звярнуў увагу на тое, што Яроцкі апошнія часы шмат раз'язджаў па наваколлю: «Назад таму месяца два делал какие-то выборы с жителей этой деревни, как денег, так и картофель. Под предлогом будто бы для собрания каких-то бумаг потом разъезжал по деревням Царства Польского, а потому и не наводится сомнения в том, что легко могло быть и то, что письмо это разъезжало вместе с ним; причём ещё не лишним считаю упомянуть и то, что характер Яроцкого вообще: злой, беспокойный, предприимчивый, возмутительный или подстрекательный, дерзкий и неблагонадежный» (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 279, 283-285; Кісялёў Г. З думаю... С. 31; Смирнов А.Ф. «Мужыцкая праўда.» // Восстание 1863 г. и русско-польские революционные связи 60-х годов. — М.: АН СССР, 1960. — С. 50).



*Крыж каля в. Грандзічы*

**ЯСЕВІЧ АНТОН**, 19 гадоў, вучань Віленскай гімназіі. Напярэдадні паўстання распаўсюджваў «Мужыцкую праўду» ў Кушлянах, чытаў сялянам. Знаходзіўся ў атрадзе Я. Козела і ў маі 1863 г. быў захоплены «са зброяй у руках» у баі пад Уладыкамі Вілейскага павета. Сасланы ў Туркестанскія лінейныя батальёны (Кісялёў Г. Сейбіты вечнага... — С. 300).

Як бачым, сярод распаўсюджвальнікаў «Мужыцкай праўды» былі людзі рознага ўзросту: ад 19 да 62 гадоў, рознага сацыяльнага стану: служачыя, сяляне, вайскоўцы, студэнты, прафесійныя рэвалюцыянеры. Паміж імі ёсць людзі, добра вядомыя нам — Каліноўскі, Урублеўскі, але большасць мала ці зусім невядомыя

патрыёты. Яны прыкладна з чэрвеня 1862 па вясну 1863 г. распаўсюджвалі на тэрыторыі Гродзеншчыны першую беларускамоўную газету. Адзначым, што менавіта тут «Мужыцкая праўда» распаўсюджвалася найбольш шырока. Па падліках даследчыка А.Ф. Смірнова, на павет прыходзілася 50-60 экзэмпляраў газеты, на губерню — каля 600-650.

У Вільні ў 1933 г. выйшла невялічкая кніжка беларускага адраджэнца ксяндза Адама Станкевіча «Кастусь Каліноўскі. «Мужыцкая праўда» і ідэя незалежнасці» Беларусі». У фондах аднаго з гродзенскіх музеяў яна захоўваецца насуперак надпісу на тытульным лісце (які, дарэчы, аформлены пад бел-чырвона-белы сцяг): «уничтожить». Вось такое красамоўнае прызнанне важнай ролі газеты «Мужыцкая праўда» ў выхаванні самасвядомасці беларускага народа.

Ніжэй прыводзім спіс тых, хто знаходзіў газету, але мы не ведаем, ці яны распаўсюджвалі яе перад тым, як аддавалі цывільнай або вайсковай уладзе.


16

MUŽYCKAJA PRAUDA.

[illegible]

*Мужыцкая праўда*

## Асобы, якія знайшлі «Мужыцкую праўду»

| № п/п | Хто знайшоў | Месца знаходкі | Дата па н. ст. | Нумар газеты | Колькасць экзэмпляраў | Крыніца |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Геліч Місей і іншыя невядомыя | На палях в. Бярозаўка, Ясенаўка, Падбуржа, Радавічы Брэсцкага павета | 22.07.1862 | 1 | 5 | НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 173-173 адв. |
| 2 | Пахнеўскі, прыстаў 4-га стана | На вуліцы Дзятлава | 26.08.1862 | невядома | 2 | ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 223 |
| 3 | Прозвішча невядома, пастух маёнтка Пержховіч | На дарозе з маёнтка Высоцк у Люшнева Слонімска-га павета | 14.10.1862 | 3 | 2 | ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 289 |
| 4 | Таўрэль Мікалай, батрак | У статуі Св. Іаанна пры дарозе з Гродна ў в. Грандзічы | 08.1862 | 2 | 1 | ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 280-280 адв. |
| 5 | Павел Мацюк, парабак в. Тымянкі Такарскай воласці Брэсцкага павета | У гародзе вёскі селяніна Аўдзея Федарука | 10.12.1862 | 1 | 2 | ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 316 |
| 6 | Вільберг, падпалкоўнік, былы ваенны начальнік Брэст-Літоўска і ваколіц | Каля каталіцкага касцёла | 8.01.1863 | 2 | 1 | ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 329 |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 7 | Новік Ігнацы, селянін в. Парчэўцы Сакольскага павета | На шашы Кузніца-Сакулка | У першай палове ліпеня 1863 г. | 4 | 1 | НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 169, а. 144 |
| 8 | Кіпрыян, селянін в. Востраў Слонімскага павета | На паштовай дарозе ў Слонім | 19.10.1862 | Невядома | 1 | ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 331. |
| 9 | Ліхач Марцін, селянін в. Востраў Слонімскага павета | На паштовай дарозе, на Гары за 5 вёрст ад Ражаны | 19.10.1862 | 3 | 1 | ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 336 |



# УДЗЕЛЬНІКІ ПЕРАДПАЎСТАНЦКАГА (МАНІФЕСТАЦЫЙНАГА) РУХУ

21 лютага 1861 г. у Варшаве пачаўся з'езд сяброў Землеробчага таварыства. Ім было вядома пра Палажэнне ад 19 лютага, адпаведна якому адмянялася прыгоннае права ў Расійскай імперыі. Яно не закранала Каралеўства Польскае, і з'езд павінен быў выпрацаваць спосабы вырашэння сялянскага пытання на польскіх землях. 27 лютага варшаўскія рэвалюцыйныя гурткі правялі дэманстрацыю з мэтай аказання ціску на сяброў Землеробчага таварыства, якія не збіраліся адмаўляцца ад прыгонніцкіх метадаў эксплуатацыі. Дэманстрацыя закончылася паліцэйскім расстрэлам, у выніку якога 5 чалавек былі забіты, а некалькі дзясяткаў паранены[103].

Пасля гэтай падзеі па Польшчы, а затым і па Беларусі і Літве пракацілася хваля рэлігійных маніфестацый, стаўшых рэквіемам у памяць пецярых забітых у Варшаве 3(15) сакавіка 1861 г. Шэфу жандараў і начальніку III аддзялення В.А. Далгарукаву мясцовае начальства дакладывала: «И некоторые лица этих сословий (дворянство и католическое духовенство. — В.Ш.) и даже из служащих чиновников, особенно же ксендзы и дамы, выражают своё сочувствие отправлением панихид по убитым в Варшаве, пожертвованиями в пользу их семейств, отстранением себя от участия в собраниях и от сообщества с русскими, и последние, дамы, нарядами вроде траура, называемыми «гарибальдинками», по примеру носимых в Варшаве. Некоторые мужчины, также подражая варшавским, носят конфедератки из белого или фиолетового сукна с чёрными околышами»[104].

Атмасферу таго часу ў Гродне апісаў гісторык Е. Арлоўскі: «Часта чыноўнікі-палякі, седзячы за перапіскай папер на рускай мове, на пытанне, звернутае да іх па-руску, адказвалі, што не разумеюць гэтай мовы. Афіцэры ў форме, якія праходзяць па вуліцы альбо па бульвары, падвяргаліся аплёўванню; прычым ім услед чулася самая адборная лаянка. У кандытарскіх рускаму чалавеку, які не ведае польскай мовы, немагчыма было дапрасіцца кубачка кавы». Святара Сафійскага сабора айца Фаўста Кавалеўскага аплёўвалі, палякі-настаўнікі хто адкрыта, а хто патаемна вялі сярод вучняў агітацыю ў «польскім духу», настаўнікам рускага паходжання па-

103 История Польши. – М., 1955. – Т. 2. – С. 107-108.

104 Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг. – М.: Наука, 1964. – С. 432.

гражалі, «вучні ў класе тачылі вялікія паляўнічыя нажы, намякаючы даволі адкрыта, «для каго» яны рыхтуюць гэтую зброю»[105]. Урач І. Мітрапольскі, які прыехаў на службу ў Гродна, у снежні 1862 г. пісаў: «Сустракаючыся з рускім у вайсковай форме, палякі не гублялі магчымасці больш ці менш галосна сказаць: «пся крэв» і плюнуць у бок праклятага маскаля, а калі праходзілі блізка, дык і на ягоную вопратку. Гэта дастаўляла майму дзеншчыку дадатковую працу — абціраць мокрай шматай мой плашч усялякі раз, калі я вяртаўся дадому. Тое ж было і з іншымі рускімі, і ўсе неслі сваё аплёўванне пакорліва ў славу айчыны. Верагодна, у нашай пакоры было разуменне сваёй сілы, можа быць, і віны, але ўжо ніяк не слабасці»[106].

У сакавіку ў гродзенскіх касцёлах адбываюцца імшы. Пра іх значэнне напісаў у сваіх паказаннях С. Сільвястровіч: «...Жалобныя малебны па касцёлах, а больш усяго бесперапыннае співанне гімнаў, якія так доўга існавалі ва ўсіх касцёлах і прыватных дамах, падпальвалі гэтае захапленне яшчэ болей...»[107]. 9 сакавіка ў прыходскім касцёле на Кобрынскім фарштаце Брэст-Літоўскай крэпасці адбылося, відаць, адно з першых набажэнстваў. На ім прысутнічалі памешчыкі, вайскоўцы і грамадзянскія чыноўнікі[108]. 14 сакавіка шматлюдная паніхіда адбылася ў Слонімскім кляштары манахаў-бернардзінцаў пад выглядам прыватнай імшы па памёрламу сваяку Ланскога, аднаго з мясцовых памешчыкаў. За агароджай касцёла бернардзінцаў быў усталяваны намёт, у якім жанчыны прадавалі розныя рэчы «на прыбытак мясцовай багадзельні». Але, як прызнаецца гараднічы Слоніма Баранаў, даведацца, ці пайшлі менавіта туды грошы, можна толькі ў камітэце дапамогі бедным пры касцёле. Гараднічы пісаў: «У апошні час з'явілася шмат белых шапак з чырвонымі стужкамі, называемых канфедэраткамі, і нават былі бачны жупаны з пончамі, якія складалі былы польскі ўбор»[109].

28 сакавіка ў Беластоцкім касцёле адбыўся жалобны малебен, пад час якога назбіралі каля 300-400 рублёў срэбрам. Грошы пераважна давалі служачыя чыгункі, якая ў той час будавалася, і праз чыгуначніка Івана Ярацынскага яны былі адпраўлены ў Варшаву

105 Орловский Е. Граф М.Н. Муравьёв как деятель над укреплением прав русской народности в Гродненской губернии. 1831-1835 и 1863-1865 гг. – Гродна, 1898. – С. 14-15.

106 Митропольский И.А. Восстание в Гродне в 1863-1864 годах. Из воспоминания врача // Русский архив. – 1895. – № 1. – С. 131.

107 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 109.

108 Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг. // Восстание 1863 года: материалы и документы. – М.-Вроцлав: Наука, 1964. – С. 433.

109 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1241, а. 7, 7 адв.; с. 1242, а. 12, 12 адв.; Революционный подъём в Литве и Белоруссии… – С. 12.

для сем'яў забітых[110]. 4 і 5 чэрвеня ў Беластоцкім касцёле на вячэрняй службе група гімназістаў, служачыя чыгункі (сярод іх Пёнткоўскі) і некаторыя жанчыны (між іншымі Камінская, Бяліцкая і Лубава) спявалі польскі гімн. А 17 чэрвеня дзяўчына Касінская не давала сесці на лаву ў гэтым касцёле жонцы надворнага дарадцы Скрабіцкай, бо тая не была апранута ў жалобу[111].

19 чэрвеня 1861 г. у Бельскім рымска-каталіцкім касцёле адбылася паніхіда па забітых у Варшаве, а затым спявалі патрыятычны гімн «Boze cos Polske...» («Божа, што Польшчу»[112]). Дамы былі апрануты ў жалобу, адзін студэнт папрасіў афіцэра, які быў у рускім мундзіры, выйсці з касцёла. Бельскія студэнты часта збіраліся па вечарах у доме Такаржэўскага і спявалі патрыятычныя песні[113].


*граф Валіцкі, уладальнік Азёраў*

У дакуменце, які выйшаў з канцылярыі ваеннага губернатара г. Гродна і гродзенскага грамадзянскага губернатара, гаварылася: «...с приездом в Гродно помещицы Валицкой началось здесь пение возмутительных гимнов...». Валіцкая Леакадзія разам з дачкой была выслана з Вільні ў м. Азёры ў маі 1861 г. «за неприличные поступки» пад строгі паліцэйскі нагляд. Але па просьбе Валіцкай віленскі ваенны губернатар і генерал-губернатар гродзенскі і ковенскі 1 ліпеня дазволіў ім жыць у Гродне. 1 верасня гродзенскі павятовы спраўнік узяў падпіску з Валіцкай, што яна не будзе пакідаць Азёраў. Падпіску яна дала, але растлумачыла яму, што маёнтак належыць не ёй, а Леапольду Валіцкаму, а таму знаходзіцца ёй там немагчыма. Пасля чаго, відаць, і была прынята пад увагу тая папера, якая дазваляла ёй жыць у Гродне. У студзені 1862 г. ёй дазволілі выехаць на два месяцы да дачкі ў Нова-Аляксандраўскі павет Ковенскай губерні. У красавіку яна вярнулася ў Гродна і пасялілася на вул. Замкавай, у доме яўрэя Собаля. 22 мая Валіцкая, відаць, без дазволу выехала ў забароненую для яе Вільню[114].

110 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1241, а. 8 адв.; с. 1242, а. 1 адв.

111 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1241, а. 21, 34.

112 Гімн напісаны ў 1816 г. А. Фелінскім з нагоды абвяшчэння Каралеўства Польскага. Тэкст, які спявалі ў 1860-х гг., меў нацыянальны і патрыятычны змест: прасілі Бога быць апекуном тых, хто ваюе за свабоду Польшчы супраць прыгнятальніка, які праліў за даволі малы час прыгнёту шмат крыві. Прасілі Бога, каб паўшыя ахвяры далі магчымасць жывым адчыніць браму вольнасці. У тэксце на беларускай мове гаварылася пра сумесную барацьбу Літвы з Польшчай за вольнасць, вяртанне царкоўнай уніі, адраджэнне Рэчы Паспалітай абодвух народаў.

113 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1241, а. 38.

114 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 256–257 адв.; ф. 1, воп. 22, с. 1143, а. 1, 6, 10-10 адв., 18, 20, 22.

23 чэрвеня ў рымска-каталіцкім Фарным касцёле Гродна ўпершыню спявалі патрыятычны гімн «Boze, cos Polske», а на другі дзень тое ж было паўторана ў Пабернардзінскім прыходскім касцёле. 25 чэрвеня ў апошнім адбыліся спевы пад час урачыстага святкавання Св. Антонія[115]. Гродзенцы збіралі грошы на помнік пяці забітым у Варшаве. Так, напрыклад, гаспадар маёнтка Гожа Станіслаў Сільвястровіч сабраў каля 80 рублёў і перадаў іх чальцу патаемнай Гродзенскай ваяводскай арганізацыі Э. Заблоцкаму[116]. Гродзенскі вольна практыкуючы ўрач Цэлясцін Цэханоўскі, таксама дзеяч падполля, быў заўважаны ў Дамініканскім касцёле за зборам грошай[117]. У Гродне хадзілі чуткі, што з Варшавы прывезлі кашулю малога дзіцяткі, якая была выпацкана крывёй забітага рускімі войскамі ў Варшаве[118].

30 чэрвеня ў касцёле мястэчка Камянецк-Літоўск жанчыны-памешчыцы спявалі польскія гімны пад акампанемент адной з іх на аргане. Спевы паўтарыліся 4 і 7 ліпеня 1861 г. Спявалі патрыятычныя гімны 9 ліпеня ў Сакольскім і 11 ліпеня ў Брэсцкім касцёлах[119].

4 ліпеня 1861 г. у свята Божага Цела ў Фарным касцёле вялікая колькасць веруючых спявала «Божа, што Польшчу...»[120].

Вечарам 10 ліпеня ў Беластоцкі касцёл прыбыла працэсія (да 100 чалавек) з м. Супрасль на чале з ксяндзом з Васількава. У 5 гадзін раніцы наступнага дня разам з беластоцкай працэсіяй яны пайшлі ў Заблудаў, спяваючы песні. Жыхары Беластока вярнуліся назад у 22 гадзіны таго самага дня і, праходзячы праз горад, спявалі забароненыя гімны[121].

20 ліпеня з Беластоцкага рымска-каталіцкага касцёла працэсія накіравалася ў м. Тыкоцін Каралеўства Польскага. Ішлі з мясцовымі святарамі, з харугвамі і абразамі і пелі забаронены гімн. Гараднічы даносіў, што быў пабіты дваранін Іосіф Лесюкевіч, якога лічылі «рускім шпіёнам». 23 ліпеня, у дзень ад'езда гродзенскага губернатара з Беластока, у 20 гадзін група народу сабралася

115 Революционный подъём в Литве и Белоруссии... – С. 34.

116 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 17 адв.

117 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 109 адв., 256; воп. 1, с. 40, а. 28 адв.

118 Гл.: Радзюк А. Гарадзенскі супраціў 1861 г. // Гарадзенскі соцыўм. 2013. Гісторыя і памяць. XV-XX стст.; пад рэд. А.К. Краўцэвіча, А.Ф. Смалянчука. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 121.

119 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1241, а. 62-62 адв.

120 Komar J. Grodzienskie manifestacji przed powstaniem Styczniowym // Przegliod Historyczny. 51. - 1960 – S. 100.

121 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1241, а. 55-55 адв.

каля зачыненага касцёла, хутка праспявала патрыятычны гімн і разбеглася ў розныя бакі. У адным са сваіх рапартаў беластоцкі гараднічы назваў прозвішчы некаторых спевакоў: калежскі асэсар Длужнеўскі, настаўнік гімназіі Граўерт, выкладчык музыкі Тачыскі, аптэкар Гансецкі, старая дзяўчына Вольская, дзяўчына Вінская, дваранка Касінская, жонка тытулярнага дарадцы Хухлінская[122].

21 ліпеня 1861 г. у доме жыхара Гродна прускага падданага Каспера Шнэлла Зубраўскі граў на фартэпіяне, а два пастаяльцы Праневіч і Зайцаў, сям'я Шнэлла спявалі «Божа. Што Польшчу...»[123].

26 ліпеня 1861 г. Прасолаў даносіў пра патрыятычныя спевы ў Слоніме, Кобрыне, Брэсце, Бельску, Беластоку, Саколцы і некаторых мястэчках. Ён пісаў, што «главными участниками пения бывают дамы дворянского и женщины среднего сословия, носящие траурное платье, и некоторые из молодых обывателей, воспитанников учебных заведений и служащих гражданских чиновников... Дерзость и подозрительность некоторых лиц доходит до того, что они заставляют русских и не принимающих участия в пении выходить из костёлов и процессий и кропят серной кислотой платья дам, не носящих траура. Такое направление умов, такие «мирные», как их называют, манифестации, к сожалению, не прекращаются, несмотря на предостережение и уговаривание благоразумных людей и местных властей, а делаются чаще и открытее и увлекают более и более народа: граждан, мещан и однодворцев, даже крестьян»[124].

1 жніўня пасля 20 гадзін у агароджы Беластоцкага касцёла сабралася прыкладна 400 чалавек, якія спявалі не толькі рэлігійныя песні, але і забаронены патрыятычны гімн. Гараднічы, папярэджаны ксяндзом, выклікаў загаддзя сотню данскіх казакоў, з дапамогай якіх хацеў перапісаць усіх сабраўшыхся. Апошнія спрабавалі пераканаць гараднічага, ксёндз Сідаровіч заявіў, што пра прымус «уся Еўропа будзе апавешчана і паведамлена газеце «Колокол». На плошчы за казакамі сталі збірацца людзі. Сакратар думы Плюта прарваўся ў агароджу і падбухторваў натоўп трымацца. У выніку прыйшлося выпусціць людзей без запісу, але некаторых гараднічы пазнаў: Касінская з дачкой, выхаванкі Пецярбургскага Смольнага манастыра дзве дзяўчыны Лянчэўскія, дзве дачкі Плюта, дачка настаўніка Кулешы, удава Пянькоўская, дваранін Каралеўства Польскага Астафінскі, дваранка Хмялеўская, мяшчанка Асвяцінская,

122 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1241, а. 56, 73 адв., 76-76 адв., 81 адв.

123 Komar J. Grodzienskie manifestacji… – S. 101.

124 Революционный подъём в Литве и Белоруссии.. – С. 438.

жонка ўнтэр-афіцэра Бельскай інваліднай каманды з дзвюма дачкамі, ксяндзы Табенскі і Сідаровіч. У наступных спевах у касцёле 12 жніўня былі заўважаны: вясковы засядацель губернскі сакратар Грэгатоўскі, пісар Беластоцкага акруговага ўпраўлення губернскі сакратар Снарскі, настаўнік музыкі ў Беластоцкім шляхетным інстытуце Маеўскі, адстаўныя вайскоўцы Хржаноўскі, Паплаўскі, Вайткоўскі, Плюта. Спявалі ў касцёле 20-23 і 25 жніўня[125].

Часта ажыццяўляліся з Беластоцкага касцёла або ў касцёл працэсіі з суседніх касцёлаў — Заблудава, Дабржынёва, Васількава, Супрасля, Тыкоціна са спяваннем гімна. Беластоцкаму гараднічаму Шчыроўскаму падкінулі на лесвіцу яго кватэры ліст, у якім прапаноўвалі не палохаць людзей «строгімі мерамі» і «памятаць, што калі ў гэты час у каго-небудзь упадзе волас з галавы праз вас, дык вы сваю галаву пакладзеце»[126].

Вечарам 5 жніўня ў вярсце за Гродна адбылася маніфестацыя, на якую сабралося больш за 1000 чалавек. Чакалі паручніка Вольскага, які, будучы афіцэрам Пскоўскага пяхотнага палка, прыняў удзел у працэсіі з Беластока ў м. Навадніцы і спяванні патрыятычных песен. Яго сустрэлі воклічамі: «Ура!», «Яшчэ Польшча не памерла!», далі грошай і пад аховай жандараў павезлі ў Тамбоў. Натоўп пайшоў на могілкі і спяваў там забароненыя песні. На наступны дзень паўтарылі спевы на могілках[127].

6 жніўня кобрынскі земскі спраўнік даносіў гродзенскаму губернатару, што ў каталіцкіх касцёлах Кобрынскага павета адбываліся паніхіды па забітых у Варшаве, але грошы не збіралі[128].

10 жніўня 1861 г. у Гродзенскім фарным касцёле былі заўважаны ў спевах польскага гімна «Boze cos Polske...» чыноўнікі Віктар-Леў Севярынавіч Лебель, Хаецкі і Трускуляўскія. Лебель быў служачым канцылярыі Гродзенскага губернскага праўлення, пад час спеваў пагражаў прыватнаму прыставу Уратноўскаму, а на прапанову гродзенскага паліцмайстра падпалкоўніка Змеева адправіцца з ім да губернатара заявіў, што зробіць гэта тады, калі сам палічыць гэта неабходным. У гэты час людзі, якія выйшлі з касцёла, крычалі, што яны ўсе разам пойдуць да губернатара. Апошні выклікаў Лебеля да сябе, але той спаслаўся на сваю хваробу і не пайшоў. Лебеля прывёў да губернатара экзэкутар. На пытанні Лебель адказваў па-польску «дерзко и невежливо и объявил, что он не только

125 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1241, а. 94-96, 120 адв., 236, 237.

126 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1241, а. 156.

127 Революционный подъём в Литве и Белоруссии.. – С. 443.

128 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1242, а. 18.

не грозил пальцем, но даже и не пел...», што будзе скардзіцца генерал-губернатару. Яго звольнілі з дзяржаўнай службы, арыштавалі і пасадзілі на гродзенскую гаўптвахту. У 19 гадзін каля дома губернатара сабралося каля 300 чалавек, якія паспрабавалі вызваліць Лебеля, але дзве роты Гродзенскага гарнізоннага батальёна і конныя жандары перашкодзілі ім. Прыйшлося Лебелю прабыць на гаўптвахце да 12 верасня. Раніцай 11 жніўня на сценах з'явіліся 2 запіскі: у адной гаварылася пра тыранства з боку ўрада, які смокча польскую кроў і ад якога трэба вызваліцца; у другой — пра тое, што жанчыны павінны падтрымліваць энергію сваіх мужоў, не журыцца, а старацца вызваліць арыштаванага. Генерал-губернатар Назімаў 12.09.1861 г. дазволіў вызваліць Лебеля з-пад арышта.

Хаецкі служыў у губернскім будаўнічым камітэце. Адзін з Трускуляўскіх служыў у земскім судзе, другі — у павятовага правадыра дваранства. Сярод спевакоў у Фарным касцёле былі заўважаны чыноўнікі грамадзянскай палаты Камінскі і Белакоз, з магістрата — Календа, з губернскага праўлення — Трабша[129].

11 жніўня 1861 г. брэсцкі гараднічы даносіў губернатару, што мясцовыя і з павета памешчыкі і дваране «начали в отношении одежды подражать жителям Царства Польского — одеваются в польские чамарки, носят под оными большие камзолы с рукавами в роде бывших польских жупанов и по верху стягиваются широкими поясами из лакированной кожи, а женщины носят особые шляпки, называемые в Царстве Польском «гарибальдинки», ссылаясь, что это по журналу, разрешённому цензурой»[130].

12 жніўня ва ўрочышчы Ласосна пад Гродна сабралося шмат людзей для таго, каб адзначыць Дзень аб'яднання Літвы і Польшчы. С. Славуцінскі ўзгадваў, што дэманстранты з жонкамі і дзецьмі хадзілі да губернатарскага дому, дзе «моцна шумелі і буянілі. Пачаўшы з патрыятычнага гімна, хутка перайшлі да лаянкі супраць губернатара і расійскай улады». У Фарным касцёле адбылося набажэнства, на якім прысутнічала каля 200 чалавек (з 74 выяўленых 61 — чыноўнікі)[131].

129 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 4, а. 1162, а. 7-8 адв., 18, 20, 21; Гостев А. П., Швед В.В. Кронан. Летопись города на Немане (1116-1990). – Гродна: БФК, Гродненское отделение, 1993. – С. 179, 265, 268; Лисицын В.М. За тюремной стеной: История Гродненской тюрьмы (XX век – 1939 г.); науч. ред. Д.В. Карев. – Гродно: ГОУПП "Грод. тип.", 2003. – С. 143; Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг… – С. 445; Komar J. Grodzienskie manifestacje przed powstaniem styczniowym // Przegliod Historyczny. – Т. 51. – 1960. – S. 102.

130 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1173, а. 1-3 адв.

131 Славутинский С. Город Гродно и Гродненская губерния во время последнего польского мятежа (отрывок из воспоминаний) // Исторический вестник. – Т. XXXVII. – 1889. – С. 66; Komar J…. – S. 103.

Тое самае адбылося ў гэты самы дзень у касцёле Брэст-Літоўска, дзе спявалі забаронены гімн вернікі з горада і павета. 12 жніўня святкавалі (каля 71 чалавека) у Беластоку, жанчыны з'явіліся ў касцёл у святочных, каляровых сукенках, зала была ўпрыгожана харугвамі, на алтары запалены ўсе свечы, спявалі некалькі разоў гімн.

Шматлюднае свята адбылося 12 жніўня ў Друскеніках. Касцёл быў упрыгожаны кветкамі і дрэвамі, жанчыны апранулі каляровыя бальныя сукенкі, мелі ў галаўных уборах міртавыя галінкі, а мужчыны паклалі такія галінкі ў пятліцы фракаў. Віленскі дэкан ксёндз Венцэслаў Гундзіўс вымавіў супрацьурадавае казанне («пра фальшывых прарокаў і вялікай жатве, а працаўнікоў мала»). Апоўдні ў зале рэсурса (значыць тацавальнай) адбыўся канцэрт віяланчэліста Самуіла Касоўскага, пасля розныя забавы, пачастунак для дам і мужчын асобна, прысутныя спявалі гімн і крычалі «Няхай жыве Польшча!». Дамы вышэйшага свету гулялі з сялянамі пад ручку і запэўнівалі іх, што Польшча ўваскрэсла, а разам з ёю і «вольнасць, роўнасць і поўны дастатак»[132].

13 жніўня віцэ-губернатар Ражноў пісаў гродзенскаму губернатару Шпееру: «Спевы гімнаў зрабіліся ўжо амаль агульнымі, ёсць ужо і ноты для іх, іх спяваюць і ў касцёлах, і ў дамах living рознага саслоўя людзі, і нават пад час палявых працаў. Гэта ўзята простымі людзьмі, вядома, у касцёлах і перайшло ўжо ў іх амаль што не ў звычку»[133].

14 жніўня 1861 г. чалец Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі Ц.М. Цэханоўскі спяваў гімны ў Дамініканскім касцёле (ужо другі раз). Патрыятычныя песні спявалі таксама ў Францішканскім і Бернардзінскім (каля 200 чалавек) касцёлах Гродна[134].

За спяванне польскіх патрыятычных песен выслалі з Беластока памешчыцу Вікторыю Касінскую з дачкой Соф'яй. Месцам жыхарства вызначылі радавы маёнтак Грыгароўцы Бельскага павета, але яна прасіла выдаць ёй пашпарт на выезд у Жытомір Валынскай губерні, дзе жыла дачка Стэфанія, у якой хутка павінен быў адбыцца шлюб. 19 жніўня 1861 г. пашпарт на праезд быў уручаны, а 25 жніўня Касінская пакінула Беласток. У Жытоміры яна прыняла ўдзел у дэманстрацыях і па загаду Валынскага губернатара павінна была быць выселена з дзвюма дачкамі ў Грыгароўцы пад нагляд паліцыі.

---

132 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1241, а. 168, 187, 247 адв.-249 адв., 311-312 адв., 324-324 адв.; Славутинский С. Город Гродно и Гродненская губерния во время последнего польского мятежа… – С. 66.

133 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1241, а. 244.

134 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 256.

Яшчэ ў студзені 1862 г. Касінская па стану здароўя знаходзілася ў Жытоміры[135].

18 жніўня 1861 г. пасля службы ў Гродзенскім фарным касцёле веруючыя накіраваліся ў Бернардзінскі касцёл, дзе павінна было адбыцца свята. Некалькі чалавек прынеслі з сабой 4 дрэўкі для харугваў, на якіх  былі размешчаны сцягі: 3 белыя з чорнай аблямоўкай з лентаў, чорнай какарды і выявай у сярэдзіне чорнага крыжа; адзін быў трохпалосны — чырвоны, блакітны і белы з выявай Маці Божай і Выратавальніка. Вечарам сцягі былі асвечаны. Пасля заканчэння службы, калі пачалося памінанне імператарскай сям'і, веруючыя пакінулі касцёл[136].

21 жніўня міністр унутраных спраў паведаміў гродзенскаму губернатару Шпееру пра стварэнне часовых паліцэйскіх судоў «по случаю возникших в последнее время в некоторых западных губерниях в разных видах политических манифестаций». Гэтым судам прапанавана «вменить в обязанность не затрудняться излишними формальностями по сему предмету, так как доказательства одежды служат достаточным фактом обвинения».

25 жніўня 1861 г. ксёндз дэкан гродзенскага Фарнага касцёла Ю. Маеўскі абвясціў з амбона аб працэсіі ў Ружаны Сток, якая адбудзецца заўтра ў 15 гадзін. Да гэтага запрашаў і Ц. Цэханоўскі, будучы рэвалюцыйны начальнік Гродна[137]. Маеўскі накіраваў паліцмайстру ліст з просьбай не перашкаджаць працэсіі, якая будзе дэманстрацыяй узаемнага паміж людзьмі адзінства і братэрства, перадаў тэкст свайго выступу з амбона губернатару. Генерал-губернатар Назімаў тэлеграфаваў гродзенскаму губернатару Шпееру меры, якія трэба прыняць, каб не дапусціць працэсіі: зачыніць касцёл, паставіць варты каля ўвахода, на плошчу вывесці батальён пяхоты і казакоў, развесці мост і паставіць каля яго гарнізонны батальён, дзёрзкіх арыштоўваць. Усё было зроблена, акрамя таго, што касцёл не змаглі зачыніць, бо там было шмат народу. Паліцмайстар Змееў не рашыўся арыштаваць Маеўскага.

26 жніўня з 16 да 17,5 гадзін адбывалася вячэрня. У заканчэнні яе Маеўскі паведаміў веруючым, што біскуп супраць любых працэсій, але сам ён не можа ні ўзбуджаць супраць уладаў, ні адгаворваць ад прынясення Богу належнага, «кожны павінен вырашыць для сябе сам, але памятаць, што нельга выкарыстоўваць сілу і прымус».  Пасля службы выйшла працэсія на чале з дэканам і 4 свята-

135 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1168, а. 1, 3, 7, 9, 12.

136 Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг… – С. 454.

137 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 29.

рамі і рушыла да Нёмана. Тут іх сустрэлі вайскоўцы на чале з генералам Галтгоерам, камандуючым 3-й дывізіяй пяхоты і губернатар. Апошнія пераканалі ўдзельнікаў вярнуцца, бо падобныя працэсіі забаронены. Па закліку Маеўскага ўсе вярнуліся на плошчу, дзе былі акружаны войскам. Там губернатар ізноў упрошваў людзей разысціся, яны ўсталі на калені, праспявалі літанію, незабаронены гімн Багародзіцы. Дэкан сказаў, што працэсію ўлады не дазволілі, і ўсе пайшлі ў касцёл, дзе зноў праспявалі літанію і забаронены гімн, пасля чаго спакойна разышліся па хатах[138]. А.Ф. Смірноў пісаў, што апісаная маніфестацыя выклікала спрэчкі паміж царскімі саноўнікамі, адстаўку гродзенскага губернатара, узмацніла непаразуменні паміж генерал-губернатарам Назімавым і міністрам унутраных спраў Валуевым[139].

Гродзенская працэсія павінна была сустрэцца з падобнай з Каралеўства Польскага. Сакольскі земскі спраўнік дакладваў Шпееру, што ў Ружаны Сток 26 жніўня прыбылі з Аўгустоўскага павета той самай губерні, з прыходу Тэалін, каля 150 чалавек на чале з ксяндзамі Дзяконскім і Будоўскім, 27 жніўня ў 7 гадзін раніцы падышлі каля 100 чалавек на чале з вікарным святаром Яўміцам з Карыцына Сакольскага павета. За імі прыйшлі каля 400 чалавек з горада Аўгустава, Штабіна і прыходаў па дарозе пры ксяндзах Мышкоўскім і Залескім. Спраўнік пісаў, што свята Успення Прасвятой Багародзіцы адбываецца штогод. Людзі паводзілі сябе спакойна, маліліся, праўда, адспявалі патрыятычныя гімны, а каля 19 гадзін, акрамя мясцовых, усе разышліся па сваіх мясцовасцях[140].

27 жніўня гродзенскі паліцмайстар У. Змееў абвясціў аб забароне спеваў польскіх патрыятычных гімнаў і маніфестацый і арганізацыі на заставах вайсковых караўлаў. 3 верасня Гродзенская губерня была абвешчана на ваенным становішчы. Але, нягледзячы на гэта, у Гродне распаўсюджваюцца ўлёткі: 30 кастрычніка знойдзена пракламацыя «Российским воинам», у якой тлумачылася, што без вольнасці Польшчы не будзе свабоднай Расія.

3.09.1861 г. віленскі вайсковы і генерал-губернатар гродзенскі і ковенскі пісаў гродзенскаму губернатару: «Усматривая из поступающих ко мне донесений, что дворяне и помещики, кроме траурного одеяния, начали носить с некоторого времени костюмы отличительные, как то: конфедератки, гарибальдийские шляпы, польские чемарки, жупаны, серые крестьянские кафтаны, с поя-

138 Komar J… – S. 107-110.

139 Смирнов А.Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. – М.: Изд-во АН СССР, 1963. – С. 359.

140 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1174, а. 4, 9, 13, 13 адв., 23.

сами из лакированной кожи и другими металлическими приборами, по-видимому условными, я счёл нужным покорнейше просить Ваше Превосходительство сделать распоряжение о поступлении с такими лицами на основании Указа Правительствующего Сената от 9 сего Августа, т.е. объявить всем ныне же о воспрещении подобных костюмов и после того немедленно передавать ослушников расправе полицейских судов, в тех самых одеждах, в которых они будут задержаны»[141].

21 верасня 1861 г. Браніслаў Якаўлевіч Сяўрук даносіў на паверанага падрадчыка на будоўлі чыгункі эмігранта Куроўскага. Ён пісаў, што на чыгунцы працуе шмат людзей без пашпартоў, магчыма, збегшых ад пераследу з Варшавы, маюць апеку з боку кіраўніцтва, вольна ездзяць у Варшаву і адтуль прывозяць, а потым распаўсюджваюць сярод рабочых друкаваныя і пісаныя ад рукі рэвалюцыйныя песні. Сяўрук пісаў, што Куроўскі казаў яму ўзяць падначаленых працаўнікоў і напасці на горад Беласток. Калі асэсар Гродзенскага губернскага праўлення Савашынскі даследаваў гэтую справу, дык ад усіх дапытваемых чуў, што Сяўрук — п'яніца і што ўсё сказанае ім няпраўда. На думку Савашынскага, паказанні Сяўрука «не заслугоўваюць ніякай ... увагі»[142]. На наш погляд, частка сказанага даносчыкам была праўдзівай — сярод чыгуначнікаў было шмат эмігрантаў, і яны былі актыўнымі ў грамадска-палітычных мерапрыемствах напярэдадні паўстання.

23 верасня ў Бернардзінскім касцёле Гродна адбылася жалобная імша па ахвярах віленскай крывавай дэманстрацыі 18.09.1861 г. А 24 верасня імша прайшла ў Фарным касцёле[143].

29 верасня 1861 г. спявалі недазволены гімн у Слонімскім касцёле. Мясцовы гараднічы не змог знайсці ўдзельнікаў спеваў, бо, па яго словах, гэта маглі быць «прыбыўшыя з павета і не ведаўшыя яшчэ ўсіх распараджэнняў урада і начальства»[144].

1 кастрычніка 1861 г. віленскі ваенны губернатар і генерал-губернатар гродзенскі і ковенскі даслаў начальніку Гродзенскай губерні цікавае распараджэнне: пазбавіць усіх жанчын, якія прымаюць удзел у «палітычным руху, спяваюць абуральны гімн, а таксама апранаюць жалобную і іншую ўмоўную вопратку, удзельнічаюць у працэсіях і іншых маніфестацыях» правоў на ўтрыманне ад урада (пенсіі за службу мужоў, дапамога ад імператара ці камітэта па-

141 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1166, а. 7-7 адв.
142 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1134, а. 7-12.
143 Komar J. … – S. 104.
144 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1111, а. 70-70 адв.

раненых, прыватных дабрачынных устаноў), навучальных устаноў за прыватную іх службу, пазбавіць іх бясплатнага жыхарства ў казённых і гарадскіх будынках. Спіс па Беластоку (гл. у дадатку), які захаваўся ў архіве, утрымлівае прозвішчы 99 жанчын, з якіх названымі правамі карысталіся 8[145].

У пачатку кастрычніка 1861 г. збег у Парыж прымаўшы ўдзел у дэманстрацыях сын памешчыка Кобрынскага павета Адам Віченцьевіч Радавіцкі. Ён збег, пакінуўшы жонку і дзяцей. Вярнуўся дадому ў маі 1862 г. і даў падпіску больш нікуды не адлучацца[146].

9 кастрычніка 1861 г. у гродзенскім Бернардзінскім касцёле ксяндзы Залеўскі, Баневіч, Гецэвіч правялі жалобнае набажэнства за душу варшаўскага мітрапаліта Фіялкоўскага. Пасля прысутныя спявалі «Boze, cos Polske» і «Serdeczna Matko»[147].

14 кастрычніка 1861 г. Лебель, Хаецкі і абодва Трускуляўскія, пра якіх мы гаварылі раней, ізноў спявалі польскі гімн у Фарным касцёле. Хаецкі быў звольнены са службы[148]. У гэты самы дзень Ц. Цэханоўскі ўдзельнічаў у «провадах» былога гродзенскага губернатара Шпеера ў садзе каля карчмы Урбанаўка на Віленскай дарозе. Натоўп колькасцю каля 150 чалавек хацеў выказаць Шпееру свае дрэнныя да яго адносіны за адмоўныя дзеянні пад час кіравання губерняй, а таксама патрабаваць адстаўкі гродзенскага паліцмайстра Змеева. Былі падрыхтаваны «інструменты для вырабу кашачай музыкі». Начальнік 3-й дывізіі генерал-лейтэнант Гальтгоер спрабаваў угаварыць народ і атрымаў слова, што ўсё будзе спакойна. Але калі паказаўся экіпаж губернатара, вольнанаёмны пісар прыватнага прыстава Пётр Петрашкевіч і акцёр Цытус Бурбекль кінуліся на яго, пачалі крычаць, кідалі пясок і камяні. Дарэмна, бо ў гэтым экіпажы ехаў паліцэйскі служачы, а Шпеер праехаў іншай дарогай. Быў заўважаны ў натоўпе і былы чыноўнік канцылярыі Гродзенскага губернскага праўлення (звольнены за ўдзел у гродзенскай дэманстрацыі 10.08) Іван Канстанцінавіч Дзітрых. Петрашкевіч і Бурбекель трапілі ў гродзенскую гаўптвахту і адсядзелі там 9 месяцаў[149].

14 кастрычніка каля 19 гадзін было выбіта шкло ў вокнах кватэр гродзенскага віцэ-губернатара Ражнова, земскага спраўніка Магнуса і інспектара гімназіі Макса (ён падаў у адстаўку). Спіс

145 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1110, а. 1, 1 адв., 8-11.

146 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1163, а. 5, 12.

147 Komar J. … – S. 114.

148 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1162, а. 27.

149 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 256 адв.; ф. 1, воп. 22, с. 1177, а. 15 адв.; Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг. … – С. 456-457; Komar J. … – S. 115.

удзельнікаў акцый складаўся з 20 падазроных чалавек, але доказаў не было, і таму іх адпусцілі[150].

19 кастрычніка ў Брыгіцкім касцёле, 20 — у Дамініканскім, а 21 кастрычніка — у Фарным касцёле гімназісты спявалі забаронены гімн. На наступны дзень дырэктар вучылішча ўгаворваў іх, гімназісты паабяцалі ўстрымацца пры ўмове, што з іх сябрам, пра якога дырэктар данёс папячыцелю, нічога не здарыцца. 21 кастрычніка гімназісты 5-га класа сустрэлі часова прызначанага на пасаду інспектара гімназіі старшага выкладчыка Рахманіна воклікамі «Прэч, прэч з класа, мы хочам інспектарам гімназіі Гінтаўта». А вучні 6-га класа сказалі Рахманіну, што пойдуць на ўрок, калі ім захочацца, а настаўніку гісторыі аб'явілі, што не падрыхтаваліся. Дырэктар з усяго гэтага захварэў. 21-22 кастрычніка 1861 г. савет гімназіі пастанавіў выключыць найбольш вінаватых гімназістаў 6-га класа Ражбіцкага і Людаміра дэ Ромера і перадаць іх грамадзянскай уладзе. Першы быў сасланы ў Пружаны да бацькі, другі — у бацькоўскі маёнтак Астравок Сакольскага павета. Усім гімназістам забаранілі хадзіць у гарадскія касцёлы, а ў свой касцёл ім можна было хадзіць толькі з наглядальнікам. Таксама ім загадалі знаходзіцца на сваёй кватэры пасля 18 гадзін пад кантролем выкладчыкаў[151]. Даследчык А.І. Мілавідаў меў падставу напісаць у сваім творы: «Дзеці свайго часу і народа, кіраўнікі і вучні, былі прасякнуты тымі самымі палітычнымі ілюзіямі, якія панавалі ў грамадстве, таксама ненавідзелі ўсё рускае, імкнуліся бачыць увесь край польскім, з пануючай польскай мовай, каталіцтвам і польскай школай»[152].

22 кастрычніка 1861 г. у касцёле мястэчка Азёры Гродзенскага павета пад час святкавання свята Ружанцовага служачыя чыгункі спявалі гімн. Па словах земскага спраўніка, яны тут былі праездам і пасля службы выйшлі з касцёла і адправіліся далей у Віленскую губерню[153].

27 кастрычніка 1861 г. у Бельскім каталіцкім касцёле па заканчэнні літургіі памешчыца Бельскага павета Тэрэзія Дашкевіч, а таксама дама, 2 дзяўчыны, 4 мужчын спявалі забаронены гімн. У гэты дзень у Дашкевіч быў дзень нараджэння, і яна запрасіла ў свой Арлянскі двор гасцей, сярод якіх былі пляменнік Конрад

150 Komar J. … – S. 115.

151 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1135, а. 3, 4 адв., 8-9 адв., 11-11 адв.

152 Миловидов А.И. Участие молодёжи Северо-Западного края в мятеже 1863 г. и вызванная им реформа местных учебных заведений (по архивным материалам). – Вильна, 1904. – С. 13.

153 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1111, а. 40-40 адв.

Дашкевіч, крынскі акруговы начальнік у Гродзенскім павеце, Міхаіл Жукоўскі, пружанскі павятовы начальнік, Напалеон Алдакоўскі, беластоцкі павятовы начальнік у Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі. Дашкевіч загадам гродзенскага губернатара ад 29.11.1861 г. была наказана экзэкуцыйным пастоем — у яе двары ў м. Орля размеркавалі на пастой 40 казакоў «на полном узаконенном продовольствии и фураже на исключительный счёт Госпожи Дашкевич...». Пастой быў спынены 8 снежня 1861 г. Часовы паліцэйскі суд пры Гродзенскім павятовым судзе прысудзіў яе да штрафу ў 150 рублёў срэбрам, дзяўчын Міхалоўскую і Гяйбовіч — па 10 рублёў, сыноў Міхалоўскага і жыхара Каралеўства Польскага Здзітавецкага — па 20 рублёў і арышту на тры дні[154].

6 лістапада 1861 г. у Фарным касцёле Гродна Хаецкі, Маркевіч, Матусевіч спявалі «Sedrczna Matko».

20 лістапада ў касцёле Брэст-Літоўска адбыўся шлюб міравога пасярэдніка, памешчыка, адстаўнога штабс-ротмістра Гераклія Дамброўскага, які апрануў польскі кунтуш з лакіраваным пасам і металічнымі знакамі (упрыгожваннямі). Ён зрабіў гэта наўмысна, напярэдадні ў праваслаўнай царкве пад час шлюбу ён быў апрануты ў гусарскі мундзір. 11 снежня 1861 г. Часовы паліцэйскі суд прыгаварыў Дамброўскага, «замеченного публично в одежде отличительного покроя от общеупотребляемого людьми его звания и состояния...», да трохдзённага арышту і штрафу ў 15 рублёў. Генерал-губернатар Назімаў патрабаваў ад гродзенскага губернатара звольніць Дамброўскага з пасады міравога пасярэдніка, але потым усё ж пагадзіўся пакінуць яго на пасадзе. Апеляцыйны паліцэйскі суд наогул прызнаў Дамброўскага невінаватым і зняў з яго пакаранні[155].

25 снежня 1861 г. часоваабавязаныя сяляне маёнтка Турасль-Дольная Беластоцкага павета графіні Патоцкай Янка Гула і Казімір Аніська знайшлі ў вёсцы «Гутарку двух суседзяў» (на беларускай мове) і лісток з рэлігійнай патрыятычнай песняй «Boze, cos Polska...». Некалькі дзён таму пастух Іван Шчыгель знайшоў кніжку «Zbior piesni za Ojczyzne»[156].

6 студзеня 1862 г. у гродзенскім Францішканскім касцёле ў спяванні польскіх патрыятычных песен заўважаны Ігнацій Пранцкевіч і сёстры Адамовічы. У першага пад час вобыску знайшлі верш на польскай мове пад назвай «З дымам пажа-

154 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1165, а. 5 адв., 14, 25 адв., 33 адв.

155 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1166, а. 4-5 адв., 11, 12, 21, 57, 59 адв.

156 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1140, а. 1, 1 адв., 5, 12, 25 адв.

раў». Пранцкевіч быў арыштаваны і пасаджаны ў Гродзенскі турэмны замак[157].

18 сакавіка 1862 г. цырульнік з 3-й пяхотнай дывізіі, якая размяркоўвалася ў Гродне, Кірыл Емяльянаў пасля наведвання Фарнага касцёла знайшоў у бакавым кішэні шынэлі пракламацыю «Что надо делать войску?». У казарме ён аддаў яе старшаму фельдфебелю, а той — ваеннаму начальніку палкоўніку А.А. Чартову. Падобны заклік шырока распаўсюджваўся па Гродзенскай губерні — у палках, якія знаходзіліся ў Беластоку, Бельску, Сакольскім і Слонімскім паветах[158]. У названай пракламацыі, напісанай у Лондане летам 1861 г. М. Агаровым пры ўдзеле М. Обручава, гаварылася, што войска не павінна ісці супраць народа: «Выратаваць Расію ад крывавай напасці, не перашкаджаць народу спакойна атрымаць зямлю і волю, гэта значыць цвёрда і мірна стаяць, нічога не рабіць і не ісці супраць народу»[159].

З чэрвеня распаўсюджваецца беларускамоўная газета «Мужыцкая праўда», пра якую ў кнізе асобны нарыс.

21.04 (3.05)1862 г. беластоцкія гімназісты пайшлі ў касцёл слухаць замоўленую імі імшу, некаторыя трымалі харугвы. Савет гімназіі выключыў асабліва актыўных з гімназіі і прапанаваў ім выехаць з Беластока да бацькоў і сваякоў. Вось шасцёрка патрыётаў з 6-га класа: Канстанцін Магільніцкі, Цэзары-Вікенці Война, Леапольд Дамброўскі, Карл Ріхтар, Дамінік Паплаўскі і Каспер Слуцкі. Калі іх сабралі ў канцылярыі гімназіі 23.04 (5.05), дык вялікая колькасць гараджан і больш за 60 гімназістаў сабраліся на вуліцы, насупраць канцылярыі. Прыйшлося ўмешвацца дырэкцыі гімназіі, паліцыі, тром пешым казакам, які білі сабраўшыхся нагайкамі. Адзін з гімназістаў (магчыма, 5-класнік Баляслаў Ягалкоўскі) ударыў казака Клімёнава па твары. У выніку шасцёрка гімназістаў усё ж выехала з Беластока[160]. Магчыма, пра іх пісаў А.І. Мілавідаў, які адзначыў, што пасля выгнання з гімназіі вінаватых гімназістаў пратрымалі месяц у турме, а паручыцеляў аштрафавалі на 200 рублёў кожнага[161].

Але падзеі ў Беластоку працягваліся. 10 мая гімназісты, якія кватаравалі па вул. Старыя Баяры ў двараніна Верпухоўскага, замежніка Райнера, мешчаніна Бронарда, удавы Дамброўскай, ад-

157 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1171, а. 19.
158 Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг. … – С. 467-468.
159 Русско-польские революционные связи: материалы и документы. – Т. I. – С. 366.
160 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1135, а. 46-47 адв., 70, 95-98.
161 Миловидов А.И. Участие молодёжи … – С. 23.

стаўнога салдата Кажанецкага і селяніна Глінскага спявалі «непозволительные песни». А таксама «производятся в квартирах разные бесчинства, заключающиеся в непозволенных выражениях противу Государства и до того увеличивающимися, что делаются невыносимы...». Разам з гімназістамі прымалі ўдзел Бронард, Кажанецкі і Глінскі[162].

Ішла агітацыйная праца сярод расійскіх вайскоўцаў. 28 красавіка 1862 г. акруговы генерал 9-й акругі Асобнага корпуса ўнутранай аховы генерал-лейтэнант Пушчын данёс губернатару, што начальнік Беластоцкай інваліднай каманды маёр Смульскі атрымаў пракламацыю пад назвай «Что надо делать войску». Такую самую атрымаў у Бельску ўнтэр-афіцэр палка, падпарадкаванага ваеннаму начальніку Бельска і ваколіц. Адзначым, што ў горадзе знаходзілася збройная майстэрня — немалаважны факт для будучага паўстання. Пракламацыю падкідваюць 2 жніўня пад караўльны дом 5-й батарэйнай батарэі 3-й артылярыйскай брыгады ў Слоніме, каля Карыцінскага касцёла Сакольскага павета, дзе размешчаны 2-і стралковы батальён 4-й роты[163].

15 мая 1862 г. брэсцкі земскі спраўнік дакладаў губернатару пра знаходку на Беластоцкай паштовай дарозе кніжкі «Гутарка старога дзеда». Нейкую «Гутарку» знайшоў 6 мая па дарозе з Беластока ў Васількава радавы 2-й стралковай роты Максім Калпераў. «Гутарку двух суседзяў. № 2» 26 чэрвеня перадаў свайму камандзіру шараговы 2-й лінейнай роты П. Дубовік, які атрымў яе ад гаспадара хаты, у якой кватараваў у в. Лазова Сакольскага павета. Селянін Галавін падабраў яе каля хаты[164].

6 чэрвеня 1862 г. шараговы 1-й стралковай роты ваеннага начальніка Гродна з паветам Фёдар Дудзін знайшоў на дарозе з Беластока на паштовую станцыю Букштэн пракламацыю «Русским войскам в Польше». 6 ліпеня падобная пракламацыя знойдзена салдатам Захаравым у Гродне на вул. Падольнай, каля дома Міравовіча. 20 ліпеня такую самую знаходзіць у Брэсце каля дома Ягміна шараговы стралец К. Хішчынскі[165]. У дадзенай пракламацыі рускія войскі ў Польшчы заклікалі: «...Прысягніце ў імя ўсяго святога вам: не падымаць зброю супраць Польшчы! Гэтую прысягу патрабуе ні цар, а сумленне народнае, народнае раскаянне...»[166]

162 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1135, а. 67-67 адв., 76.
163 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 138-139, 169, 265.
164 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 146-147, 164.
165 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 154-154 адв., 166, 170.
166 Русско-польские революционные связи: материалы и документы. – Т. I. – С. 388.

24 чэрвеня 1862 г. на адной з вуліц Гродна мытны даглядчык знайшоў лісток пад назвай «Русская правда»[167]. Невядома, які гэта быў нумар пракламацыі. У першым (выйшаў 27.03) узгадваўся расстрэл дэманстрацыі ў Варшаве ў 1861 г. («святыя ахвяры, аплаканыя ўсімі сумленнымі людзьмі») і гаварылася: «Браты палякі! Калісьці вы пісалі на сваіх сцягах: «За нашу і вашу вольнасць». Тады нешматлікія яшчэ разумелі ваш вялікадушны выклік, але цяпер пазнанне свабоды завалодала сэрцамі ўсіх сумленных людзей, цяпер на ваш заклік з'явяцца тысячы. Браты! Забудзем і даруем адзін аднаму ўсё былое. Наперадзе ж нас няма хмараў, якія маглі бы засмуціць наш святы саюз: вольны голас вырашыць усё, а дзе вольнасць, там і праўда!»[168]. У другім нумары (апублікаваны 27.04) пісалася, што расійскі ўрад «не бачыць, што рускі народ зразумеў не толькі бясслаўе, але і бескарыслівасць угняцення роднаснай нам Польшчы..., пакуль мы будзем прыцясняць іншых — не бачыць нам ні дабрадзенства, ні спакою»[169].

12 жніўня 1862 г. у Друскеніках адбылася маніфестацыя з нагоды юбілею аб'яднання Літвы з Польшчай (Люблінскай уніі, 31 ліпеня па ст. ст.)[170]. Арганізатарамі былі адстаўны тытулярны дарадца Махнаўр, адстаўны прапаршчык Станішэўскі і некалькі «невядомых і нязначных людзей». Удзельнікаў сабралося да 100 чалавек — памешчыкаў, сялян, яўрэяў. Усе былі па-святочнаму апрануты ў каляровую вопратку: мужчыны — у чамаркі і светлыя жупаны, жанчыны — у белыя сукенкі з малінавымі і блакітнымі стужкамі. У касцёле ў 11 гадзін пачалося набажэнства з аркестрам музыкантаў. У 16 гадзін для «простага народу» быў арганізаваны абед у публічным садзе, дзе выступіў Махнаўр, які чытаў Варшаўскую газету і даваў свае тлумачэнні. Пасля абеду адбылася бяспройгрышная латарэя для сялян, кожны з якіх атрымаў нейкую рэч на памяць. У будынку вакзала вечарам адбылася музычная вечарына, куды дапусцілі і народ. Затым сялян і яўрэяў пачаставалі гарбатай з цукеркамі. А 21 гадзіне на Нёмане адбыўся феерверк і дэманстрацыя транспаранта з выявай працягнутых над ракой дзвюх рук, адна з якіх была драпіраваная польскім кунтушам, а другая — літоўскай сярмягай.

Каб ліквідаваць пагрозу парадку, з Гродна ў Друскенікі камандзіравалі роту пяхоты, якую размеркавалі экзэкуцыйным парадкам

167 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 158.

168 Русско-польские революционные связи: материалы и документы. – Т. I. – С. 136.

169 Русско-польские революционные связи: материалы и документы. – Т. I. – С. 140.

170 Электронны рэсурс: narod.ru|1864|Ssilka-Olonezk.htm. – Дата доступа: 18.01.2013.

па дамах жыхароў, а Махнаўра выслалі ў Петразаводск[171]. Пэўным чынам пацярпеў за ўдзел у гэтым мерапрыемстве і гродзенскі віцэ-губернатар князь Абаленскі — яго перавялі ў Маскву на пасаду старшыні казённай палаты. Пры развітанні мясцовае дваранства на чале з графам Старжынскім дало яму абед і дзякавала за «глыбокае спачуванне» палякам[172].

12 жніўня 1862 г. у Беластоцкім касцёле сабралася вельмі шмат народу, значную колькасць складалі жанчыны вышэйшага класа, апранутыя ў рознакаляровыя сукенкі. Сялянам было аб'яўлена аб вольным ад паншчыны дне. У Ваўкавыску шмат народу не было, але «па-польску спяваная імша» адбывалася. Ва ўсіх касцёлах Беласточчыны 12 жніўня адбыліся імшы, на якія прыйшлі памешчыкі і дваране. Памятныя літургіі адбыліся ў Беластоцкім прыходскім касцёле (ксяндзы Сідаровіч і Шарскі) і ў гродзенскім Фарным касцёле, усюды жанчыны пераапрануліся з жалобы ў каляровыя сукенкі[173].

2 верасня 1862 г. пад следства ў Гродне трапіла дваранка графіня 17 гадоў Леакадзія дэ Ромер за «спяванне вершаў абуральнага зместу».

15 кастрычніка 1862 г. у Беластоцкім прыходскім касцёле адбылася жалобная імша ў памяць Андрэя Тадэвуша Касцюшкі. Быў усталяваны катафалк з мноствам свечак, харугвы за спакой. Усе былі апранутыя ў жалобную вопратку. Каб схаваць сапраўдную мэту, распаўсюдзілі чуткі пра імшу па памёрлых бацьках беластоцкіх манашак — сясцёр міласэрнасці[174].

25 лістапада 1862 г. начальнік корпуса жандараў А.Е. Цімашоў даносіў генерал-губернатару Назімаву: «Некоторые из служащих Гродно и Вильно чиновников, между коими имеют состоящего в гродненском приказе общественного призрения губернского секретаря А. Блажеевского, распуская слухи о том, что в январе или феврале месяце в Царстве Польском одновременно с западными губерниями вспыхнет революция, распространяют в народе воззвания и какое-то послание от имени католического духовенства

171 Соркіна І. Гістарычная палітыка ў Гродне ў другой палове XIX – пачатку XX ст. паводле матэрыялаў архіўных фондаў мясцовай адміністрацыі // Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV –XX стст. – Мн.: Зміцер Колас, 2012. – С. 303-304.

172 Архивные материалы Муравьёвского музея, относящегося к польскому восстанию 1863-1864 гг. в пределах Северо-Западного края / сост. А.И. Миловидов. – Ч. 1 // Виленский временник. – Кн. VI. – С. 182.

173 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 201, 212, 214, 215.

174 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 231; Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг. … – С. 475.

в Варшаве... Жертвуют даже из жалованья 2% на покупку оружия»[175]. У гэты самы дзень у Гродзенскай гімназіі «по окончании класса были беспорядки»[176].

12 чэрвеня 1863 г. выйшаў цыркуляр Мураўёва аб нашэнні жалобы. Яна дазвалялася толькі тым асобам, у якіх сапраўды хтосьці памёр, і на тэрмін, усталяваны мясцовымі традыцыямі. Жанчынам забаранялася насіць чорную вопратку і рэвалюцыйныя знакі пад пагрозай выключэння са службы іх мужоў-чыноўнікаў, штрафаў за першы і другі раз (25 і 50 рублёў) і арышту за трэці раз, продажу маёмасці за неаплачаны штраф. Мужчыны не маглі насіць чамаркі, канфэдэраткі, доўгія боты паверх ніжняй вопраткі, рэвалюцыйныя знакі[177].



*Віленскі генерал-губернатар В. Назімаў*

22 ліпеня 1863 г. у «Гродненских губернских ведомостях» было апублікавана распараджэнне гродзенскага губернатара «о строжайшем запрещении женщинам носить траур, а мужчинам — польские национальные костюмы или же другие революционные знаки»[178]. Відаць, гэта самае ўзгадаў 24 красавіка1864 г. Уладзіслаў Жалкоўскі, апошні рэвалюцыйны начальнік Гродна. На допыце ў следчай камісіі ён паказаў, што, калі ў канцы ліпеня ці пачатку жніўня польскія дамы па загаду расійскай улады апранулі каляровую вопратку, дык з'явілася распараджэнне начальніка Гродна Цэханоўскага, якое ён знайшоў на плошчы насупраць сабора ў выглядзе праккламацыі. Там было напісана наступнае: «Каб дамы апранулі адразу ж жалобу пад стро-



*Шляхцянка ў жалобнай вопратцы*

175 Гл.: Гостев А. П., Швед В.В. Кронан. … – С. 59.

176 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 256 адв.

177 Сборник распоряжений графа Михаила Николаевича Муравьёва по усмирению польского мятежа в Северо-Западных губерниях 1863-1864 гг. / сост. Н. Цылов. – Вильна, 1866. – С. 353-354.

178 Гостев А. П., Швед В.В. Кронан. … – С. 61.

гую адказнасць і што гэта вельмі сорамна і непрыстойна для іх як для патрыётак, апранаць у такі час, калі кроў братоў льецца, стракатую вопратку»[179].

Вядомы верш доктара Ц. Цэханоўскага пад назвай «Падзяка Полькам». У ім ён пісаў (пераклад В. Шведа):

Дзякуй Вам, Polькі, што зразумелі —
Не час танчыць з маскалямі,
Што калі мае паўстаць з труны народ цэлы,
Вы прыгажэйшыя з малітвай і слязамі...

Бо вусны вашыя, калі малітву вымаўляюць,
І слёзы, калі з вачэй бягуць па кроплі,
Анёлы ў ружовыя бутоны збіраюць
І носяць у дар Бога Нарадзіўшай.

А кожная просьба, кожная слязінка
У гэтай апякунцы ў вялікім кошце,
Бо за іх Каралева нябесная
На год наблізіць Айчыны вызваленне[180].

Ваенны губернатар горада Гродна і гродзенскі грамадзянскі губернатар пісаў ваеннаму начальніку Гродна палкоўніку Чартову: «Неоднократно доходили до меня слухи, будто бы многие из служащих здесь католиков, вне службы собираясь друг у друга по вечерам, являются на оные в своём кругу, в условных, запрещённых административным порядком костюмах или платье, как то: чемарках, жупанах и пр. ... » Ён пісаў, што знойдзены яўрэі-краўцы, якія шыюць вопратку, сярод заказчыкаў назваў пісьмавадзіцеля гродзенскага павятовага правадыра дваранства калежскага асэсара Сасуліча, двараніна Івана Дзітрыха (які ўжо арыштаваны на галоўнай гаўптвахце). Было загадана ваеннаму начальніку скласці камісію і знайсці вінаватых у шыцці забароненай вопраткі. Чамаркі, як высветлілася, шылі Вольф Лекін, Шэр Прэнскі, Нота Шмі-

179 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 204.

180 Jodkowski J. Rok 1863 w powiecie Grodzienskim // Echo Grodzienski. – 1923. – № 179. – S. 3.

гельскі, Энох Фалкман, жылеты — Абрам Розэнберг, Моўша Гайдамак. Заказы былі зроблены, акрамя вышэйназваных, чыноўнікам Аляксандрам Корнам, Уладзіславам і Казімірам — сынамі дваранiна Жалкоўскага, дваранінам пісарам Антонам Галконтам. Паколькі не было даказана, што вопратка насілася ў грамадскіх месцах, а яўрэі выраблялі яе толькі для свайго «дневного пропитания», дык нікога не пакаралі[181].

Нельга не ўзгадаць пра рэвалюцыянізіруючую ролю «революционных знаков». Пад час вобыску ў доме памешчыка Фларэнціна Мікульскага (памочніка Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі) знайшлі медальён з вобразам анёла, які трымае крыжык з надпісам па-польску «1861 г. жнівень 12-га». Пад час вобыску ў доме князя Георгія Чацвярцінскага знайшлі «запонки, сделанные из римской мозаики, и знаки на них означают святую эмблему»[182]. Вінская ў пачатку жніўня 1861 г. раздавала сялянам-палякам у Тыкоціне медалі ў гонар «разрубленага крыжа» і прадавала пярсцёнкі ў гонар, па яе выразу, «паўшых братоў»[183].



*Бранзалета ў выглядзе кандалоў*

Гродзенскі віцэ-губернатар Ражноў у рапарце ад 27.07 (8.08) пісаў: «Наогул вонкавы гарадскі быт можна было б назваць нармальным, калі б не сустракаліся б яшчэ жанчыны цалкам у жалобнай вопратцы з галавы да носа, часам з белым пяром на гарыбалдзійскім капялюшы і з вялікімі булаўкамі ў выглядзе крыжа або з белым арлом...»[184]



*Брошка з паўстанцкай сімволікай*

Пасля паступіўшага даноса брэсцкі гараднічы 6 жніўня 1861 г. зрабіў вобыск у злотніка Янкеля Зыльберберга і знайшоў у яго зробленых 18 булавак з польскімі арламі, 60 падрыхтаваных да вырабу арлоў і 60 шпілек, 6 срэбных пярсцёнкаў з надпісам па-польску

181 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1177, а. 1-2, 9-10 адв.
182 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 3, а. 364 адв.; с. 2, а. 420 адв.
183 Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг. … – С. 442.
184 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1241, а. 157-157 адв.

з вонкавага боку, а таксама формы, з якіх выраблялі арлоў. Злотнік і яго кампаньёны Борух Пантэра, Лейзер Хазан, работнік Юдка Іцкавіч былі арыштаваны. На следстве гаварылі, што пачалі рабіць упрыгожванні 4 дні перад вобыскам і толькі для заробку, бо яны былі ў модзе, што яшчэ нічога не прадалі. Генерал-губернатар дазволіў вызваліць Зыльбербер-га, вярнуць забранае і знішчыць арлоў[185].



*Паўстанцкі пярсцёнак*

Яшчэ адзін вобыск у злотнікаў-яўрэяў Брэст-Літоўска быў зроблены 11 жніўня. Былі знойдзены срэбныя шпількі з польскім арлом, пярсцёнкі з надпісамі, якія «должны служить политическим знаком для друзей, желающих восстановления Польши через возмущение общественного спокойствия»[186].



*Запанка з гербам паўстання*

Па лініі чыгункі ад Варшавы да Вільні распаўсюджваліся ў верасні 1862 г. фатаграфіі Ярашынскага — асобы, якая замахвалася на жыццё Намесніка Каралеўства Польскага. Памерам візітнай карткі партрэты раскупляліся па 10 рублёў (звычайны кошт — не болей 50 капеек) мясцовымі памешчыкамі і чыноўнікамі. У Беластоку, напрыклад, было каля 40 партрэтаў[187]. Гродзенскі паліцмайстар дакладаў губернатару, што ў мясцовага кнігагандляра Загаеўскага выкупіў 11 штук дагератыпаў Людовіка Напалеона Банапарта, якія той набыў у Варшаве ў фатографа Пайнера з мэтай продажу ў Гродне[188].

31.10 (12.11).1863 г. адбыўся раптоўны вобыск у Гродзенскай палаце дзяржаўных маёмасцяў, пад час якога знайшлі наступныя сімвалічныя знакі: пярсцёнак з надпісам «1861. L.27 d» (27 лютага 1861 г. расстралялі дэманстрацыю ў Варшаве), запанкі з партрэтам італьянскага рэвалюцыянера Гарыбальдзі[189].

Дададзім, што маніфестацыйны перыяд адбываўся ў той час, калі складалася і пачала дзейнічаць Гродзенская рэвалюцыйна-дэ-

185 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1173, а. 1-2, 11, 11 адв., 23.
186 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1173, а. 6, 7.
187 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 230.
188 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 315.
189 Кісялёў Г.В. З думай пра Беларусь. – Мінск, 1966 – С. 49.

макратычная арганізацыя Кастуся Каліноўскага. Апісаныя падзеі паўплывалі на «крызіс вярхоў» — частую змену гродзенскіх губернатараў (тры за 1861-1862 гг.).

## “КРОЎ, ЯКАЯ ЛЬЕЦЦА ЗА НЁМАНАМ, ЗАКЛІКАЕ І НАС ДА ЗБРОІ!”

Адной з галоўных задач Гродзенскай ваяводскай арганізацыі было стварэнне паўстанцкіх атрадаў. Павятовыя рэвалюцыйныя камітэты прыступілі да іх арганізацыі ў сакавіку-красавіку 1863 г. Кожны павет павінен быў сабраць атрад колькасцю 100-150 чалавек. Інструкцыя, складзеная рэвалюцыйным камісарам В.-К. Каліноўскім для павятовых камісараў Гродзенскага ваяводства, абавязвала іх асабіста прысутнічаць пры фарміраванні атрада і забяспечваць яго зброяй найлепшай якасці, запасам зарадаў не меней 50 на кожнага паўстанца, абмундзіраваннем і амуніцыяй, медыцынскай дапамогай, сачыць за дысцыплінай і парадкам[190].

Інструкцыя для ваенных начальнікаў, ваяводскіх і павятовых (выдадзеная паміж 1.02 і 11.03.1863 г.) заклікала іх як мага хучэй «сабраць сілы, падрыхтаваць зброю, скласці план дзеянняў і пачаць барацьбу». З прычыны таго, што сілы царскага войска перавышалі паўстанцкія[191], прапаноўвалася партызанская тактыка: «Атакаваць толькі такія пункты, дзе перамога над Масквой будзе несумненнай», «ва ўсіх пунктах, дзе толькі можна, знішчаць і разбройваць нават самыя маленькія атрады, нават паасобных салдат, перахопліваць урадавых кур’ераў, знішчаць камунікацыі», «усімі сродкамі старацца забіраць урадавыя касы», пашыраць паўстанцкую прапаганду[192].

Характарыстыку партызанскага руху даў шэф корпуса жандараў князь Далгарукаў: «Характар уласна ваенных дзеянняў у Паўночна-Заходнім краі, якія кіраваліся Варшаўскім рэвалюцыйным камітэтам, быў чыста партызанскі. Мясцовыя тапаграфічныя

190 Восстание в Литве и Белоруссии 1863-1864 гг. – М., 1965. – С. 349.

191 Смирнов А. Кастусь Калиновский. – М.: Соцэкгиз, 1959. – С. 82: царскае войска ў Літве і Беларусі налічвала 123 тыс. штыкоў і сабель; паўстанцы, па афіцыйных дадзеных, 70 тыс., але лічбы перавышаны ў 3-4 разы.

192 Каліноўскі К. За нашую вольнасць. Творы, дакументы / уклад., прадм., паслясл. і камент. Г. Кісялёва. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1999. – С. 96-97.

ўмовы, лазутчыкі, якія набіраліся воляй ці няволяй сярод сялян і яўрэяў, і асабліва ж памешчыкі, арандатары, кіраўнікі і аднадворцы, падтрымлівалі намаганні мяцежнікаў. Лясныя нетры хавалі іх ад пераследу войскаў, а падводы жыхароў служылі дапамогай і нават сродкам для хуткага перамяшчэння і адцягнення ўвагі нашых атрадаў. Пры няўдачах шайкі раздрабляліся і рассейваліся па навакольных мясцінах, дамовіўшыся адносна зборных пунктаў»[193]. Сапраўды, паўстанцкія атрады дзяліліся на групы па 10-15 чалавек на чале з унтэр-афіцэрам, а некалькі груп аб'ядноўваліся ва ўзводы пад камандай афіцэра.

У нарысах пра Гродзенскую ваяводскую арганізацыю і яе памочнікаў мы пісалі пра спробы збору фінансаў ад памешчыкаў, дапамогу сялянаў харчаваннем, фуражом, праваднікамі. У распараджэнні Выканаўчага аддзела Літвы было 400 000 франкаў (100 000 рублёў срэбрам) на закупку зброі за мяжой. Частка гэтых грошай была змешчана як заклад паводле кантракта з фабрыкантам зброі, а частка была прызначана па патрабаванню Нацыянальнага ўрада на агульны фундуш Камісіі зброі ў Льежы[194]. Не апраўдаліся спадзяванні на еўрапейскую дапамогу. У «Пісьмах з-пад шыбеніцы» Каліноўскі пісаў: «Доўга палякі чакалі дапамогі з-за мяжы, народы чужаземныя крычалі шмат, і да гэтай пары нічога для нас не зрабілі; кажуць, што яны не маюць ніякай патрэбы сваёй у польскай справе, каб на маскаля ісці за нас ваяваці»[195].

Паўстанцы самі спрабавалі дапамагчы сабе праз еўрапейскія народы. На зафрактаваным у Англіі параходзе «Ward Jackson» знаходзіліся атрад Т. Лапінскага колькасцю 150-165 чалавек і зброя: 1000 карабінаў са штыкамі, 750 кавалярыйскіх шабляў, 200 дзідаў, 100 000 патронаў, 50 цэнтнераў пораху, 2 мільёны капсюлей, 3 артылярыйскія гарматы і іншае. Параход павінен быў даплыць да Палангі ў Літве, але быў затрыманы ў шведскім порце Мальмё. 21.03 (2.04).1863 г. шведскі ўрад (пасля трох дзён бяздзейнічання) аддаў загад аб сяквестры на груз і інтэрніраванні польскага атрада. Удзельнікі экспедыцыі (рэшткі атрада ў колькасці 85 чалавек) толькі праз 2 месяцы працягнулі свой шлях на шхуне «Эмілія». 11 чэрвеня 1863 г. яна ўвайшла ў прускія тэрытарыяльныя воды і кінула якар у 1,5-2 мілях ад Мемеля. У Палангу капітан шхуны і Лапінскі ісці не рызыкнулі. Была зроблена спроба высадкі на бе-

---

193 Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. – Т. II. – Мн.: Выд-ва АН БССР, 1940. – С. 495.

194 Каліноўскі К. За нашую вольнасць. … – С. 340.

195 Каліноўскі К. За нашую вольнасць. … – С. 44.

раг, але пад час шторму частка зброі і 24 чалавекі патанулі[196].

Вядома таксама спроба ўраджэнца Гродзенскай губерні Эжы Краскоўскага, студэнта вайсковай інжынерыі ў Вільні, арганізаваць транспарт зброі. Ён збіраў яе разам з сябрамі і захоўваў на складзе чыгункі. Перавесці хацелі ў вагоне пад пяском, але машыніст здрадзіў. 300 чалавек былі арыштаваны. Краскоўскага саслалі ў салдаты ў Сібір на 9 гадоў[197].


*В. Урублеўскі*

Усе партызанскія атрады былі падпарадкаваны штабу Гродзенскага ваяводства, які знаходзіўся спачатку пры сакольскім атрадзе капітана Эйтмановіча, а потым — пры ваўкавыскім[198]. На чале штаба стаяў палкоўнік Духінскі, былы паўстанец 1830-1831 гг., прыбыўшы з Парыжу. Шэфам штаба быў Валерый Урублеўскі, ад'ютантамі — Чэслаў Калупайла, Булгарын, Здзяхоўскі і Арамовіч. Штаб пасылаў загады ў атрады, аб'ядноўваў ці раздзяляў іх у залежнасці ад абставін, складаў рапарты Аддзелу Нацыянальнага ўраду ў Вільні аб становішчы, патрэбах і адбыўшыхся баях.

Зброя складалася са старых паляўнічых ружжаў (часцей крэмнёвых), сярод якіх двухствольныя сустракаліся рэдка; ваенныя вінтоўкі (штуцэры) былі рэдкасцю. Большасць ваявала самаробнымі пікамі і дзідамі, зробленымі з кос (адсюль назва «касінеры»). Порах і кулі выраблялі таксама самі. Зразумела, што такой зброяй ваяваць супраць добра ўзброенай царскай арміі было цяжка. І першапачатковыя поспехі паўстанцкіх атрадаў былі звязаны з тактыкай партызанскай барацьбы. Вось што гаварылася ў дакуменце з паўстанцкай пячаткай, які знайшлі ўлады ў ваўкавыскага аптэкара Пагароўскага (пераклад на рускую мову): «В настоящем положении сил восстания в краю Вы (граждане. — В.Ш.) можете вести только партизанскую войну, и никогда не забывайте главной задачи партизанской войны, главного её правила: вредить неприятелю на каждом шагу, где только можно, стараться бить неприятеля, удаляться, на большую силу его не отваживаться, избегать встречи в открытом месте, ретироваться в безопасные позиции, словом, всегда и везде быть

196 Дьяков В.А. Маркс, Энгельс и Польша. – Москва: Наука, 1989. – С. 82; Зайцев В.М. Морская повстанческая экспедиция к берегам Литвы в 1863 г. // К столетию героической борьбы "За нашу и вашу свободу". – М.: Наука, 1964. – С. 182, 186, 209; Тарас А.Е. Анатомия ненависти. Русско-польские конфликты в XVIII – XX вв. – Мн.: Харвест, 2012. – С. 305.

197 Powstanie styczniowe i zeslancy syberyjscy. Katalog fotografii ze zbiorow Muzeum Historycznego m.st. Warszawy. – T. 1. – Warszawa: Argraf, 2004. – S.366.

198 Rozanski F. Z wojewodztwa Grodzienskiego… – S. 396.

и отнюдь не допускать, чтобы неприятель мог уничтожить»[199].



*Паўстанцкая зброя*

Колькасць паўстанцаў у атрадах складала каля 1700 чалавек. Менавіта такую лічбу падалі І. Арамовіч і К. Каліноўскі. Супраць іх вялі барацьбу расійскія войскі на чале з генералам Манюкіным: 7 эскадронаў, 6 казачых соцен, 67 рот пры 38 гарматах з прыслугай. Акрамя гэтага, былі батальёны ўнутранай аховы, этапныя і інвалідныя каманды, паліцыя[200]. Стварaліся атрады сялянскай аховы, якія ўзначальвалі ўнтэр-афіцэры рэгулярнага войска.

Поспехі паўстанцаў залежалі ад асобы камандзіраў, якія валодалі арганізацыйнымі здольнасцямі і вайсковымі ведамі, арыентаваліся на мясцовасці, ведалі маральныя якасці паўстанцаў. А таму ніжэй мы прыводзім біяграмы каманднага складу партызанскіх атрадаў. Яны розныя па аб'ёму і, зразумела, не канчатковыя, а складзены на сённяшні стан крыніц і літаратуры, якія патрапілі ў нашае даследаванне.



*Паўстанцкія жаўнеры*

**АКІНЧЫЦ СТАНІСЛАЎ ТАДЭВУШАВІЧ** (1838 ці 1840—1889 гг.), з дваран Гродзенскай губерні, вучыўся ў Беластоцкай гімназіі і Канстанцінаўскім вайсковым вучылішчы (1859-1861 гг.). Верагодна, быў чальцом Пецярбургскага ваеннага гуртка. Служыў прапаршчыкам расійскай 3-й палявой артылерыйскай брыгады. У красавіку 1863 г. перайшоў на бок паўстанцаў. Камандаваў стралковай ротай у атрадзе Г. Стравінскага. Эміграваў у Францыю, у 1866 г. пераехаў у Галіцыю (Дьяков В. Bitwy i potyczki 1863-1864. Na podstawie materjalyw drukowanych i rękopisemnych Muzeum

199 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 16, а. 68.

200 Смирнов А.Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. – М.: Изд-во АН СССР, 1963. – С. 233, 245.

Narodowego w Rapperswilu. — Rapperswil, 1930. — C. 126; ARCHE. — 2010. — № 12. — C. 29; Powerza P. Wspomnienia z Powstania Styczniowego 1863 roku. Testament moralny autora. — Białystok: Muzeum Wojska w Białymstoku, 1996. — S. 102).

**АРАМОВІЧ (АРЦЫМОВІЧ) ІГНАЦЫЙ МІКАЛАЕВІЧ** (? — 1875 гг., Казань), настаўнік матэматыкі Беластоцкай гімназіі (пра яго ўзгадваюць вучні-паўстанцы П. Павежа, А. Белакоз). У яго на кватэры некаторы час жыў А. Духінскі. Казначэй паўстанцкага атрада і ад'ютант В. Урублеўскага (з 12.04.1863 г.). У студзені 1864 г. эміграваў у Швейцарыю, у 1872 г. вярнуўся на радзіму, але быў арыштаваны і сасланы на пасяленне ў Казань, дзе і памёр. Аўтар успамінаў «Marzenia. Pamietnik o ruchu partyzanskim w wojewodztwie Grodzienskim w 1863 i 1864 r.» (Быхаўцаў М. Паўстанне 1863-1864 гг. у Ваўкавыскім павеце. — Гародня, 2014. — С. 95-96; Восстание в Литве и Белорусии 1863-1864 гг. // Восстание 1863 года: материалы и документы. — М.: Наука, 1965. — С. 365, 368, 380,396, 537; Powierza P. ... — S. 10).

**АСТРОГА** (гл. ПАРАДОЎСКІ АЛЯКСАНДР).

**БАРАНЦЭВІЧ АНТОНІЙ КАЗІМІРАВІЧ** (30.01.1837—26.01.1918 гг.), паходзіў з Кірклішак Ашмянскага павета Віленскай губерні. Вучыўся ў Віленскай гімназіі, з 1853 па 1863 г. служыў у расійскім войску — Лібаўскі пяхотны № 6 полк, з 1859 г. — афіцэр. Напярэдадні паўстання служыў падпаручнікам у Лібаўскім пяхотным палку, які кватараваў у Беластоку. Належаў да рэвалюцыйнай арганізацыі афіцэраў рускай арміі ў Польшчы, ажыццяўляў сувязь паміж Духінскім і афіцэрамі мясцовага гарнізону. Выконваў абавязкі вайсковага начальніка Бельскага павета. 24 красавіка 1863 г. прыбыў на зборны пункт пад в. Каменка і стаў адным з камандзіраў партызанскага атрада Беластоцкага павета, які дзейнічаў і ў Бельскім павеце. Там сфарміраваў з Кярсноўскім атрад колькасцю 90 чалавек і адаслаў Духінскаму, а затым сабраў атрад колькасцю 320 чалавек і адаслаў да Тышкі ў Ламжынскі павет. Са сваім атрадам стральцоў (больш за 100 чалавек) рабіў засады і нападаў на рускія часці. Пазней злучыўся з атрадам В. Урублеўскага. Ад следства схаваўся, эміграваў у Францыю, жыў у Парыжы, затым у Галіцыі (Львоў), дзе і памёр. Аўтар успамінаў (Гродно: энцикл. справочник. — Мн.: БелСЭ, 1989. — С. 166; НГАБ у Грод-

не, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 8 адв.; ARCHE. — 2010. — № 12 (99). — С. 18; Zielinski St. Bitwy i potyczki. ... — S. 337, 338; Malesza, S. 127; Дьяков В.А. Деятели. ... — С. 24, 209, 226; Революционный подъём в Литве и Белоруссии. ... — С. 635; Русско-польские революционные связи: материалы и документы. — Т. I. — М.: АН СССР, 1963. — С. 491, 507; Т. II. — С. 653).

**БІРФРЭЙНД ЮЛІЯН ВІЛЬГЕЛЬМАВІЧ**, урач. З красавіка 1863 г. па люты 1864 г. знаходзіўся ў партызанскім атрадзе В. Урублеўскага. Сасланы ў Сібір (Грицкевич В.П. С факелом Гиппократа: Из истории белорусской медицины. — Мн.: Наука и техника, 1987. — С. 194).

**БРАНДТ УЛАДЗІСЛАЎ ПЁТР КАЗІМІРАВІЧ** (1837 ці 1836 г., Свянцяны Віленскай губерні — 1912 г.), служыў у расійскім Лібаўскім пяхотным палку (субалтэрн-афіцэр, паручнік). Належаў да рэвалюцыйнай арганізацыі афіцэраў рускай арміі ў Польшчы. Пакінуў полк разам з Баранцэвічам (гл.) 24.04.1863 г. Спачатку служыў у атрадзе Духінскага. Пасля бітвы пад Валіламі накіраваўся ў Аўгустоўскае ваяводства, дзе камандаваў атрадам, колькасць якога дасягала 110 чалавек пяхоты і 18 каваларыстаў. Паспяхова правёў бітвы пад Грушкамі, Кадышом, Балвяржышкамі. У канцы ліпеня 1863 г. расійскія войскі выцеснілі паўстанцаў з Аўгустоўскага ваяводства ў Ломжынскае. Брандт пакалечыў праз каня нагу і 4 тыдні лячыўся. У другой палове снежня эміграваў: дабраўся да Дрэздэна, потым пасяліўся ў Францыі. Па адной версіі, у 1880 г. вярнуўся на радзіму (Львоў). Па іншай — быў удзельнікам Парыжскай Камуны і забіты на барыкадах у 1871 г. (Русско-польские революционные связи. ... — Т. I. — С. 491, 507; Дьяков В. Деятели. ... — С. 32, 209, 226; ARCHE. — 2010. — № 12 (99). — С. 18; Powerza. P. Wspomnienia z Powstania Styczniowego 1863 roku. Testament moralny autora. — Białystok: Muzeum Wojska w Białymstoku, 1996. — S. 105; Brandt W. Moj udzial w powstaniu // W czterdziestą rocznicę powstania styczniowego. Lwyw, 1903. — S. 78-79).



*Магіла паўстанцаў у Кадышы*

**БУГЕЛЬСКІ ПАЛІКАРП**, шляхціц, кіраваў нейкім паўстанцкім атрадам. Пакараны ў Шчучыне 2(14).05.1864 г. (Rok 1863: wyroki smerci / red. W. Studnicki. — Wilno, 1923. — S. 15).

**ВАНЬКОВІЧ ЯН ВАЛЕНЦЬЕВІЧ** (мянушка Ляліва) (11.(23).10.1834 г., маёнтак Сляпянка пад Мінскам — 02.08.1899 г., Кракаў), з дваран, сын мастака В. Ваньковіча, былога сябры таварыства філарэтаў. Скончыў у 1856 г. Лясны інстытут у Санкт-Пецярбургу ў чыне прапаршчыка. 23.06.(5.07).1856 г. прызначаны ляснічым у Екацярынаслаўскую губерню. З 13(25).05.1857 г. кіраваў Бахмуцкім лясніцтвам і за выдатную службу атрымаў чын падпаручніка (3.04.1860 г.). З 21.05.(2.06).1860 г. — падпаручнік, ляснічы 1-га Пружанскага лясніцтва, а з 28.11 (10.12) — яго кіраўнік. 11.03.1863 г. стаў камандзірам атрада стральцоў у паўстанцкім аддзеле Стасюкевіча ў Падляскім ваяводстве, а затым — у атрадзе Бонча-Чарнецкага. У складзе гэтага атрада браў удзел у нападзе на мястэчка Міжрэчча, дзе быў паранены ў нагу. 8 мая 1863 г. атрымаў намінацыю на капітана і стаў камандзірам партызанскага атрада ў Брэсцкім павеце (каля 100 чалавек у Рудскіх лясах). Далучыўся ў маі 1863 г. да кобрынска-брэсцкага атрада Траўгута ў Гарадзецкіх Бялінскіх лясах і разам з ім прымаў удзел у рэйдзе на Піншчыну і паўночную Валынь. Удзельнічаў у бітвах пад Карэчынам 13.06 і пад Воронай 23.06. У ліпені каля м. Калоднае Пінскага павета паўстанцы былі акружаны царскім войскам і пасля бою (13.07) па загаду Траўгута разбіліся на дзясяткі і разбегліся. Хворы Траўгут перадаў кіраванне атрадам Ваньковічу. У ліпені 1863 г. Ваньковіч выехаў у Каралеўства Польскае, затым у Галіцыю (Львоў). 4.12.1863 г. намінаваны на пасаду начальніка кадраў 1-й секцыі рэгіёну Жулкеўскага, дзе працуе да 22.03.1864 г., да арышту аўстрыйскімі ўладамі. З восені жыў у Парыжы і вучыўся ў гандлёвай школе Дувігнаў. Адначасова працаваў у гандлёвым доме Караля Лалоў (з 15.10.1864 г. на працягу пяці гадоў). У 1869 г. пасяляецца ў Кракаве, працуе ў Галіцыйскім банку гандлю і прамысловасці. Завочна прыгавораны да смерці (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 37, с. 221, а. 1 аб. — 6 аб.; ЭГБ. — Т. 6. — Мн.: БелЭн., 2001. — С. 518; ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 41; Aramowicz I. Marzenia. Pamietnik o ruchu partyzanckim w wojewydztwie grodzieńskim w 1863-1864 г. — Bendlikon, 1865. — S. 43-45; Jelski A. Przyjacel Traugutta // Magazyn Polski. — 1993. — № 1/2 (5/6). — S. 65-67; Gusciora F. Powstanie styczniowe na Polesiu. — Brzest nad Bugiem, 1937. — S. 35).

**ВАШКЕВІЧ**, камандзір атрада (каля 50-60 чалавек), сфармаванага ў Бельскім павеце ў чэрвені-ліпені 1863 г. Атрад стаяў лагерам пад Рудней у Заблудаўскім лесе. Прывёў яго да Духінскага, які знаходзіўся ля Будзіска ў Сакольскай пушчы. Пасля бітвы пад Жаркаўшчынай Ваўкавыскага павета (21.06.1863 г.) узначаліў атрад колькасцю 60 чалавек і павёў яго ў Бельскі павет (Арамовіч І. Мары. Успаміны пра партызанскі рух у Гродзенскім ваяводстве ў 1863 і 1864 гг. // ARCHE. — 2010. — № 12. — S. 22; Zielinski St. Bitwy i potyczki 1863-1864 ... — S. 334).

**ВЕРАШЧЫНСКІ АНТОНІ**, падафіцэр у трэцім швадроне коннага атрада літоўскай кавалерыі В. Урублеўскага (Dokumenty terenowych wladz wojskowych=Документы повстанческих военачальников, 1863-1864 / Red. Tomu W. Djakow, S. Kieniewicz // Powstanie styczniowe: materialy i dokumenty, Wroclaw: Zaklad Narodowy im. Osolińskich, 1976. — С. 191).

**ВІШНЕЎСКІ ЛЕАНАРД**, камандзір атрада, які прыйшоў на Гарадзеншчыну з Каралеўства Польскага (Ігнатоўскі У. 1863 год на Беларусі: Нарыс падзей. — Менск: Бел. АН, 1930. — С. 157).

**ВЛАДЫЧАНСКІ АНТОН ТАДЭВУШАВІЧ (ФАДЗЕЕВІЧ)**, з сям’і памешчыка Ваўкавыскага павета, 1843 года нараджэння, студэнт універсітэта, камандаваў аддзелам у атрадзе Г. Стравінскага, у баі пад Гутай Міхалінскай быў паранены, памёр у чэрвені 1863 г. (Быхаўцаў М. Паўстанне 1863-1864 гг. у Ваўкавыскім павеце. — Гародня: б.в., 2014. — С. 183, 190).

**ВЛАДЫЧАНСКІ ІОСІФ (ВОСІП) ТАДЭВУШАВІЧ (ФАДЗЕЕВІЧ)**, з сям’і памешчыка Ваўкавыскага павета, 1842 года нараджэння, вучань Беластоцкай гімназіі, камандаваў аддзелам у атрадзе К. Кабылінскага, ваяваў на тэрыторыі Гродзенскай і Люблінскай губерняў. Эміграваў у Парыж, вучыўся там на інжынера. Пасля дазволу вярнуўся ў бацькоўскі маёнтак Сядзельнікі (Быхаўцаў М. Паўстанне 1863-1864 гг... — С. 190).

**ВЫСОЦКІ МАРЦЭЛІЙ АНТОНАВІЧ**, нарадзіўся ў Гродзенскай губерні. Пасля заканчэння Пецярбургскай медыцынска-хірургічнай акадэміі атрымаў прызначэнне на пасаду ўрача 2-га ўчастка Кубанскага казачага войска. На месца размеркавання не з’явіўся,

а прабраўся да паўстанцаў. Пасля таго, як трапіў у палон, быў асуджаны на 8 гадоў катаржных прац (Грицкевич В.П. С факелом Гиппократа. ... — С. 195).

**ГАЛОСКА** (гл. Лукашэвіч).

**ГЛАСКА ВІКТАР ІОСІФАВІЧ**, 26 гадоў, памешчык, уладальнік маёнтка Жукевічы Горніцкай воласці. Камандзір паўстанцкага атрада ў чыне маёра, які дзейнічаў у Сапоцкінскай зоне Аўгустоўскага павета, у Свентаянскіх лясах пад Алітай, Сейненскім павеце. Падтрымліваў сувязі з атрадам Ваўра. Вядома бітва атрада Гласкі каля в. Кадыш Аўгустоўскага павета. Збег у эміграцыю, але праз 9 гадоў вярнуўся ў Каралеўства Польскае і быў у Варшаве арыштаваны. Пасля вызвалення з турмы яму забаранілі жыць у заходніх губернях Расійскай імперыі. Жыў у Сувалках, у Сейненскім павеце. Спрабаваў вярнуць правы на свой маёнтак (Буднік І. Да падзеяў 1864-64 гадоў на Гарадзеншчыне. — Гроднаа: ЮрСа-Прынт, 2013. — С. 71, 93-94).

**ГУРСКІ**, камандзір атрада ў бітве пад Маркавым 30.07.1863 г. (Zelinski St. Bitwy i potyczki... — S. 334).

**ДАМАНОЎСКІ**, урач, узначаліў групу паўстанцаў з Кобрына, якая ў чэрвені 1863 г. увайшла ў склад партызанскага атрада Траўгута. Забіты пад час бою з расійцамі пад Калодна Пінскага павета (Грицкевич В.П. С факелом Гиппократа. ... — С. 204).

**ДУХІНСКІ АНУФРЫ (АНУФРАМ)**, былы кавалерыст польскай арміі і ўдзельнік паходу Дэмбінскага на тэрыторыю Літвы і Беларусі пад час Лістападаўскага паўстання 1830-1831 гг. Прыехаў з Парыжа з мандатам Ю. Высоцкага, знаходзіўся на нелегальным становішчы, жыў у Беластоку і ўдзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання. У красавіку 1863 г., пасля сакавіцкага перавароту «белых», быў прызначаны вайсковым начальнікам Гродзенскага ваяводства ў чыне палкоўніка. Знаходзіўся пры беластоцка-сакольскім партызанскім атрадзе, дзе быў галоўны штаб. Камандаваў партызанскім атрадам спачатку ў Слонімскім павеце, потым — у Сакольскім. Прабыўшы 30 гадоў у эміграцыі, слаба арыентаваўся ў мясцовых абставінах, «больш задаваў пытанні і праяўляў энергію толькі тады, калі рэч ішла пра падтрыманне ягонага прэстыжу». На следстве

Гафмайстар паказаў: «У час нашай размовы я заўважыў, што Духінскі да такой ступені не быў азнаёмлены з мясцовым краем, што нават не ведаў, што ў Брэсце знаходзіцца крэпасць». Фактычна кіраваў ваяводствам, а потым партызанскім атрадам В. Урублеўскі. Менавіта апошні выратаваў няўдалую засаду Духінскага супраць расійскіх войск каля Папялярні пад Боркамі Слонімскага павета (10.06.1863 г.) (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 6 адв.; воп. 1, с. 40 а, а. 74; Гродно: энцикл. справочник: БелСЭ, 1989. — С. 166; ARCHE. — 2010. — № 12 (99). — С. 19; Восстание в Литве и Белоруссии. 1863-1864 гг. — С. 397; Абрамявичюс В.Е., Дьяков В.А. Валерий Врублевский. — М.: Мысль, 1968. — С. 35; Ігнатоўскі У. 1863 год. — С. 156; Zgorżelski Cz. Powstanie Styczniowe na terenie wojewydztwa nowogrydzkiego. — Wilno, 1934. — S. 15).

**ЗАВІСТОЎСКІ СТАНІСЛАЎ КАРЛАВІЧ**, са шляхты Ваўкавыскага павета, з 1839 па 1844 г. служыў у расійскім войску, ваяваў на Каўказе. Выйшаў у адстаўку капітанам і служыў гараднічым у м. Зэльва. Завербаваў у рэферэнты Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі Л. Завістоўскага (у сваяцтве не былі). У паўстанні вайсковы начальнік Ваўкавыскага павета. У паўстанцкім атрадзе кіраваў асобай часткай — жандараў-вешальнікаў. Узяты ў палон у бітве пад Сцерцежам. З 18.06.1863 г. зняволены ў Гродзенскім астрозе. Быў расстраляны ў Ваўкавыску 10(22).07.1864 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 147-148; Rok 1863: wyroki smerci / red. W. Studnicki. — Wilno, 1923. — С. 110; ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 26; Kolumna Z. Pamiątka dla rodzin polskich. Kratkie wiadomasci o stracionych na rusztowaniach, rozstrzelanych i zmarłych na wygnaniu syberyjskim i tulactwe ofiar z 1861-1866 roku: ze dziennikyw, wiarogodnych i towarzyszy broni. — Krakyw: Wl. Jaworowski, 1868. — Cz. 1. — S. 177).



*Прыгаворанага да пакарання вязуць на расстрэл*

**ЗАРЭМБА** (гл. УЛАДЫЧАНСКІ Тэафіл Тадэвушавіч).

**ЗАМЕЧАК** (гл. Ціхорскі).

**ЗВЯРДОЎСКІ ФЕЛІКС**, падафіцэр у другім узводзе коннага атрада літоўскай кавалерыі Урублеўскага (Документы повстанческих военачальников. ... — С. 191).

**КАБЫЛІНСКІ АДОЛЬФ КАЗІМІРАВІЧ** (1840—1866 гг.), сын Казіміра, быў сябрам Беластоцкай арганізацыі. 2.06.1863 г. удзельнічаў разам з бацькам у складзе атрада Духінскага ў бітве ва ўрочышчы Пагарэлае Ружанскай казённай дачы Слонімскага павета. Пасля бітвы пад Валіламі стаў ад'ютантам і 14.09.1863 г. атрымаў чын паручніка. Пасля смерці бацькі быў у атрадзе В. Урублеўскага. Удзельнічаў у бітве пад Рудкай Карыбутаўскай, збіраў рэшткі атрадаў з Літвы і чакаў атрады з Галіцыі ад Урублеўскага. Пасля паражэння свайго атрада хаваўся ў Петрыкозах. У 1864 г. здаўся ўладам, прынёс прысягу і нейкі час працаваў пісарам у расійскага генерала Манюкіна, які кіраваў пагромам паўстання на Беласточчыне і Гродзеншчыне. Пазней быў пераведзены ў Гродна, дзе і памёр у вайсковым шпіталі (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 16, а. 64 адв.; ARCHE. — 2010. — № 12 (99). — С. 19; Powerza P. ... — S. 20, 102).

**КАБЫЛІНСКІ КАЗІМІР ВІКТАРАВІЧ** (каля 1817—1863 гг.), памешчык Беластоцкага павета (в. Зацішша), афіцэр расійскай арміі. У красавіку 1863 г. далучыўся да паўстання разам з двума сынамі і пляменнікам. Узначальваў атрад вершнікаў, які сфармаваўся каля карчмы Зялёнкі Беластоцкага павета. 2.06.1863 г. камандаваў коннымі стральцамі атрада Духінскага ў бітве ва ўрочышчы Пагарэлае Ружанскай казённай дачы Слонімскага павета. Бываў у бітвах пад Валіламі, Замбровам каля ст. Лапы, Мерачоўшчынай 8.06, Ружанамі 18.06. Загінуў у баі з расійскім войскам 4.11.1863 г. пад Менё Люблінскай губерні. Маёнтак Калонія з фальваркам Залессе секвестраваны (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 16, а. 64 адв.; ф. 23, воп. 1, с. 372, а. 120; ARCHE. — 2010. — № 12 (99). — С. 19; Zielinski St. Bitwy i potyczki. ... — S. 334; Революционный подъём в Литве и Белоруссии. ... — С. 657; Показания и записки о Польском восстании 1863 года Оскара Авейде. // Восстание 1863 года. Материалы и документы. М.: АН СССР, 1961. — С. 637; Kolumna. — Cz. 1. — S. 73-74).

**КАБЫЛІНСКІ КАНСТАНЦІН КАЗІМІРАВІЧ**, шляхціц з Беластоцкага павета, быў у партызанскіх атрадах. 2.06.1863 г. удзельнічаў разам з бацькам у складзе атрада Духінскага ў бітве ва ўрочышчы Пагарэлае Ружанскай казённай дачы Слонімскага

павета. Ваяваў на Беласточчыне, Аўгустоўскім і Плоцкім ваяводствах. Трапіў у палон і быў сасланы на 4 гады катаржных прац за Байкалам, у Сівакова і на Нерчынскія руднікі. У 1866 г. пераведзены на пасяленне ў Кірэнскую акругу, у 1870-х гг. знаходзіўся ў Навагродскай губерні. Пасля 1883 г. звольнены ад паліцэйскага нагляду і атрымаў права паступіць на службу (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 16, а. 64 адв.; ARCHE. — 2010. — № 12 (99). — С. 19; Powstanie styczniowe i zeslancy syberyjscy. Katalog fotografii zez biorow Muzeum Historycznego m.st. Warszawy. — T. 2. — Warszawa: Argraf, 2005. — S. 177).

**КАЛІНОЎСКІ ІВАН ЮР’ЕВІЧ**, ураджэнец Брэсцкага павета, стрыечны брат В.-К. Каліноўскага. Пасля заканчэння Пецярбургскай медыцынска-хірургічнай акадэміі ў пачатку 1863 г. не паехаў на месца службы (Стаўрапаль), а вярнуўся на радзіму. Там уступіў у партызанскі атрад Стасюкевіча ў якасці ўрача. 2.06.1863 г. удзельнічаў у складзе атрада Духінскага ў бітве ва ўрочышчы Пагарэлае Ружанскай казённай дачы Слонімскага павета і быў забіты. Па іншай версіі расійскіх улад, быў забіты ў баі пры р. Сцэрцэж 8.07.1863 г. На думку сучасных даследчыкаў, яму ўдалося эміграваць, і ён жыў у Парыжы ў 1866 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 16, а. 64, 65; Грицкевич В.П. С факелом Гиппократа. ... — С. 204; Игнатович Ф.И. Медики-соратники К.С. Калиновского в восстании 1863-1864 гг. // Советское здравоохранение. — 1975. — № 8. — С. 74; ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 25; Кісялёў Г. Сейбіты вечнага: артыкулы пра беларускіх пісьменнікаў і дзеячоў рэвалюцыйнага руху 1863 года. — Мінск: Медысонт, 2009. — С. 99).

**КАЛУПАЙЛА ЯН**, камандзір Слонімскага партызанскага атрада пасля Ф. Юндзіла са жніўня 1863 г. (Кісялёў Г. Радаводнае дрэва: Каліноўскі — эпоха наступнікі. Мн.: Маст. літ., 1994. — С. 258).

**КАРНІЛОВІЧ**, камандзір коннага паўстанцкага атрада, які дзейнічаў у Гродзенскай і Аўгустоўскай губернях (Русско-польские революционные связи: материалы и документы. — Т. II. — С. 467, 698).

**КАСІНСКІ**, камандзір групы паўстанцаў, якія пасля бою ў Семятычах праз Заходні Буг адышлі на тэрыторыю Каралеўства Польскага (Zielinski St. Bitwy i potyczki. ... — S. 335).

**КАШАНСКІ ЮЗЭФ** (мянушкі Глеба, Глеб, Казанскі), паходзіў з Мінскай губерні, былы расійскі вайсковец-артылярыст. Камандзір партызанскага атрада, які дзейнічаў на тэрыторыі Аўгустоўскага і Гродзенскага ваяводстваў. Эміграваў, але ў 1870 г. вярнуўся на радзіму. У 1880 г. жыў у Самары (ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 60).

**КВАПІШЭЎСКІ МІХАЛ**, адстаўны вайсковец расійскай арміі (штабс-ротмістр Марыўпальскага гусарскага палка). У 1863 г. камандзір (у чыне маёра) коннага атрада, які дзейнічаў у Гродзенскім і суседніх ваяводствах. Удзельнік бітвы пад Маркавым Бельскага павета (30.07.1863 г.). У сярэдзіне лістапада замяняў Урублеўскага, калі той выехаў у Варшаву. Эміграваў у Францыю (Дьяков В.А. Деятели русского и польского освободительного движения в царской армии 156 — 1865 годов (Библиографический словарь). — М.: Наука, 1967. — С. 78; ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 63; Powerza P. Wspomnienia z Powstania Styczniowego 1863 roku. Testament moralny autora. _ Białystok, 1996. — S. 104-105).

**КРАКАЎСКІ** (гл. Траўгут Рамуальд).

**КРЫСІНСКІ КАРАЛЬ**, камандзір партызанскага атрада ў баі пад Дамачава Брэсцкага павета 11.07.1863 г. (Gusciora F. Powstanie styczniowe na Polesiu. — Brzest-nad-Bugiem, 1937. — S. 35).

**КЯРСНОЎСКІ ЭДВАРД ВОСІПАВІЧ**, мянушка Гром (каля 1814—1864 гг.). Былы маёр расійскай арміі. Уладальнік маёнтка Аляксандрава Слонімскага павета. Збіраў паўстанцаў і прыводзіў у атрад Баранцэвіча ў лагер пад Скрабацянкай. Быў камандзірам партызанскага атрада. Удзельнічаў у бітве пад Каралёвым Мастом 9.06. Пасля пагрому паўстання сасланы ў Тамбоў, памёр у Камышлове ў маі 1864 г. Па звестках А. Гіллера, быў атручаны (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 74 адв.-75; с. 2, а. 373-378; ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 7; Gusciora F. Powstanie styczniowe na Polesiu. — Brzest-nad-Bugiem, 1937. — S. 35; Zielinski St. Bitwy i potyczki. ... — S. 337, 338; Дьков В.А. Деятели. ... — С. 79).

**ЛЕВАНДОЎСКІ ВАЛЕНТЫ Тэафіл** (1823 г., Падляшша — 1907 г.), удзельнік вянгерскай кампаніі 1848 г. (быў у польскім легіёне паўстанцаў), прафесар Бацігнольскай школы і сябра Польскага дэмакратычнага таварыства ў Парыжу. Да канца 1862 г. жыў


*В. Левандоўскі*

у Лондане. Па рашэнню ваеннай нарады камандзіраў атрадаў, сабраўшыхся ў Семятычах, стаў іх кіраўніком у бітве 7.02.1863 г. Пазней прызначаны падляскім вайсковым начальнікам у чыне палкоўніка. У канцы сакавіка быў паранены і 24.03.1863 г. узяты ў палон. Прыгавораны спачатку да смерці, а потым — да ссылкі ў Сібір. Удзельнічаў у Забайкальскім паўстанні зняволеных і зноў быў катаваны і ўвязнены ў студзені 1866 г. Высланы ў Кірынск. У 1879 г. быў вызвалены, жыў у Варшаве, дзе памёр у студзені 1907 г. (Ігнатоўскі У. 1863 год ... — С. 108-109; Białynia-Cholodecki J. Dowodcy oddziaływ w powstaniu styczniowym i wspyłczesne piesni rewolucyjne. — Lwyw, 1907. — S. 48; Powstanie styczniowe i zeslancy syberyjscy. Katalog fotografii zezbiorow Muzeum Historycznego m.st. Warszawy. — T. 1. — Warszawa: Argraf, 2004. — S. 243; Deskur A. Dlia moich wnukow. ... — S. 148).


*Капліца на полі бітвы пад Мілавідамі*

**ЛУКАШЭВІЧ ІСІДАР** (псеўданім Галоска), паходзіў з маёнтка Львоўшчына Слонімскага павета. Адстаўны афіцэр расійскага войска. Актыўна ўдзельнічаў у канспірацыйнай працы напярэдадні паўстання. Камандзір атрада, сфарміраванага ім у Мілавідах Слонімскага павета. Атрад складаўся пераважна з сялян. Загінуў 18 ліпеня 1863 г. у баі ля мызы Харабровічы (ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 53; Кісялёў Г. Радаводнае дрэва. ... — С. 256-257).

**ЛЯНДЭР** (гл. Лянкевіч Аляксандр).

**ЛЯНКЕВІЧ АЛЯКСАНДР АЛОЙЗАВІЧ** (мянушка Ляндэр), 40 гадоў, з дваран Гродзенскай губерні, адстаўны падпалкоўнік расійскага войска. Разам з братам Антонам валодаў маёнткам Панюкі ў 7 вярстах ад Скідзеля і Азёр. У паўстанні быў вайсковым начальнікам Гродзенскага павета ў чыне палкоўніка. 20 красавіка (2 мая) 1863 г. сфарміраваў у лясах каля м. Азёры партызанскі атрад,

які складаўся ў асноўным з сялян і стралкоў лясной аховы. Яго колькасць дасягала 200 чалавек. Сярод іх былі жыхары наступных вёсак: Абухавічы — Аляксандр, Фелікс, Кандрат Абуховічы, Іван РадзівАноўскі; Талочкі (сярод 16 чалавек — сын уладальніка маёнтка Уладзіслаў Канеўскі); з м. Азёр — каля 20 чалавек, з фальварка Вільянова і Задуб'е — 10 чалавек з прыслугі і батракоў.



*Паўстанцкія крыжы ў Азёрах*

Удзельнічаў у бітве каля Святых Балот 4 мая (недалёка ад м. Азёры). Пасля паражэння частка атрада (25 чалавек) адышла ў Ваўкавыскі павет і далучылася да атрада Г. Стравінскага. Л. схаваўся ад следства і эміграваў у верасні 1863 г. Завочна прыгавораны да смяротнага пакарання. Магчыма, прысуд адбыўся 12 ці 22 лістапада 1866 г., менавіта такія даты акрэслены ў імянным паказальніку асоб да пратаколаў пасяджэнняў палявога аўдытарыяту. Маёнтак спачатку секвестравалі, а потым канфіскавалі (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 105; воп. 1, с. 53; ф. 23, воп. 1, с. 372, а. 117 адв.; Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гг. на Гарадзеншчыне. — Гродна: ЮрСаПрынт, 2013. — С. 35; Матвейчык Д. Паўстанне 1863-1864 гг. у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў. — Мн.: Медысон, 2013. — С. 81).

**ЛЯТКОЎСКІ (ЛАТКОЎСКІ)**, чыноўнік Беластоцкага павятовага казначэйства, камандзір атрада ў Бельскім павеце ў Белавежскай пушчы. Гэты атрад быў разбіты 3 мая ў в. Брашчанка. 2.06.1863 г. камандаваў касінерамі 1-га аддзялення атрада Духінскага ў бітве ва ўрочышчы Пагарэлае Ружанскай казённай дачы Слонімскага павета (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 16, а. 64 адв.; Гродно: энцикл. справочник: БелСЭ, 1989. — С. 166; Ігнатоўскі У. 1863 год на Беларусі: Нарыс падзей. — Менск: Бел АН, 1930. — С. 157).

**МАЗУРКЕВІЧ ВІКЕНЦІ (Вінцэнці) ІВАНАВІЧ**, дваранін, незацверджаны Герольдыяй, 28 гадоў у 1864 г., вучыўся ў элементарнай школе в. Рогава. Перад паўстаннем працаваў вінакурам у в. Пянткова графа Старжынскага. Камандаваў атрадам паўстанцаў, удзельнічаў у нападзе на г. Сураж. Арыштаваны, даваў паказанні спачатку ў Беластоцкай, а пазней у 1-й Гродзенскай следчых камісіях.

Прыгаворам пазбаўлены ўсіх правоў і прыгавораны да высылкі на пасяленне ў аддаленыя месцы Сібіры (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 557 адв.; ЛДГА, ф. 1248, воп. 1, с. 917 б., а. 2-3).

**МІХАЙЛОЎСКІ УЛАДЗІСЛАЎ**, памешчык, памочнік камандзіра коннага паўстанцкага атрада К. Кабылінскага (Восстание в Литве и Белоруссии 1863 — 1864 гг. ... — С. 563).

**МЛОТАК** (гл. Стравінскі Густаў).

**НАВІЦКІ**, інжынер-капітан, начальнік VII дыстанцыі III Акругі шляхоў зносін, падазраваўся ў заняцці пасады ваеннага начальніка Брэсцкага павета. Быў арыштаваны і знаходзіўся пад следствам (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 10 адв.).

**НАРБУТ БАЛЯСЛАЎ ТЭАДОРАВІЧ** (? — 1889 гг., Шаўры Лідскага павета), брат Людвіка, яго ад'ютант у паўстанцкім атрадзе. Калі 14 сакавіка 1863 г. узброеныя гродзенскія гімназісты (каля 100 чалавек) на чале з начальнікам станцыі Л. Кульчыцкім няўдала спрабавалі выехаць на цягніку ў Парэчча, ён чакаў іх тут для таго, каб адвесці ў атрад. Выехаць здолелі толькі 7-8 чалавек. Пасля смерці брата ў бітве 5.05.1863 г. пад Дубічамі ўзначаліў частку атрада і адышоў у Гродзенскую пушчу. Быў разбіты пад час пераправы праз раку Ганчу каля Кадыша 12.05.1863. Б. злавілі ў ваколіцы Друскенік і рашэннем ваенна-палявога суда выслалі на катаржныя працы ў Іркуцк. Пасля амністыі ў 1880 г. вярнуўся ў родныя Шаўры, дзе і памёр (Талерчык А., Майсяёнак А. Першы летапісец нашай гісторыі // Пагоня. — 1994. — 2-8 снежня. — С. 5; Швед В.В. Губернскі Гродна: аповеды з гісторыі горада (канец ст. — пачатак XX ст.). — Баранавічы: Баранавіцкая ўзбуйненая друкарня, 2003. — С. 81-88).



*Б. Нарбут*

**НАРБУТ КАЗІМІР КАЗІМІРАВІЧ** (1838—1903 гг.), адстаўны афіцэр расійскай арміі. Камандзір коннага партызанскага атра-

да (каля 100 чалавек), сфарміраванага каля Чэрска. Дзейнічаў на тэрыторыі Брэсцкага павета і Палесся. Пэўны час быў ад'ютантам у атрадзе Стасюкевіча. Удзельнічаў у баях пад Пінскам 1.07 і Макранамі 8.07. Па загаду начальніка ўзброеных сіл Гродзенскага ваяводства ад 15.11.1863 г. быў арганізатарам коннага атрада ў літоўскай конніцы Урублеўскага. Эміграваў, служыў у французскай і швейцарскай арміях. Памёр у Галіцыі. Па іншых дадзеных, вярнуўся на радзіму, займаўся гаспадаркай. Пахаваны на Ракавіцкіх могілках Кракава (ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 464; Документы повстанческих военачальников. ... — С. 191, 352; Gusciora F. Powstanie styczniowe na Polesiu. — Brzest-nad-Bugiem, 1937. — S. 35; Powstanie styczniowe i zeslancy syberyjscy. Katalog fotografii ze zbiorow Muzeum Historycznego m.st. Warszawy. — T. 1. — Warszawa: Argraf, 2004. — S. 143).



*Л. Нарбут*

**НАРБУТ ЛЮДВІК ТЭАДОРАВІЧ** (31.08.1832 г., в. Шаўры Лідскага павета — 05.05 1863 г., в. Дубічы Лідскага павета). Сын гісторыка Літвы Тэадора Нарбута і Крысціны Садоўскай, дачкі касцюшкаўскага жаўнера. У Лідзе скончыў школу і ў 1849 г. вучыўся ў Віленскай гімназіі, дзе быў удзельнікам рэвалюцыйнага гуртка «Арол і Крыж», за што ў 1850 г. быў пакараны біццём розгамі (300 разоў) і ссылкай на 12 гадоў радавым у Каўказскі корпус (ва ўзросце 18 гадоў). У 1855 г. стаў унтэр-афіцэрам за поспехі ў баі пад Карсам. Удзельнічаў у 90 сутычках з каўказскімі горцамі, 4 разы быў паранены. Атрымаў чын прапаршчыка і быў узнагароджаны ордэнам Св. Ганны 4-й ступені. Аляксандр II паміласаваў яго, і ў 1859 г. Нарбут выйшаў у адстаўку паручнікам, пасяліўся ў Лідскім павеце, у родных Шаўрах. У канцы 1862 г. прызначаны ЛПК вайсковым начальнікам Лідскага павета (з 13.02.1863 г.). У 1863 г. узначаліў адзін з першых партызанскіх атрадаў, які быў створаны ў лютым і дзейнічаў на поўдні Лідскага павета, у Белавежскай пушчы (каля 1000 чалавек). Да яго збіраліся выехаць гродзенскія гімназісты ў сакавіку 1863 г., але выбрацца здолелі толькі 7-8 чалавек. Выкарыстоўванне партызанскай тактыкі, добрае веданне мясцовых умоваў і падтрымка сялян даз-



*Т. Нарбут*

волілі атраду дзейнічаць даволі паспяхова на працягу трох месяцаў. На Лідчыне меў баі 11 красавіка 1863 г. каля в. Дубічаны і 20 красавіка каля в. Кавалкі. За заслугі ў партызанскай барацьбе Літоўскі правінцыйны камітэт надаў Нарбуту чын палкоўніка (30.04.1863 г.). Народ клікаў яго Пераможцам, а праціўнікі — чараўніком. Пасля смерці Н. у баі з карнікамі пад Дубічамі 5 мая (недалёка ад Ліды, цяпер Літва) рэшткі атрада ўліліся ў атрад А. Парадоўскага (Гродно: энцикл. справочник: БелСЭ, 1989. — С. 166; Дьяков В. Деятели. ... — С. 118-119; Швед В.В. Губернскі Гродна: аповеды з гісторыі горада (канец ст. — пачатак XX ст.). — Баранавічы: Баранавіцкая ўзбуйненая друкарня, 2003. — С. 81-88; Швед В.В. Падзеі і постаці гродзенскай даўніны. — Гродна: Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня, 1995. — С. 151-157; Karnowski T. Ludwik Narbut. Zyciorys wodza w powstaniu Styczniowem na Litwe. — Grodno, 1933; Soltysowa H. Ludwik Narbut. Wspomnienie spisan wedlug opowiadania pani Teodory Monczunskiej, rodzonej siostry Ludwika // W czterdziesta rocznice powstania Styczniowego. 1863-1903. — Lwow, 1903. — S. 433-437; Białynia-Cholodecki J. Dowodcy oddziaływ w powstaniu styczniowym ... — S. 68-69).



*Магілы Нарбутаў у Шаўрах*

**НЕВЯРОЎСКІ ФЛАРЫЯН**, ваяваў у паўстанцкім атрадзе Духінскага, а затым загадамі Урублеўскага ад 15.11.1863 г. і 3.01.1864 г. прызначаны падафіцэрам чацвёртага швадрона літоўскай кавалерыі Урублеўскага (Документы повстанческих военачальников. ... — С. 192, 215, 291, 361).

**ПАРАДОЎСКІ АЛЯКСАНДР** (мянушка Астрога), былы расійскі вайсковец, драгунскі паручнік, камандзір атрада Лідскага павета пасля смерці Л. Нарбута (4 мая 1863 г.). Дзейнічаў да позняй во-

сені 1863 г. на тэрыторыі Гродзенскай (Шчучыншчына), Віленскай (Лідчына) і Аўгустоўскай губерняў. У сярэдзіне чэрвеня каля Шчучына злучыў свой атрад з атрадам Лянкевіча, які прыйшоў сюды пасля баёў пад Янінам (15.06) і Лыскава (16.06). У складзе атрада П. ваяваў будучы класік беларускай літаратуры Ф. Багушэвіч. Восенню 1863 г. П. эміграваў, пасяліўся ў Парыжы (Гродно: энцикл. справочник: БелСЭ, 1989. — С. 166; Швед В.В. Падзеі і постаці гродзенскай даўніны. — С. 157; ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 59; Дьяков В.А. Деятели русского. ... — С. 140; Zgorzelski Cz. Powstanie Styczniowe ... — S. 11-12).

**ПАРЧЭЎСКІ ВАЛЕНЦІ**, камандзір атрада ў Бельскім павеце (некалькі дзясяткаў чалавек). У ваколіцах Супрасля атрад 1 красавіка 1863 г. напаў на транспарт, які суправаджалі 50 казакоў, частка іх была забіта, астатнія разагнаны. У гэты самы дзень напаў на каманду інвалідаў у Чарнавесі (ці Чорнае Сяло), забраў 40 ружжаў. Парчэўскі быў паранены, таму атрад распусціў, а сам паехаў у Вільню (Zielinski St. Bitwy i potyczki... — S. 321-322; Матвейчык Д. Паўстанне 1863-1864 гг. у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў. — Мн.: Медысон, 2013. — С. 29-30).

**ПАЎЛОЎСКІ РУДОЛЬФ** (альбо Павал), вольны ўрач з Кобрына. Адзін з лідараў мясцовай канспіратыўнай арганізацыі. Менавіта ён і Элерт прапанавалі Траўгуту ўзначаліць атрад Брэсцкага, Кобрынскага і Пружанскага паветаў. Сам пайшоў у партызанскі атрад Р. Траўгута. Забіты 13 мая 1863 г. у бітве каля Горак (90 км ад Кобрына на паўночны ўсход) (Грицкевич В.П. С факелом Гиппократа... — С. 204; ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 45).


*Р. Рагінскі*

**РАГІНСКІ РАМАН** (29.02.1840 г., Ловіцкі павет Варшаўскай губерні, па іншых дадзеных, 1835-15.02.1915 г., в. Снява на Украіне), паходзіў з Варшавы. З 1861 г. уключыўся ў рэвалюцыйны рух, прытрымліваўся поглядаў «чырвонай» партыі. Удзельнічаў у вядомай дэманстрацыі 27.02.1861 г. У Парыжы быў сябрам Таварыства польскай моладзі, мэтай якога была духоўная і матэрыяльная дапамога «чырвоным» у падрыхтоўцы паўстання. Вучыўся ў польскай вайсковай школе ў Італіі (Генуя), быў тут сакратаром Таварыства польскай

моладзі і вёў перапіску з Ю. Высоцкім. Напярэдадні паўстання 1863 г. займаўся фарміраваннем і навучэннем вайсковых атрадаў. Сабраў каля 800 чалавек. У студзені 1863 г. быў прызначаны вайсковым камісарам Падляшскага ваяводства. Прыцягваў у партызанскія атрады не толькі шляхту, але і мяшчан, дворскую службу, сялян. З пачаткам узброенай барацьбы ўзначаліў вялікі партызанскі атрад (да 1 тысячы чалавек), які ваяваў і на тэрыторыі Гродзенскага ваяводства: бітвы пад Сямяцічамі Бельскага павета (6-7.02.1863 г.) і Каралеўскім Мастом Беластоцкага павета (11.02), захоп Пружан (13.02). Перайшоў у Кобрынскі і Пінскі паветы, 26.02 быў атакаваны расійцамі каля в. Боркі Пінскага павета. Атрад быў разбіты, а камандзір разам з 12 чалавекамі перайшоў у Мазырскі павет. Рагінскі быў захоплены каля Турава сялянамі і перададзены расійцам (3.03.1863 г.). Яго прывезлі ў Варшаву, пасадзілі ў Аляксандраўскую цытадэль і дапытвалі. Генерал Носціц выпрасіў у вялікага князя намесніка дараваць жыццё Рагінскаму. Магчыма, таму той даў падрабязныя паказанні (за што некаторыя абвінавачваюць яго ў здрадзе), але быў высланы. На працягу амаль 30 гадоў быў зняволены ў Сібіры: Усоль, з 1868 г. на пасяленні ў Віціне, Верхнявудынску, Іркуцку. У 1892 г. вызвалены з ссылкі, паехаў у Галіцыю, дзе жыў у Носціца, супраць якога ваяваў у паўстанні. Напісаў успаміны «Z pamietnikow Romana 1859—1863» (ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 56; Авейде О. Показания и записки... — С. 648; Ігнатоўскі У. 1863 год ... — С. 110; Ностиц И.Г. Из воспоминаний о польском восстании 1863 г. М., 1900. — Ст. 6, 8; Фалькович С.М. Идейно-политическая борьба в польском освободительном движении... — С. 197, 222, 226, 230, 236; Матвейчык Д. Паўстанне 1863—1864 гг. у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў. — Мн.: Медысон, 2013. — С. 27; Roginski R. Roman Roginski, powstaniec 1863 r. Zeznania i wspomnienia. Warszawa, 1983. — S. 25-26).

**РАЖАНСКІ ФЕЛІКС**, паплечнік В.-К. Каліноўскага. Землямер з Вялікай Бераставіцы; чалец Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі (1861 г.). Пісаў вершы на беларускай мове. Адзін з выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў «Мужыцкай праўды». У 1863 г. — паўстанец атрада В. Урублеўскага, для партызан якога ствараў патрыятычныя песні. Пасля паражэння паўстання жыў у эміграцыі. Пакінуў успаміны «Z wojewodstwa grodzienskiego // W czterdziesta rocznica powstania styczniowego. 1863-1864». — Lwow, 1903. — S. 396-400.

**РАМАТОЎСКІ КАНСТАНТЫ** (мянушка Ваўр), удзельнік паўстання 1830-1831 гг., калі служыў паручнікам у 4-м палку лінейнай пяхоты. Далей перайшоў расійскую мяжу і служыў у французскім легіёне ў Алжыры. У часы існавання патаемнай арганізацыі перасяліўся ў Літву-Беларусь. З пачаткам узброенай барацьбы стаў на чале атрада ў Беластоцкім павеце. Як былому вайскоўцу яму ўдавалася доўга берагчыся ад праціўніка. 2 красавіка ўдзельнічаў у бітве ў Вялікіх Яшвілях Беластоцкага павета. 22.04.1863 г. пад Калетамі Гродзенскага павета перайшоў у Плоцкае ваяводства. Вітгенштэйн з Сувалак даносіў гродзенскаму губернатару, што 13(25), 14(26), 16(28) і 17(29) чэрвеня нанёс значныя страты атраду Ваўра: забіты каля 300 чалавек, шмат параненых, захоплены абоз, Ваўр паранены і паўстанцы разбегліся. Пасля паражэння паўстання эміграваў у Францыю, памёр у Парыжы (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 6, с. 22, а. 292; Bialynia-Cholodecki. Dowodcy... — S. 59; Jodkowski J. Rok 1863 wpowiecie... — № 33; Zielinski St. — S. 322).

**РАМАН АПАЛІНАРЫЙ ФРАНЦЭВІЧ**, мянушкі Анастазы, Атаназы, Сава (1825-1872 гг.), з дваран Люблінскай губерні, выхоўваўся ў прыватнай навучальнай установе, на рускай вайсковай службе з 1846 па 1863 г. Удзельнічаў у венгерскім паходзе ў 1849 г., ваяваў у Крымскай вайне. Належаў да рэвалюцыйнай арганізацыі афіцэраў рускай арміі ў Польшчы. Калі пачалося студзеньскае паўстанне, быў штабс-капітанам Лібаўскага пяхотнага палка. 24.04.1863 г. збег у Беласток да паўстанцаў. Камандаваў асобным паўстанцкім атрадам на Гродзеншчыне, Падляшшы, Любліншчыне. Пасля паражэння паўстання эміграваў у Францыю, дзе і памёр. Па некаторых дадзеных, ён застрэліўся ў Парыжы ў другой палове 1864 г. (Русско-польские революционные связи: материалы и документы. — Т. I. — С. 507; Дьяков В.А. Деятели... — С. 147-148, 209, 229; Кісялёў Г. Паплечнік Каліноўскага... — С. 31; Łaniec S. Partyzanci kresyw Pyłnocno-wschdnich w powstaniu styczniowym (ziemie białoruskie). — Toruń: b.w., 1996. — S. 104).

**РЫЛЬСКІ БРАНІСЛАЎ**, камандзір атрада Бельскага павета. Атрад прыняў бой пад Сямяцічамі 6-7.02, Каралеўскім Мастом 11.02, удзельнічаў у захопе Пружан 13.02. 15 лютага 1863 г. пераважаючым расійскім войскам атрад быў разбіты пад Рэчыцай Пружанскага павета. Рыльскі трапіў у палон (Гродно: энцикл. справочник. — С. 165; Gusciora F. Powstanie styczniowe na Polesiu. — Brzest-nad-Bugiem, 1937. — S. 35; Roginski R. Roman Roginski, powstaniec ... — S. 79).

**САМУЛЬСКІ**, спачатку знаходзіўся ў атрадзе Рагінскага, быў паранены, пасля выздараўлення сфарміраваў свой атрад з 70 пружанскіх паўстанцаў і прывёў іх да Стравінскага. Затым сфарміраваў атрад з 40 чалавек і далучыўся да Улодака. Сасланы ўглыб Расіі (ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 28).

**САНГІН СТАНІСЛАЎ ЮЗЭФАТАВІЧ**, камандзір атрада Бельскага павета. Атрад прыняў бой пад Сямяцічамі, удзельнічаў у захопе Пружан, 15 лютага 1863 г. быў разбіты пераважаючым расійскім войскам каля в. Рэчыца Кобрынскага павета. Сангін у баі быў забіты (Гродно: энциклопедический словарь... — С. 165; Матвейчык Д. Паўстанне 1863-1864 гг. у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў. — Мн.: Медысон, 2013. — С. 29).

**САСУЛІЧ КСАВЕРЫ** (1821—? гг.), камандзір 3-й стралковай роты з Гродна ў атрадзе Г. Стравінскага, а потым асобнага атрада колькасцю 120 чалавек, які дзейнічаў на поўдні Ваўкавыскага павета (ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 29, 39).

**СТАНІШЭЎСКІ ЯЎГЕН** (каля 1836—10.01.1864 гг.), земляўладальнік з Літвы, ад’ютант Стасюкевіча, затым служыў у атрадзе Нарбута, быў ад’ютантам камандзіра літоўскай кавалерыі атрада Урублеўскага. Забіты ў бітве пад Усцімавым (Dokumenty terenowych wladz wojskowych=Документы повстанческих военачальников, 1863-1864 / Red. Tomu W. Djakow, S. Kieniewicz // Powstanie styczniowe: materialy i dokumenty, Wroclaw: Zaklad Narodowy im. Osolińskich, 1976. — С. 191).

**СТАСЮКЕВІЧ ФЛАРЫЯН** (1839—? гг.), былы семінарыст з м. Янава. Спачатку ваяваў у атрадзе Р. Рагінскага. Атрымаўшы патэнт ад варшаўскіх уладаў, сфарміраваў атрад колькасцю да 300 чалавек у Брэсцкім павеце, у Ракітнянскіх лясах за 10 вёрст ад Янава (у маі 1863 г. — да 460 чалавек). Большасць атрада складалі сяляне, рамеснікі, рабочыя з Кобрынскага і Брэсцкага паветаў. Фінансы прыходзілі з Гродзенскага павета і Каралеўства Польскага. У атрадзе знаходзіліся стрыечныя браты К. Каліноўскага (доктар Іван Юр’евіч і ўнтэр-афіцэр). Вядомы бой атрада пад Чэрскам 27 мая, які доўжыўся 2 гадзіны. Страцілі 11 забітымі і 17 параненымі. Летам С. быў выкліканы ў Варшаву, эміграваў (Гродно: энцикл. справочник: БелСЭ, 1989. — С. 166; ARCHE. — 2010. — № 12. —

С. 45; Каліноўскі К. За нашую вольнасць... — С. 185, 367; Aramowicz I. Marzenia. Pamietnik o ruchu partyzanckim ... — S. 42-43).

**СТРАВІНСКІ ВІЛЬГЕЛЬМ**, падафіцэр у другім узводзе коннага атрада літоўскай кавалерыі Урублеўскага (Документы повстанческих военачальников... — С. 191).

**СТРАВІНСКІ ГУСТАЎ** (мянушка Млотак) (1837 г., в. Ізабэлін Ваўкавыскага ўезда — 1905 г.). Служыў у расійскім войску: паручнік Мурамскага пяхотнага палка, удзельнічаў у Крымскай вайне. У адстаўцы займаўся сельскай гаспадаркай — у Слонімскім павеце меў маёнткі Ржэнічы і Сіротаўшчына. У красавіку 1863 г. атрымаў намінацыю на камандзіра атрада Ваўкавыскага павета. Камандаваў партызанскім атрадам, аснову яго складалі жыхары м. Лыскаў і ваколіц (каля 136 чалавек). Правёў паспяховыя баі і сутычкі з расійскімі войскамі пад Міхалінам Ваўкавыскага павета (14-15.05), быў лёгка паранены ў правую руку, пад Савіцкімі Карчмамі, Вялікім Кутам (17.05), Мілавідамі (3-4.06), Жаркаўшчынай, Рышкоўскімі Астраўкамі ў Белавежскай пушчы, Глыбокім Куце Пружанскага павета (30.08). 15.08.1863 г. прызначаны начальнікам узброеных сіл Ваўкавыскага павета ў чыне маёра. У канцы верасня 1863 г. распусціў свой атрад і з’ехаў у Францыю на лячэнне пасля ранення. Двор у Ізабэліне быў секвестраваны. У студзені 1866 г. пасяліўся ў Галіцыі, дзе купіў маёнтак Шыдлоўцы ў Гусяцінскім павеце, дзе і памёр (НГАБ у Гродне, ф. 23, воп. 1, с. 372, а. 118 адв.; Дьяков В. Деятели... — С. 165-166; Электронны рэсурс: narod.ru|kalinouski | archives| memorires|razhanski.htm. — Дата доступа: 16.01.2013; ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 26; Быхаўцаў М. Паўстанне 1863-1864 гадоў у Ваўкавыскім павеце. — Гародня, 2014. — С. 99; Białynia-Cholodecki J. Dowodcy... — S. 68-69; Zielinski St. — S. 14).

**ТОЛКІН ДАМІНІК**, калежскі асэсар. Удзельнічаў у спяванні патрыятычных песен і гімнаў, патрыятычных мерапрыемствах у 1861-1862 гг. Да паўстанцаў далучыўся ў красавіку 1863 г. Удзельнічаў у бітвах пад Мерачоўшчызнай (8.06), Жаркаўшчызнай (21.06). З А. Духінскім адышоў у Белавежскую пушчу. З канца чэрвеня 1863 г. камандзір партызанскага атрада (каля 60 чалавек), лагер якога быў у Пілатаўскіх лясах пад Гарадком (Грудкам) Беластоцкага павета. Дзейнічаў на тэрыторыі гэтага і Бельскага паветаў. 1 жніўня падвергся атацы расійскай часці пад Гарадком, вымушаны

адысці да Скрабацянкі да Ю. Эйтміновіча і быў далучаны да атрада Б. Эйтміновіча. Загінуў у сутычцы пад в. Лукавіца Бельскага павета. 17 ці 19.09.1863 г. паранены куляй і заколаты дзідай. Драўляны дом, які Толкін меў у Гродне, быў секвестраваны 24.07.1864 г. і перададзены штабс-ротмістру Федасенка за плацёж 80 рублёў у год (вызвалены ад секвестра 09.1866 г.) (НГАБ у Гродне, ф. 31, воп. 3, спр. 553, а. 13 адв.-14; ф. 23, воп. 1, с. 372, а. 118; ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 37; Zielinski St. — S. 334, 338; Ksiazek T., Mlynarski Z. Udzial Rosjan, Litwinyw, Bialorusinyw, Ukraincyw w powstaniu Styczniowym 1863-1864. — Warszawa: Wojsk. Zakl. Graf., 1962. — S. 40).

**ТРАЎГУТ РАМУАЛЬД ЛЮДВІКАВІЧ** (мянушка Кракаўскі) (16.01.1826 г., в. Шастакова Брэсцкага павета — 5.08.1864 г.). Скончыў Свіслацкую гімназію, потым пансіён Сцяпанава ў Пецярбургу. З 1845 па 1861 г. служыў у Расійскай арміі, падпалкоўнік інжынернай службы. Быў звязаны з шэрагам дзеячоў рэвалюцыйнага руху. Удзельнічаў у Крымскай вайне. Выйшаў у адстаўку з Пецярбургскай гальванічнай установы ў маі 1861 г. Пасяліўся ў маёнтку Востраў (3 км ад Кобрына), ажаніўся на ўнучцы А.Т. Касцюшкі Антаніне Эстка. Падчас паўстання ў маі-ліпені 1863 г. камандаваў кобрынскім партызанскім атрадам, сфарміраваным у Гарадзецкім лесе 7-13 мая 1863 г. (каля 200 чалавек). Перамог царскіх вайскоўцаў у баі пры в. Горкі (17.05). Праз 10 дзён да яго далучыліся паўстанцы атрада Я. Ваньковіча (Лялівы) і Старынкевіча, з якімі зрабілі рэйд на Піншчыну і паўночную Валынь. Тройчы прымалі ўдзел у баях з расійскім карным войскам. Пасля бітвы 26 чэрвеня пад Дамбровіцай рэшткі атрада адышлі ў Пінскі павет і каля м. Калоднае (12-13.07) былі акружаны, а затым разбіты царскім войскам. Сам Траўгут з дапамогай Э. Ажэшкі даехаў да мяжы Каралеўства Польскага, каб дабрацца да Варшавы. 14 жніўня 1863 г. атрымаў чын генерала і быў накіраваны Нацыянальным урадам у якасці надзвычайнага камісара ў Францыю, каб прыспешыць міжнародную дапамогу паўстанню. 17 кастрычніка ўзначаліў Нацыянальны ўрад і фактычна стаў праводзіць дыктатарскую ўладу паўстання ў Польшчы (афіцыйна такой пасады не было). Арыштаваны ў ноч з 10 на 11 сакавіка 1864 г. і 5.08.1864 г. павешаны ў Варшаўскай цытадэлі. У 1928 г. у Свіслачы быў усталяваны помнік Т., які пазней разбурылі, а ў 1989 г. аднавілі (Гродно: энцикл. справочник: БелСЭ, 1989. С. 166; Дьяков В. Деятели... — С. 170-171; Кісялёў Г. Траўгут Рамуальд Людвікавіч // ЭГБ. — Т. 6. — Кн. 1. — Мн.: БелЭн, 2001. — С. 518; Slownik historii Polski / pod red. J. Maciszewskiego. — Warszawa: POW, 1998. — S. 314-315; Bialynski-Cholodecki J. Dowodcy... — S. 74-76; Cederbaum... — S. 156).

**ТЫШКЕВІЧ (Тышка, Тыска) АНТОНІ** (1839 — ? гг.). Паручнік у атрадзе Замэчка, ад'ютант Падлеўскага. Пазней маёр, камандзір атрада колькасцю каля 100 чалавек, які дзейнічаў на тэрыторыі Гродзенскай і Аўгустоўскай, Ламжынскай губерняў. Пасля паўстання гаспадарыў на зямлі (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 280, а. 6; Восстание в Литве и Белоруссии 1863 — 1864 гг. ... — С. 77; Документы повстанческих военачальников. ... — С. 369).

**УЛАДЫЧАНСКІ ТЭАФІЛ ТАДЭВУШАВІЧ** (мянушка Зарэмба) (1833-1863 гг.), паходзіў з Гродзенскай губерні. Вучыўся ў Брэсцкім кадэцкім корпусе, у Акадэміі Генеральнага штаба. У красавіку 1863 г. выйшаў у адстаўку і далучыўся да паўстанцаў. Камандзір атрада (каля 120 чалавек), сфарміраванага ў Сакольскім павеце. Прывёў яго да Духінскага, які знаходзіўся ля Будзіска ў Сакольскай пушчы. Ваяваў на тэрыторыі Гродзенскай губерні і Каралеўства Польскага, загінуў 30.09.1863 г. (Арамовіч І. Мары. Успаміны пра партызанскі рух у Гродзенскім ваяводстве ў 1863 і 1864 гг. // ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 22-23).

**УЛОДЭК ФЕЛІКС-Адам-Ян** (мянушкі Самуха, Здзіхоўскі, Шчэнсны) (1838—? гг.). Гаспадар маёнткаў Кабякі ў Пружанскім павеце і Матыкі ў Брэсцкім. Выконваў абавязкі вайсковага начальніка Пружанскага павета. Камандзір атрада (каля 300 чалавек), які сфарміраваны 20.04.1863 г. каля карчмы Пінюкі Пружанскага павета. Па паказаннях аднаго з паўстанцаў, у атрадзе не было конных і каней, харчаваліся ўсе самі па сабе ад сялян у вёсках, грошы бралі з агульнай касы, якая захоўвалася ў камандзіра. Атрад дзейнічаў у сённяшніх Пружанскім, Бярозаўскім і Івацэвіцкім раёнах. Прыняў удзел у бітве пад Людвінава, потым увайшоў у злучэнне Лянкевіча і прыйшоў у лагер Юндзіла пад Мілавідамі. Не згодны з планам бою Лянкевіча, 3.06.1863 г. пакінуў яго і адышоў да атрада Траўгута. Прыняў удзел у бітве ў Чорнага возера каля в. Пескі (11.06). У сярэдзіне лета перадаў свой атрад А. Духінскаму. Ад следства схаваўся (эміграваў) (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 10; Электронны рэсурс: rberascie.livejournal.com. — Дата доступа: 16.01.2013; ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 28; Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии... — С. 353, 365; Maliszewski J. Powstanie Styczniowe: Notatki biograficzne uczestnikyw. — Warszawa: nakładem autora, 1932. — S. 95-96; Zgożelski Cz. Powstanie Styczniowe ... — S. 14).

**УРУБЛЕЎСКІ ВАЛЕРЫ АНТОНІЕВІЧ** (15(27).12.1836 г., м. Жалудок — 5.08.1908 г., Парыж), камандуючы ўзброенымі сіламі паўстанцаў Гродзенскага ваяводства да сакавіцкага пераварота «белых» у 1863 г. У канцы 1850-х гг. у доме дзядзькі Яўстахія ў Вільні сустрэўся з Л. Кандратовічам (Сыракомлей), З. Серакоўскім, К. Каліноўскім. Па сцвярджэнню стрыечнага брата Тадэвуша, Урублеўскі «падтрымліваў беларускую народнасць». З 24 красавіка 1863 г. У. фарміраваў паўстанцкі атрад Сакольскага павета, меў чын капітана. Аснову атрада складалі вучні пісарска-егерскага вучылішча ў Сакулцы. Камандаваў стралкамі ў бітве ва ўрочышчы Пагарэлае Ружанскай казённай дачы Слонімскага павета (2.06.1863 г.). У чэрвені адзначыўся ў бітве каля в. Мерачоўшчына. Быў начальнікам штаба і па сутнасці камандаваў войскам, бо Духінскі не валодаў мясцовай сітуацыяй. З ад’ездам апошняга з 15 жніўня 1863 г. кіраваў рэшткамі беларускіх атрадаў на тэрыторыі Падляшша і Люблінскага ваяводства ў чыне палкоўніка. Сучаснікі сведчылі, што Урублеўскі першым уступаў у бой і апошнім адыходзіў. У студзені 1864 г. У. быў цяжка паранены ў галаву і правае плячо і лячыўся спачатку ў арандатара Ксаверыя Складоўскага, а потым быў вывезены яго пляменніцай (цёткай Марыі Кюры-Складоўскай) пераапранутым у жаночую вопратку ў паўстанцкі шпіталь графіні Таркоўскай у Галіцыю. Пазней яму ўдалося эміграваць у Францыю, дзе ў 1871 г. стаў генералам Парыжскай камуны і ваяваў з вярсальцамі. Гродзенскі ваенны суд 22.08 (3.09).1864 г. завочна прыгаварыў Урублеўскага да пакарання смерцю праз расстрэл (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11 адв., 39, 47 адв.; воп. 1, с. 16, а. 64 адв.; Абрамавичус В.Е., Дьяков В.А. Валерий Врублевский // За нашу и вашу свободу. Герои 1863 года. — М.: Молодая гвардия, 1964. — С. 394-395; Кісялёў Г. Разам з вялікім Кастусём //Беларуская мова і літаратура у школе. — 1989. - № 2. — С. 47-48; Лушчыцкі І.П. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палове XIX ст. — Мн.: Белдзяржуніверсітэт, 1958. — С. 194; Гродно: энцикл. справочник: БелСЭ, 1989. — С. 166; 124; Białynia-Cholodecki J. Dowodcy oddziaływ w powstaniu styczniowym ... — S. 79-80; Limanowski B. Szermiierze wolności. — Krakyw: spylka nakladowa „książka», 1911. — S. 245; Rożanski F. Z wojewydztwa Grodzieńskiego // W czterdziestą rocznicę powstania Styczniowego, 1863-1903. — Lwyw, 1903. — S. 400; Zgozelski Cz. Powstanie Styczniowe. — S. 18).

**ХАДАКОЎСКІ ІЛЬДЭФОНС**, выконваў абавязкі вайсковага начальніка Пружанскага павета пасля Ф. Улодка (Maliszewski J. Powstanie Styczniowe ... — S. 96).

**ЦІХОРСКІ УЛАДЗІСЛАЎ РАМАН** (псеўданім Замечак), камандзір аб'яднаных паўстанцкіх сіл, якія прыйшлі з Польшчы і ўдзельнічалі ў бітве ў заштатным горадзе Сураж Беластоцкага павета (21 студзеня 1863 г.). Перадаў свой атрад З. Падлеўскаму пасля бітвы пад Сямяцічамі Бельскага павета (6.02.1863 г.). Рагінскі ва ўспамінах пісаў, што Ціхорскі не меў ніякага разумення аб вядзенні баявых дзеянняў. Хаджынскі ўзгадваў, што Ц. не любіў падпарадкоўвацца іншым камандзірам, а паўстанцкія камандзіры не любілі яго. Эміграваў у Парыж (Białynia-Cholodecki J. Dowodcy oddziaływ w powstaniu styczniowym ... — S. 18; Gyra S. Działalnosć powstańcza Romana Rogińskiego na Podlasiu // Rocznik Białostoćki. T. VI. — Białystok, 1966. — S. 393-394).



*Р. Рагінскі*

**ЧАРНЯЎСКІ А.**, камандзір атрада (каля 400 чалавек), які прыйшоў у Сямяцічы 7 лютага 1863 г. і ўдзельнічаў у бітве.

**ШАНЯЎСКІ АЛЯКСАНДР**, памешчык, сябра патаемнай арганізацыі Падляскага ваяводства (вайсковы начальнік Бяльскага павета). Камандзір групы паўстанцаў у бітве пры Сямяцічах 7 лютага 1863 г. Адбіў некалькі атак расійскіх стральцоў і прымусіў іх адысці. Памёр ад ран, атрыманых у бітве пад Сыцына (Machnik L. Fotografie powstańcyw styczniowych w zbiyrach Gabinetu Grafiki Zakladu Narodowego im. Ossolinskich. Katalog. — Wroclaw: Tow-wo Przyjaciyl Ossolineum, 2002. — S. 184; Zielinski St. — S. 334).

**ШЧУКА ВІНЦЭНТ**, падафіцэр у чацвёртым узводзе коннага атрада літоўскай кавалерыі Урублеўскага (Документы повстанческих военачальников... — С. 192).

**ЭЙТМІНОВІЧ БАГУСЛАЎ АНТОН ФРАНЦАВІЧ** (1833, ці 1830—1864, ці 1863 г.), з дваран Ковенскай губерні, закончыў у кастрычніку 1857 г. Царскасельскую афіцэрскую стралковую школу. Верагодна, уваходзіў у гурток З. Серакоўскага-Я. Дам-

броўскага. Калі пачалося паўстанне, быў паручнікам Лібаўскага пяхотнага палка, які знаходзіўся на Беласточчыне. Перайшоў на бок паўстанцаў, выконваў абавязкі вайсковага начальніка Сакольскага павета. Партызаніў у Беластоцкім і Бельскім паветах, пераняўшы камандаванне атрадам ад брата Юліяна. Пазней камандаваў пяхотай у атрадзе Урублеўскага. У жніўні лагер атрада знаходзіўся ў Скрабацянцы, куды прыйшоў пасля бітвы пад Гарадком (Грудкам) Толкін. Разам яны разбілі расіян пад Сакаловым (17.09) і Расочам (18.11) Падляскага ваяводства, в. Калана (19.11.1863 г.), Малінаўкай (21.11), Цыцовым (14, 16.12), Воляй Асавінскай (16.12). 6 студзеня 1864 г. адбылася апошняя бітва Э. пад Усцімавым, дзе на яго напалі драгуны і казакі, затым расійская пяхота. Быў забіты палашом па галаве, а па словах сведкі, ён застрэліўся, каб не трапіць у палон. У 2008 г. месца яго пахавання знойдзена, а ў 2009 г. польскія і літоўскія ўлады ўсталявалі помнік на яго магіле (Zielinski St. Bitwy i potyczki... — S. 334, 337; Кісялёў Г. Паплечнік Каліноўскага. — Мн.: Народная асвета, 1976. — С. 27; Дьяков В.А. Деятели ... — С. 193; Łaniec S. Partyzanci kresyw Pyłnocno-wschdnich w powstaniu styczniowym (ziemie białoruskie). — Toruń: b.w., 1996. — S. 104; ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 22; Maliszewski J. Powstanie styczniowe ... — S. 96; Kolumna. — Cz. 2. — S. 11-14).

**ЭЙТМІНОВІЧ МАНТВІЛ БАГУСЛАВАВІЧ** (1830—1864 гг.), афіцэр расійскага гарнізона ў Беластоку, сябра патаемнага таварыства, у красавіку 1863 г. разам з Юліянам перайшоў на бок паўстанцаў і ўзначаліў атрад, які стварыў брат. Разам з Баранцэвічам і Крысінскім ваяваў на Падляссі і Люблiншчыне. Забіты ў бітве пад Усцімавым 6.01.1864 г. (Kolumna. — Cz. 2. — S. 205, 352).

**ЭЙТМІНОВІЧ 1-ы (Эйтмановіч) ЮЛІЯН-МАРК ФРАНЦАВІЧ** (1834—1873 гг.), з дваран Ковенскай губерні, вучыўся ў прыватнай навучальнай установе. З 1850 г. на вайсковай службе, удзельнічаў у Крымскай вайне (1853—1856 гг.). Калі пачалося паўстанне, быў капітанам Лібаўскага пяхотнага палка. Належаў да рэвалюцыйнай арганізацыі афіцэраў рускай арміі ў Польшчы. У бітве пад Сямяцічамі ваяваў супраць паўстанцаў (займаў нейтральную пазіцыю) і быў узнагароджаны па прадстаўленні Манюкіна ордэнам Св. Уладзіміра з мячамі і чынам маёра. Адаслаў узнагароду Манюкіну і 24.04.1863 г. перайшоў на бок паўстанцаў з вернымі яму польскімі салдатамі. У Скрабацянцы Бельскага павета збіраў з дапамогай Баранцэвіча і Кярсноўскага партызанскія атрады. 4 мая

ваяваў пад Горнавым. Камандаваў батальёнам паўстанцаў у бітве ва ўрочышчы Пагарэлае Слонімскага павета (2.06.1863 г.). Узначальваў атрад, які дзейнічаў у Гродзенскай і Люблінскай губернях. Прымаў удзел у баях пад Вялікім Углом, Баярамі, Лукавіцай. Супрацоўнічаў з В. Урублеўскім. Пасля бітвы пад Рудкай Карыбутаўскай перайшоў мяжу і застаўся ў эміграцыі. Дзякуючы былому камандзіру А. Баранцэвічу пасяліўся ў Станіславове (Галіцыя), дзе і памёр (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 8 адв.-9; воп. 1, с. 16, а. 64 адв.; Zielinski St. Bitwy i potyczki... — S. 334, 337; Кісялёў Г. Паплечнік Каліноўскага...— С. 27; Дьяков В.А. Деятели... — С. 193, 209, 229; Łaniec S. Partyzanci kresyw Pyłnocno-wschdnich w powstaniu styczniowym (ziemie białoruskie). — Toruń: b.w., 1996. — S. 104; Zielinski St. — S. 334, 337; Powierza P. — S. 20, 102; Русско-польские революционные связи: материалы и документы. — Т. I. — С. 491; Т. II. — С. 772).

**ЮНДЗІЛ ФРАНЦІШАК УЛАДЗІСЛАВАВІЧ** (1825—14.02.1865 гг.), нарадзіўся ў фальварку Югалін Слонімскага павета (цяпер Івацэвіцкі раён), былы расійскі вайсковец. Выконваў абавязкі вайсковага начальніка Слонімскага павета. Камандзір атрада (каля 300 чалавек), які фарміраваўся ва ўрочышчы Старынка паблізу Югаліна, злучыў свой атрад з атрадам І. Лукашэвіча. Атрад дзейнічаў у раёне Югаліна і Дабрамысля, браў удзел у бітвах пад Літвінавам 28 мая, Мілавідамі 2-3 чэрвеня, Глыбокім Кутам 30 жніўня 1863 г. У пачатку чэрвеня злучыўся з атрадамі А. Лянкевіча і В. Міладоўскага. У жніўні перадаў камандаванне атрадам Я. Калупайлу, праз некаторы час эміграваў. Жыў у Кракаве, дзе стаў камендантам горада, 20.01.1864 г. — арганізатарам Кракаўскай вайсковай акругі. 12.02.1864 г. яму нададзена званне падпалкоўніка. У пачатку сакавіка 1864 г. выехаў у Францыю. Лячыўся ў парыжскім шпіталі, дзе і памёр ад сухотаў (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 112; Электронны рэсурс: rberascie.livejournal.com. — Дата доступа: 16.01.2013).

**ЯБЛАНОЎСКІ УЛАДЗІСЛАЎ**, сябра Таварыства польскай моладзі ў Парыжы (1861 г.), служыў у Вянгерскім легіёне. Вучыўся ў вайсковай школе ў Кунеа (Італія), дзе выконваў абавязкі вучня-фельдфебеля. Пад час паўстання 1863 г. камандаваў атрадам колькасцю 800 чалавек, які стаяў у 6 вярстах ад Сямяціч, калі там ішоў бой 7 лютага 1863 г. (Миловидов А.И. Перечень боевых столкновений русских войск с польскими повстанцами в кампании

1863-1864 гг. в пределах Северо-Западного края..., Вильна, 1915. — С. XXX; Фалькович С.М. Идейно-политическая борьба... — С. 197, 198, 223).



*Ф. Ягмін*

**ЯГМІН ФЕЛІКС-Станіслаў-Ігнацый-Люцэўм СТАНІСЛАВАВІЧ** (каля 1833—1864 гг.), з дваран Гродзенскай губерні, меў маёнтак Дывін у Кобрынскім павеце, пасля смерці бацькі — дамы ў Брэсце і Друскеніках. Выхоўваўся ў прыватнай навучальнай установе. З 1852 г. на расійскай вайсковай службе, з 1854 г. — афіцэр. Удзельнічаў у Крымскай вайне. Штабс-ротмістр лейб-уланскага Курляндскага палка. Чалец рэвалюцыйнай арганізацыі афіцэраў рускай арміі ў Польшчы. Спачуваў паўстанцам і за «дрэнны» ўплыў на калег быў пераведзены 21.03.1862 г. у Вазнясенскі ўланскі полк. Падаў у адстаўку і быў звольнены загадам ад 28.08.1862 г. Камандзір кавалерыі ў атрадзе Траўгута, які сфарміраваўся ў красавіку 1863 г. у Кобрынскім павеце. Параненым трапіў у палон у бітве пад Горкамі, быў сасланы, на этапе, недзе паміж Казанню і Кунгурам памёр у красавіку 1864 г. Частка маёнтка, якая належала яму, была секвестравана (Дьяков В.А. Деятели... — С. 195, 227; НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 14, с. 292, а. 31; ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 126 адв.; ф. 23, воп. 1, с. 372, а. 120; Русско-польские революционные связи: материалы и документы. — Т. I. — С. 382; Т. II. — С. 773).

**ЯТАЎТ МАРЦІН ВОСІПАВІЧ** (1839 г., Ковенская губерня — ?). У вайсковай службе з 1859 г. Юнкер Лібаўскага пяхотнага палка. У лютым 1863 г. пакінуў войска і перайшоў на бок паўстанцаў, узяўшы з сабой «усе казённыя рэчы, 6-лінейную вінтоўку за № 977, поўную баявую амуніцыю з поўнай колькасцю патронаў і гарністы свісток». Сфарміраваў з вучняў 5-га і 6-га класаў Беластоцкай гімназіі атрад. Забіты ў бітве з расіянамі 11.02.1863 г. пад Крулёвым Мастом Ваўкавыскага павета Гродзенскай губерні (Дьяков В.А. Деятели... — С. 198; Kolumna. — Cz. 2. — S. 11-14).

Такім чынам, партызанскія атрады былі створаны ва ўсіх паветах Гродзенскага паўстанцкага ваяводства. Вельмі многія з іх былі пад камандаваннем адстаўных ці дзеючых расійскіх афіцэраў, якія паходзілі з беларускіх зямель. Агульная колькасць усіх гродзенскіх

атрадаў, па падліках А.Ф. Смірнова, не перавышала 2 тысяч чалавек[201]. Ніжэй апісаны баі, бітвы, сутычкі, у якіх яны прынялі ўдзел (даты падаюцца па новаму стылю)[202].

*23.01.1863 г.,* м. Кодэн, 20 вёрст ад г. Брэст-Літоўска, паўстанцкі атрад на чале з Грубецкім ноччу ўступіў у бой з расійскім атрадам (лятальны парк № 2). Забіты 9, паранены 16 ніжніх чыноў. Страты паўстанцаў невядомыя.

*23.01.1863 г.,* заштатны г. Сураж, Беластоцкі павет. 7-я рота 22-га батальёна Лібаўскага пяхотнага палка пад камандаваннем капітана Малюгі ў ноч на 23.01 баранілася ад нападу паўстанцаў (каля 1000 чалавек). У. Ціхорскага (Замечка), але вымушана была ў колькасці 60 чалавек адступіць да Заблудава. Забіты 3 расійцы і 1 паўстанец. Апошнія разграмілі ротны цэйхгаўз, але зброю і амуніцыю не захапілі (за што Ціхорскі абвінавачваў камандзіра аддзела, штурмуючага магазін, Клімантовіча)[203].

*30.01,* маёнтак Рудка, Бельскі павет. Ноччу паўстанцы (па паказаннях палонных казакоў, іх было каля 2 тысяч чалавек) напалі на каманду казакоў Данскога № 33 палка колькасцю 45 чалавек (камандзір харужы Каласкоў), з якіх 4 забілі (іх пахавалі 3.02 у Бельску), 6 паранілі, 8 узялі ў палон. Казакі адышлі да Бельска. Жыхарам маёнтка на наступны дзень паўстанцы зачыталі маніфест аб неіснаванні расійскага ўрада, спалілі паперы з валаснога праўлення, адабралі ў казакоў 33 страявых каня і 23 дзіды, 22 ружжа, 23 палашы. Генерал З.С. Манюкін выслаў пагоню, але безвынікова[204].

*4.02,* в. Мялейчыцы, Бельскі павет. Атрад паўстанцаў вызваліў рэкрутаў, якіх везлі з Мялейчыц да Высока-Літоўска. У пагоню расійцы паслалі з Брэста ў напрамак Высока-Літоўска роту пяхоты з 2 гарматамі, 40 казакамі.

201 Смирнов А.Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. – М.: Изд-во АН СССР, 1963. – С. 229.

202 Базавыя крыніцы прыводзяцца напрыканцы дадзенага нарыса, дадатковая літаратура даецца ў спасылках.

203 Сборник распоряжений графа Михаила Николаевича Муравьёва по усмирению польского мятежа в Северо-Западных губерниях 1863-1864 гг. / сост. Н. Цылов. – Вильна, 1866. – С. 306.

204 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 167, а. 6, 16 адв. – 18 адв.

*6.02*, мыза Далбізна Брэст-Літоўскага павета. Бой паміж паўстанцамі Рагінскага (да 1500 чалавек) і расійцамі (2 роты Рэвельскага палка і 5-я рота Пскоўскага палка, 53 казакі Данскога № 24 палка) пад камандаваннем Янішэўскага.

*6.02*, м. Сямятычы, Бельскі павет. Тут 10 дзён стаяў моцны атрад У. Ціхорскага, да якога сцякаліся іншыя паўстанцы (мясцовыя С. Сангіна і Б. Рыльскага) — усяго каля 4-5 тысяч чалавек. Царскія часці пад камандаваннем генерал-лейтэнанта З.С. Манюкіна і Крываносава (7ротаў пяхоты, артылерыйская батарэя з 4 гармат і казакі) пачалі бамбардзіроўку мястэчка, але беспаспяхова. Таму касіянеры на чале з І. Місткоўскім ударылі па іх, прымусілі адступіць, некалькі чалавек забіўшы і параніўшы. Страты паўстанцаў: 14 забітых, 13 параненых (сярод іх М. Сняжынскі і А. Волман). У. Ціхорскі адправіў кавалерыю на чале з Л. Плуцінскім да Драгічына, а сам вырашыў пакінуць мястэчка.

*7.02,* падзеі ў Сямятычах працягваліся. Сюды падышлі атрады Р. Рагінскага, В. Левандоўскага і А. Чарняўскага (400 чалавек), у 6 вярстах ад мястэчка стаяў У. Ябланоўскі (800 чалавек). Каля поўдня генерал Манюкін атакаваў паўстанцаў, ілжывым адступленнем выманіў атрады ў адкрытае поле і нанёс ім моцны ўрон артылерыйскім абстрэлам. Паўстанцы вымушаны былі адысці. Зацятыя баі адбываліся і на вуліцах мястэчка. Першым адышоў праз мост за рэчку Рагінскі, затым Левандоўскі, яны страцілі каля 100 чалавек забітымі, каля 200 чалавек (у большасці сяляне) трапілі ў палон (сярод іх К. Тапольскі, Э. Іваноўскі, Н. Стаповіч, Р. Белаўскі). За дапамогу паўстанцам жылыя і гаспадарчыя пабудовы жыхароў Сямятычаў былі спалены.

*8.02,* заштатны горад Сураж, Беластоцкі павет. Адзін з атрадаў паўстанцаў Ціхорскага, вырваўшыся з Сямятыч, напаў на казацкі патруль і забіў 6 чалавек.

*9.02,* мыза Далбізна Брэст-Літоўскага павета. Бой паміж паўстанцамі Рагінскага і расійцамі (2 роты Рэвельскага палка) пад камандаваннем Янішэўскага. Забіты 1, паранены 3 расійцы, страты паўстанцаў невядомыя. Расійцы артылерыйскім агнём знішчылі вёску, разрабавалі маёнтак, а яго гаспадара Снежку расстралялі за дапамогу паўстанцам.

*10.02,* м. Янава і Нямірава Бельскага павета, сюды адступіў ад Белай атрад Р. Рагінскага (па афіцыйных дадзеных, каля 600 чалавек). Пад час пераправы праз Буг ён быў абстраляны пяхотай Пскоўскага палка на чале з падпалкоўнікам Вімбергам. Апошні згубіў 18 чалавек, а паўстанцы — некалькі (па афіцыйных дадзеных, расійцы — 1 забіты і 2 паранены, паўстанцы — забіты 1 чалавек).

*11.02,* Каралёў Мост, Пружанскі павет. Адбылася зацятая сутычка атрадаў Рагінскага, Рыльскага і Сангіна, якія перапраўляліся праз раку, з урадавым войскам (5 ротаў Пскоўскага палка, 3 роты Рэвельскага палка, 85 казакоў № 24 Данскога палка пры 4 гарматах) пад кіраўніцтвам флігель-ад'ютанта графа І. Носціца і падпалкоўніка Вімберга. Паўстанцы страцілі абоз, штандар атрада, некалькі чалавек забітымі і палоннымі (па афіцыйных дадзеных, забіты 12, патанулі 5, у палон узяты 20 чалавек), але 70 чалавек пераправіліся праз раку і дабраліся да Белавежскай пушчы.

*12.02,* м. Шарашова. Атрад паўстанцаў Рагінскага і Сангіна, Рыльскага (каля 200 чалавек), узброеных паляўнічымі ружжамі, пісталетамі, кінжаламі, захапіў мястэчка. У кватэры прystава размеркаваўся камандзір атрада, астатнія каля касцёла. Пасля закупкі кажушкоў, ботаў і іншага адзення, забраўшы ў сельскім праўленні 93 рублі казённых грошай, выехалі на 15 фурманках у напрамку Пружан[205].



*Бой атрада Рагінскага за Пружаны*

*13.02,* г. Пружаны. У 7 гадзін Р. Рагінскі, С. Сангін і Рыльскі на чале 85 чалавек (па іншых дадзеных, 100) напалі на казармы пружанскай інваліднай каманды, казну, цэйхгаўз, казначэйства, гарадавую турму, кватэру гараднічага. Хаця ўрадавых войск было больш (250 чалавек), яны здаліся. Тры паўстанцы былі забіты, 9 паранены. Праціўнік страціў 3 чалавекі забітымі і 9 параненымі. Паўстанцы захапілі ў цэйхгаўзе ўсю зброю, порах, патроны

205 Восстание в Литве и Белоруссии 1863 – 1864 гг. … – С. 343.

(1720 штук), амуніцыю, 1720 патронаў, а ў казначэйстве — 10 808 рублёў 85 капеек срэбрам[206]. Сангін і Рыльскі пасля бою прайшлі з Рагінскім толькі палову дарогі на Кобрын, а потым адышлі, каб ізноў вярнуцца да Сямятыч.

*15.02,* ферма (вёска) Рэчыца, Пружанскі павет. Моцны расійскі аддзел падпалкоўніка Вімберга напаў на атрад Сангіна-Рыльскага (38 чалавекі, па афіцыйных дадзеных, 250 чалавек). 11 паўстанцаў былі забіты, 14 трапілі ў палон (па афіцыйных дадзеных, 83 забіты, 34 паранены і 14 узяты ў палон). Страты Вімберга — 2 забіты, 3 паранены. У баі загінуў Сангін, а Рыльскі і яшчэ 9 паўстанцаў трапілі ў палон.




*Шлях паўстанцкага атрада Рагінскага*

*17.02,* урочышча Масты, Бельскі павет. 2-я рота Рэвельскага пяхотнага палка пад камандаваннем штабс-капітана Любімава ўступіла ў бой з паўстанцкім атрадам (каля 500 чалавек). У іх страты — 1 забіты, 13 паранены, 3 зніклі без звестак, у паўстанцаў — 2 забітых і 1 паранены (астатніх забітых і параненых паўстанцы вывезлі на падводах).

*1.03,* в. Чарнавесь (Чорнае сяло), Сакольскі павет. У ваколіцах Супрасля атрад Валенты Парчэўскага напаў на транспарт, які суправаджалі 50 казакоў, 8 забіў, астатніх разагнаў. У Чарнавесі напаў на каманду інвалідаў, забраў 40 ружжаў. Пасля гэтага атрад быў распушчаны, а яго паранены камандзір паехаў у Вільню.

206 Восстание в Литве и Белоруссии 1863 – 1864 гг. … – С. 343.



*Раскопванне цягніка, які затрымаўся у снезе*

*14.03,* г. Гродна. Вечарам былы капітан расійскай службы, начальнік станцыі ў Гродне Л.Ф. Кульчыцкі на чале каля 100 маладых людзей (намі знойдзена 71 прозвішча) спрабаваў захапіць падрыхтаваны да руху цягнік, каб выехаць да месца фарміравання атрада Л. Нарбута каля чыгуначнай станцыі Парэчча. Ад'ехаць удалося толькі самому Кульчыцкаму і яго 7 ці 8 сябрам, бо машыніст адчапіў вагоны. Рота расійскіх войск атакавала моладзь, якая засталася на вакзале. Пры гэтым 2 чалавекі былі паранены (К. Самулінскі і К. Талочка) і 2 узяты ў палон (Ю. Гамулецкі і В. Жукоўскі).

*2.04,* в. Вялікія Яшвілі, Беластоцкі павет. Страты абодвух бакоў пасля бою не вызначаны.

*3.04,* в. Пенск, Беластоцкі павет. Рускія сілы складаліся з пяхоты Рэвельскага і Калужскага палкоў, 30 казакоў і 6 улан лейб-уланскага Курляндскага палка на чале з капітанам генеральнага штаба Тугенгольдам і падпалкоўнікам Прыгароўскім. Паўстанцкі атрад налічваў каля 300 чалавек на чале з Раматоўскім. Страты расійцаў невядомы, у паўстанцаў — забіты 20, паранены 2, узяты ў палон 10 чалавек (афіцыйныя дадзеныя).

*29.04,* в. Валілы (інакш пад Пілатаўшчызнай), Беластоцкі павет. Вялікая сутычка атрадаў В. Урублеўскага і А. Духінскага з моцным урадавым войскам (атрады палкоўнікаў Прыгароўскага і Пенхержэўскага). Толькі рашучая дзейнасць камандзіраў выратавала паўстанцаў ад поўнага знішчэння. Страты паўстанцаў, па дадзеных расійцаў, склалі каля 200 чалавек (сярод іх афіцэры Ян Макарэвіч, Ян Радзівіновіч, Пухальскі, былы клерык Маліноўскі), у палон трапілі 9 чалавек, адбіты абоз і захоплена шмат зброі[207].

207 Краткие известия о военных действиях в Царстве Польском, в Виленском и Киевском военных округах // Военный сборник. – 1863. – Т. 32. – № 6. – С. 648.

*30.04,* в. Зялёная, Беластоцкі павет. Бой паміж рускім атрадам (1,5 роты Калужскага палка, узвод Лібаўскага палка, паўэскадрон лейб-уланскага Курляндскага палка) пад камандаваннем Тугенгольда і паўстанцамі. Па афіцыйных дадзеных, у рускіх страт не было, у паўстанцаў забіты 22, у палон трапілі 10 чалавек.

*1.05,* в. Страблы (Страбла), Бельскі павет. Рускі атрад складаўся з 1-й роты і 1-га ўзвода 5-й лінейнай роты Лібаўскага палка, 2-га ўзвода ўлан лейб-уланскага. Курляндскага палка на чале з маёрам Байкоўскім. Паўстанцаў было каля 100 чалавек на чале з Духінскім. Яны былі вымушаны адысці за р. Нараў. Па афіцыйных дадзеных, у рускіх быў забіты 1 чалавек, у паўстанцаў забіты каля 30, паранены 1, узяты ў палон 6, патанулі 25 чалавек і некалькі згарэлі ў стозе.

*2.05,*

- паштовая ст. Свадзьбічы. Атрад паўстанцаў захапіў 18 коней і казённую зброю.
- В. Горнаў (Горнава), Бельскі павет. 1-я стралковая рота Сафійскага палка і 10 казакоў 5-га Данскога палка на чале з падпаручнікам Грабеншчыковым напалі на невялікую конную групу паўстанцаў пад кіраўніцтвам Францішка Латкоўскага. Яны прабіраліся з Каралеўства Польскага ў Белавежскую пушчу. Паўстанцы былі разбіты. Па афіцыйных дадзеных, рускія страт не мелі, у паўстанцаў 3 паранены.
- М. Азёры, Гродзенскі павет. Першы бой атрада Лянкевіча — разграмілі лясніцтва і валасную ўправу, спалілі казённыя паперы, забралі 600 рублёў 30 капеек, 60 ружжаў, 2 пісталеты, 1 рэвальвер, 22 фунты пораху, 25 фунтаў пуль. У фальварках Вільянова і Задуб'е ўзялі 9 коней і 2 фургоны, гружаных харчаваннем і аўсом.

*3.05,*

- В. Берасцянка, Бельскі павет, адбылася сутычка паўстанцкага атрада з карнікамі. Паўстанцаў было больш за 200 чалавек на чале з Бржэзінскім. Рускі атрад сфарміраваны з 6-й і 8-й ротаў Сафійскага палка, 20 казакоў на чале з маёрам Гарфам. Па афіцыйных дадзеных, у рускіх 1 паранены і 3 зніклі без звесткаў, у паўстанцаў забіты 56, у палон узяты 15.

- Гродзенская пушча, балоты. Новасфарміраваны атрад паўстанцаў на чале з Баляславам Нарбутам быў атакаваны Лідскім аддзелам рускай часці пад камандаваннем палкоўніка Алхазава[208].

*3.05,* в. Горнаў (Горнава), Бельскі павет. 3-я стралковая і 12-я лінейная роты Рэвельскага палка і 4-ы эскадрон улан С.-Пецярбургскага палка на чале з генерам-маёрам Бяклемішавым мелі бой з паўстанцкім атрадам Ламоўскага (можа Латкоўскага?) у колькасці больш за 200 чалавек. Салдаты мелі 2 параненых, паўстанцы пакінулі на полі бою 2 забітых і 2 палонных.

*4.05,* в. Шклянск (Склянка, Шкленск), Гродзенскі павет, 12 км ад Азёр, лясы «Святых балот». Дзве роты Калужскага палка і 22 казакі пад камандаваннем падпалкоўніка Мантэйфеля атакавалі паўстанцаў на чале з А. Лянкевічам (да 200 чалавек). Мантэйфел адначасова з двух бакоў напаў на паўстанцаў, якія знаходзіліся на ўзвышшы, вакол якога былі непраходныя балоты. Яму ўдалося прымусіць іх адысці да ракі Бярвонкі. Паўстанцы кінуліся ў бок багны і пачалі тануць, пасля чаго рускія спынілі пераслед. Забіты і патанулі каля 40 паўстанцаў, узяты ў палон 2 (па іншых дадзеных, 5). Рускім дасталіся 14 коней, 4 вазы, 7 сёдлаў, 8 карабінаў, пісталет, 2 нажы (багнета), каля 4 пудоў пораху, аптэка і багаж Лянкевіча і ксяндза Янушкевіча, харчаванне. Расійскія салдаты страт, па афіцыйных дадзеных, не мелі[209].

*9.05,* Пескі, Слонімскі павет. Аб’яднаныя сілы паўстанцаў (атрады Лянкевіча і Стравінскага, Улодака, Ваньковіча) вытрымалі атаку атрада расійскіх войск (агулам каля 300 чалавек) на чале з палкоўнікам Гэссэльбергам. Страты абодвух бакоў пасля сутыкнення невядомыя. Пасля бою атрад Ваньковіча адышоў да мяжы Пінскага павета і злучыўся з атрадам Траўгута.

*10.05,* Янін, Ваўкавыскі павет. Сутычка ўрадавых войск з паўстанцамі А. Лянкевіча. Расійцаў было 3 роты пяхоты, што значна перавышала сілы паўстанцаў, якім пагражала акружэнне. Дзякуючы кіраўніцтву Лянкевіча ўдалося вырвацца і пазбегнуць разгрому. Быў страчаны фургон з харчаваннем і амуніцыяй.

208 Jodkowski J. “Swieto bloto” // Echo Grodzienskie. – 1921. – 77. – S. 4.
209 Jodkowski J. “Swieto bloto” // Echo Grodzienskie. – 1921. – 77. – S. 4.

*12.05,* м. Бяроза (Картуз-Бяроза), Брэст-Літоўскі павет. Паўстанцы напалі на заставу, знішчылі шлагбаўм, забралі казённыя грошы, дакументы, затрымалі абоз з 40 фурманак.

*13.05,* Смалярня, Слонімскі павет. Сутычка ўрадавых войск з паўстанцамі на чале з Улодакам. Ён даў сваім партызанам адпачынак і абед у карчме. Калі пастарункі данеслі пра падыход расійскіх войск, атрад паўстанцаў заняў баявыя пазіцыі. Камандзір, убачыўшы значную перавагу сіл праціўніка, вырашыў разбіць атрад на дзясяткі і адысці. Пасля некалькіх дзён паўстанцы зноў злучыліся і далучыліся да аддзела Лянкевіча.

*14-15.05,* карчма Міхалін каля м. Сельцы, Слонімскі павет. Паўстанцы на чале з Улодакам у выніку двух баёў страцілі больш за 100 забітымі (сярод іх Глябовіч, Грыневіч, пружанец Стравінскі), 9 параненымі (сярод іх А. Уладычынскі). Паводле адных звестак, паўстанцаў было 800, паводле іншых — 500 чалавек, карныя атрады налічвалі 2 роты салдат Рэвельскага пяхотнага палка (каля 190 чалавек) і каля 60 казакоў на чале з штабс-капітанам Еўдакімавым. Першымі атакавалі казакі, затым далучылася расійская пяхота, якая з маршу кінулася ў штыкавую атаку. Паўстанцы стрымалі і адышлі ўглыб лесу. Панёсшы значныя страты, царскія войскі адышлі, але падаспеўшае з мястэчак Сялец і Картуз-Бяроза падмацаванне выратавала іх ад поўнага разгрому. Рускія страцілі 10 чалавек забітымі, 30 параненымі, 30 штуцэраў, 7 коней. Страты паўстанцаў — 5 забітых і 4 параненых. Стомленыя баямі, яны вымушаны былі адыходзіць, падзяліўшыся на два атрады: 80 чалавек на чале з А. Акінчыцам пайшлі ў бок Сцэрцэжова, а рэштка са Стравінскім — да Альховага Балота, дзе стаяў абоз.

*17.05,* сяло Горкі (Адрыжэнскі лес), Кобрынскі павет. Атрад Траўгута (каля 300 чалавек, па іншых дадзеных, 160 чалавек) размеркаваўся на двух баках грэблі, пакладзенай на беразе багны ў ваколіцах Каралеўскага канала. Калі расійская вайсковая каманда на чале з капітанам Кярсноўскім (6-я і 7-я роты Рэвельскага палка і 38 казакоў Данскога № 5 палка) вышла на палову грэблі, дык трапіла пад крыжаваны агонь паўстанцаў і ў паніцы разбеглася, страціўшы 2 (у тым ліку Кярсноўскага) забітых і 20 чалавек параненых. Сярод паўстанцаў быў 1 забіты.

*21.05,* сяло Горкі, Кобрынскі павет. Палкоўнік Эрнберг сабраў супраць Траўгута буйныя вайсковыя сілы (4 пяхоты роты, 2 сотні казакоў Данскога № 27 палка, 2 гарматы). Яны стралялі па паўстанцах са штуцэраў, але ў атаку праз адкрытую лясную паляну ісці баяліся. 14 паўстанцаў-добраахвотнікаў атакавалі правае крыло рускіх войск, і тыя адышлі. Але і паўстанцы вымушаны былі адысці да в. Адрыжын, а затым у Бялінскія лясы. 1 паўстанец быў забіты. Салдаты ўрадавых войск страцілі 70 чалавек. Па іншых дадзеных, страты склалі: паўстанцаў — 4 забіты (сярод іх — кобрынскі чыноўнік Антоні Ласкоўскі, гаспадар маёнтка Дзядкавічы Апалінары Радоўскі), маскоўцаў — 12 чалавек.

*25.05,*

- Сяло Новы Двор, Ваўкавыскі павет. Баявая сутычка паміж паўстанцамі (каля 300 чалавек) і ўрадавым войскам на чале з капітанам Кулікоўскім (каля 150 чалавек 3-га стралковага батальёна і 40 казакоў). Страты паўстанцаў — 12 чалавек забіты, рускіх — 4 паранены.
- Горкі, Кобрынскі павет, Бялінскі лес (Парэчча Скірмунтоўскае,
- Белая Гара, Вароны, Зялёны Востраў, Зялёны Вугал, Холмскае возера). Паўстанцы (каля 400 чалавек), ведаючы пра значныя сілы ўрадавага войска на чале з генералам Эггерам і палкоўнікам Эрнбергам (1,5 роты Чарнігаўскага палка і 50 казакоў), прынялі бой. Тры першыя атакі былі адбіты. Аднак карныя войскі завалодалі лагерам паўстанцаў пасля трохгадзіннага бою. 13 паўстанцаў у баі забіты (сярод іх доктар Паўлоўскі, афіцэры Кузьмінскі, Пяршхальскі, Нівінскі, Ян Багурскі, Міхал Астроўскі) і 9 трапілі ў палон (па рапарту Эггера — усяго 26, адпаведна, 21 і 5 чалавек). З рускага боку страты склалі: 9 чалавек забіты і 36 паранены. Пасля бою пад камандай Траўгута сабралося толькі 43 паўстанцы, доктар Даманоўскі з 20 кобрынцамі. Хутка спалучыліся з атрадам Ваньковіча (меў каля 100 чалавек)[210].

210 Усе дадзеныя па Горках гл.: Восстание в Литве и Белоруссии 1863–1864 гг. … – С. 359; Laniec S. Bialorus w drugiej polowie XIX stulecia. – Olsztyn: Wyzsza Szkola Pedagogiczna, 1997. – С. 61-62.

*25.05,* м. Браньск, Бельскі павет. Паўстанцы (каля 200 чалавек) напалі на рускі канвой пад камандаваннем падпаручніка Пальгрэма (10 чалавек Сафійскага палка і 10 казакоў). Паўстанцы страцілі 7 чалавек забітымі і параненымі, рускія — 4.

*26.05,* Белін, Кобрынскі павет. Баявыя сутычкі паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі.

*27.05,* Чэрск, Бельскі павет (таксама Славяцічы). 7 ротаў расійскай пяхоты, 2 эскадроны драгунаў, 1 сотня казакоў пры 4 гарматах (агулам каля 2000 чалавек) напалі на паўстанцаў атрада Стасюкевіча. Апошнія пабеглі, акрамя 70 стральцоў, якія трымалі бой на працягу прыкладна 2 гадзін. Былі забіты 11 паўстанцаў, 17 трапілі ў палон да расійцаў. Маскалёў было забіта 78 чалавек[211]. Пасля бою Нарбуту ўдалося сабраць каля 200 чалавек, але хутка палова іх пакінула атрад і вярнулася за Буг.

*28.05,* каля Людвінова, Ваўкавыскі павет. Гродзенская рота Сасуліча, ваўкавыская Стравінскага, пружанская Улодака і касінеры Ельскага напалі на 2 расійскія роты і 15 казакоў, якія зайшлі ў лес з боку Савіцкіх Карчмаў. У выніку чвэрцьгадзіннага бою былі забіты 2 паўстанцы і 12 расійскіх салдат. Партызанскі атрад пайшоў праз леснічоўку Людвінава і м. Новы Двор у лес пад Прахоўню.

*2.06,* Кадыш, Гродзенскі павет, пры дарозе з Капцёва на Сапоцкін. Бой паміж атрадамі В. Гласка і Брандта з дзвюма рускімі ротамі пяхоты і гусарамі капітана Кулакова. Страты паўстанцаў: 14 забітых (сярод іх — афіцэр Іосіф Гласка, Пронашка, Буткевіч, Верпахоўскі), 2 палонных (адзін з іх напалеонаўскі салдат Казлоўскі).

*3.06,* Урочышча Пагарэлае, Слонімскі павет. У Ружанскай казённай дачы адбыўся бой паміж 3-й і 9-й стралковымі ротамі Неўскага палка на чале з маёрам фон Крамерам з атрадам паўстанцаў (да 700 чалавек пешых і 40 конных) А. Лянкевіча і А. Духінскага. Батальёнам камандаваў капітан Эйтміновіч, ротай пешых стральцоў — адстаўны паручнік Завістоўскі, ротай касінераў — Ляткоўскі

211 Aramowicz... – S. 42-43.

і француз Сіманэ, коннымі стральцамі — К. Кабылінскі[212]. Урадавыя войскі пачалі наступленне, але іх сустрэлі паўстанцкія стрэлы на адлегласці 50 крокаў, і яны вырашылі адысці і выманіць паўстанцаў з лесу. Тыя паддаліся і трапілі пад абстрэл праціўніка, прыйшлося вярнуцца на былыя пазіцыі. Пачалася другая атака царскіх вайскоўцаў, ім удалося пацясніць паўстанцаў, але тыя сталі атакаваць ворага з бакоў. Апошнія ўзмацніліся рэзэрвам і вытрымалі 8 атак паўстанцаў. Каля 19 гадзін паўстанцы па 1 ці па 3-5 чалавек сталі разбягацца з месца бою ў бок багны, якая з левага боку прылягае да возера, у 4 вярстах ад в. Ласосіна. Царскія вайскоўцы не пераследавалі паўстанцаў і адышлі ў м. Ружаны. Апошнія страцілі забітымі як мінімум 127 чалавек (сярод іх урач І. Каліноўскі), адзін трапіў у палон (беластоцкі памешчык Р. Карыцкі). Урадавы аддзел пакінуў на полі бою 4 забітых (пахаваны ў м. Ружаны), было 15 чалавек параненых (1 памёр на наступны дзень) і 1 кантужаны. Было захоплена шмат зброі, порах, свінец, харчовыя запасы, вопратка, лекі, 6 коней, шмат планаў, кніг, газет[213].

*3-4.06,* Мілавіды, Слонімскі павет. На лагер паўстанцаў (каля 800 чалавек на чале з палкоўнікам А. Лянкевічам), які знаходзіўся ў лесе паблізу шашы Брэст — Бабруйск (на 6-й вярсце злева ад дарогі ад Мілавід да Чамелаў), напалі тры роты Стараінгерманландскага пяхотнага палка. Бой пачаўся 3.06 у 11.30 і працягваўся да 20.30, пасля чаго царскія войскі адышлі. На дапамогу ім прыйшлі дзве роты Новаінгерманландскага палка, і ў наступны дзень наступленне аднавілася. У выніку бою царскія войскі страцілі, па некаторых дадзеных, 50, па іншых, 240 забітымі і паранеными, паўстанцы — 18 чалавек. Паўстанцы не замацавалі свой поспех, а разышліся ў розныя бакі (Пінскія і Бярозаўскія лясы, у бок Слуцка), і паасобку пазней былі разбіты. У бітве прымалі ўдзел камандзіры В. Міладоўскі (навагрудскі атрад), Уладак (пру-



*Падмурак сядзібы Каліноўскіх у Якушоўцы*

212 Восстание в Литве и Белоруссии 1863 –1864 гг. … – С. 368.
213 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 16, а. 64 адв., 66.

жанскі), Лянкевіч (гродзенскі), ксёндз Ф. Лашкевіч, І. Хадакоўскі, Г. Стравінскі (ваўкавыскі), Ф. Юндзіл (слонімскі), Ельскі.

*7.06,* м. Сялец, Пружанскі павет. Паўстанцы на чале з Лянкевічам (40 чалавек) былі разбіты ўрадавымі войскамі. Падобны лёс напаткаў і атрады Лашкевіча і Міладоўскага, якія базаваліся каля Сяльца.

*8.06,* Мерачоўшчына, урочышча Пагарэлае Слонімскага павета (Бронзавае Балота, Ружаны, Ружанская Пушча, Косава, Сярадаўскі Лес, Мерачоўшчына). Бой паміж атрадамі Лянкевіча і Духінскага з 2 ротамі Неўскага палка і 20 казакамі Данскога № 33 палка пад камандаваннем маёра фон Крамера. Паўстанцы пад камандаваннем В. Урублеўскага некалькі гадзін утрымлівалі пазіцыі і тры разы контратакавалі рускіх, а затым адышлі. Апантана ваявалі камандзіры змешаных аддзелаў і касінераў Гувальд, Толкін, Эйтміновіч, Завістоўскі. Паўстанцы страцілі каля 13 забітымі, 8 былі паранены. Афіцыйныя дадзеныя адносна страт паўстанцаў былі значна перавышаны — 127 забітых і 1 палонны.

*9.06*

- В. Туравічы і Кулікі, Слонімскі павет. Сутыкненне на р. Мышанцы ў 12 км ад Мілавідаў, 3-я рота Рэвельскага пяхотнага палка пад кіраўніцтвам маёра Скарабагатага сустрэлася з атрадамі паўстанцаў (больш за 600 чалавек) на чале з Лукашэвічам, ксяндзом Ляшкевічам, Ю. Стравінскім, Лянкевічам. Страты паўстанцаў складалі 15 забітых і невядомую колькасць загінуўшых у дрыгве. Страт з боку расійскага войска не было.
- Рудка, Навадворскія лясы, Бельскі павет. На атрады Млотка, Урублеўскага, Улодка, Юндзіла напалі рускія войскі. Паўстанцы адышлі на дзве вярсты, і на сходзе Урублеўскі прапанаваў добраахвотна альбо ісці з ім у Сакольскі павет і затым у Каралеўства Польскае, альбо разысціся па хатах і з'явіцца да начальства з павіннай. Пажадалі пайсці з Урублеўскім 100 чалавек, а 200 вырашылі падацца дамоў[214]. У баі загінулі 5 салдат і некалькі былі паранены.
- Каралёў Мост, Пружанскі павет. Паўстанцкі атрад на чале з Кярсноўскім вёў бой з расійскай часткай. Да

214 Восстание в Литве и Белоруссии 1863 –1864 гг. … – С. 381.

праціўніка падцягвалася падмацаванне, якое ўдарыла па флангах і прымусіла паўстанцаў адысці. 22 паўстанцы забіты.

*10.06*

- Папялярня, Кобрынскі павет (Серадава, Борк). Духінскі размеркаваў стральцоў (31 чалавек) пад камандай Гувальда і Зарэмбы ў зарасніках грэблі, якая была адзіным пераходам праз багну ад Папялярні да Серадава. Бой паміж рускім атрадам, які складаўся з дзвюх рот і ўзвода Рэвельскага палка і атрада казакоў пад камандай капітана Пішчамукава і паўстанцамі, закончыўся спачатку адыходам казакоў, якія трапілі ў засаду паўстанцаў. Пазней у атаку пайшла расійская пяхота, і паўстанцы вымушаны былі адысці ў лес. Казакі атакавалі партызанскі абоз, які баранілі паўстанцы на чале з Урублеўскім. Дзякуючы іх абстрэлу з блізкай адлегласці праціўнік адышоў, знішчаючы па шляху харчаванне і гаршкі папеляжы. 2 паўстанцы былі забіты, 1 паранены ( па іншых дадзеных, 4 забіты і 3 палонных), рускія страцілі забітымі 2 чалавек, параненымі — 13.
- м. Харошча, Беластоцкі павет. Узвод улан С.-Пецярбургскага ўланскага палка на чале з карнетам Якшыбскім сутыкнуўся з паўстанцкім атрадам (каля 40 чалавек). Паўстанцы згубілі 2 забітых, 3 параненых і 6 палонных.

*11.06,* в. Пескі, некалькі кіламетраў ад Чорнага Возера Слонімскага павета. Бой атрадаў Уладака і Лялівы з царскімі войскамі на чале з падпалкоўнікам Гесельбергам (дзве роты пяхоты і некалькі дзясяткаў казакоў). Пасля бою паўстанцы невялікімі групамі разбегліся па лесе, потым ізноў аб’ядналіся ў адзін атрад[215].

*13.06,* в. Карэчын (Чорнае Возера), Слонімскі павет. Паўстанцы ў вёсцы набылі харчаванне і, калі вярталіся ў лес, былі атакаваны расійскай часткай (дзве роты пяхоты) на чале з падпалкоўнікам Гесельбергам. Паўстанцы адышлі да багны і падрыхтаваліся да абароны. Расійцы адмовіліся ад далейшай барацьбы і адышлі. Па афіцыйных дадзеных, загінулі 2 расійцы, а страты паўстанцаў былі «значныя».

215 Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии… – С. 401.

*15.06,* Баяры, Ваўкавыскі павет. Баявая сутычка паміж паўстанцамі атрада Юліяна Эйтміновіча і ўрадавымі войскамі. Паўстанцам удалося вырвацца з акружэння і дайсці да Сакольскай Пушчы, дзе атрад перайшоў пад кіраўніцтва Багуслава Эйтміновіча.

*16.06*

- Ружаны, Слонімскі павет. Група з 18 конных паўстанцаў на чале з К. Кабылінскім заняла мястэчка, забрала ад інваліднай каманды (47 чалавек) 23 карабіны, 2 дубальтоўкі і 2 палашы, з пошты — грошы, коней і колы. Усё гэтае было дастаўлена ў партызанскі лагер, які быў размешчаны ў лясным гушчары Вялікі Вугал.



*Ружанскі палац*

- Гута, Ваўкавыскі павет. Кавалерыя Кабылінскага напала на калону расійскіх войск пад камандаваннем падпалкоўніка Блюменталя. Адзін паўстанец быў забіты (Дзерамер), адзін трапіў у палон, частка кавалерыстаў страціла коней і разбеглася па ваколіцы. Кабылінскі вярнуўся да лагера пад пераследам Блюменталя.
- м. Лыскава, Ваўкавыскі павет. Дзве роты пяхоты і 40 казакоў пад камандаваннем падпалкоўніка Блюменталя і маёра Скарабагатага (Скрабатава) атакавалі рэшткі атрада Духінскага і Урублеўскага. Спачатку яны напалі на сярэдзіну паўстанцкай абароны, дзе іх сустрэлі агнём стрэльбаў і карабінаў. Не спраўдзілася і атака на левы фланг паўстанцаў. Расійцы адышлі, страціўшы 11 забітых (у тым ліку афіцэр) і 17 параненых, на полі бою пакінулі 29 штуцэраў. Паўстанцы страцілі забітым 1 афіцэра (Пётр Радавіцкі) і 3 чалавекі былі паранены.



*Магіла паўстанцаў у Ласасіне на Пружаншчыне*

- Янін, Слонімскі павет. На партызанскі атрад Лянкевіча, які

ішоў у ваўкавыскія лясы, напаў расійскі аддзел з дзвюх рот пяхоты. Пад час бою сярод паўстанцаў адзін забіты, сярод урадавых салдат — 3 забітых і 2 параненых. Расійцы захапілі 3 каня і воз з амуніцыяй. Лянкевіч адарваўся ад праціўніка і пайшоў у кірунку Ваўкавыска, далей на Крамянец, Струбніцу да м. Пескі.

*18.06,* в. Караліны, Слонімскі павет. Сутыкненне ў Мажаеўскім лесе, паблізу вёскі, паміж першай ротай Стараінгермарландскага палка капітана Дзяканава (забіты 3, паранены 3) і атрадам паўстанцаў каля 200 чалавек (забіты, паранены — 1, палонных — 1).

*18.06,* в. Харабровічы, Слонімскі павет. 29 салдат Стараінгерманландскага палка пад камандаваннем паручніка Азулевіча сутыкнуліся з паўстанцкім атрадам Лукашэвіча (Галоска) колькасцю 22 чалавекі. Па афіцыйных дадзеных, рускія не мелі страт, а паўстанцы — 7 забітых, 1 паранены, 4 узятыя ў палон.

*20.06,* м. Бяроза, Брэсцкі павет. Баявая сутычка паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі ў Бярозаўскім балоце. Адна рота 3-га стралковага палка на чале з капітанам Штэкерам нанесла страты паўстанцам (каля 200 чалавек) — забіты 11 чалавек.

*21.06,* Урочышчы Пясец і Кацюхова каля Жаркаўшчыны Ваўкавыскага павета. Бой паміж дзвюма ротамі Стараінфманландскага палка на чале з штабс-капітанам Шахавым і былым атрадам Духінскага (цяпер Урублеўскага) у колькасці да 800 чалавек. Царскія вайскоўцы атакавалі паўстанцаў, якія занялі пазіцыі за адкрытай палянай, на ўзвышшы вялікага і непраходнага леса. Ім удалося адцясніць паўстанцаў, частка якіх схавалася за каранямі дрэў, на дрэвах і апынулася ў тыле наступаўшых. Ім удалося разбіць рэзерв расійцаў. У 16 гадзін Шахаў даў каманду адысці. Страты ўрадаўцаў — 1 забіты, 8 параненых, паўстанцаў — больш за 40 чалавек забіты (па словах Арамовіча, 2 чалавекі забіты і 5 паранены). Урадаўцам дасталіся 11 коней, 6 ружжаў, 2 пісталеты, 4 касы, пулі, порах, дакумент на прадстаўленне чына[216].

*21.06,* мястэчкі Гарадзец і Антопаль, Кобрынскі павет. Бой паміж рускім атрадам з 100 чалавек Чарнігаўскага палка з казакамі і 1 роты Пскоўскага палка з 20 казакамі пад камандаваннем маёра

216 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 16, а. 77 адв.

Кека і 67 коннымі паўстанцамі. Рускія ўзялі ў палон 2 чалавекі, некалькіх паранілі.

*23.06,* Масты, Ваўкавыскі павет. У 4 км ад Мастоў у наднёманскіх лясах калона расійскіх войск (дзве роты Фінляндскага гвардзейскага палка) на чале з палкоўнікам Крамерам разбілі паўстанцкі атрад (каля 100 чалавек). У выніку бою паранены 2 салдаты.

*26.06,* Боркі, Кобрынскі павет. Баявая сутычка паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі.

*27.06,* Шэрашава, Пружанскі павет. 1 рота Рэвельскага палка на чале з капітанам Штэкерам сутынулася з паўстанцамі (каля 70 чалавек) і нанесла ім страты — забіла 16 і ўзяла ў палон 3 чалавек.

*Пачатак 07,* станцыя Парэчча, Гродзенскі павет. Рота ўрадавых войск напала на вялікі атрад паўстанцаў, якія адышлі і разышліся дробнымі групамі. Пошукі іх вынікаў не далі.

*5.07,* фальварак Раманаўка, Слонімскі павет. Адбылася перастрэлка паміж ротай Стараінгерманландскага палка капітана Дзяканава (страт не было) і атрадам паўстанцаў, якія пры адступленні страцілі 5 чалавек палоннымі.

*Ноч з 7.07 на 8.07,* Макраны, Кобрынскі павет. Расійцы (рота пяхоты і 20 казакоў) пад камандаваннем паручніка Дзюбы атакавалі атрад кавалерыі Казіміра Нарбута (80 чалавек). Улічваючы значную перавагу праціўніка, Нарбут вырашыў адысці і рушыў у Каралеўства Польскае. У выніку бою сярод паўстанцаў 6 забітых і 4 палонных.

*11.07,* м. Дамачава, Брэст-Літоўскі павет. Расійцы арганізавалі тут моцны атрад міліцыі (сельскі караўл, каля 50 чалавек), якая дапамагала іх рэгулярным сілам. Партызанскі аддзел (каля 600 чалавек) складаўся з атрадаў Янкоўскага, Зялінскага пад агульным кіраўніцтвам Крысінскага. У выніку бою расійскае войска было выбіта з мястэчка. Затым паўстанцы атакавалі міліцыю, якая, страціўшы 12 чалавек, разбеглася. Паўстанцы здабылі шмат зброі і амуніцыі. Страты паўстанцаў — 2 забітых і 13 параненых, урадавага

аддзела — 2 салдаты забітыя і 3 параненыя, 3 караўльныя з сялян забітыя, 1 паранены, 1 згарэў у караўльным доме.

*15.07,* Топчава, Бельскі павет. Расійскае войска пад кіраўніцтвам капітана Мамылава абстраляла невялікі атрад паўстанцаў. У выніку бою забіты 2 паўстанцы і 4 паранены.

*18.07,* Львоўшчына, Слонімскі павет (Ханевічі, Харабровічы), Дзераўна). Бой паміж 29 салдатамі Стараінгерманландскага палка паручніка Азулевіча і атрадам паўстанцаў з 22 чалавек на чале з Лукашэвічам (Галоска). Апошнія страцілі забітымі 7 чалавек і паранnetwork — 1, палонных — 4; вайскоўцы страт не мелі. Разбегшыхся паўстанцаў сабраў партызанскі атрад Юндзіла.

*20.07,* Бярозавае балота, Слонімскі павет. Баявая сутычка паміж паўстанцамі Улодака і ўрадавымі войскамі пад камандаваннем капітана Стэцкера. Апошні разбіў паўстанцаў.

*25.07,* м. Азёры, Гродзенскі павет. Паўстанцкі аддзел Лянкевіча і Астрогі (каля 200 чалавек) быў атакаваны моцнай калонай расійскіх войск. 7 паўстанцаў забіты ў выніку бою.

*27.07,* Вялікае Балота, Ваўкавыскі павет. Урадавымі войскамі пад камандаваннем капітана Стэцкера разбіты атрад паўстанцаў (ён памылкова лічыў, што Улодака). У выніку бою вайскоўцы захапілі ў палон 3 паўстанцаў.

*30.07,* Маркава, Бельскі павет. У выніку бою сярод паўстанцаў забіты 1, паранены 1 чалавек, урадавага аддзела — адпаведна, 2 і 5.

*31.07,* Ігнаткі, Бельскі павет. 4 паўстанцы трапілі ў палон.

*2.08,* м. Гарадок (Грудэк), Беластоцкі павет. Атацы расійскага Неўскага палка з 15 казакамі Данскога № 5 палка падвергліся атрады Кабылінскага і Толкіна. У выніку бою забіты 4 паўстанцы (па афіцыйнай версіі, забіты 42, у палон узяты 4 чалавекі).

*5.08,* мыза Пухлы, Бельскі павет. У выніку бою з атрадам Уру-

блеўскага (каля 250 чалавек) сярод салдат урадавага аддзела (рота Сафійскага палка і 30 казакоў 5 сотні Данскога № 5 палка пад камандаваннем падпалкоўніка Цігерстэна) 20 забітых і 14 параненых (па афіцыйных дадзеных, 2 і 4)[217].

*7.08,* в. Баяры, Ваўкавыскі павет. Капітан Руткоўскі на чале 7-й роты Пскоўскага пяхотнага палка і 40 улан Курляндскага Яго Вялікасці палка ў пошуках паўстанцаў размеркаваўся ў Баярах на начлег. Не паспелі яны размясціць назіральныя пасты, як з двух бакоў напалі паўстанцы (каля 150 чалавек) пад кіраўніцтвам І. Хадакоўскага. Вайскоўцы здолелі сабрацца і адбіць атаку, а затым пераследаваць 3 вярсты да лесу. 1 салдат быў паранены ў нагу (па іншых дадзеных, 4 забіты, 5 паранены)[218].

*8.08,* ва ўрочышчы Цымлева Ваўкавыскага павета адбыўся трохгадзінны бой 10-й роты Стараінгерманландскага пяхотнага палка на чале з паручнікам Ліневічам з прыдадзенымі яму 10 казакамі 6-й сотні 5-га Данскога палка і 10 міліцыянерамі ад вясковага караўла м. Поразава, а таксама далучыўшыхся каля в. Навасёлкі 7-й роты Пскоўскага пяхотнага палка і атрада лейб-улан Курляндскага палка з паўстанцкім атрадам каля 150 чалавек. Страты паўстанцаў: 20 забіты, 1 палонны. Вайскоўцы не пацярпелі[219].

*9.08,* урочышча Пашкоўшчызна ў Тышкевічскіх лясах, Ваўкавыскі павет. 10-я рота Страінгерманладскага палка, дзве роты Пскоўскага палка, эскадрон лейб-улан Курляндскага палка маёра Духноўскага напалі на ўмацаваны лагер паўстанцаў. Там знаходзіліся атрады Ф.-А. Улодэка, А. Духінскага, Ю. Стравінскага (да 400 чалавек). Калі скончылася амуніцыя, частка паўстанцаў адышла ўглыб лесу, абарону трымалі 40 партызан на чале з Урублеўскім. Гэта дапамагло ўратаваць адыходзячых і прымусіла расійцаў саміх адысці, бо яны не ведалі, колькі сілаў у паўстанцаў. Пасля цяжкага бою былі забіты 45 паўстанцаў, 1 паранены ўзяты ў палон. Расійскія вайскоўцы страцілі 2 параненых і адышлі ноччу ў в. Навасёлкі[220].

---

217 Сборник распоряжений графа.. . – С. 310.
218 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 16, а. 93-93 адв.
219 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 16, а. 93 адв.-94.
220 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 16, а. 95-95 адв.

*23.08,* м. Цэхановец, Бельскі павет. Баявая сутычка паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі.

*30.08,* Глыбокі Кут, Пружанскі павет. Расійцы некалькі разоў атакавалі партызанскі лагер і толькі пасля ўдара ў цэнтр абароны прымусілі паўстанцаў адысці з пазіцый. У выніку бою 1 паўстанец забіты (Чарняўскі), 1 паранены (Здановіч).

*2.09,* в. Усенькі, Бельскі павет. Бой паміж 2,5 роты пяхоты і паўэскадронам кавалерыі пад камандаваннем палкоўніка Воранава і генерал-маёра графа Толя і паўстанцкім атрадам Тычкіна (Толкіна — ?). Апошнія страцілі 42 забітымі і 1 палоннага.

*3.09,* в Ушынск. Сутычка ўзвода Новаінгерманландскага палка, паўэскадрона С.-Пецярбургскага ўланскага палка пад камандаваннем палкоўніка Воранава. Урадавыя войскі нанеслі страты паўстанцам: 16 забітых, 1 узяты ў палон.

*3.09,* паміж вёскамі Урублёва і Цясака. Той самы рускі атрад палкоўніка Воранава сутыкнуўся з паўстанцамі да 400 чалавек і зноў нанёс ім страты, забіўшы 30 чалавек.

*3.09,* Выганаўскі Лес, Бельскі павет. Рота Сафійскага палка на чале з штабс-капітанам Емяльянавым правяла бой з паўстанцкім атрадам каля 400 чалавек, забіла 60 з іх і сама панесла страты ў колькасці 2 параненых.

*11.09,* Берагава Сядзенне, урочышча каля лясной аховы Горбач Свіслацкай дачы Ваўкавыскага павета. Атрад паўстанцаў (каля 300 чалавек) на чале з В. Урублеўскім прыняў бой ад урадавай вайсковай часці на чале з маёрам Шульжэнка. Пасля гадзіннага ўпартага супраціўлення вымушаны былі разбегчыся. Страцілі 31 чалавека забітымі і 2 палонных. Царскія вайскоўцы страт не мелі. Паўстанцы разбіліся на часці пад камандаваннем Урублеўскага, Улодака і Млотка[221].

221 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 16, а. 107- 108.

*12.09,* Рудня, Ваўкавыскі павет. У выніку бою каля 16 гадзін паўстанцы на чале з Урублеўскім (каля 180 чалавек) адбілі атаку маскоўскага войска, які страціў да 20 чалавек параненых і забітых. Страчаны 1 паўстанец. Паўстанцы схаваліся ў лесе, і раніцай Урублеўскі іх збіраў нанова.

*16.09,* маёнтак Улісоўшчызна, Ваўкавыскі павет. Перастрэлка паміж 28 салдатамі Стараінгерманландскага палка прапаршчыка Чымбаевіча (страт няма) з атрадам паўстанцаў (забіты 3, паранены 3 чалавекі).

*19.09,* ваколіца Лукавіца, Бельскі павет. Расійскія часці напалі на паўстанцаў, кіруемых братамі Эйтміновічамі. З боку Лукавіцы абараняўся ўзвод Гувальда, з супрацьлеглага боку — узвод Вашкевіча, у сярэдзіне — Толкін. Атрад расійцаў складаўся з 20 чалавек пяхоты і 10 казакоў на чале з маёрам Банецкім, накіраваным для арганізацыі вясковых караўлаў. З дапамогай часткі 5-й лінейнай роты Сафійскага пяхотнага палка штабс-капітана Юр'ева ўдалося перамагчы паўстанцаў. 5 з іх былі забіты, 5 паранены, рэшткі паўстанцаў пераследаваў маёр Корф, але яны схаваліся ў лесе[222].

*19.09,* в. Пёнткова, Бельскі павет. Баявая сутычка паміж паўтары роты Сафійскага палка і 12 казакамі Данскога № 5 палка пад камандаваннем маёра Ганецкага і паўстанцкім атрадам Урублеўскага (каля 300 чалавек). Страты рускіх: забіты 2, паранены 12, паўстанцаў: забіты больш за 50, шмат параненых і 1 узяты ў палон.

*20.09,* м. Боцкі, Бельскі павет. Баявая сутычка паміж паўстанцамі Баранцэвіча (каля 109 чалавек) і ўрадавымі войскамі. Пасля бою Баранцэвіч пайшоў на злучэнне з Урублеўскім.

*22.09,* в. Крыванцы, недалёка ад Друскенік, Гродзенскі павет. Бой паміж 90 ніжнімі чынамі лейб-гвардзейскага Сямёнаўскага палка на чале з паручнікам Клакачовым і паўстанцкім атрадам каля 120 чалавек. Апошніх забіта 36 чалавек і 1 палонны.

*2.10,* Выганоўскі лес па дарозе з маёнтка Паканева ў Бельск. На 9-ю лінейную роту Сафійскага пяхотнага палка (камандзір

222 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 167, а. 74 адв., 209.

штабс-капітан Емяльянаў), якая ахоўвала транспарт з канфіскаванай у жыхароў маёмасцю, напалі паўстанцы (да 400 чалавек). Бой доўжыўся каля 3 гадзін. У выніку яго паўстанцы разбегліся дробнымі групамі, пераследаваць у лесе якіх царскія войскі не палічылі мэтазгодным. Паранены 1 радавы, 1 кантужаны. Паўстанцаў забіта да 60 чалавек каля дарогі, а колькі ў лесе, невядома. У паўстанцаў адбіта 5 ружжаў, 2 шаблі, пісталет, 12 косаў[223].

*7.10,* Боркі, Пружанскі павет. У выніку бою 5 паўстанцаў забіты, 5 паранены.

*9.11,* сяло Карчова, Бельскі павет. У баі сустрэліся дзве роты Сафійскага палка, 25 добраахвотнікаў, узвод улан, 15 казакоў і 4 конных ратніка пад камандаваннем маёра Ганецкага з паўстанцкім конным атрадам у 250 чалавек на чале з Мухай. Апошнія страцілі 8 забітымі і некалькіх параненых.

*10.12,* Брэст-Літоўск Брэсцкага павета. Баявая сутычка паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі.

У завяршэнні трохі статыстыкі для разумення значнасці Гродзенскай губерні ў баявых дзеяннях паўстанцаў.

Па спісу Мураўёва-Вешальніка, з 23.01.1863 г. па 3.01.1864 г. адбылося 59 баявых сутычак, якія занеслі ў паслужны спіс афіцэраў. Астатнія былі, на яго погляд, «незначительные». У Гродзенскай губерні па мураўёўскаму спісу было 10 баёў і сутычак (7 з іх адбыліся ў маі-чэрвені)[224].

«Журнал военных действий», складзены афіцэрамі штаба Віленскай вайсковай акругі, прыводзіць лічбу каля 165 баёў і сутычак на тэрыторыі віленскага генерал-губернатарства. На Гродзенскую губерню прыпадае 50 баявых аперацый[225].

Згодна з «Перечнем» А.І. Мілавідава, усіх сутыкненняў расійскіх войск з паўстанцамі ў межах так званага Паўночна-Заходняга краю ў 1863-1864 гг. было 260[226].

223 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 167, а. 75 адв.

224 Смирнов А.Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. – М., 1963. – С. 122.

225 Тамсама. – С. 123.

226 Архивные материалы Муравьёвского музея, относящегося к польскому восстанию 1863-1864 гг. в пределах Северо-Западного края / сост. А.И. Миловидов. – Ч. 2 // Виленский временник. – Кн. VI. – С. XXXIV, XXXVII.

Па храналагічнаму спісу С. Зялінскага на тэрыторыі Літвы і Беларусі адбылося 237 баёў і сутычак (з агульнай лічбы 1229 на тэрыторыі Літвы, Беларусі, Каралеўства Польскага, Правабярэжнай Украіны). У Гродзенскай губерні — 65 баявых аперацый (большасць іх у маі-чэрвені)[227].

Па нашаму спісу, прыведзенаму ў дадзеным нарысе, у 1863 г. на тэрыторыі Гродзенскай губерні адбылося каля 98 баёў і сутыкненняў паміж расійскімі ўрадавымі часцямі і атрадамі паўстанцаў. Пік іх прыйшоўся на май (21) і чэрвень (25). Больш баявых сутыкненняў было на тэрыторыі Бельскага (25), Слонімскага (16), Ваўкавыскага (15) паветаў. У баявых дзеяннях удзельнічалі паўстанцкія атрады пад кіраўніцтвам Ціхорскага (Замечак), Рагінскага, Левандоўскага, Чаркоўскага, Ябланоўскага, Рыльскага і Сангіна, Парчэўскага, Урублеўскага, Лапкоўскага, Лянкевіча, Духіцкага, Лукашэвіча, ксяндза Ляшкевіча, Стравінскага і інш. Супраць іх вялі барацьбу расійскія часці Стараінгерманландскага, Неўскага, Пскоўскага, Рэвельскага і Данскога № 33 і № 5 палкоў.

## Спіс крыніц і літаратуры (да баёў і сутычак)


Арамовіч І. Мары. Успаміны пра партызанскі рух у Гродзенскім ваяводстве ў 1863 і 1864 гг. // ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 18-71.

Архивные материалы Муравьёвского музея, относящегося к польскому восстанию 1863-1864 гг. в пределах Северо-Западного края / сост. А.И. Миловидов. — Ч. 2 // Виленский временник. — Кн. VI. — С. XXIX-XLV.

Буднік І. Да падзеяў 1863—1864 гг. на Гарадзеншчыне. — Гродна: ЮрСаПрынт, 2013. — С. 27-41.

Ігнатоўскі У. 1863 год на Беларусі. Нарыс падзей. — Мінск, 1930.

Каліноўскі К. За нашую вольнасць. Творы, дакументы / уклад, прадм., паслясл. і камент. Г. Кісялёва. — Мн.: Беларускі кнігазбор, 1999. — 464 с.

Матвейчык Д. Паўстанне 1863 — 1864 гг. у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў. — Мн.: Медысон, 2013. — С. 25-31, 77-91.

Смирнов А.Ф. Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии. — М., 1963.

Gyra S. Partyzantka na Podlasiu 1863-1864. — Waszawa, 1976.

Laniec S. Bialorus w drugiej polowie XIX stulecia. — Olsztyn: Wyzsza Szkola Pedagogiczna, 1997. — С. 38-42, 55-60, 76-100.

Rozanski F. Z wojewodstwa grodzieńskiego // Czterdziesta rocznice powstania styczniowego. 1863-1864. — Lwow, 1903.

Zielinski St. Bitwy i potyczki 1863-1864. Na podstawie materialow drukowanych i rekopismiennych Muzum Narodowego w Rapperswilu. — Rapperswil, 1913.


227 Zielinski St. Bitwy i potyczki 1863-1864. Na podstawie materialow drukowanych i rękopismiennych Muzeum Narodowego w Rapperswilu. – Rapperswil, 1913. – С. 2-8.

# ПАЎСТАНЦЫ ГРОДЗЕНСКАЙ ГІМНАЗІІ

Дажджлівым суботнім вечарам 14 сакавіка 1863 г. на гродзенскай чыгуначнай станцыі адбылася падзея, перадгісторыя якой пачалася значна раней. У 1862 г. гродзенскі губернатар даносіў віленскаму генерал-губернатару У.І. Назімаву: «Стаўлю сабе ў абавязак дакласці да асабістага вашага разумення, што кіраванне чыгункай, якое складаецца выключна з асоб польскага паходжання, пераважна эмігрантаў, у сапраўднасці стварае непарыўны ланцуг тайных і дакладных зносін, якім не могуць супрацьстаяць ніякія намаганні мясцовага грамадзянскага начальства, бо гэтыя асобы, не падпадаючыя ні пад які кантроль, служаць старыннымі агентамі справе польскіх намаганняў, і спыненне гэтай шкоды можа быць забяспечана не інакш, як выбарам людзей, на адданасць і добрасумленнасць якіх можна было бы з упэўненасцю пакласціся».

Гродзенскі губернатар не памыляўся, бо амаль тое самае пісаў у сваім артыкуле-ўспаміне С. Славуцінскі, які з 1866 г. працаваў на Гродзеншчыне: «У ліку інжынераў і розных арганізатараў Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі было вельмі шмат французскіх падданых з палякаў-эмігрантаў пасля паўстання 1830-1831 гг. або з іх нашчадкаў, менавіта яны будавалі гэтую дарогу ў прымяненні да новага мяцежнага прадпрыемства. Пра гэта расказваў мне цалкам даставерны сведка тагачасных гродзенскіх падзей, і што так было ў сапраўднасці, на тое, між іншым, ясна намякае раптоўны ад'езд з Гродна начальніка мясцовай чыгуначнай станцыі з цэлым цягнікам людзей, які сабраліся да паўстання...».

У лютым 1863 г. ваяводскі рэвалюцыйны камітэт Гродзенскай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі (створанай у 1861 г. В.-К. Каліноўскім і В. Врублеўскім) звярнуўся да ўсіх сваіх падраздзяленняў з заклікам паскорыць стварэнне паўстанцкіх атрадаў. Вышэйназваны факт пра начальніка станцыі і быў адказам на гэты заклік. Ваенна-следчай камісіі ўдалося выявіць, што праект выезда гродзенскіх паўстанцаў узнік сярод гімназістаў, якія пражывалі ў інтэрнаце Прушынскага, у так званых «агульных кватэрах» (цяпер вуліца Кірава). Па паказаннях гімназіста А. Кашубы і шляхціца Ю. Гамулецкага, ініцыятарам праекта быў служачы прыказа грамадскай апекі Г. Зуброўскі. У інтэрнаце адбываліся размовы, на якіх абмяркоўваліся падзеі паўстання. Ільдэфонс Клюкоўскі, удзельнік такіх размоў, адзначыў, што большасць гімназістаў падтрымала вучня 7-га класа Аляксандра Букрабу, які выказаўся за хуткі выхад «у поле».

Сярод гімназістаў праводзіў агітацыю паважаны імі настаўнік (прафесар) польскай мовы Станіслаў Максіміліянавіч Навакоўскі. Па паказаннях Я. Жука, ён гаварыў яму «быць у любы час гатовым», а 14 сакавіка, сустрэўшы яго на вуліцы, даў запіску, у якой было напісана, каб ён разам з Ю. Кудзінскім з'явіўся ў палове 8-га на чыгунку каля вакзала для «вядомай мэты». Я. Жук быў старшым па агульнай кватэры і перадаў запіску сваім сябрам.

Ваенна-следчай камісіі не ўдалося даведацца пра самае важнае — пра галоўнага арганізатара праекта. Па разрозненых дадзеных нам удалося ўстанавіць сувязь удзельнікаў падзей з кіраўніцтвам Гродзенскай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі: ваяводам Эразмам Заблоцкім, улада якога распаўсюджвалася на Гродзенскі, Слонімскі, Ваўкавыскі, Сакольскі і Беластоцкі паветы, злучаныя праз Гродна чыгункай; вайсковым начальнікам Гродна Цэлясцінам Цэханоўскім. Згодна з рапартам гродзенскага паліцмайстра падпалкоўніка Змеева, чыноўнік канцылярыі дваранскай апекі К. Самулінскі разам з Ст. Шантырам і Радавіцкім пераправіліся з-за Нёмана ў ноч з 12 на 13 сакавіка, а перад вечарам 14 сакавіка Самулінскі шпацыраваў па бульвару з начальнікам чыгуначнай станцыі Лявонам Кульчыцкім і бухгалтарам будаўнічай камісіі Эразмам Заблоцкім. Удзельнік выправы Аўгусцін Шэршановіч (Шэршаневіч) перад тым, як ісці на станцыю, з 20 гадзін да 21 гадзіны быў у знаёмага доктара Ц. Цэханоўскага, у якога потым начаваў.

Хочацца звярнуць увагу яшчэ на аднаго ўдзельніка падзей — Вільгельма Грабоўскага. Ён працаваў пісьмаводам у наглядальніка Друскеніцкіх мінеральных вод і нядаўна быў прыкамандзіраваны ў яго камітэт у Гродне. Арыштаваны ён быў на кватэры вядомага ўжо нам Зуброўскага. Грабоўскі мог быць связным ад атрада Людвіка Нарбута, да якога і была зроблена спроба выправы з Гродна».

Уладзіслаў Карбоўскі, аўтар кнігі «Людвік Нарбут», піша, што ў Парэччы чакаў гродзенскую групу брат камандзіра Баляслаў. Гродзенская ўлада баялася, што адтуль яны нападуць на горад (пра гэта сказаў адзін з арыштаваных). Жандарскаму паручніку Геру ўдалося ўстанавіць, што ў Парэччы пад выглядам імянін наглядальніка чыгункі Юліяна Краскоўскага напярэдадні 14 сакавіка адбылася агульная нарада, на якой гаспадар першым падтрымаў Л. Кульчыцкага.

А цяпер падрабязна пра тое, як адбываліся падзеі 14 сакавіка, калі гродзенскія паўстанцы на чале з начальнікам чыгуначнай станцыі Гродна Лявонам Францавічам Кульчыцкім

паспрабавалі выехаць з горада на цягніку. Было тры месцы збору: на чыгуначнай станцыі каля вагонаў, у Брыгіцкага маста, у арцельным доме вёскі Капліца. Асноўныя падзеі, відаць, разгарнуліся на станцыі. З 8 гадзін тут у драўляным павеце пачалі збірацца ўдзельнікі выправы. Ім раздалі зброю (ружжа, пісталеты, кінжалы, сякеры, косы) і павялі да крытых таварных вагонаў і платформаў. У гэты час Кульчыцкі быў у камандзіра 6-й роты Калужскага палка штабс-капітана Макарава, і калі той аддаў загад аб вывадзе вонкавых вартавых, дык сказаў яму, што яшчэ рана і можна зрабіць гэта пазней, перад прыходам экстранага цягніка з Сафійскім батальёнам. Сам хутка выйшаў да вагонаў і з іншымі ўдзельнікамі накіраваўся да лакаматыва, які стаяў у гатоўнасці, як дзяжурная машына.



*Л. Кульчыцкі*

Каля 22 гадзін патруль, пасланы з Гродзенскай станцыі ў напрамку да чыгуначнага маста, паведаміў Макараву пра тое, што каля лакаматыва знаходзяцца невядомыя асобы, якія на пытанне «Хто яны?» адказалі, што яны рабочыя і рыхтуюцца ехаць за дровамі. Незвычайныя ў начны час перасоўванні машын і вагонаў, данясенні патруля выклікалі падазрэнні Макарава. Ён вырашыў, пакінуўшы на чале з прапаршчыкам Пушко варту для аховы тэлеграфа і будынка станцыі, праверыць, што робіцца каля лакаматыва.

Трохі раней пададзены цягніком свісток прыцягнуў увагу машыніста Вінтара, які знаходзіўся ў будынку станцыі. Ён выйшаў паглядзець і каля лакаматыва быў акружаны трыма невядомымі асобамі, двое з іх былі ўзброены кінжаламі, адзін пісталетам. Апошні быў прыстаўлены да ілба Вінтара, ад якога пад пагрозай пазбаўлення жыцця патрабавалі везці туды, куды будзе загадана. Не маючы магчымасці супрацьстаяць, машыніст выканаў загад, але перад гэтым паспеў крыкнуць свайму памочніку Якімовічу: «Вагон!». Той добра зразумеў, што ад яго патрабавалі, і пад покрывам змроку адчапіў лакаматыў ад вагонаў. Калі гэта было зроблена, Вінтар даў ход аднаму лакаматыву (па іншай версіі, гэта зрабіў Кульчыцкі), а сам паспеў выскачыць з яго.

Перад самым рухам машыны да вагонаў падышоў качагар, які ўбачыў, што ў іх сядзяць нейкія людзі, а іншыя рыхтуюцца так-

сама сесці ў вагоны. Ён пайшоў дакласці пра гэтае ротнаму камандзіру Макараву. Але той ужо выбег з караўлам з будынка станцыі да вагонаў, пачаў крычаць: «Хто тут, што за людзі?». У адказ пачуліся стрэлы, ён быў паранены ў левае плячо. Затым паўстанцы зрабілі залп з усёй зброі і пачалі адыходзіць. Расійскія салдаты адказалі стрэламі, два паўстанцы былі паранены: чыноўнік канцылярыі дваранскай апекі Казімір Самулінскі і чыноўнік канцылярыі дваранскага дэпутацкага сходу Казімір Талочка (у дакументах часта блыталі гэтых людзей). Два паўстанцы былі затрыманы адразу на месцы здарэння: шляхціц Юзэф Гамулецкі і салдацкі сын Вікенці Жукоўскі.



*Гродзенскі чыгуначны вакзал у 1860-х гг.*

Людзі, якія сабраліся на станцыі, пачалі разбягацца. Цёмная ноч перашкаджала пераследаваць іх, але і яны не маглі дабрацца дадому і хаваліся ў агародах, ровах, дварах, на кватэрах знаёмых, якія жылі недалёка ад станцыі. Станцыя і ўвесь горад былі акружаны расійскімі войскамі, па вуліцах да світанку ездзілі раз’езды з двух кавалерыйскіх эскадронаў. На платформах былі знойдзены 16 ружжаў і пісталетаў, косы, шаблі, 1 пуд 30 фунтаў пораху, свінец і частка вопраткі. Пазней Гродзенская следчая камісія складзе «Вопіс зброі і рэчаў, адабраных ад мяцежнікаў у горадзе Гродне з 2 на 3 сакавіка 1863 г. і перададзеных: зброя — у Гродзенскі батальён, рэчы — у Калужскі пяхотны полк». У гэтым спісе я налічыў 35 адзінак зброі (6 аднаствольных ружжаў, 5 аднаствольных вінтовак, 3 пісталеты, 2 штыкі, 2 шаблі, 2 касы на шасце, 7 сякер і інш.), 51 адзінку рэчаў (сярод іх адзначым 15 геаграфічных картаў, 5 карт лясоў Гродзенскай губерні, «кашолка з медыкаментамі, вагамі, лыжачкай і пакетамі для парашкоў, з якіх на адным напісана па-польску «Apteka Adamowicza», якая прымацавана да кашолкі»). У спісе яшчэ былі пазначана розная вопратка: шубы, шынэлі, буркі, цёплыя і звычайныя паліто, а таксама 6 скруткаў паперы. Як бачым, гродзенскія паўстанцы сур’ёзна рыхтаваліся да партызанскіх дзеянняў.

Але дабрацца да партызан удалося нямногім. Як было сказана вышэй, вагоны былі адцэплены ад лакаматыва, і кіраўнік вы-

правы Кульчыцкі застаўся без сваіх паўстанцаў. Разам з ім было 7 ці 8 чалавек. Яму ўдалося завалодаць грошамі з касы станцыі. На 20-й вярсце ад Гродна Кульчыцкі і яго таварышы пакінулі лакаматыў у цэласці. Па словах гісторыка Ю. Ядкоўскага, Кульчыцкі дайшоў да партызанскага атрада (невядома, ці Л. Нарбута), у адным з баёў быў паранены і трапіў у палон. Архіўныя матэрыялы Мураўёўскага музея сведчаць пра смерць Кульчыцкага ад ран.

У снежні 1863 г. быў пасаджаны ў Гродзенскі турэмны замак (былы езуіцкі кляштар) Актавіян Лапінскі. 16-гадовы былы вучань Гродзенскай гімназіі таксама ўдзельнічаў у сакавіцкай выправе, але тады быў вызвалены з-пад арышту. Напрыканцы красавіка, як ён паказаў на следстве, прачытаў у адной з газет («Сын Отечества» або «Виленский вестник») аб існаванні паўстанцкага атрада ў Аўгустоўскай губерні Каралеўства Польскага. Праз Нёман дабраўся, дзякуючы сустрэчы са знаёмым, да атрада Андрушковіча, пасля бою пад Кадышом тры месяцы партызаніў у атрадзе Ваўра (Канстанціна Раматоўскага). Пачуўшы пра амністыю для тых, хто добраахвотна пакіне паўстанцкія атрады, Лапінскі пайшоў да ваеннага начальніка Сапоцкіна, які адправіў яго ў Гродна. Следчая камісія прызнала Лапінскага «положительно вредным для края» і вырашыла выслаць з месца жыхарства.

Хто яшчэ з гродзенскіх паўстанцаў дабраўся да партызанскіх атрадаў, пакуль невядома, але далейшыя архіўныя пошукі, спадзяюся, дадуць нам новыя матэрыялы. Усіх жа ўдзельнікаў няўдалай выправы з Гродзенскай станцыі налічваецца прыкладна каля 100 чалавек. Мне ўдалося ў розных крыніцах знайсці прозвішчы 72 чалавек, якіх прыцягнулі да следства па справе 14 сакавіка. Сярод іх 25 гімназістаў з Гродзенскай губернскай (былой Дамініканскай) гімназіі і 1 з Свянцянскай гімназіі; 13 чыноўнікаў: з губернскага праўлення (2 чалавекі), канцылярыі гродзенскага губернатара (1 чалавек), палаты дзяржаўных маёмасцяў (3 чалавекі), грамадзянскай і крымінальнай судовых палат, прыказа грамадскай апекі, канцылярый дваранскага дэпутацкага сходу і дваранскай апекі, казённай палаты і камітэта Друскеніцкіх мінеральных вод (ва ўсіх пералічаных па 1 чалавеку); 1 рабочы і 7 служачых чыгункі (шляхціцы); 1 аптэкар і 6 аптэкарскіх вучняў з аптэк Кандратовіча, Несцяровіча і Адамовіча; 2 работніка друкарні Гродзенскага губернскага праўлення; студэнт Пецярбургскага ўніверсітэта Г. Даланскі; 3 шляхціцы, 2 памешчыкі, 1 селянін,1 мешчанін, 1 шавец, 2 настаўнікі, 1 адстаўны вайсковец і 1 салдацкі сын.

Загадам гродзенскага губернатара генерал-маёра І.У. Галера для расследавання падзеі 14 сакавіка пры Гродзенскім батальёне ўнутранай аховы была створана 16 сакавіка ваенна-следчая камісія. 12 мая яна рапартавала губернатару аб завяршэнні следства. 9 чалавек былі вызвалены з-пад суда пад нагляд гродзенскай паліцыі: Ю. Пушкарэвіч, Ст. Шантыр, Ст. Развадоўскі, Ян Эйслер, У. Пачобут, Любамір і Лявон Ястржэмбскія, Ст. Куроўскі, Ян Ажэ. Астатнія арыштаваныя былі падзелены на чатыры катэгорыі. Да другой аднесены К. Самулінскі і К. Талочка — абодва былі пазбаўлены правоў стану і прыгавораны да 3 гадоў катаржных прац. Да трэцяй катэгорыі аднесены Г. Зуброўскі і Г. Далянскі — пазбаўлены правоў стану і сасланы на жыхарства ў аддаленыя губерні: першы — у Пермскую, другі — у Табольскую.

16 чалавек, большасць з іх гімназісты, былі прыгавораны да службы радавымі ў сібірскіх вайсковых часцях: Ст. Ражбіцкі, А. Кашуба, Ю. Кашуба, Ю. Кудзінскі, Я. Гартунг, Ю. Гамулецкі, Ян Жук, А. Ржансніцкі, К. Ізбіцкі, Ст. Крэйбіх, А. Шэршэневіч, А. Пржыбылка, Е. Краскоўскі (усе пералічаныя не пазбаўляліся правоў стану); А. Сямашка, А. Багатырэвіч, А. Букраба (усе яны захавалі правы стану). Маёмасць усіх названых вышэй падсудных канфіскоўвалася ў казну, а калі маёмасці ў іх не было, дык сяквестр накладваўся на маёмасць бацькоў, з якой тая частка, якая павінна была адысці да іх па спадчыне, канфіскоўвалася ў казну.

Падзеі 14 сакавіка занепакоілі дырэкцыю Гродзенскай гімназіі. Па просьбе дырэктара Шэвелева ў дзень святога Казіміра ў калідорах гімназіі неслі службу да 10 афіцэраў на чале з афіцэрам. У палове красавіка з гімназіі былі адлічаны без права паступлення ў іншыя вучэбныя ўстановы 119 чалавек. 11 чэрвеня М.М. Мураўёў загадаў адпускаць гімназістаў на канікулы толькі пад абавязацельствы бацькоў. Восенню забаранілі ўжываць польскую мову ў гімназіі, нават маліцца прымушалі па-руску. У кастрычніку 1863 г. звольнілі з працы інспектара Ст. Наркевіча, а праз паўгода — і апошніх прафесараў-палякаў: Гедройца (матэматыка), Бялаўскага (лацінская мова), Ю. Карэйву, Гінтаўта, В. Вайновіча і Мройскага.

Вось так журботна скончылася справа 14 сакавіка. Праходзячы каля будынка новага вакзала, звярніце ўвагу на мемарыяльную шыльду, прысвечаную падзеі 1863 г., і пакланіцеся нашым мужным продкам, якія пакінулі нам у спадчыну ідэю незалежнасці:

**Ажэ Ян Эльяшэвіч**, вучань Гродзенскай гімназіі;

**Антушэвіч Юзаф Адамавіч**, вучань 5-га класа Гродзенскай гімназіі;

**Арцішэвіч Вікенці**, аптэкарскі вучань;

**Арцымовіч Вінцэнт Тамашавіч**, адстаўны вайсковец;

**Багатырэвіч Антоні Францішкавіч**, вучань Гродзенскай гімназіі;

**Бараноўскі Міхаіл Юзафавіч**, вучань Гродзенскай гімназіі;

**Баршчыцкі Уладзімір Уладзіслававіч**, аптэкарскі вучань;

**Баяроўскі Юліян**, калежскі сакратар грамадзянскай палаты;

**Бергель Марцін Янавіч**, шляхціц;

**Блашынскі Станіслаў Кантаравіч**, друкар друкарні губернскага праўлення;

**Букраба Аляксандр Валер'евіч**, вучань 7-га класа Гродзенскай гімназіі;

**Быстры Юзаф Ксавер'евіч**, вучань Гродзенскай гімназіі;

**Валінскі Генрык**, вучань Гродзенскай гімназіі;

**Верашчынскі Антоні**;

**Высоцкі Юзаф Міхайлавіч**, служачы канцылярыі гродзенскага губернатара;

**Высоцкі Міхаіл**, канцылярскі служачы палаты дзяржаўных маёмасцяў;

**Галконт (Галконд) Антоні Янавіч**, 21 год, у службе і на пасадзе пісара гаспадарчага аддзела палаты дзяржаўных маёмасцяў з 17.11.1860 г.[228] (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 57);

**Гартунг Януары Андрэевіч**, вучань 5-га класа Гродзенскай гімназіі;

**Гамулецкі Юзаф Віктаравіч**, былы вучань Гродзенскай гімназіі, дваранін Гродзенскай губерні, 18 гадоў. Па рашэнню камандуючага войскамі Віленскай ваеннай акругі ад 17.09.1863 г. аддадзены на вайсковую службу. Цыркулярам Міністэрства ўнутраных спраў ад 9.04.1869 г. сасланы на жыхарства пад нагляд паліцыі ў Пензенскую губерню. Хадайнічаў у 1870 г. аб прызначэнні казённага ўтрымання і аплаты за наём кватэры (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 169, 248; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 18);

**Грабавецкі Вільгельм Іванавіч**, 27 гадоў, калежскі рэгістратар, служачы для пісьмаводства пры наглядальніку ўпраўлення Дру-

228 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 1138, а. 7 адв.

скеніцкіх мінеральных вод (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 61);

**Далянскі Генрык Мацэевіч**, студэнт Пецярбургскага ўніверсітэта, кандыдат па юрыдычнаму факультэту;

**Дзмітрыеў Андрэй**, аптэкарскі вучань;

**Жмайловіч Іван Мартынавіч**, 41 год, дваранін Кобрынскага павета (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 204);

**Жук Іван Восіпавіч (Ян Юзэфавіч)**, 19 гадоў, з вольна адпушчаных сялян, вучань 7-га класа Гродзенскай гімназіі. Сасланы па прыгавору вайсковага суда ўглыб Расіі з адданнем у салдаты. Пасля вяртання жыў у В. Бераставіцы, дзе і памёр[229] (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 155);

**Жукоўскі Вінцэнці Вінцэнтавіч**, 18 гадоў, сын адстаўнога радавога гродзенскай каманды ўнутранай аховы, узяты з прычыны выступлення на вуліцы Раскошы, калі ішоў з аптэкі Дзічкоўскага, дзе, як сведчыў, купляў для хворай мацеры лекі (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 141, 255, 257);

**Зубраўскі Гіпаліт Аляксандравіч**, 55 гадоў, памешчык Гродзенскага павета, валодаў пазямельным маёнткам у ваколіцы Кульбакі, пэўны час працаваў засядацелем Гродзенскага земскага суда (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 230-230 адв.);

**Ізбіцкі Баляслаў Якаўлевіч (Якубавіч)**, 34 гады, з дваран, служачы Гродзенскага губернскага праўлення, калежскі рэгістратар, памочнік столаначальніка 5-га стала (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 165);

**Ізбіцкі Клеменс Якубавіч**, вучань Гродзенскай гімназіі;

**Казімірскі Іван Мацвеевіч (Ян Мацэевіч)**, 39 гадоў, праваслаўны, на службе з 16.01.1848 г., на пасадзе бухгалтара гаспадарчага аддзела Гродзенскай палаты дзяржаўных маёмасцяў з 24.07.1861 г. [230]ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 56);

**Карчэўскі Ян Ксавер'евіч**, 16 гадоў, бацька меў маёнтак Кашылова, вучань 4-га класа Гродзенскай гімназіі (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 167);

**Карны Канстанцін Восіпавіч (Мацэевіч)**, 17 гадоў, вучань 7-га класа Гродзенскай гімназіі (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 206);

**Кашуба Адольф Юльянавіч**, дваранін Гродзенскай губерні, 16 гадоў, пасля смерці бацькоў застаўся маёнтак бацькі ў в. Рапелька Ваўкавыскага павета і маёнтак маці ў в. Чарнаўшчызна ў Лідскім

229 Jodkowski J. Sylwety z roku 1863 // Nowe Życie (Grodno).- 1926. – n.8.

230 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 1138, а. 6 адв.

павеце Віленскай губерні. Маёнткі знаходзіліся ў апецы да падзелу паміж братам і 3 сёстрамі. Вучань 7-га класа Гродзенскай гімназіі (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 43, 50);

**Кашуба Юзаф Юльянавіч**, 18 гадоў, брат Адольфа (гл.), вучань 7-га класа Гродзенскай гімназіі (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 50);

**Краскоўскі Юліян Адольфавіч**, 26 гадоў, праваслаўны, дваранін, наглядальнік на чыгунцы (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 208);

**Краскоўскі Георгій Адольфавіч**, 17 гадоў, праваслаўны, дваранін, служачы на чыгуначным вакзале (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 210);

**Крэйбіх Станіслаў Казіміравіч**, вучань Гродзенскай гімназіі, з маёнтка

**Грандзічы**;

**Крэвін Казімір Мартынавіч**, 25 гадоў, казённы селянін в. Каменка Немяйшыцкага грамадства Сакольскага павета, служыў работнікам на чыгунцы і лакеем у Ю. Краскоўскага, у якога і жыў. Паказаў на следстве, што да яго часта прыходзіла шмат гасцей, у тым ліку і 2(14).03 вечарам (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 149);

**Кудзінскі Юзаф Янавіч**, вучань 6-га класа Гродзенскай гімназіі;

**Кульчыцкі Ляон Францавіч** (каля 1823—1863 гг.), адстаўны штабс-капітан расійскай арміі, наглядальнік (па іншых дадзеных, начальнік) Гродзенскай станцыі Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі. Па яго ініцыятыве ў гродзенскіх чыгуначных слясарных майстэрнях выраблялі халодную зброю. Удзельнічаў у арганізацыі выезду гродзенскіх гімназістаў у паўстанцкі атрад. Пасля няўдачы дабраўся да лясоў паміж Парэччам і Друскенікамі, а затым на Коўеншчыну. Разбіў расіян у ваколіцы чыгуначнай станцыі Казлова Руда на адрэзку чыгункі Коўна-Вержбалава (у пачатку красавіка 1863 г.). У баі 9 красавіка 1863 г. каля в. Павілайцэ быў цяжка паранены, трапіў у палон, памёр у вайсковым шпіталі ў Коўне. 4 сакавіка на кватэры К. быў зроблены вобыск, пад час якога знайшлі куфар з паперамі (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 231, а. 19 аб.; ф. 3, воп. 1, с. 2, а. 22; Jodkowski J. Gimnazium podominikanski ... — S. 30; Lanec St. Partyzanci kresow... — S. 28; Lanec St. Partyzanci żeliaznych dryg... — S. 206-207; Революционный подъём в Литве и Белоруссии... — С. 661);

**Куроўскі Станіслаў Адамавіч**, 19 гадоў, запісаны ў кнігі м. Цераспаль Каралеўства Польскага, жыў у Гродне па пашпарту люблінскага губернатара, служыў аптэкарскім вучнем аптэкі Дзічкоўскага па вул. Дамініканскай (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 64);

**Квяткоўскі Антоні Антоніевіч**, вучань Гродзенскай гімназіі;

**Лапінскі Актавіян Стэфанавіч**, вучань Гродзенскай гімназіі;

**Мазуркевіч Ігнаці Карлавіч**, 33 гады, гродзенскі мешчанін, шавец, меў у Гродне два невялікія драўляныя дамы. Захоўваў у сябе і даваў чытаць іншым нелегальную газету «Харугва вольнасці». З-пад арышту вызвалены 27.03 (8.04).1863 г. (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 214, 228, 262);

**Мілкевіч**, вучань Гродзенскай гімназіі;

**Навакоўскі Станіслаў Максімільянавіч**, 28 гадоў, нарадзіўся ў м. Вальбром Олькушскага павета Радамскай губерні. Спачатку працаваў настаўнікам у Ковенскай гімназіі, затым — настаўнікам польскай мовы ў Гродзенскай гімназіі. Пры вобыску на даху дома, дзе ён жыў, знайшлі польскі кунтуш, камзол і шапку, якія падараваў яму швагер Браніслаў Ясенскі ў Любліне (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 239, 290-291);

**Немчыновіч Вянцэслаў Паўлавіч**, 16 гадоў, дваранін Лідскага павета Віленскай губерні, вучань 7-га класа Гродзенскай гімназіі (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 285);

**Пачобут Уладзіслаў Юзафавіч**, 25 гадоў, дваранін Гродзенскай губерні, памешчык Ваўкавыскага павета, пасля смерці бабулі яму прызначаўся маёнтак Малыя Эйсманты. Начаваў у Ястржэмскіх у ноч з 2 на 3.03 (14 на 15) і быў арыштаваны разам з імі (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 281-281 адв.);

**Пржыбылка Адам Андрэевіч**, шляхціц, тэлеграфіст на чыгуначнай станцыі Гродна, затрыманы 3(15.03).1863 г. і пасаджаны ў Гродзенскі астрог (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 147);

**Пушкарэвіч Юліян Мікалаевіч**, 20 гадоў, шавец. У яго знайшлі нелегальную газету «Харугва вольнасці» на польскай мове, якую даў яму брат па мацеры Ігнат Мазуркевіч. Даваў чытаць яе Карнаму (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 214, 216);

**Плаўскі Эміль (Емяльян) Францішкавіч**, вучань Гродзенскай гімназіі;

**Рагоўскі**, вучань Гродзенскай гімназіі;

**Развадоўскі Станіслаў Юзафавіч**, аптэкарскі вучань;

**Ражбіцкі Станіслаў Нарбертавіч**, дваранін Гродзенскай губерні, 18 гадоў, вучань 6-га класа Гродзенскай гімназіі. Жыў у мацеры ў Гродне. Педагагічны савет гімназіі 9 і 10 (21-22) кастрычніка 1861 г. вырашаў пытанне аб яго выключэнні з гімназіі за спяванне забароненага польскага гімна ў гімназічным касцёле. Быў вы-

сланы ў Пружаны, дзе служыў засядацелем земскага суда бацька. Над ім усталявалі паліцэйскі нагляд. 28.04.1862 г. губернатар дазволіў пераехаць на жыхарства да мацеры, дзе над Р. працягвалі сакрэтна наглядаць[231]. У верасні 1862 г. прынялі зноў у гімназію (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 52, 76);

**Ржонсніцкі Антон**, былы вучань Свянцянскай гімназіі, не меўшы ў 1863 г. 20 гадоў. Па канфірмацыі камандуючага войскамі Віленскай вайсковай акругі ад 17.09.1863 г. быў аддадзены на вайсковую службу, з якой быў выключаны ў 1869 г. без прысваення вайсковага звання. У 1870 г. пражываў у Кастрамской губерні[232];

**Ружко (Рушке) Тэадор Фрыдрыхавіч**, 32 гады, прускі падданы, лютэранін, са снежня 1862 г. працаваў вартаўніком на складах чыгуначнай станцыі Гродна (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 123);

**Самулінскі Казімір Ігнацьевіч**, 21 год, дваранін. Служыў пісарам у міравога пасярэдніка Гродзенскага павета 1-га ўчастка Шантыра. Пастаянна жыў у маёнтку Дзяміткава. Пазней працаваў канцылярскім служачым у дваранскай апецы. У ноч з 28.02 (12.03) на 1.03 (13.03) пераправіўся праз Нёман разам з Шантырам і Ст. Радавіцкім (гл. нарыс пра памочнікаў-паўстанцаў), памешчыкам Ваўкавыскага павета. Вечарам заўважаны ў кампаніі з начальнікам станцыі Кульчыцкім і бухгалтарам будаўнічай камісіі Заблоцкім. На вул. Польнай салдат параніў яго штыком, а затым з дапамогай іншых адвёў на вакзал. У яго знайшлі пісталет і 2 ражкі пораху (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 143, 233-234, 254);

**Сямашка Антоні Стэфанавіч (Сцяпанавіч)**, 21 год, з незацверджаных Герольдыяй дваран Гродзенскай губерні, бацька меў зямлю ў ваколіцы Сямашкі Гродзенскага павета. Прыватны настаўнік. Сасланы ў Сібір[233] (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 282);

**Сямашка Юзэф**

**Талочка Казімір Юзэфавіч**, 24 гады, дваранін Сакольскага павета, маючы непадзеленыя маёнткі ў гэтым і Гродзенскім паветах. Служачы канцылярыі дваранскага сходу. Пад час вобыску знайшлі верш патрыятычнага зместу, у якім гаварылася пра службу і вернасць мацеры-полькі (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 247, 249);

**Філістовіч Ян**, рабочы чыгункі;

**Хамічэўскі Сільверст Вікенцьевіч**, канцылярскі служачы губернскага праўлення;

231 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1135, а. 3, 4 адв., 28.

232 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 664.

233 Jodkowski J. Sylwety z roku 1863…

**Чачот Людвік Ксавер'евіч**, 26 гадоў, з дваран, пісар Гродзенскай палаты крымінальнага суда з 25.11.1857 г., католік[234], вызвалены з-пад арышту 14 (26).03 (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 112, 148 адв.);

**Чачот Эдуард (Эдвар) Ксавер'евіч**, 33 гады, з дваран, чыноўнік Гродзенскай казённай палаты, вызвалены з-пад арышту 14 (26).03 (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 16 адв., 113, 148 адв.);

**Шантыр Станіслаў**, шляхціц Гродзенскага павета;

**Шмідт Адольф Іванавіч**, 28 гадоў, ураджэнец Плоцкай губерні Каралеўства Польскага, аптэкар, арандатар гродзенскай аптэкі І. Адамовіча, дзе і жыў са сваёй жонкай пасля прыезду з Плоцка. Яго абвінавачвалі ў забеспячэнні паўстанцаў лекамі, а таму арыштавалі 20 сакавіка і даставілі на допыт. Ш. на следстве казаў, што палукашак з лекамі быў прададзены незнаёмай асобе для лячэння сялян у сваім маёнтку некалькі тыдняў таму. Далей следства дазналася, што Ш. удзельнічаў у Плоцку ў «беспарадках» 1861 г., за што знаходзіўся да 24 сакавіка 1862 г. пад наглядам паліцыі. 28.09.1863 г. па канфірмацыі камандуючага войскамі Віленскай вайсковай акругі быў пазбаўлены ўсіх правоў і прывілеяў, 27.10 адпраўлены ў Томскую губерню пад нагляд паліцыі[235];

**Шмігіра**, вучань Гродзенскай гімназіі;

**Шыдлоўскі Адольф Андрэевіч**, служачы губернскага праўлення;

**Шэршэневіч Аўгусцін Янавіч**, вучань Гродзенскай гімназіі;

**Эйсляр Юзаф**, аптэкарскі вучань;

**Янкоўскі Караль Станіслававіч**, друкар друкарні губернскага праўлення;

**Ястржэмскі Любамір Юзэфавіч**, 31 год, нарадзіўся ў Радамскай губерні, дваранін, служачы чыгункі (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 292);

**Ястржэмскі Ляон Юзэфавіч**, 17 гадоў, нарадзіўся ў Радамскай губерні, брат Любаміра, дваранін, служачы чыгункі (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 292 адв.).

---

234 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 1138, а. 37 адв.

235 ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 195, 243; Игнатович Ф. Аптека провизора Ивана Адамовича и восстание 1863 г. // Город Святога Губерта: альманах локальной истории. – Вып. 7 (2013) / рэдкал.: А. Смалянчук [і інш.]. – Гродна, 2013. – С. 129-131.

# ПАМОЧНІКІ ПАЎСТАНЦАЎ

Даследчык сацыяльна-саслоўнага складу паўстанцаў 1863 г. У.М. Зайцаў прыводзіць колькасць рэпрэсаваных за садзейнічанне і спачуванне паўстанню па паветах Гродзенскай губерні. Агульная колькасць — 827 чалавек. Сярод іх: 426 дваран (53,38 %), 163 селяніна (20,43 %), 65 мяшчан (8,15 %), 50 шляхціцаў (6,26 %), 36 каталіцкіх святароў (4,51 %), 25 аднадворцаў і вольных сялян (3,13 %), 14 яўрэяў (1,75 %) і іншыя (кожная катэгорыя менш за 1 %)[236].

У гэтым нарысе аповед будзе ісці менавіта пра паўстанцаў, якія актыўна дапамагалі паўстанцкай ваяводскай арганізацыі, забяспечвалі партызанскія атрады транспартам, харчаваннем, вопраткай, вербавалі ў атрады людзей, збіралі грошы, хавалі паўстанцаў, лячылі іх, перадавалі звесткі аб перасоўваннях расійскіх войск і карных атрадаў. Гэта былі мужныя людзі, бо іх учынкі царская ўлада «ацаніла» рознымі відамі пакарання: прыгаворам да палітычнага нагляду, турэмным зняволеннем, ссылкай у Сібір або ў далёкія расійскія губерні, пасяленнем у Сібіры з забаронай вяртання на радзіму нават пасля амністыі.

Вось, напрыклад, рашэнне 1-й Гродзенскай ваенна-следчай камісіі ад 2(14).01.1864 г. аб высяленні шляхты і аднадворцаў з вёсак Бельскага павета за дапамогу паўстанцам харчаваннем:

- Гарнова — тут кватараваў паўстанцкі атрад, і жыхары яго кармілі;
- Выганова, Асмоля, Толвін, Верцень, Ясянуўка — давалі харчаванне партызанскаму атраду ў Горнаўскім лесе;
- Старое Альшэва — жыхары давалі ежу атраду, якія знаходзіўся каля в. Валкі;
- Клопаты Станіславы — насельніцтва збірала грошы па 15 капеек срэбрам з чалавека на патрэбы паўстанцаў[237].

Памочнік М. Мураўёва, «мураўёўскі ўлюбёнец» Пётр Чарэвін ва ўспамінах пісаў: «Задушэнне такога мецяжу, якім ён быў у 1863 г., можна параўнаць з вайной, бо гэтыя 6 мільёнаў, за малым вынятkам, сапраўды аб'явілі нам вайну. Не ўсе адкрыта, са зброяй у руках, але ж таемны вораг, з нажом у халяве больш небяспечны»[238].

236 Зайцев В.М. Социально-сословный состав участников восстания 1863 г. (Опыт статистического анализа). – М.: Наука, 1973. – Табл. 41

237 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 1400, а. 1-5.

238 Чарэвін П. Паўночна-Заходні край: успаміны // Спадчына. – 1998. – № 3. – С. 42.

Уклад кожнага з ніжэйпададзеных патрыётаў на крок набліжаў час сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення.

**АЖАРОЎСКІ КАЗІМІР**, граф, былы міравы пасярэднік Кобрынскага павета. «Весьма радушно угощал» паўстанцаў атрада Р. Рагінскага, даў ім неабходныя харчы ў дарогу, каня і карабін (Архивные материалы Муравьёвского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863-1864 гг. в пределах Северо-Западного края. — Ч. 1. — Вильно, 1913. — С. 392; Studia i materialy do historii Wojskowosci. — T. 28. — Warszawa, 1985. — S. 203).



*П. Ажэшка*

**АЖЭШКА ПЁТР ФЕЛІКСАВІЧ** (каля 1823 г. — 25.08.1874 г.), муж пісьменніцы Элізы, чыноўнік Гродзенскай казённай палаты. З 28.01.1863 г. знаходзіўся на працягу 28 дзён у адпачынку. За дапамогу паўстанцам харчаваннем, прыём іх у сваім маёнтку, дапамогу коньмі Траўгуту быў арыштаваны ў кастрычніку 1863 г. У Кобрынскай следчай камісіі не прызнаў сваёй віны, сцвярджаючы, што дапамагаў пад прымусам. Пэўны час знаходзіўся не ў турме, а на паруках айчыма Элізы К. Відацкага. 24 снежня 1864 г. быў прыгавораны да ссылкі ў Пермскую губерню, хаця «па праведзенаму даследаванню не выяўлена юрыдычных доказаў». 6.03.1865 г. адпраўлены па этапу. Яго маёнтак Людвінова быў спачатку секвестраваны, а потым вызвалены ад секвестра і абкладзены 10 % зборам. У маі 1867 г. А. быў амніставаны і, верагодна, у гэты час прадаў свой маёнтак па пакупным акце ад 22.08.1867 г. за 30 000 руб. калежскаму дарадцы П. Кантараву. Жыў у Варшаве пад паліцэйскім наглядам, дзе і памёр у евангелісцкім шпіталі пасля працяглай хваробы (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 231, а. 60; ф. 1159, воп. 3, с. 18, а. 168, 168 адв., 181; ДАГВ, ф. 104, с. 75, а. 5 адв.; Jankowski E. Eliza Orzeszkowa. — Warszawa: PIW, 1966. — S. 72, 74, 78, 80-81).



*Э. Ажэшка*

**АЖЭШКА ЭЛІЗА БЕНЯДЗІКТАЎНА** (1841 г., Мількаўшчына, Гродзенскі павет — 1910 г., Гродна). Была звязана з атрадам Р. Траўгута, які дзейнічаў на тэрыторыі Гродзенскай губерні: дастаўляла харчаванне, лекі, пошту, перадавала звесткі пра дзеянні царскіх войск, шыла канфедэраткі і кашулі. У ліпені 1863 г. спачатку хавала, а потым перавезла ў сваёй карэце Р. Траўгута ў Каралеўства Польскае. Гэтаму эпізоду прысвечана навэла Ажэшкі «Ён». Праславіла паўстанцаў у сваім апошнім творы — зборніку навэл «Gloria victis (г. 1863)», рамане «Над Нёманам». Пахавана на гродзенскіх каталіцкіх могілках (Гродно: энциклопедический справочник. — Мн.: БелСэ, 1989. — С. 297-298; Jankowski E. Eliza Orzeszkowa... — S. 68).

**АЙЗІЛЕВІЧ МІХАІЛ**, селянін Беластоцкага павета, 49 гадоў. Прыцягнуты да следства ў ліпені 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за кантакты з паўстанцамі (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі» // ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 183).



*А. Акінчыц*

**АКІНЧЫЦ АЛЯКСАНДР ВОСІПАВІЧ** (1839-1886 гг.), урач пасля заканчэння Маскоўскага ўніверсітэта. З 1862 г. жыў у Шарашове Пружанскага павета і працаваў акруговым лекарам гэтага і Слонімскага паветаў. У красавіку 1863 г. пайшоў у атрад Г. Стравінскага («Была ідэя такая распаўсюджаная і такая даўняя — вызваленне сваёй айчыны»). Аказваў медыцынскую дапамогу паўстанцам. Арыштаваны па даносе сялян 14.11.1863 г. Сасланы на 12 гадоў катаржных прац. У маі 1865 г. разам з З. Мінейка ажыццявіў удалыя ўцёкі з Томска. Пасяліўся ў Францыі, дзе пацвердзіў дыплом урача і займаўся лекаваннем (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 1979, а. 3 адв.; Русско-польские революционные связи: материалы и документы. — Т. II. — С. 608, 725; Грицкевич В.П. С факелом Гиппократа: из истории белорусской медицины. — Мн.: Наука и техника, 1987. — С. 195; ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 29).

**АКІНЧЫЦ ЛЮДВІК**, вольна практыкуючы ўрач Ваўкавыскага павета, 24 гады ў 1864 г., прыцягнуты да следства Гродзенскай ва-

енна-следчай камісіяй за садзейнічанне паўстанню ў чэрвені 1863 г. Пры арышце спрабаваў атруціцца. Сасланы ў Пермскую губерню. Працаваў урачом на Суксунскім заводзе. Там у яго нарадзіўся сын Людвіг, які ў будучым стане прафесарам акушэрства і гінекалогіі 1-га Ленінградскага медыцынскага інстытута (Игнатович Ф.И. Медики — участники восстания 1863 г. и их судьба // Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсу людзей. — Ваўкавыск: Ваўкав. узбуйн. друкарня, 1997. — С. 138; Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі» // ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 182).

**АСКЕРКА А.О.**, урач акруговага ўпраўлення Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў па Слонімскаму і Пружанскаму паветах. Быў урачом у паўстанцкім атрадзе Г. Стравінскага. У лістападзе 1863 г. быў арыштаваны за аказанне медыцынскай дапамогі параненым паўстанцам. Прыгавораны да 12 гадоў катаржных прац (Игнатович Ф.И. Врачи Слонимщины — участники восстания 1863 г. // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў. 1252-2002. — Слонім: ГАУПП «Слонімская друкарня», 2002. — С. 210).



*А. Аскерка*

**АСТРАМЕЦКІ ЛЕЎ**, зяць Алендскага, гаспадар маёнтка Ласосна з хутарам Валкуш, дапамагаў паўстанцам харчаваннем. Маёнтак быў секвестраваны да 22.02.1867 г. (НГАБ у Гродне, ф. 23, воп. 1, с. 372, а. 120; Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гг. на Гарадзеншчыне. — Гродна: ЮрСаПрынт, 2013 — С. 79).

**БАГДАНОВІЧ ЭВЭЛІНА**, чалец рэвалюцыйнага жаночага камітэта (або камітэта апекі) у Сакольскім павеце для дапамогі ўдовам і сіротам-паўстанцам. У лістападзе 1863 г. была саслана ўглыб Расіі на 1 год (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 8; Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — 160. — S. 3).

**БАЛЬЦАР МАЦЕЙ ФАМІЧ**, селянін, 38 гадоў, з в. Лойкі. Прывозіў паўстанцам харчаванне, дапамагаў будаваць лагер. Арыштаваны, узяты сельскай грамадой на парукі (Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў на Гарадзеншчыне. — Гродна: ЮрСаПрынт, 2013. — С. 79).

**БАНЕВІЧ СЕВАСЦЯН**, 55 гадоў, ксёндз з в. Адамавічы. Заклікаў да паўстання, дапамагаў паўстанцам. Зняволены ў Гродзенскай турме (Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў ... — С. 79).

**БАРТАШЭВІЧ ФЕРДЫНАНТ ВЕНІДЫКТАВІЧ**, мешчанін, у 1863 г. меў 38 гадоў, абвінавачваўся ў сувязях з паўстанцамі, сядзеў у Слонімскай турме з 15 чэрвеня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 21 адв., 53 адв.).

**БАРТАШЭВІЧ ІОСІФ ВІКЕНЦЕВІЧ**, дваравы чалавек, у 1864 г. меў 45 гадоў, абвінавачваўся ў забеспячэнні паўстанцаў харчаваннем, сядзеў у Слонімскай турме з 24 жніўня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 27 адв.).

**БАРТНОЎСКІ ФРАНЦ**, сакратар Брэсцкага магістрата, быў зборшчыкам грошай па Брэсцкаму павету. Быў арыштаваны і знаходзіўся пад следствам (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 10 адв.-11).

**БАЯРОЎСКІ АДОЛЬФ**, 43 гады, чыноўнік земскага суда. Захоўваў дакументы Гродзенскай арганізацыі, падтрымліваў паштовыя сувязі. Высланы на жыхарства ў Енісейскую губерню (Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў... — С. 67).

**БЕЛАКОЗ ФЕЛІКС**, 26 гадоў, памешчык маёнтка Марцыновічы. Прывозіў паўстанцам харчаванне. Высланы ў Арэнбургскую губерню (Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў... — С. 79).

**БЕЛІЧАНСКІ ОЎЗЕР**, мешчанін м. Сапоцкін, дапамагаў паўстанцам харчаваннем. Зняволены ў Гродзенскай турме (Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў ... — С. 79).

**БЯНЕЦКІ МІКАЛАЙ ІВАНАВІЧ**, дваранін, нарадзіўся ў Магілёве, 26 гадоў, выхоўваўся ў Слонімскім дваранскім вучылішчы. За ім і бацькамі нерухомай маёмасці не было. Служыў у Гродзенскай паштовай канторы, затым памочнікам слонімскага паштмайстра (снежань 1863 г.), губернскі сакратар. Па паказаннях Э. Заблоцкага, Б. перадаваў праз казённую пошту рэвалюцыйную карэспандэнцыю. Сваёй віны не прызнаў, гаворачы, што па службовых абавязках прымаў законна афармленую карэспандэнцыю

ад усіх, не выключаючы, што сярод яе магла быць і патаемная ад паўстанцаў. Пад следствам сядзеў у мурах Кармяліцкага касцёла ў Гродне. Прыгаворам вызвалены ад суда і арышта. Высланы на месца жыхарства пад строгі паліцэйскі нагляд, секвестр зняты (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а., а. 8; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 69 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 12 адв., 272-274; с. 1, а. 561 адв.; Jodkowski J. Sylwety z roku 1863 // Echo Grodzienski. — 1926. — № 8. — S. 3).

**БЖЭЗІНСКІ АНТОНІ РЫГОРАВІЧ**, дваранін, 45 гадоў у 1870 г., адміністратар маёнтка Азёры графа Л. Валіцкага, дастаўляў у партызанскія атрады харчаванне. Сасланы з пазбаўленнем правоў на жыхарства. З 1864 г. знаходзіўся ў Табольску, займаўся пісьмаводствам (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 160. — S. 3; Электронны рэсурс: narod.ru|Ssilka-ZapSib.html. — Дата доступа: 13.01.2013).

**БІРФРЭЙНД ЮЛІЯН (Ян) ВІЛЬГЕЛЬМАВІЧ** (1833 альбо 1839 г., Вільня — 1874 г.), шляхціц з Гродзенскай губерні, лютэранін. Вучыўся ў Беластоцкай гімназіі і Маскоўскім універсітэце. Летам 1861 г. пасля заканчэння медыцынскага факультэта Маскоўскага ўніверсітэта прыехаў у Беласток. Жыў у доме бабулі Елізаветы, які знаходзіўся на вул. Новабаярскай, паміж казначэйствам і вул. Млыновай. Працаваў вольна практыкуючым урачом. У яго пэўны час жыў вайсковы ваявода Духінскі. Тут бывалі Урублеўскі, Гафмайстар, Каліноўскі. Па паказаннях бабулі Елізаветы, вясной 1863 г. пакінуў дом і знік (быў урачом у партызанскіх атрадах Духінскага, Урублеўскага, Эйтміновіча на працягу 8 месяцаў). У чэрвені 1864 г. знаходзіўся пад следствам, у 1866 г. сасланы на катаргу ва Урук, але, здаецца, тут не быў, а знаходзіўся ў Іркуцку, дзе быў лекарам. Ажаніўся на дачцы купца Маладыха (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40 а, а. 101-101 адв., 106, 109-112; с. 16, а. 65; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917 б., а. 409; Игнатович Ф.И. Медики — соратники К.С. Калиновского // Кастусь Каліноўскі (1838-1864): материалы республиканской конференции. — Гродно: ГрГУ, 1988. — С. 67; Powstanie styczniowe i zeslancy syberyjscy. Katalog fotografii ze zbiorow Muzeum Historycznego m. st. Warszawy. — T. 2. — Warszawa: Argraf, 2005. — S. 261).

**БІСПІНГ АЛЯКСАНДР КАМІЛЬЕВІЧ**, 20 гадоў, нарадзіўся ў маёнтку Струбніца Ваўкавыскага павета Гродзенскай губерні. Вучыў-

ся ў Курляндскай Мітаўскай губернскай гімназіі і Бонскім універсітэце (Германія). У жніўні быў арыштаваны, а 29.09 (11.10).1863 г. быў высланы як неблаганадзейны і па падазрэнню ў дастаўцы харчавання паўстанцам у Арэнбургскую губерню (з кастрычніка 1863 г. жыў у г. Уфе). Па паказаннях Э. Заблоцкага, прымаў у сваім маёнтку Вярэйкі Ваўкавыскага павета яго і К. Каліноўскага пад час іх паездкі па гэтаму павету ў маі 1863 г. Відаць, таму ў пачатку чэрвеня 1864 г. быў дастаўлены ў Гродна для дачы паказанняў. На вочнай стаўцы Заблоцкі не пазнаў Б., а сам ён не прызнаваў свайго ўдзелу ў дапамозе паўстанцам. Верагодна, у 1867 г. памёр (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 75 адв.-76; с. 1, а. 551; воп. 1, с. 40, а. 176; Jodkowski J. Rok 1863 // Echo Grodzienski. — 1921. — № 160. — S. 3; Быхаўцаў М. Паўстанне 1863-1864 гг. у Ваўкавыскім павеце. — Гародня: б.в., 2014. — С. 234).

**БОНДАР ІВАН**, 26 гадоў, праваслаўны селянін з маёнтка Алекшыцы. Прывозіў паўстанцам харчаванне, знаходзіўся ў паўстанцкім атрадзе. Высланы ў Кастрамскую арыштанцкую роту на 2 гады (Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў... — С. 79).

**БРАНЧЭЎСКІ МІКАЛАЙ ЦІТАВІЧ**, памешчык, у 1863 г. меў 26 гадоў, абвінавачваўся ў схаванні паўстанцаў і закліку сялян у паўстанцкія атрады, сядзеў у Ваўкавыскай турме з 6 лістапада 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 21 адв., 42 адв.).

**БРАНЧЭЎСКІ РУДОЛЬФ**, памешчык, абвінавачваўся ў закліку сялян у паўстанцкія атрады, сядзеў у Ваўкавыскай турме з 27 чэрвеня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 21 адв., 42 адв.).

**БУЛАТ ІОСІФ АЛЯКСАНДРАВІЧ**, мешчанін, у 1864 г. меў 39 гадоў, абвінавачваўся ў прыняцці паўстанцаў і забеспячэнні іх харчаваннем, сядзеў у Слонімскай турме з 15 чэрвеня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 21 адв.).

**БУЧЫНСКІ АДАМ ВІКЕНЦЕВІЧ**, дваранін, у 1864 г. меў 43 гады, абвінавачваўся ў сувязях з паўстанцамі, сядзеў у Слонімскай турме з 15 чэрвеня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 21 адв.).

**БЯЛЕВІЧ ПАВЕЛ ЯНАВІЧ**, 25 гадоў, селянін в. Навасады графа Валовіча. Прывозіў паўстанцам харчаванне. Узяты сельскай грамадой на парукі (Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў... — С. 79).

**ВАЛЕНТЫНОВІЧ МАРЦЭЛІ АНТОНІЕВІЧ**, селянін, 25 гадоў, аканом у маёнтку Гансоўскага ў Гродзенскім павеце. Арыштаваны ў верасні 1863 г. за дастаўку харчавання паўстанцам (Jodkowski J. Rok 1863 // Echo Grodzienski. — 1921. — № 177. — S. 3).

**ВАЛЯНЧЭЙЧЫК МІХАІЛ**, 24 гады, селянін Сакольскага павета, падбухторваў сялян да ўдзелу ў паўстанні. Следства не знайшло дастатковых доказаў яго віНаватасці, таму пакінула без пакарання, але вырашыла «оставить в подозрении» (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 557).

**ВАЛІЦКАЯ ЛЮДВІКА**, графіня, 22 гады, пляменніца Леапольда Валіцкага, сувязная ў партызанскім атрадзе Лянкевіча. Дастаўляла яму прадукты, адзенне, гаспадарчыя рэчы. Арыштавана ў верасні 1863 г. і выслана ў Варонежскую губерню ў лістападзе 1863 г. (Jodkowski J. Rok 1863 // Echo Grodzienski. — 1921. — № 177. — S. 3; Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў ... — С. 80).

**ВАЛІЦКІ ЛЕАПОЛЬД ЯНАВІЧ**, граф, 50 гадоў, уладальнік маёнтка Вільянова (м. Азёры). Кандыдат абодвух правоў. Аказваў дапамогу паўстанцам харчаваннем, вопраткай, фуражом, купляў зброю для атрада Лянкевіча. Быў арыштаваны ў верасні 1863 г., пазбаўлены правоў, сасланы ў Сібір, маёнтак канфіскаваны. Разам з ім забраны 2850 кніг, якія трапілі ў Віленскую публічную бібліятэку. У 1871 г. атрымаў дазвол на перасяленне ў еўрапейскую частку Расіі, у Вятку. Але застаўся на месцы з прычыны адсутнасці грошай. Памёр у Іркуцку ў 1875 г. (НГАБ у Гродне, ф. 23, воп. 1, с. 372, а. 18-23; Jodkowski J. Rok 1863 // Echo Grodzienski. — 1921. — № 177. — S. 3; Коўкель Л. Канфіскацыя прыватных кніжных калекцый на беларускіх землях пасля паўстання 1863 г. // ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 214; Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў... — С. 79; Powstanie styczniowe i zeslancy syberyjscy. Katalog fotografii ze zbiorow Muzeum Historycznego m. st. Warszawy. — T. 2. — Warszawa: Argraf, 2004. — S. 49).

**ВАЛОВІЧ ВІТОЛЬД**, 35 гадоў, граф, уладальнік маёнтка Свяцк Аўгустоўскага павета. Прывозіў у партызанскі атрад харчаванне. Зняволены ў Гродзенскай турме.

**ВАЛОВІЧ МІХАІЛ**, 50 гадоў, граф, уладальнік маёнтка Свяцк. Прывозіў у партызанскі атрад харчаванне. Зняволены ў Гродзенскай турме. У 1864 г. знаходзіўся на «поручительстве» па загаду гродзенскага ваеннага губернатара (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 13, с. 1399, а. 7; Jodkowski J. Rok 1863 // Echo Grodzienski. — 1921. — № 177. — S. 3).

**ВАЙНЕЎШ ФЕЛІКС АНТОНІЕВІЧ**, 44 гады, ксёндз м. Азёры, арыштаваны ў ліпені 1863 г. і прысудам палявога суда накіраваны ў ссылку ў Томскую губерню за патрыятычныя прамовы і падбухторванне да паўстання. Адпраўлены з Гродна ў ссылку 29.11.1863 г. (Jodkowski J. Rok 1863 // Echo Grodzienski. — 1921. — № 177. — S. 3; НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 504, а. 30; ф. 3, воп. 1, с. 33).

**ВАЙСЯТЫЧ ТЫТУС АЛЬБЕРТАВІЧ**, шляхціц, 56 гадоў, арыштаваны ў верасні 1863 г. за дастаўку харчавання паўстанцам (Jodkowski J. Rok 1863 // Echo Grodzienski. — 1921. — № 177. — S. 3).

**ВАЙТУШКАВА (ВАЙТУШКА) ЛЕАКАДЗІЯ МАЦЕЕВІЧАЎНА**, жыхарка Аўгустоўскага павета, 45 гадоў. Арыштавана ў лістападзе 1864 г. за знойдзеныя ў яе адозвы ў значнай колькасці (Jodkowski J. Rok 1863 // Echo Grodzienski. — 1921. — № 177. — S. 3).

**ВАЛЕВІЧ А.**, аптэкар у Слоніме. Арыштаваны 17.10.1863 г. за дапамогу паўстанцам «харчаваннем і іншымі рэчамі». Сасланы на жыхарства пад нагляд паліцыі ў Пензенскую губерню (Игнатович Ф.И. Врачи Слонимщины — участники восстания 1863 г. // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў. 1252—2002. — Слонім: ГАУПП «Слонімская друкарня», 2002. — С. 210).

**ВАНСОЎСКІ ПЁТР ІВАНАВІЧ**, у 1863 г. меў 46 гадоў, дваранін, сакратар Браньскай думы. Па словах вайсковага начальніка Бельска з паветам, «дурной маралі і вельмі шкодны ў Браньску, распаўсюджвае чуткі аб інсурэкцыі, якая, па яго словах, абавязкова

павінна хутка скончыцца на карысць паўстанцаў, і тады ўсіх, хто не спачувае ім, чакае пакаранне». Ён сачыў за Браньскім атрадам і даносіў паўстанцам аб яго перасоўваннях. Маёмасці В. не меў, дзеці знаходзіліся на ўтрыманні добрых людзей, бо сваякоў у Бельскім павеце не меў. Быў высланы ў канцы лістапада 1863 г. у аддаленыя губерні Расіі (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 705, а. 1 адв., 21 адв., 22, 77 адв.).

**ВАНАРОЎСКІ (Внароўскі) ДОНАТ**, 46 гадоў, шляхціц з в. Баля Сольная, ляснік у маёнтку Азёры Л. Валіцкага. Інфармаваў паўстанцаў аб перасоўваннях царскіх карных атрадаў, «распаўсюджваў шкодныя чуткі». Быў высланы ў лістападзе 1863 г. у Томскую губерню (Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў ... — С. 80).

**ВЕЙС МЕЧЫСЛАЎ**, дваранін, 30 гадоў. Прымаў паўстанцкі атрад Ляндэра, тры разы даваў ім абед, адвозіў харчаванне ў лес (Быхаўцаў М. Паўстанне 1863-1864 гг. у Ваўкавыскім павеце. Застаўся пад паручыцельства ў сваім павеце (Быхаўцаў М. Паўстанне 1863-1864 гадоў у Ваўкавыскім павеце. — Гародня: Гарадзенская бібліятэка., 2014. — С. 236-237).

**ВІЛЬБІК ФРАНЦ ІОСІФАВІЧ**, дваранін, у 1863 г. меў 40 гадоў, абвінавачваўся ў сувязях з паўстанцамі, сядзеў у Слонімскай турме з 11 ліпеня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 55 адв.).


*В. Вільчэўскі*

**ВІЛЬЧЭЎСКІ ВАЛЕРЫ (ВАЛЕРЫЯН) АНТОНІЕВІЧ**, вольна практыкуючы ўрач (1838 г., Навагрудскі павет — 1916 г.). Выконваў абавязкі правадыра дваранства Брэсцкага павета, забяспечваў харчаваннем паўстанцаў. Быў урачом у атрадзе Лукашэвіча. З 5.08.1863 г. знаходзіўся пад арыштам у Слонімскай турме і падлягаў высылцы ў Арэнбургскую губерню. Па іншых дадзеных, трапіў у палон у красавіку 1864 г. Высланы ў Уфу, а затым па этапу ў Мінусінск. У 1870 г. выехаў у польскі г. Каліш (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 500, а. 5; воп. 1, с. 11, а. 59 адв.; Грицкевич В. С факелом... — С. 194; Jodkowski J. Rok 1863... — № 177).

**ВІЛЬЧЫКЕВІЧ ЯН**, дваранін Гродзенскай губерні, 45 гадоў. Прыцягнуты да следства ў ліпені 1863 г. Гродзенскай ваенна-след-

чай камісіяй за кантакты з паўстанцамі (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі» // ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 183).

**ВІРЫЁН ІВАН**, 68 гадоў, памешчык Гродзенскага павета, дапамагаў паўстанцам прадуктамі, зняволены ў Гродзенскай турме (Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў... — С. 80).

**ВІРЫЁН СТАНІСЛАЎ ІВАНАВІЧ**, 31 год, дапамагаў паўстанцам прадуктамі, зняволены ў Гродзенскай турме (Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў... — С. 80).

**ВОЙНАВА (ВОЙНА) СОФ'Я МІКАЛАЕЎНА**, сястра чыноўніка канцылярыі гродзенскага губернатара, збірала грошы на паляпшэнне харчавання і да восені 1863 г. закупляла яго для тых, хто знаходзіўся пад арыштам па палітычных справах. Грошы таксама атрымлівала ад невядомых асобаў, якія давалі іх у пакеце з надпісам «для арыштантаў» (верагодна, грошы ад рэвалюцыйнай арганізацыі, бо Э. Заблоцкі прасіў Баяроўскага прасачыць, колькі марнуе Войнава на закупкі харчавання) (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 171 адв.-172, 178, 181).

**ВОЙНА ЛЕАН**, вербаваў людзей у партызанскія атрады Бельскага павета (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 8 адв.).

**ВЫГАНОЎСКІ ІВАН**, з дваран, дапамагаў паўстанцам рознымі сродкамі, зняволены ў Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 40 адв.).

**ВЫСОЦКІ АЛЯКСАНДР ФРАНЦАВІЧ**, чыноўнік па піцейнаму акцызнаму збору, у 1863 г. меў 25 гадоў, абвінавачваўся ў сувязях з паўстанцамі, сядзеў у Слонімскай турме з 5 жніўня 1863 г. Быў высланы ў Пермскую губерню (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 278; ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 58 адв.).

**ВЫСОЦКІ ЛЮДВІГ**, дваранін, дапамагаў паўстанцам рознымі сродкамі, зняволены ў Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 40 адв.).

**ВЫСОЦКІ ЭДВАРД**, 32 гады, земскі гаспадар у Брэсцкім павеце, даў 7 коней атраду Стасюкевіча і не данёс уладам пра паўстанцаў. Высланы ў Томскую губерню. Памёр ад запалення мозгу па дарозе ў Казань у першай палове 1864 г. (Kolumna Z. Pamiątka dla rodzin polskich... — Cz. 1. — S. 175).

**ГАДОМСКІ ТАМАШ ЛУК'ЯНАВІЧ**, ураджэнец г. Аўгустава, у 1867 г. было 30 гадоў. Тытунёвы ахоўнік г. Сапоцкіна. Хаваў у сябе паўстанца мешчаніна С. Плаўскага і не данёс уладам. Асуджаны ў Гродне ў 1864 г. і па канфірмацыі віленскага генерал-губернатара ад 2.02 пазбаўлены палітычных правоў і сасланы з сямействам (жонка Караліна і тры дачкі) на казённыя землі Валагодскай губерні. Затым (?) жылі ў Енісейскай губерні (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 108, 109, 163-164).

**ГАНСОЎСКІ**, памешчык, даў рэвалюцыйнай арганізацыі 160 рублёў срэбрам. Прыгавораны Гродзенскай ваенна-судовай камісіяй да штрафу ў трайным памеры ад названай сумы на карысць пацярпелых ад паўстанцаў асобаў (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 414 адв.).

**ГЗОЎСКІ**, аднадворац, быў у камандзе Лянкевіча, вербаваў людзей у партызанскія атрады. Асуджаны і павешаны (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 7).

**ГЕРМАНОВІЧЫ**, сёстры: Схаластыка (38 гадоў), Леакадзія (30 гадоў), Каміла (28 гадоў), дачкі былога ўніяцкага святара ў м. Азёры Сцяпана Германовіча. Забяспечвалі паўстанцаў прадуктамі. У лістападзе 1863 г. высланы ў Казанскую губерню (Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў ... — С. 80).

**ГІНТАЎТ АЛЯКСАНДР**, гродзенскі дэкан, ксёндз. Узяўна парукі арыштаванага ксяндза Т. Гадлеўскага. Таго адпусцілі, але пад сакрэтны паліцэйскі нагляд (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 231, а. 147).

**ГІНТАР ГЕНРЫХ ЗАХАРАВІЧ**, дваранін, у 1863 г. меў 43 гады, абвінавачваўся ў забеспячэнні паўстанцаў харчаваннем, сядзеў у Ваўкавыскай турме з 13 верасня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 11 адв.).

**ГЛІНДЗІЧ АНТОН ЯГОРАВІЧ** (? — 4.03.1864 г.), памешчык Ваўкавыскага павета, 72 гады, маёнтак Кватары. Вучыўся ў хатніх настаўнікаў, службу пачаў у Ваўкавыскім апеляцыйным судзе. Па даносу праваслаўнага святара ў яго адбываліся сходы суседніх памешчыкаў-мяцежнікаў, дваравым людзям чыталіся рэвалюцыйныя пракламацыі, дапамагаў паўстанцам харчаваннем праз свайго возчыка К. Кухту. Яго спачатку прыгаварылі да палітычнай смерці і канфіскацыі маёмасці ў казну, але пасля смерці (у Ваўкавыскай турме ў 1863 г.) і за недаказальнасцю віны пакінулі без пакарання, секвестр знялі і аддалі маёнтак спадчыннікам (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а., а. 9; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 80-81; с. 1, а. 414 адв., 564 адв.; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917 б., а. 291, 321-323, 375; Kolumna. — Cz. 1. — S. 54).

**ГЛІНДЗІЧ ПЁТР АНТОНАВІЧ**, дваранін, у 1864 г. меў 60 гадоў, абвінавачваўся ў сувязях з паўстанцамі, сядзеў у Слонімскай турме з 14 чэрвеня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 23 адв.).

**ГЛІНДЗІЧ ТЭАДОРА (Фядора) ФЕЛІКСАЎНА**, з Ажэшкаў, дваранка Кобрынскага павета, жонка Антона, 35 гадоў. Забяспечвала паўстанцаў корпіяй і іншымі прыпасамі, падбухторвала дваравых люзей ісці ў партызанскі атрад, абяцаючы за гэта 3 моргі зямлі, хавала ў сваім маёнтку параненых паўстанцаў і аднаго з іх пахавала (Мацэвіча). Сядзела ў Гродзенскім астрозе з 3 ліпеня 1864 г. Прыгаворана да турэмнага зняволення на паўгода і далей на жыхарства ва ўнутраных губернях Расіі. Па канфірмацыі вызвалена ад арышту і аддадзена на паручыцельства і нагляд паліцыі з аплатай штрафу ў памеры 200 рублёў срэбрам (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а., а. 9; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 80 адв.-81; с. 1, а. 561; ф. 1, воп. 13, с. 1399, а. 129 адв.; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917 б., а. 291, 307; с. 917, ч. 1, а. 118).

**ГЛЯБОВІЧ АНТОН ІОСІФАВІЧ**, аднадворац, у 1864 г. меў 74 гады, абвінавачваўся ў сувязях з паўстанцамі, вырабе куль, паездках у атрад. Сядзеў у Слонімскай турме з 16 чэрвеня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 23 адв.).

**ГЛЯБОВІЧ ІОСІФ**, аднадворац Гродзенскага павета, дапамагаў паўстанцам. Адпраўлены ва Уладзімірскую арыштанцкую роту (Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў ... — С. 80).

**ГРАБАВЕЦКІ ВІЛЬГЕЛЬМ ЯНАВІЧ**, служачы кіравання мінеральных вод у Друскеніках, 27 гадоў, быў арыштаваны ў сакавіку 1863 г. па падазрэнню ў вербоўцы ахвотнікаў у партызанскія атрады, але пазней адпушчаны. Ён прыцягнуў да ўдзелу ў паўстанні Ю. Тржэцяка. Жыў на Калажанскай вуліцы ў хаце Кушалеўскай (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 180-181; Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 166. — S. 3).

**ГРАХОЎСКІ РЫГОР ВОСІПАВІЧ**, памешчык, у 1863 г. меў 63 гады. Абвінавачваўся ў забеспячэнні паўстанцаў харчаваннем і порахам. Сядзеў пад арыштам у Ваўкавыскім астрозе з 6 верасня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 10 адв.).

**ГРУСВІЦКІ**, памешчык ваколіцы Токары. Абвінавачваўся ў адпраўцы людзей у паўстанцкі атрад і раскідванні брашур рэвалюцыйнага зместу. Сядзеў пад арыштам у Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 40 адв.).

**ГРЫНЕВІЧ**, служыў у Гродзенскай паштовай канторы. Па паказаннях Э. Заблоцкага, Г. перадаваў на пошту рэвалюцыйную карэспандэнцыю. Памёр да ліпеня 1864 г. Яго маёмасць прыцягвалася да адказнасці, але пазней секвестр быў зняты (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 12 адв.; с. 1, а. 414 адв.).

**ГРЫНЯВІЦКІ АЛЯКСАНДР**, ксёндз, 28 гадоў у 1863 г., нарадзіўся ў Пружанах. У 1860 г. з адзнакай скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію і атрымаў прызначэнне на пасаду законавучыцеля ў Пружанскае дваранскае вучылішча. Згодна з даносам, у яго хаце збіраліся на палітычныя сходы мясцовыя памешчыкі і чыноўнікі, меў сувязі са сваім сакурснікам М. Табенскім, які быў вікарным у Беластоку. Закупляў для паўстанцаў амбундзіраванне, падтрымліваў фінансава і духоўна арыштаваных. 19.03.1864 г. пасаджаны ў Гродзенскую турму за сувязь з паўстанцкім атрадам Жукоўскага. Пад час арышту быў прэфектам у Пружанскай школе. Высланы ў Табольскую губерню, затым у Баброва Варонежскай губерні. Па хадайніцтву сям'і і касцельнага начальства пераведзены на пасаду вікарнага ў Рыгу (Революционная Россия и революционная Польша (вторая половина XIX в.)). — М.: Наука, 1967. — С. 41; Powierza P. ... — S. 108).

**ГРЫНЯВІЦКІ ЯН**, ксёндз, адміністратар парафіі Туроснь Беластоцкага павета. Пад час паўстання збіраў грошы, вопратку і абутак, зброю для паўстанцкіх атрадаў. З 17.01.1865 г. знаходзіўся пад паліцэйскім наглядам у Драгічыне, пазней быў аддадзены пад касцельны нагляд. У Гродне быў капеланам у Брыгіцкім касцёле. У канцы жыцця служыў прэфектам у Суражскай школе (Powierza P. ... — S. 108).

**ГРЫЦКЕВІЧ ІВАН**, вольнаадпушчанік памешчыка А. Казлоўскага (гл.), 22 гадоў, прыцягнуты да следства ў маі 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй па падазрэнню ў кантактах з паўстанцамі (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі» // ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 181).

**ГУЗЭЛЬФ ОТТАН**, дваранін, 25 гадоў у 1864 г. Служыў канцылярскім чыноўнікам Беластоцка-Сакольскага павятовага суда. Арыштаваны ў лістападзе 1863 г. Падазраваўся ў вярбоўцы людзей у партызанскія атрады. Па канфірмацыі Часовага палявога аўдытарыята вызвалены ад адказнасці пад надзейнае папячыцельства (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2887, а. 76 адв.).

**ГУМЕЛЬ ВІЛЬГЕЛЬМ**, жыхар м. Супрасль, 37 гадоў. Прыцягнуты да следства ў ліпені 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за кантакты з паўстанцамі (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»...— С. 183).

**ГУСТОЎСКІ УЛАДЗІСЛАЎ СТАНІСЛАВАВІЧ**, у 1863 г. меў 32 гады, дваранін з в. Бжэзніца, жыхар м. Браньск. Набіраў рэкрутаў у паўстанцкі атрад, жыхары бачылі яго ў в. Даманава з двустволкай і пісталетам (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 705, а. 77).

**ГУТОЎСКІ ШЫМАН**, памешчык Брэсцкага павета, вербаваў людзей у партызанскія атрады. Высланы ў Расію па канфірмацыі (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 10 адв.).

**ДАЛУБОЎСКІ ЯНКЕЛЬ**, брэсцкі купец. Рэгулярна пастаўляў паўстанцам харчаванне і вопратку. Гродзенскі ваенна-палявы суд ад адказнасці вызваліў (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 1320, ч. 1,

а. 238); Fajnchauz D. Ludnosc zydowska na Litwe i Bialorusi a powstanie Styczniowe // Biuletyn Zydowskiego Instytutu Historyczniego. — 1961. — № 38. — S. 47).

**ДЗЮБІНСКІ МАЦВЕЙ**, селянін Беластоцкага павета, арганіст, 47 гадоў. Прыцягнуты да следства ў жніўні 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за дастаўку харчавання (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 184).

**ДЭ-ФЛЕРЫ**, французскі падданы, вербаваў людзей у партызанскія атрады па Беластоцкім павеце. Выехаў за мяжу (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 9).

**ДМОЎСКІ ГЕНРЫХ**, арандатар маёнтка Плянты памешчыка Паніквіцкага (гл.), вербаваў людзей у партызанскія атрады. Арыштаваны 28.08.1863 г. і знаходзіўся пад следствам у Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 40 адв.).

**ДРЫНДОЎСКАЯ АГАТА АНТОНАЎНА**, сялянка, у 1863 г. мела 30 гадоў, абвінавачвалася ў забеспячэнні паўстанцаў харчаваннем і порахам. Сядзела ў Ваўкавыскай турме з 6 верасня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 20 адв.).

**ЖАКОЎСКІ ВІНЦЭНТ ЯНАВІЧ**, гродзенскі мешчанін, 25 гадоў. Арыштаваны ў красавіку 1863 г. за схаванне параненага паўстанца са зброяй (Jodkowski J. Rok 1863 // Echo Grodzienski. — 1921. — № 179. — S. 3).

**ЖАКОЎСКІ СТАНІСЛАЎ ЯНАВІЧ**, брат папярэдняга, гродзенскі мешчанін, 25 гадоў. Арыштаваны ў красавіку 1863 г. за схаванне параненага паўстанца са зброяй (Jodkowski J. Rok 1863 // Echo Grodzienski. — 1921. — № 179. — S. 3).

**ЖЫВІЦКІ СТАНІСЛАЎ ФРАНЦАВІЧ**, дваранін, абвінавачваўся ў сувязях з паўстанцамі, у 1864 г. меў 64 гады, сядзеў у Слонімскай турме з 13 чэрвеня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 23 адв.).

**ЗАЛЕСКІ ЭРАЗМ-ФЕЛІКС ФРАНЦАВІЧ** (1828—? гг.), нарадзіўся ў Мінскай губерні, урач, выпускнік Дэрпцкага ўніверсітэта, служыў у палку ў Бельску. Аказваў медыцынскую дапамогу параненым паўстанцам. Арыштаваны ў кастрычніку 1863 г. і прыгавораны да ссылкі ў Енісейскую губерню ў лістападзе 1864 г. (Грицкевич В.П. С факелом Гиппократа: из истории белорусской медицины. — Мн.: Наука и техника, 1987. — С. 195).

**ЗАЛЕЎСКІ ЛЕАН ПАЎЛАВІЧ**, памешчык ваколіцы Токары. Абвінавачваўся ў адпраўцы людзей у паўстанцкі атрад і раскідванні брашур рэвалюцыйнага зместу. Сядзеў пад арыштам у Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 40 адв.).

**ЗАЛЕЎСКІ ПАВЕЛ**, бацька Леана (гл.), памешчык ваколіцы Токары. Абвінавачваўся ў адпраўцы людзей у паўстанцкі атрад і раскідванні брашур рэвалюцыйнага зместу. Сядзеў пад арыштам у Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 40 адв.).

**ЗУБАЛЕВІЧ СТАНІСЛАЎ**, мешчанін г. Ваўкавыска, 23 гады. Прыцягнуты да следства ў маі 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй па падазрэнню ў кантактах з паўстанцамі (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»...— С. 181).

**ЗУБЕРБІР**, 24 гады, скончыў курс медыцынскіх навук у Варшаве. Зімой 1862 г. прыехаў у Беласток, працаваў вольна практыкуючым урачом. У яго доме, які знаходзіўся на вул. Баярскай, паміж казначэйствам і вул. Млыновай, пэўны час жыў вайсковы ваявода А. Духінскі. Тут бывалі Урублеўскі, Гафмайстар, Каліноўскі. Падтрымліваў знаёмства з Бірфрэйндам, які сведчыў, што З. ваяваў у партызанскім атрадзе і быў забіты пад Валіламі (магчыма, ратаваўся і збег у Каралеўства Польскае) (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40 а., а. 73, 76, 106-106 адв.).

**ЗУБРОЎСКІ ІПАЛІТ**, 55 гадоў, памешчык маёнтка Кульбакі. За дапамогу паўстанцам пазбаўлены дваранскіх правоў і высланы на жыхарства ў Пермскую губерню (Буднік І. Да падзеяў 1863-1864 гадоў... — С. 80).

**ІГНАТОВІЧ ІОСІФ ВІКЕНЦЕВІЧ**, селянін, у 1863 г. меў 20 гадоў, абвінавачваўся ў забеспячэнні паўстанцаў харчаваннем, сядзеў у Ваўкавыскай турме з 15 лістапада 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 27 адв.).

**ІЛЛАКОВІЧАВА (напэўна, ІЛЛАКОВІЧ)**, сястра Хрысціны Нарбут, удава. За агітацыю вучняў Свіслацкай гімназіі ўдзельнічаць у маніфестацыях генерал-губернатар В.І. Назімаў прадпісаў 29.04.1862 г. гродзенскаму губернатару Галлеру выслаць «у іншыя павятовыя гарады даверанай вам губерні». Выслалі ў Ваўкавыск пад паліцэйскі нагляд (Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг... — С. 468).

**ІОПШАЛЬ МІХАІЛ**, мешчанін г. Беластока, 39 гадоў. Прыцягнуты да следства ў ліпені 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за кантакты з паўстанцамі (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»...— С. 183).

**КАЗЛОЎСКІ АЛЯКСАНДР**, памешчык Гродзенскай губерні, 26 гадоў. Прыцягнуты да следства ў маі 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй па падазрэнню ў кантактах з паўстанцамі (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»...— С. 181).

**КАЗЯРАДСКІ**, памешчык Пружанскага павета, маёнткі Каляды і Рудаўцы. Меў вінакурны, шкіпінарны і цагляны заводы, карчму. У Слонімскім павеце вербаваў людзей у партызанскія атрады. Тры разы прывозіў у атрад Млотка харчаванне, водку, рагатую жывёлу. Сам пазней пайшоў у атрад, пад час следства яго не злавілі. Маёнткі былі канфіскаваны (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 10 адв.; ф. 23, воп. 1, с. 372, а. 98 адв., 101; Восстание в Литве и Белоруссии 1863 — 1864 гг. ... — С. 383).

**КАЛАСОЎСКІ ІОСІФ**, селянін, у 1863 г. меў 30 гадоў, абвінавачваўся ў схаванні паўстанцаў і рамонце ружжаў. Сядзеў у Ваўкавыскай турме з 26 кастрычніка 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 14 адв.).

**КАЛУДЗКІ АНДРЭЙ ВОСІПАВІЧ**, 42 гады, ураджэнец Каралеўства Польскага, адстаўны штабс-капітан. З 1.11.1856 г. служыў

у памешчыка Слонімскага павета стацкага дарадцы П.А. Орды кіраўнікам маёнтка Дзеравянчыцы. Суд прызнаў яго вінаватым у прыёме Э. Заблоцкага і К. Каліноўскага, у тым, што ён даў ім коней для праезду. Зняволены 22 жніўня 1864 г. у Гродзенскай турме. На следстве казаў, што палічыў прыехаўшых чыноўнікамі МУС, як яны і прадставіліся, а таму даў ім коней для далейшага перасоўвання па дзяржаўных справах. Вызвалены ад адказнасці, аддадзены на даручальніцтва, павінен заплаціць ён ці Орда штраф у памеры 200 рублёў (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а., а. 10; ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 565; воп. 1, с. 40, а. 243-246).

**КАНАПЛІЦКІ**, капітан, служачы водных камунікацый, падазраваўся ў дапамозе паўстанцам перапраўляць харчаванне водным шляхам. Быў арыштаваны і прыцягнуты да следства (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 11).

**КАНДРУСІК РЫГОР МІКІФАРАВІЧ**, пяцісоцкі ў м. Валілы Беластоцкага павета, у 1865 г. яму было 67 гадоў, праваслаўны, жанаты, меў 5 дзяцей, займаўся сельскай гаспадаркай. Верагодна, збіраў харчаванне для паўстанцаў і адпраўляў яго ў лес. Мы напісалі верагодна, бо на следстве сам Кандрусік гаварыў, што да гэтага яго прымусілі паўстанцы, пагражаючы павесіць, што ён быў разам са старастам Андрэем Пятровічам Мялешка (1865 г. н.), арыштаваны паўстанцамі. Апошні сведчыў, што ў дом Кандрусіка збіралі харчаванне (хлеб, крупы, сала і інш.) Васілі Рыгоравіч Бараноўскі, Людвік Раманавіч Храноўскі, Рыгор Бенядзіктавіч Сарачынскі — усе праваслаўныя гарадоцкія сяляне, адпаведна 50-, 48-, 60-гадовыя. У лес да былога лясніка Жэлязоўскага (Жэлізоўскага) павёз па загаду Кандрусіка харчаванне Андрэй Якімавіч Рашко. Ён таксама гаварыў, што яго абяцалі забіць, калі не падпарадкуецца.

**КАСМОЎСКІ КАНСТАНТЫ АНТОНІЕВІЧ**, быў арыштаваны ў чэрвені 1863 г. за збор грошай для паўстанцаў (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 168. — S. 3).

**КАСЦЮКЕВІЧ КАЗІМІР АНТОНАВІЧ** (?—15.01.1870 гг.), бургамістр г. Слоніма (у іншым дакуменце, Кобрынскага магістрата), у 1863 г. меў 43 гады, абвінавачваўся ў сувязях з паўстанцамі, сядзеў у Слонімскай турме з 29 ліпеня 1863 г. Быў сасланы адміністрацыйным парадкам, без суда, на жыхарства ў Гомель Магілёўскай

губерні пад строгі паліцэйскі нагляд, а праз 2 гады — у Томскую губерню. Жонка Разалія (у іншым дакуменце, Людвіга) Антонаўна з дачкамі Антанідай, Юзэфай, Ядзвігай і Каміліяй, сынам Вітольдам паехалі з ім добраахвотна. Пасля смерці мужа Разалія ў 1870 г. прасіла ўлады дазволіць выехаць на радзіму ў Слонім (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 2050, а. 1-1 адв., 4; воп. 34, с. 2025, а. 699; ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 56 адв.).

**КАТОВІЧ КСАВЕРЫ**, 37 гадоў, праваслаўны святар, збіраў па вёсках розныя прадукты і адпраўляў у партызанскія атрады. Напрыклад, у маі 1863 г. быў разам з Канстанцінам Радзелем у в. Стары Востраў (гэта засведчылі на допыце 30 сялян). Разам з тым агітаваў уступаць у партызанскія атрады. Па магчымасці дастаўляў зброю. Арыштаваны ў кастрычніку 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 501-502, 505, 541; Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 168. — S. 3).

**КАЧЫНСКІ АНТОН**, верагодна, дапамагаў Валіцкаму. Дом у м. Азёры быў секвестраваны (НГАБ у Гродне, ф. 23, воп. 1, с. 372, а. 118).

**КЕДЫШ ФРАНЦ**, селянін, 55 гадоў. Спаліў частку рэвалюцыйных папер, знойдзеных у садзе памешчыка Алендскага, і не аддаў іх уладам. Прыгавораны да пазбаўлення асабістых і нададзеных яму правоў і прывілеяў і да службы ў арыштанцкіх ротах грамадзянскага ведамства на 3 гады (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 560).

**КЕЙСЛЕР ЮЗЭФ** (1838 г., Гродзенская губерня — ?), гандляр. Браў удзел у балтыйскай экспедыцыі паўстанцаў. Шведскія ўлады арыштавалі яго і выслалі ў Англію. На радзіму вярнуўся ў 1872 г. Сядзеў у Гродне (Maliszewski J. Powstanie Styczniowe... — S. 36).

**КІРСАКОЎСКІ**, памешчык з маёнтка Шаткоўліскі. Займаўся дастаўкай харчавання, пораху і зброі для паўстанцаў (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 167, а. 36 адв.).

**КЛАПАТОЎСКІ ІОСІФ (ЮЗАФ)**, 32 гады, аканом маёнтка Свяцк гр. Валовіча. Супрацьдзейнічаў рэкруцкаму набору, агітаваў уступаць у партызанскія атрады паўстанцаў (Буднік І. Да падзеяў

1863-64 гадоў ... — С. 80; Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 177).

**КЛІМАШЭЎСКІ**, тытулярны дарадца, уладальнік маёнтка ў Ваўкавыскім павеце, у якім рыхтавалі бялізну і вопратку для паўстанцаў (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 14 адв.).

**КЛІЦКІ ВОЙЦЭХ** (1848 г., Ганіёндз, Беластоцкі павет — ?). Дзеля ўдзелу ў паўстанні збег з 4-га класа Беластоцкай гімназіі. Быў жандарам, дастаўляў паўстанцам зброю і звесткі пра расійскія часці (Maliszewski J. Powstanie... — S. 37).

**КРАСНІЦКІ ІГНАЦІ МІКАЛАЕВІЧ**, шляхціц, 60 гадоў, за кантакты з паўстанцамі і дапамогу ім быў арыштаваны ў чэрвені 1863 г. (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 168. — S. 3).

**КРУПОВІЧ ЮЗЭФАТ АДАМАВІЧ**, дваранін, у 1864 г. меў 37 гадоў, абвінавачваўся ў сувязях з паўстанцамі, сядзеў у Слонімскай турме з 15 чэрвеня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 21 адв.).

**КРЫМСКІ МОЎША АРЫЕВІЧ**, 40 гадоў, мешчанін м. Сапоцкін. Быў інфарматарам паўстанцаў. Узяты на парукі жыхарамі (. Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў ... — С. 81).

**КРЫНСКІ ІОСІФ**, памешчык ваколіцы Токары. Абвінавачваўся ў адпраўцы людзей у паўстанцкі атрад і раскідванні брашур рэвалюцыйнага зместу. Сядзеў пад арыштам у Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 40 адв.).

**КРЭТОВІЧ ГЕНРЫХ**, дваранін, 33 гады. У маёнтку Ласосна служыў кіраўнікам маёнтка ў Астрамецкіх з 1.03.1862 г. па 1.07.1863 г. Абвінавачваўся ў дастаўленні ў партызанскі атрад 2 коней, але паколькі суд не меў дастатковых доказаў яго віны, «пакінуў у падазрэнні» (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 560 адв.; воп. 1, с. 40 а, а. 25).

**КУРЦЭВІЧ ІВАН**, прызнаўся ў Гродзенскай следчай камісіі, што дапамагаў Катовічу перадаваць у паўстанцкія атрады зброю, харчаванне, вопратку, адпраўляў у лес паўстанцаў. Даў паказанні на Солтана (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 500 адв.-501).

**КУХЦІНСКІ АДАМ ІВАНАВІЧ**, памешчык, у 1863 г. меў 60 гадоў, абвінавачваўся ў сувязях з паўстанцамі, сядзеў у Слонімскай турме з 14 ліпеня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 24 адв., 55 адв.).

**КУЧАРЭНА ІЦКА**, пастаўляў зброю атраду Р. Траўгута, выкарыстоўваючы свае сувязі, праз Галіцыю (Fajnchauz D. Ludnosc zydowska na Litwe i Bialorusi a powstanie Styczniowe... — S. 54-55).

**КЯРСНОЎСКІ АПАЛІНАРЫ ВОСІПАВІЧ**, 48 гадоў. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі, з 1842 па 1849 г. служыў у канцылярыі, а апошнія тры гады быў чыноўнікам да асобых даручэнняў пры Віцебскім, Магілёўскім і Смаленскім генерал-губернатарах. Адстаўны губернскі сакратар, меў маёнтак Скарынкі ў Слонімскім павеце (300 дзесяцін). Па паказаннях Э. Заблоцкага, прымаў у сваім маёнтку яго і Каліноўскага пад час іх паездкі па Слонімскаму павету ў маі 1863 г. Арыштаваны і 15.04.1864 г. пасаджаны ў Гродзенскі турэмны замак. Сваёй віны не прызнаў, сказаўшы, што, магчыма, яны былі ў маёнтку яго брата Эдуарда (Эдварда) Аляксандраве, які жыве бліжэй да знаходжання паўстанцкіх атрадаў у ваколіцах Мілавід. Аддадзены на парукі, пад строгі паліцэйскі нагляд, секвестр з маёнтка зняты (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а., а. 10; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 74 адв.-75; с. 2, а. 373-378; ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 7).

**КЯРСНОЎСКІ ГАЎРЫІЛ ПАЎЛАВІЧ**, у 1863 г. меў 45 гадоў, аднадворац з в. Бендугі. Паўстанцкі жандар, назіраў за перасоўваннем Браньскага атрада і даносіў паўстанцам (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 705, а. 77 адв.).

**КЯРСНОЎСКІ ЭДУАРД**, памешчык Слонімскага павета, былы маёр рускай арміі. Напярэдадні паўстання быў пастаянным сябрам Слонімскай публічнай бібліятэкі, у 1863 г. дастаўляў паўстанцам харчаванне і вопратку, жалеза і косы. Сасланы на пасяленне ў Табольскую губерню, памёр ад тыфа ў Камышлове ў маі 1864 г.

Меў каля 50 гадоў (Революционный подъём в Литве и Белоруссии... — С. 505, 507, 508; Kolumna. — Cz. 1. — S. 72).

**ЛАВІЦКІ АНТОНІ МАРЦІНАВІЧ**, 45 гадоў, дваранін Гродзенскага павета, быў арыштаваны ў жніўні 1863 г. за кантакты з паўстанцамі (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 171. — S. 3).

**ЛАЗАВІЦКІ ВАЛЯР'ЯН ВІКЕНЦЬЕВІЧ**, 25 гадоў, аднадворац Гродзенскага павета. Прывозіў паўстанцам харчаванне. Захоплены ў баі і зняволены ў Гродзенскай турме (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў ... — С. 81).

**ЛАНГЕЙМ ВІЛЬГЕЛЬМ**, падданы Прусіі, 28 гадоў. Прыцягнуты да следства ў ліпені 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за кантакты з паўстанцамі (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі» // ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 183).

**ЛАПІНСКІ ЯН ФРАНЦАВІЧ**, селянін, 38 гадоў, нарадзіўся ў Тржцянскім прыходзе Беластоцкага павета. Вучыўся ў Беластоцкай гімназіі, дзе здаў экзамен на прыходскага гарадавога настаўніка. На працягу каля 10 гадоў быў адміністратарам маёнтка Свяржбенскай Келбасіна пад Гродна. Займаўся перасылкай паўстанцкай карэспандэнцыі ў Ваўкавыскі і Сакольскі паветы. За неданясенне ўладам прыгавораны ў арыштанцкія роты дзяржаўнага ведамства на 1 год, але суд прасіў змякчэння пакарання, бо Л. здаў ім двух паўстанцаў. Па канфірмацыі ад 14.11.1864 г. сасланы на жыхарства ў аддаленыя месцы Сібіры. Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 558; воп. 1, с. 40, а. 197; с. 40 а., а. 32; Jodkowski J. Sylwety z roku 1863 // Echo Grodzienski. — 1926. — №. — S. 3;. Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў ... — С. 67).

**ЛАШЭВІЧ МІКАЛАЙ ЯНАВІЧ**, фельчар у маёнтку графа Солтана (гл.), меў кантакты з паўстанцамі, дапамагаў К. Катовічу (гл.) (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 500-503; Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 169. — S. 3).

**ЛЕАНОВІЧ ВОСІП**, 64 гады, адстаўны тытулярны дарадца. Служыў станавым прыставам Ваўкавыскага павета. Абвінавачваўся ў зносінах з паўстанцамі і забеспячэннні іх харчаваннем. Недастатковасць доказаў пакінула Л. у «падазрэнні» (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2887, а. 60 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 560 адв.).

**ЛЕМСАН БОРУХ**, «золотых дел мастер» з Брэста. Пры арышце ў яго знайшлі «21 штуку розных металічных рэчаў з партрэтамі Гарыбальдзі, Панятоўскага, Касцюшкі і нейкай невядомай асобы». Падазравалі, што ён з'яўляецца перакупнікам крадзенай зброі, але доказаў гэтага факта не было (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 226, а. 41-42).

**ЛІПКА АЎГУСЦІН** (нарадзіўся каля 1830 г. — ?), ксёндз, адміністратар Поразаўскага касцёла ў Ваўкавыскім павеце. За зносіны з паўстанцамі, падбухторванне праваслаўных да пераходу ў каталіцтва высланы на жыхарства пад нагляд паліцыі ў Архангельскую губерню. З 21.09.1868 г. жыў у Халмагорах на казённую дапамогу (Электронны рэсурс: narod.ru|1864|Ssilka-Olonezk.htm. — Дата доступа: 18.01.2013).

**ЛІСОЎСКІ ІГНАЦІЙ АНТОНАВІЧ**, селянін, у 1863 г. меў 51 год, абвінавачваўся ў схаванні паўстанцаў, сядзеў у Ваўкавыскай турме з 24 верасня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 12 адв.).

**ЛІТМАН**, кравец, яўрэй з м. Сапоцкін. Сувязны (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў ... — С. 81).

**ЛУНЕЎСКІ ІВАН**, 24 гады, сын ляснічага з м. Азёры. Прывозіў паўстанцам харчаванне, хаваў іх. З ліпеня 1863 г. знаходзіўся ў Гродзенскай турме пад следствам. Высланы 26 лістапада 1863 г. з Гродна на жыхарства ў Табольскую губерню. Маёмасць канфіскавана (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 504, а. 29; Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў ... — С. 81; Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі» ... — С. 182).

**ЛЯГОВІЧ ЯН**, 30 гадоў, аканом у маёнтку Астапкоўшчына Р. Мантовіча. Прывозіў паўстанцам харчаванне. Высланы ва Уладзімірскую губерню (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў ... — С. 81).

**ЛЯНКЕВІЧ ІОСІФ**, памешчык ваколіцы Токары. Абвінавачваўся ў адпраўцы людзей у паўстанцкі атрад і раскідванні брашур рэвалюцыйнага зместу. Сядзеў пад арыштам у Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 40 адв.).

**ЛЯНКЕВІЧ МІКАЛАЙ**, памешчык ваколіцы Токары. Абвінавачваўся ў адпраўцы людзей у паўстанцкі атрад і раскідванні брашур рэвалюцыйнага зместу. Сядзеў пад арыштам у Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 40 адв.).

**МАДЗАЛЕЎСКІ**, памешчык ваколіцы Токары. Абвінавачваўся ў адпраўцы людзей у паўстанцкі атрад і раскідванні брашур рэвалюцыйнага зместу. Сядзеў пад арыштам у Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 40 адв.).

**МАЕЎСКІ ВІКТАР**, мешчанін Аўгустоўскай губерні, 46 гадоў. Прыцягнуты да следства ў лютым 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за кантакты з паўстанцамі і супрацьдзеянне рэкруцкаму набору (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі» // ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 177).

**МАЗЮК МАЦЕЙ ЯНАВІЧ**, 42 гады, казённы селянін лясной стражы з в. Лосева Гродзенскага павета, быў арыштаваны ў маі 1863 г. за агітацыю прыняць удзел у паўстанні (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 171. — S. 3).

**МАЗЮК АДАМ ЯНАВІЧ**, 40 гадоў, казённы селянін лясной стражы з в. Лосева Гродзенскага павета, быў арыштаваны ў маі 1863 г. за агітацыю сялян в. Парэчча прыняць удзел у паўстанні (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 171. — S. 3).

**МАЛАШКА ЯН СЫМОНАВІЧ**, 45 гадоў, войт м. Лунна, арыштаваны за знойдзеную ў яго доме забароненую літаратуру (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 171. — S. 3).

**МАЛЕНДА АДАМ**, селянін Беластоцкага павета, 50 гадоў. Прыцягнуты да следства ў ліпені 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за кантакты з паўстанцамі (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... - С. 183).

**МАНТОВІЧ РУДОЛЬФ ІВАНАВІЧ**, 55 гадоў, памешчык маёнтка Астапкоўшчына, прывозіў харчаванне і фураж у партызанскія атрады. Сядзеў у Гродзенскай турме з 13.06.1863 г. Высланы ў Табольскую губерню (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 33, а. 6).

**МАНЬКОЎСКІ**, памешчык ваколіцы Токары. Абвінавачваўся ў адпраўцы людзей у паўстанцкі атрад і раскідванні брашур рэвалюцыйнага зместу. Сядзеў пад арыштам у Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 40 адв.).

**МАРКЕВІЧ ГІПАЛІТ АДАМАВІЧ**, 59 гадоў, ксёндз-пробашч м. Волпа, быў арыштаваны за падбухторванне сялян трымаць у таямніцы звесткі пра паўстанцкі рух. Яго дапытвалі ў Гродзенскай ваенна-следчай камісіі ў ліпені 1864 г. (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 171. — S. 3).

**МАРКЕВІЧ ЮЗЭФ ІВАНАВІЧ (ЯНАВІЧ)**, 29 гадоў, нарадзіўся ў Мінскай губерні, вучыўся ў Віленскай гімназіі і Маскоўскім універсітэце, які скончыў з атрыманнем ступені доктара медыцыны. З 1860 г. — штатны ўрач Гродзенскай гарадской лячэбніцы. 6.11.1861 г. спяваў у Фарным касцёле «Serdeczna Matko». Абвінавачваўся па паказаннях Э. Заблоцкага ў тым, што збіраў грошы для паўстанцаў. Не прызнаўся ў гэтым, але сказаў, што аднойчы збіраў грошы для бедных асобаў, якіх высылалі ва ўнутраныя расійскія губерні, на сабраныя 100 рублёў купілі вопратку і абутак. Прызнаўся, што двойчы атрымліваў грошы ад Багаткі, Ромера, Чацвярцінскага, якія былі аддадзены ссыльным з Каралеўства Польскага, праязджаючым праз Гродна. Лічыў сваю дзейнасць дабрачыннай, а не палітычнай. Быў арыштаваны ў красавіку 1864 г. і сасланы ў Пермскую губерню, жыў на пасяленні ў Шадрынску разам з жонкай Валерыяй з Абламовічаў і дачкой Ганнай (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 69; с. 2, а. 438-441, воп. 1, с. 40, а. 11; Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 171. — S. 3).

**МАРКОЎСКІ**, памешчык з маёнтка Маркава. Займаўся дастаўкай харчавання, пораху і зброі для паўстанцаў (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 167, а. 36 адв.).

**МАСАЛЬСКІ АНТОН ДАМІНІКАВІЧ** (каля 1826 г., Гродна — ?), князь, адстаўны губернскі сакратар. Высланы разам з

сямействам (жонка, 5 дзяцей і глуханямая сястра) пад строгі нагляд паліцыі ў Архангельскую губерню за «неблагонадёжность в политическом отношении и составление подложных прошений». З 4.09.1864 г. адбываў пакаранне ў Халмагорах. Сям'я жыла за дапамогу казны. 6.07.1869 г. адпраўлены разам з сямействам у Варшаву (Электронны рэсурс: narod.ru|1864|Ssilka-Olonezk.htm. — Дата доступа: 18.01.2013).

**МАХОЎСКІ ІВАН ІВАНАВІЧ**, мешчанін, у 1863 г. меў 89 гадоў, абвінавачваўся ў схаванні паўстанца Завадскага. Сядзеў у Ваўкавыску, у асобным доме, занятым пад арыштаваных, з 10 верасня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 21 адв.).

**МАХНЕЎСКІ ІОСІФ АНТОНАВІЧ**, памешчык, у 1863 г. меў 49 гадоў. Абвінавачваўся ў сувязях з паўстанцамі. Сядзеў пад арыштам у Ваўкавыскім астрозе з 19 жніўня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 7 адв.).

**МАЦЭВІЧ АНТОН ДЗЯМ'ЯНАВІЧ**, селянін, у 1863 г. меў 60 гадоў, абвінавачваўся ў забеспячэнні паўстанцаў харчовымі прыпасамі, сядзеў у Ваўкавыскай турме з 24 верасня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 12 адв.).

**МАЦЁТАВІЧ АНТОНІ ЮЗЭФАВІЧ**, ксёндз, у 1864 г. меў 73 гады, абвінавачваўся ў антыўрадавых выступленнях, сядзеў у Слонімскай турме з 21 снежня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 32 адв.).

**МЕРЖЭЕЎСКІ ІВАН КАЗІМІРАВІЧ**, ахоўнік, у 1864 г. меў 63 гады, абвінавачваўся ў дастаўленні паўстанцам харчавання, сядзеў у Слонімскай турме з 23 жніўня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 27 адв.).

**МІКУЛЬСКІ ФЛАРЭНЦІН АНДРЭЕВІЧ**, 63 гады. Вучыўся ў Віленскім універсітэце, які скончыў з прысваеннем ступені кандыдата філасофіі ў 1819 г. Служыў гродскім суддзёй у Слоніме, павятовым суддзёй Слонімскага павятовага суда, чальцом губернскага інвентарнага камітэта, чальцом губернскага камітэта па паляпшэнню быта сялян (да 1861 г.), міравым пасярэднікам Слонімскага па-

вета (палова 1861 — май 1863 гг.). Узнагароджаны ордэнам С. Уладзіміра 4-й ступені і срэбным медалём. Меў маёнтак Старыя Жыровіцы ў Слонімскім павеце (3000 дзесяцін). Падазраваўся ў зносінах з паўстанцамі, забеспячэнні іх харчаваннем і бялізнай, прыналежнасці да рэвалюцыйнай арганізацыі. Арыштаваны 14.04.1864 г., праведзены вобыск, сядзеў у Гродзенскім турэмным замку. Следства не знайшло доказаў яго віны, а сам М. ні ў чым не прызнаўся. Пакінуты на месцы жыхарства пад нагляд паліцыі і з выплатай 10 % збора з маёмасці (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 12; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 72 адв.-73 адв., с. 3, а. 362 адв.-363, 366-367).



*Двор Гродзенскай турмы*

**МІНЕВІЧ АНТОН**, дваранін Беластоцкага павета, 45 гадоў. Прыцягнуты да следства ў жніўні 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за дастаўку харчавання (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 184).

**МІНЧЭЎСКІ ІОСІФ**, ксёндз, настаяцель Крэмянецкага касцёла Ваўкавыскага павета, 51 год, абвінавачваўся ў дапамозе паўстанцам: прымаў іх у сваёй хаце па 15-20 чалавек, забяспечваў конямі, ежай (хлеб, вяндліна), боепрыпасамі (дроб, кулі), адвозіў іх у лясны лагер. Пазбаўлены маёмасці, духоўнага сану, сасланы ў Томскую губерню (Быхаўцаў М. Паўстанне 1863-1864 гг. у Ваўкавыскім павеце. — Гародня: б.в., 2014. — С. 236-237).

**МІХАЙЛОЎСКІ АЛЯКСАНДР**, селянін Гродзенскай губерні, 52 гады, прыцягнуты да следства Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за садзейнічанне паўстанню ў жніўні 1863 г. (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 184; Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 81).

**МІХАЙЛОЎСКІ МІХАІЛ**, адстаўны вахмістр Украінскага ўланскага палка, 40 гадоў. Прыцягнуты да следства ў маі 1863 г.

Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй па падазрэнню ў кантактах з паўстанцамі (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі» ... — С. 181).

**МІХЛІЕЎСКІ ІГНАЦІЙ ІВАНАВІЧ**, памешчык, у 1863 г. меў 59 гадоў, абвінавачваўся ў сувязях з паўстанцамі, сядзеў у Слонімскай турме з 10 ліпеня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 55 адв.).

**МІЦКЕВІЧ КЛЕМЕНС ЕЖАВІЧ**, 45 гадоў, гродзенскі мешчанін, збіраў ахвяраванні на паўстанне. Арыштаваны ў першыя дні студзеня 1866 г. (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 171. — S. 3).

**МОЦАРСКІ МАЦВЕЙ АДАМАВІЧ**, у 1863 г. меў 57 гадоў, з дваран Аўгустоўскай губерні, фельчар з Браньска. Дапамагаў паўстанцам медыкаментамі, лячыў параненых (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 705, а. 54).

**МРОЧАК ФЕЛІКС**, 76 гадоў, шляхціц Гродзенскага павета. Прывозіў паўстанцам харчаванне. Зняволены ў Гродзенскай турме (Буднік І. Падзеі 1863-64 гадоў... — С. 81).

**НАВІЦКІ**, былы інжынер, паручнік Рэвельскай інжынернай каманды. Перадаваў рэвалюцыйную карэспандэнцыю, пазней уступіў у паўстанцкі атрад. Быў забіты пад час бою з царскімі войскамі. Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 12; ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 124).



*У. Навіцкі*

**НАВІЦКІ РЫЧАРД**, 35 гадоў, адстаўны губернскі сакратар. Адвозіў харчовыя запасы ад ксяндза І. Мінчэўскага (гл.) паўстанцам. Палявы суд пазбавіў яго маёмасці, правоў стану і саслаў у Табольскую губерню (Быхаўцаў М. Паўстанне 1863-1864 гг. у Ваўкавыскім павеце. — Гародня: б.в., 2014. — С. 236-237).

**НАЖЫМСКАЯ ЮЛІЯ**, дваранка Гродзенскай губерні, 32 гады, прыцягнута да следства Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за садзейнічанне паўстанню ў жніўні 1863 г. (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 185).

**НАРБУТ ЛЮДВІГА ТАДЭВУШАЎНА**, народжаная Эстка, 55 гадоў у 1863 г. Памешчыца Кобрынскага павета. Маці Хрысціны (гл.). Была арыштавана, пэўны час знаходзілася ў Кобрынскім астрозе, а ў маі 1864 г. вывезена разам з Хрысцінай пад канвоем у Гродна да ваенна-суднай камісіі (ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 741А; НГАБ у Гродне, ф. 1159, воп. 3, с. 35, а. 101, 104).



*Камера Кобрынскай турмы*

**НАРБУТ ХРЫСЦІНА** (Крысціна), жонка Тэадора Нарбута, маці паўстанцкіх камандзіраў Людвіка і Баляслава. Разам з вядомым гісторыкам ВКЛ яна ператварыла сваю хату ў явачны пункт і месца захоўвання зброі, амуніцыі, харчавання для паўстанцаў. За агітацыю вучняў Свіслацкай гімназіі ўдзельнічаць у маніфестацыях генерал-губернатар В.І. Назімаў прадпісаў 29.04.1862 г. гродзенскаму губернатару Галлеру выслаць Хрысціну «ў іншыя павятовыя гарады даверанай вам губерні». Той высяліў яе ў Ваўкавыск пад паліцэйскі нагляд. Генерал-губернатар Мураўёў вырашыў выслаць Нарбутаў у Сібір, маёнтак канфіскаваць, хату спаліць і заараць зямлю, каб і следу ад іх не засталося. Але цяжка хворага Тэадора пакінулі пад наглядам паліцыі ў Вільні, дзе ён 15.11.1864 г. памёр, а Хрысціну выслалі ў Пензенскую губерню. Яна вернецца ў Шаўры ў 1874 г. і пакіне свет у 1899 г. Пахавана каля сына Баляслава ў Шаўрах (Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861-1862 гг... — С. 468; Талерчык А., Майсяёнак А. Першы летапісец нашай гісторыі // Пагоня. — 1994. — 2-8 снежня. — С. 5).



*Чэпчык, у якім прайшла ссылку маці Людвіка Нарбута Хрысціна*

**НЯДЗВЕЦКІ АНТОН**, 51 гадоў, шляхціц, арандатар маёнтка ў в. Кадыш Аўгустоўскага павета. Агітаваў уступаць у паўстанцкія атрады. Зняволены ў Гродзенскай турме (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 81).

**НЯМАЖКА МАЦВЕЙ**, пісар Скіндэрскага сельскага таварыства Сакольскага павета. Абвінавачваўся ў агітацыі сярод сялян. Яшчэ да паўстання чытаў сялянам паперу, у якой гаварылася пра цяжкасць урадавых падаткаў, намякаў, што хутка будзе агульнае паўстанне, калі «кожны гаспадар павінен будзе зарэзаць хаця б аднаго рускага салдата». Высланы ў Маскву для вырашэння лёсу ў МУС (Восстание в Литве и Белоруссии в 1863 — 1864 гг. ... — С. 397, 398, 564).



*Напалеон Орда*

**ОРДА НАПАЛЕОН МІХАЙЛАВІЧ** (11.02.1807 г., в. Варацэвічы Пінскага павета Мінскай губерні — 26.04.1883 г.), піяніст, кампазітар, мастак, удзельнік паўстання 1830-1831 гг. Вярнуўся з эміграцыі па маніфесту 1856 г. у гэтым самым годзе. Прыпісаны да Кобрынскага мяшчанскага грамадства, арандаваў казённую ферму Варацэвічы ў Кобрынскім павеце. Вясной 1863 г. агітаваў сваіх дваравых уступіць у паўстанцкі атрад (тры з іх так і зрабілі 30.04 (12.05). Быў пад следствам з 22.01 (3.02)1866 г., сядзеў у Кобрынскім турэмным замку з 28.02 (12.03).1866 г. Пад час вобыску ў яго хаце знайшлі парахаўніцу з порахам, патрыятычныя вершы і падазроныя паперы. 3(15).05.1866 г. адпраўлены ў Гродна і пасаджаны тут у астрог да 30.05 (11.06)1867 г. Яшчэ Напалеон і яго жонка Ірына абвінавачваліся ў дазволе свайму сыну Вітольду ўступіць у французскае войска без дазволу расійскага ўрада. Гэта абвінавачванне пазней было знята, відаць, пад націскам французскага пасольства. Вайсковым судом прыгавораны да высылкі ў «аддаленыя губерні Расіі», але канфірмацыяй в.а. камандуючага Віленскай вайсковай акругі Манюкіна ад 15(27).07.1867 г. звольнены ад адказнасці. Пэўны час жыў на Валыні. Вынікам яго падарожжаў па Беларусі, Літве, Польшчы і Украіне сталі малюнкі

архітэктурных помнікаў і мясцін, звязаных з жыццём вядомых асоб (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 31, с. 108, а. 1, 7, 16 адв., 17, 36-40, 49, 59, 67 адв.).

**ПАНІКВІЦКАЯ АЛЕНА**, жонка Іосіфа (гл.), памешчыца Брэсцкага павета, маёнтак Плянты, вербавала людзей у партызанскія атрады. Арыштавана 28.08.1863 г. і знаходзілася пад следствам у Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 11; воп. 1, с. 11, а. 40 адв.).

**ПАНІКВІЦКІ ІОСІФ**, памешчык Брэсцкага павета, маёнтак Клюкавічы, вербаваў людзей у партызанскія атрады. Арыштаваны 28.08.1863 г. і знаходзіўся пад следствам у Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 40 адв.).

**ПАНЯТОЎСКІ МІХАІЛ ФРАНЦАВІЧ**, 52 гады, чыноўнік Гродзенскай казённай палаты (памочнік бухгалтара), праслужыў там 30 гадоў. Пасля адстаўкі пасяліўся на арандаванай зямлі ў ваколіцы Драмавічы Лідскага павета. Захоўваў порах і кулі. Высланы 26 лістапада 1863 г. з Гродна ў Пензенскую губерню пад нагляд паліцыі. 18.01.1864 г. быў туды дастаўлены і адпраўлены ў г. Ніжні Ломаў. Меў жонку і 3 малалетніх дзяцей (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 504, а. 9, 28; Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 81).

**ПАНЯТОЎСКІ ГЕНРЫХ МІХАЙЛАВІЧ**, сын М. Панятоўскага, 15 гадоў, прыцягнуты да следства Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за садзейнічанне паўстанню ў ліпені 1863 г. (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 182).

**ПАЎЛЮКЕВІЧ КАЭТАН ЛУКІНАВІЧ**, шляхціц, у 1863 г. меў 60 гадоў, абвінавачваўся ў забеспячэнні паўстанцаў харчаваннем, сядзеў у Слонімскай турме з 26 жніўня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 27 адв.).

**ПАЦІНКА СТАНІСЛАЎ ФРАНЦАВІЧ**, дваранін, у 1864 г. меў 56 гадоў, абвінавачваўся ў сувязях з паўстанцамі, сядзеў у Слонімскай турме з 15 ліпеня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 23 адв.).

**ПЕТРАШКЕВІЧ АНДРЭЙ АНТОНІЕВІЧ**, гродзенскі мешчанін, 58 гадоў у 1863 г., арыштаваны ў кастрычніку 1863 г. за агітацыю людзей уступаць у паўстанцкія атрады. У лістападзе быў сасланы ў Сібір з пазбаўленнем усякіх правоў (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 172. — S. 3).

**ПІСАНКА БАНІФАЦЫЙ**, у 1864 г. 34 гады, ураджэнец Ковенскай губерні, ксёндз, настаяцель Поразаўскага касцёла. Быў абвінавачаны ў дапамозе паўстанцам. 28.05 (9.06).1863 г. у яго кватэры быў праведзены вобыск і знойдзены ліст М. Свянткоўскай з Парыжа да маці ў Вільна, дзе ўзгадваўся нейкі Каліноўскі з Літвы. Арыштаваны разам з пляменніцай Ядзвігай, быў дастаўлены ў Віленскую следчую камісію. Мешчанін Ф. Крыцкі сведчыў, што на кватэры Пісанкі часта збіраліся памешчык Сасуліч (гл.), К. Пісанка (гл.), пляменніца Ядзвіга Пісанка, урач Талашнянскі (гл.) і інш., спявалі забароненыя гімны. Па рашэнню ваенна-палявога суда ад 14(26).01.1864 г. быў сасланы ў Томскую губерню. Да верасня 1866 г. знаходзіўся на лячэнні ў Віленскім турэмным шпіталі. Затым у Маскве яго перанакіравалі ў г. Калагрыў Кастрамской губерні разам з сястрой Каралінай. Памёр 7 (19).12.1870 г. (Быхаўцаў М. Паўстанне 1863-1864 гг. у Ваўкавыскім павеце. — Гародня: б.в., 2014. — С. 219, 223, 227, 270).

**ПІСАНКА КАРАЛІНА**, сястра ксяндза Баніфацыя (гл.), шыла разам з Ядзвігай Пісанка чырвоныя кашулі для паўстанцаў, дастаўляла ім з дапамогай фурмана І. Казімірчыка харчаванне. Па рашэнню ваенна-палявога суда ад 14(26).01.1864 г. была саслана ў Аланецкую губерню, але потым яе перанакіравалі з братам у Кастрамскую губерню. Пасля вяртання жыла ў Віленскім павеце, выйшла замуж за былога паўстанца А. Урублеўскага (Быхаўцаў М. Паўстанне 1863-1864 гг.... — С. 223, 225, 227).

**ПЛАЎСКІ ДАМІНІК ВІКЕНЦЕВІЧ**, дваранін, у 1863 г. меў 69 гадоў, абвінавачваўся ў схаванні паўстанцаў і рамонце ружжаў. Сядзеў у Ваўкавыскай турме з 26 кастрычніка 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 24 адв.).

**ПЛАЎСКІ МІХАІЛ ВІКЕНЦЕВІЧ**, дваранін, у 1863 г. меў 60 гадоў, абвінавачваўся ў схаванні паўстанцаў і рамонце ружжаў. Сядзеў

у Ваўкавыскай турме з 26 кастрычніка 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 24 адв.).

**ПРЖЭЎЛОЦКІ ЮЛІЯН ФРАНЦАВІЧ**, ахоўнік, у 1864 г. меў 32 гады, абвінавачваўся ў забеспячэнні паўстанцаў харчаваннем, сядзеў у Слонімскай турме з 23 жніўня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 27 адв.).

**ПРЭЙСІК ФЁДАР**, кіраўнік маёнтка памешчыка Высоцкага Лумцы, вербаваў людзей у партызанскія атрады. Арыштаваны 28.08.1863 г., знаходзіўся пад следствам у Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 40 адв.).

**ПТУШЫНСКІ АНТОН**, паштовы экспедытар м. Сапоцкін. Падтрымліваў сувязі паміж паўстанцкімі атрадамі. Зняволены ў Гродзенскай турме (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 82).

**ПУЛЯНОЎСКІ КАРАЛЬ АНДРЭЕВІЧ**, 28 гадоў, шляхціц Гродзенскага павета, арыштаваны ў маі 1863 г. за неданясенне ўладам на Незабітоўскага, які ў сваім маёнтку выдаў паўстанцам правіянт (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 172. — S. 3).

**ПУХАЛЬСКАЯ ЕЛІЗАВЕТА РАФАІЛАЎНА**, памешчыца, у 1863 г. мела 78 гадоў, абвінавачвалася ў прыняцці паўстанцаў, пад час следства сядзела пад хатнім арыштам з 4 кастрычніка 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 12 адв.).

**ПУХОВІЧ ІВАН**, 28 гадоў, аднадворац Гродзенскага павета. За дапамогу паўстанцам быў зняволены ў Гродзенскай турме (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 82).

**ПЯЧЭЎСКІ АНТОН ВОЙЦЭХАВІЧ**, у 1863 г. меў 48 гадоў, мешчанін м. Браньск. Збіраў грошы і вопратку ў навакольных вёсках і адпраўляў два разы ў тыдзень у партызанскі атрад (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 705, а. 77 адв.).

**РАБІЦКІ (РЫБІЦКІ) КАРЛ АНДРЕЕВІЧ**, у 1863 г. меў 46 га-

доў, мешчанін Браньска. Збіраў для паўстанцаў рэкрутаў, адпусціў у атрад свайго работніка, дастаўляў паўстанцам сала, мяса, каўбасы і іншую ежу (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 705, а. 77).

**РАДАВІЦКІ СТАНІСЛАЎ СЦЯПАНАВІЧ**, з дваран, 58 гадоў, памешчык маёнтка Менкі з хутарам Ваўкавыскага павета. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі, пасля заканчэння якой працаваў у дэпутацкім сходзе, тытулярны дарадца. Удзельнік паўстання 1830-1831 гг., жыў у эміграцыі. Абвінавачваўся на падставе даноса праваслаўнага святара Іаана Катовіча ў зносінах з паўстанцамі і забеспячэнні іх харчаваннем, распаўсюджванні рэвалюцыйных пракламацый. Прымаў удзел у выступленнях гродзенскіх гімназістаў 14-15.03.1863 г., 20.02.1864 г. быў арыштаваны, 21.04. адпраўлены ў Гродзенскі турэмны замак (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2887, а. 60 адв.-61; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917 б., а. 291 адв., 310 адв., 313-314, 375; с. 933, а. 143).

**РАДОМСКІ ІВАН**, шляхціц Беластоцкага павета, 30 гадоў. Прыцягнуты да следства ў жніўні 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за дастаўку харчавання паўстанцам (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 184).

**РАЖКОЎСКІ ДЗЯМ'ЯН М.**, ляснік памешчыка Казерадскага (гл.). На допыце 28.09.1863 г. сведчыў, што 2-3 разы ў тыдзень дастаўляў у атрад Духінскага (Урублеўскага) харчаванне. Пасля бітвы пад Глыбокім Кутам забраў да сябе хворага паўстанца-афіцэра з Кобрынскага атрада (Восстание в Литве и Белоруссии 1863-1864 гг. ... — С. 383, 384).

**РАМАН ІОСІФ АНТОНАВІЧ**, ахоўнік, у 1864 г. меў 50 гадоў, абвінавачваўся ў забеспячэнні паўстанцаў харчаваннем, сядзеў у Слонімскай турме з 24 жніўня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 27 адв.).

**РАМАНОЎСКАЯ ПЕЛАГЕЯ**, дачка Д. Раманоўскага, 15 гадоў, прыцягнута да следства Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за садзейнічанне паўстанню ў жніўні 1863 г. (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 184).

**РАМАНОЎСКІ ДАМІНІК**, дваранін Гродзенскай губерні, 47 гадоў, прыцягнуты да следства Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за садзейнічанне паўстанню ў жніўні 1863 г. (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»...— С. 184).

**РАСЛЕВІЧ ЯН ЯНАВІЧ**, 27 гадоў, селянін м. Сапоцкін. Дапамагаў паўстанцам харчаваннем. Узяты жыхарамі на парукі (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 82).

**РАТНІЦКІ**, памешчык з маёнтка Бржэзніца. Займаўся зборам грошай, харчавання і зброі для паўстанцаў (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 167, а. 36).

**РАЧЫНСКІ ВОЙЦЭХ**, сын чыноўніка Полацкай гарадской паліцыі, 18 гадоў. Прыцягнуты да следства ў лютым 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за кантакты з паўстанцамі і падробку пашпарта (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 177).

**РЖАНЯНІЦКІ ЭРНЭСТ**, дваранін Гродзенскай губерні, 48 гадоў. Прыцягнуты да следства ў маі 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй па падазрэнню ў кантактах з паўстанцамі (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 181).

**РЫБАКЕВІЧ МІХАІЛ**, мешчанін Беластоцкага павета, 23 гады. Прыцягнуты да следства ў ліпені 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за кантакты з паўстанцамі (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 183).

**РЫЗОЎСКІ**, памешчык з маёнтка Даманава Бельскага павета. Збіраў па вёсках рэкрутаў у паўстанцкі атрад, дастаўляў харчаванне (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 167, а. 36).

**САКАЛОЎ ІВАН ІВАНАВІЧ**, 57 гадоў, селянін Гродзенскага павета, арыштаваны ў верасні 1863 г. за дастаўку харчавання паўстанцам (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 174. — S. 3).

**САКАЛОЎСКІ ЛЮДВІГ МІКАЛАЕВІЧ**, дваранін, у 1863 г. меў 40 гадоў, абвінавачваўся ў забеспячэнні паўстанцаў харчаваннем, сядзеў у Слонімскай турме з 26 жніўня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 27 адв.).

**САКАЛОЎСКІ ПЁТР ІВАНАВІЧ**, дваранін, у 1864 г. меў 26 гадоў, абвінавачваўся ў хаванні ў сябе паўстанцаў, сядзеў у Слонімскай турме з 17 чэрвеня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 22 адв.).

**САКОВІЧ ЯН ДЫЯНІЗЕВІЧ**, меў у 1863 г. 23 гады, гаспадар маёнтка Грыневічы Бельскага павета. Узяў 8 сваіх работнікаў і вывез 18 (30).01.1863 г. у лес Міцічкі для злучэння з паўстанцкім атрадам. Мелі 4 ружжа, 6 кос, 3 пуды пораху. Арыштаваны ў будынку Дваранскага сходу ў Бельску і пасаджаны ў мясцовую турму 20.01 (1.02).1863 г. Па канфірмацыі генерал-губернатара Назімова расстрэл быў заменены на высылку на катаржныя працы на 12 гадоў, маёнтак канфіскоўваўся (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 182, а. 1, 4, 20-22, 27).

**САНКОЎСКІ (Сянкоўскі) СТАНІСЛАЎ ВІКЕНЦЬЕВІЧ**, 49 гадоў, фельчар з маёнтка Закрэўшчына Гродзенскага павета. Не данёс на ксяндза м. Азёры Вайнеўша, які вербаваў жыхароў у паўстанцкі атрад. Высланы 26.11.1863 г. у Кастрамскую арыштанцкую роту на 4 гады. Затым жыў у Табольску, дзе памёр у 1876 г. (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 504, а. 29 адв.; Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 82).

**САСОВА РЫЎКА**, яўрэйка з Гродна, якая хавала ў сябе зброю і кулі. Арыштавана ў сакавіку 1863 г. (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 174. — S. 3).

**САСУЛІЧ**, памешчык маёнтка Харашэвічы Ваўкавыскага павета. Скупляў у м. Поразава косы і дастаўляў іх у Ваўкавыскі паўстанцкі атрад, дзе знаходзіўся яго брат. Верагодна, атрад Стравінскага, дзе служыў Ксаверы Сасуліч (гл. вайскоўцы) (Быхаўцаў М. Паўстанне 1863-1864 гг... — С. 223, 226).

**САЧКО ФЁДАР ГЕРАСІМАВІЧ**, дваравы чалавек, сядзеў у Слонімскай турме з 11 жніўня 1863 г., абвінавачваўся ў за-

беспячэнні паўстанцаў харчаваннем і іншымі сродкамі (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 58 адв.).

**СЕГЕНЬ АЛЯКСАНДРА**, дваранка Ваўкавыскага павета, жонка памешчыка. Збірала грошы і харчаванне для арыштаваных паўстанцаў. Папярэдзіла ксяндза Б. Пісанку (гл.), што мае адбыцца вобыск, і ён паспеў спаліць кампраметуючыя яго паперы. Аддана на паручыцельства і пад нагляд паліцыі, узята 300 рублёў срэбрам штрафа (ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 13 адв.; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917, ч. 1, а. 125; Быхаўцаў М. Паўстанне 1863-1864 ... — Гародня: б.в., 2014. — С. 223).

**СВЯЖЫНСКІ (СВЯРЖЫНСКІ) СТАНІСЛАЎ АНТОНАВІЧ**, 32 гады, нарадзіўся ў маёнтку Гавенавічы, вучыўся ў Свіслацкай гімназіі і Мінскім шляхетным пансіёне. Служыў у Беларускім гусарскім палку (1851—1858 гг.), у адстаўку выйшаў паручнікам. З восенні 1858 г. два з паловай гады жыў у Пецярбургу. Прымаў у сваім маёнтку Гавенавічы Э. Заблоцкага і Каліноўскага пад час іх паездкі па паветах, даў ім коней (май 1863 г.). 14.08.1863 г. быў арыштаваны, сядзеў у Гродзенскім астрозе. У красавіку 1864 г. быў прызначаны да высылкі ў Пермскую губерню (па іншых дадзеных, у Арэнбургскую). Маёнтак быў вызвалены ад секвестра за аплату 10 % збора (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 74 адв.-75; с. 2, а. 369-372; ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 6 адв.; с. 40 а, а. 18 адв.; с. 21, а. 315; ф. 23, воп. 1, с. 372, а. 119; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917, ч. 1, а. 125).

**СЕРКУЧЭЎСКІ ФЕЛІКС ЯНАВІЧ**, 45 гадоў, з ваколіцы Эйсманты, арыштаваны ў красавіку 1864 г. за агітацыю сярод сялян да ўдзелу ў паўстанні (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 174. — S. 3).

**СКАЧЫНСКІ МЕДАРД**, памешчык маёнтка Голені, дастаўляў у атрады Урублеўскага і Млотка харчаванне, 15 штуцэрных ружжаў са штыкамі, ботаў з доўгімі халявамі (Восстание в Литве и Белоруссии 1863—1864 гг. ... — С. 383).

**СЛІВОЎСКІ АЛЯКСАНДР ФЕРДЫНАНДАВІЧ**, у 1863 г. меў 27 гадоў, дваранін з в. Бжэзніца. Набіраў рэкрутаў у паўстанцкі атрад, жыхары м. Браньск бачылі яго ў в. Даманава ўзброеным, меў двустволку і пісталет (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 705, а. 77).

**СНЕЖКА**, чыноўнік Пружанскага земскага суда, рэгулярна дастаўляў паўстанцкаму атраду Духінскага (Урублеўскага) харчаванне. Затрыманы вайскоўцамі ў в. Ліхасельцы 4.08.1863 г., калі разам з дзвюма іншымі асобамі перавозіў паўстанцам злітак свінца вагай 1 пуд 5 фунтаў, 2 галавы цукру, 10 скрынь сігараў, 20 пачак папяросаў, каля 3 фунтаў тытуню, папяросную і пісчую паперу (Восстание в Литве и Белоруссии 1863—1864 г. ... — С. 376, 384).



*С. Солтан у паўстанцкай вопратцы (фотакопія са следчай справы)*

**СОЛТАН СТАНІСЛАЎ СТАНІСЛАВІЧ**, 42 гады, граф, сын паўстанца сутычкі, якая адбылася ў 1794 г., удзельніка вайны 1812 г. на баку Напалеона, брат напалеонаўскага вайскоўца 1812 г. і ўдзельніка паўстання 1831 г., сваяк паўстанцаў 1863 г. Франца Юндзіла і Северына Ромера. Вучыўся ў Мітаўскай гімназіі і Дэрпцкім універсітэце. Служыў у канцылярыі Гродзенскага дваранскага сходу. Да чэрвеня 1862 г. быў міравым пасярэднікам Гродзенскага павета. Ёсць сведчанні, што ў гэты час сяляне выганялі яго з вёскі, ён выклікаў войскі для «ўціхамірвання мужыкоў». Па паказаннях Э. Заблоцкага, Сільвярстовіча, Геніўша, садзейнічаў ім у выкананні іх абавязкаў на рэвалюцыйных пасадах: парадамі, выбарам асобаў для рэвалюцыйнай арганізацыі, складаннем складак 10 % збора з памешчыцкіх маёнткаў на закупку зброі за мяжой. Каліноўскі ў канцы мая 1863 г. выслаў яму намінацыю на пасаду памочніка камісара Гродзенскага ваяводства і пячатку, але С. адмовіўся (з прычыны хваробы жонкі) і аддаў іх назад. Солтан прызнаў гэты факт, але адмаўляўся ва ўдзеле ў паўстанні і садзейнічанні рэвалюцыйнай арганізацыі. Абвінавачваўся таксама ў забеспячэнні паўстанцаў зброяй (атраду Духінскага перадаў 50 двуствольных ружжаў, 4 бутэлькі пораху, сундучок пуль), вопраткай, харчаваннем, прыняццем іх у сваім маёнтку. Ведаў К. Каліноўскага, Гофмайстра, Заблоцкага, Сільвястровіча — кіраўнікоў рэвалюцыйнай арганізацыі, якія бывалі ў яго хаце. Э. Заблоцкі паказаў, што С. пісаў рэвалюцыйныя адозвы. Арыштаваны, сядзеў у мурах паезуіцкага касцёла. Распараджэннем гродзенскага губер-

натара ад 13.05.1864 г. яго маёнтак падлягаў канфіскацыі. Прыгавораны да катаржных прац у капальнях на 15 гадоў (было «мнение» расстраляць) (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 65-66 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а.12, 15 адв., с. 426-436; с. 1, а. 38, 500-505, 556 адв., 566; ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 11; Jodkowski J. Sylwety z roku 1863 // Echo Grodzienski. — 1926. — № 8. — S. 3).

**СРЭБРОЎСКІ РАМУАЛЬД ПАЎЛАВІЧ**, каланіст, 73 гады, дастаўляў у партызанскія атрады харчаванне, арыштаваны ў верасні 1863 г. (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 174. — S. 3).

**СРЭБРОЎСКІ СТАНІСЛАЎ РАМУАЛЬДАВІЧ**, 33 гады, сын папярэдняга, арыштаваны за тыя самыя дзеянні (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 174. — S. 3).

**СТАНІШЭЎСКІ ІВАН**, 42 гады, прыцягнуты да следства Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за садзейнічанне паўстанню ў жніўні 1863 г. (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 184).

**СТРЖЭЗІНСКІ ЮЛІЯН**, шляхціц Гродзенскай губерні, 41 год, абвінавачваўся ў «падбухторванні людзей уступіць у мяцеж». Быў сасланы без пазбаўлення правоў на жыхарства ў аддаленыя месцы Сібіры. Знаходзіўся ў Омску (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 539; Электронны рэсурс: narod.ru|1864|Ssilka-ZapSib.html. — Дата доступа: 15.01.2013).

**СТЫЧЫНСКІ ЮЗЭФ**, 27 гадоў, фурман Сапоцкінскай паштовай станцыі. Падтрымліваў сувязь паміж паўстанцкімі атрадамі. Адпраўлены ў Кастрамскую арыштанцкую роту (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 82).

**СТЭЦКЕВІЧ АНТОН СТАНІСЛАВАВІЧ**, аднадворац, у 1863 г. меў 47 гадоў, абвінавачваўся ў падбухторванні сялян супраць ураду, сядзеў у Ваўкавыскай турме з 14 кастрычніка 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 13 адв.).

**СТЭЦКЕВІЧ ПЁТР ПЯТРОВІЧ**, ксёндз, францішканін Гродзенскага канвенту, арыштаваны ў жніўні 1863 г. за знойдзеныя

ў яго казанні, напісаныя ў рэвалюцыйным духу (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienskie. — 1921. — № 174. — S. 3).

**СЯМАШКА ІОСІФ ВІКЕНЦЕВІЧ**, дваранін, у 1863 г. меў 26 гадоў. Абвінавачваўся ў дастаўцы паўстанцам прадуктаў. Сядзеў пад арыштам у Ваўкавыскім астрозе з 24 жніўня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 7 адв.).

**СЯНКОЎСКІ СТАНІСЛАЎ**, мешчанін Гродзенскага павета, 49 гадоў, прыцягнуты да следства Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за садзейнічанне паўстанню ў ліпені 1863 г. (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 182).

**СЯРЖПУТОЎСКАЯ ВАЛЕРЫЯ ВІНЦЭНТАЎНА**, 47 гадоў, дваранка з Гарлеўскіх Сакольскага павета, жыла ў сына Адама (гл.), ёй належала пятая частка маёнтка Ласосна. Як сведчыў селянін Юргель, яна загадала яму адкапаць схаваныя ў садзе порах, свінец, корпію, 4 ружжы і схаваць у амбары. Усё гэта вечарам забраў невядомы яму чалавек. Арыштаваная не прызнала сваю віну нават на вочнай стаўцы. Прыгаворана да вытрымкі ў турме паўгода і высылцы на жыхарства ва ўнутраныя губерні Расіі. Сядзела ў Гродзенскім астрозе з 3 ліпеня 1864 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 82, с. 1, а. 540 адв., 550, 559 адв.; ф. 1, оп.13, с. 1399, а. 151 адв.; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917 б., а. 269-270, 273-274).

**СЯРЖПУТОЎСКІ АДАМ ЭМІЛЬЕВІЧ**, сын Валерыі, 27 гадоў, уладальнік чацвёртай часткі маёнтка Ласосна Сакольскага павета. Прызнаўся ў забеспячэнні паўстанцаў ваеннымі і харчовымі прыпасамі, вопраткай, спасылаючыся на страх перад імі, а паляўнічыя ружжы належалі юнкеру Ф. Вяльгорскаму. Сасланы ў лютым 1864 г. на пасяленне ў Сібір у Табольскую губерню. Маёнтак канфіскаваны (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 81 адв. — 82; с. 1, а. 517; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917 б., а. 262-267; Буднік І. — С. 82).

**ТАКАРЖЭЎСКІ ВАЎЖЫНЕЦ ТЭАФІЛАВІЧ**, памешчык ваколіцы Токары. Абвінавачваўся ў адпраўцы людзей у паўстанцкі атрад і раскідванні брашур рэвалюцыйнага зместу. Сядзеў пад арыштам у Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 35 адв.).

**ТАКАРЖЭЎСКІ ТЭАФІЛ**, бацька Ваўжынца (гл.), памешчык ваколіцы Токары. Абвінавачваўся ў адпраўцы людзей у паўстанцкі атрад і раскідванні брашур рэвалюцыйнага зместу. Сядзеў пад арыштам у Слонімскай турме (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 35 адв.).

**ТАЛАЧМАНСКІ ЯКАЎ ФЁДАРАВІЧ**, селянін, у 1863 г. меў 80 гадоў, абвінавачваўся ў схаванні паўстанцаў, сядзеў у Ваўкавыскай турме з 21 верасня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 12 адв.).

**ТАЛАШМЯНСКІ**, урач м. Поразава Ваўкавыскага павета, апавяшчаў паўстанцаў (дзе былі яго два браты) пра ўсё, што робіцца, дзе праходзяць войскі (Быхаўцаў М. Паўстанне 1863-1864 гг. у Ваўкавыскім павеце. — Гародня: б.в., 2014. — С. 223).

**ТАРАСОВІЧ (ТАРАСЕВІЧ) КАНСТАНЦІН ГЕРАНІМАВІЧ**, 38 гадоў, памешчык Ваўкавыскага павета. Нарадзіўся ў маёнтку Гнезна Ваўкавыскага павета ў сям'і дваран, вучыўся ў Маскоўскім універсітэце. На 4-м курсе пасля смерці бацькі вымушаны быў пакінуць вучобу і паступіць на службу ў Ваўкавыскі павятовы суд. Быў ганаровым назіральнікам вучылішчаў Бельскага павета. Узнагароджаны медалём у памяць аб вайне 1853-1856 гг. Меў маёнтак Конна ў Ваўкавыскім павеце, які налічваў каля 3000 дзесяцін. Па паказаннях Э. Заблоцкага, прымаў у сваім маёнтку яго і Каліноўскага пад час іх паездкі па гэтым павеце (май 1863 г.). Т. паказаў, што не жыў у той час у маёнтку, бо ў яго была хворая жонка і ён знаходзіўся ў Варшаве (тое самае гаварыў на следстве і ягоны брат). Ад суда і арышта вызвалены (было «мнение» выслаць на катаржныя працы на 8 гадоў) (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 74 адв.-75, 330 адв., 333; с. 1, а. 562).



*Інструкцыя па апрананні кандалоў*

**ТАЎРЭЛЬ ФРАНЦІШАК**, 50 гадоў, шляхціц Гродзенскага павета. Зняволены ў Гродзенскай турме за забеспячэнне паўстанцаў харчаваннем (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 82).

**ТРЖЭЦЯК (ТРАЦЯК) ЮЛЬЯН ВІКТАРАВІЧ**, нарадзіўся ў в. Шымакі Сакольскага павета, 29 гадоў у 1864 г. Ягоны бацька Віктар Францавіч — адстаўны Польскага войска капітан, служыў у 1-м гвардзейскім уланскім палку на баку Напалеона Банапарта ў 1807—1815 гг., меў Крыж Ганаровага Легіёна 3-й ступені. Юльян вучыўся ў Гродзенскай гімназіі, даслужыўся ў войску да чына падпаручніка (1854—1859 гг.), узнагароджаны срэбным медалём у памяць аб Севастопальскай (Крымскай) вайне. У Гродна прыбыў з Нежына Чарнігаўскай губерні ў снежні 1862 г. і заняўся пераплётным рамяством. Дапамагаў Сільвястровічу перадаваць рэвалюцыйныя паперы павятовым і акруговым начальнікам ваяводства. Для гэтага Сільвястровіч набыў у Багаткі (гл.) 2 коней, купіў каляску і конскую збрую. Верагодна, Т. спрабаваў угаварыць Івана Францавіча Лапінскага, кіраўніка маёнтка Келбасін, выконваць ролю развозчыка карэспандэнцыі ў Ваўкавыскі і Слонімскі паветы. Арыштаваны ў маі 1864 г. На допытах расказаў следчым шмат таямніц паўстанцкай арганізацыі. Пад час вобыска ў маёнтку бацькі Шымакі Сакольскага павета, у пакоі Юльяна, знайшлі «мешочек со свинцовыми литерами». Прыгавораны да катаржных прац на 8 гадоў. Рашэннем Гродзенскага губернскага праўлення ад 1(13).12.1864 г. маёмасць падлягала канфіскацыі (НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 611, 127; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 52, 280-280 адв., 290, 311-319; с. 1, а. 555 адв.; воп. 1, с. 40, а. 180; ф. 320, воп. 2, с. 160, а. 27 адв.-28; Jodkowski J. Rok 1863... — № 176, 34).

**ТРУСКОЎСКІ (ТРУШКОЎСКІ) ВОЙЦЭХ ФАМІЧ**, меў у 1864 г. 60 гадоў, шляхціц в. Трускі Бельскага павета. Па яго заданню дзясяцкі М.М. Альшэўскі збіраў грошы для паўстанцаў. Іх і харчаванне Т. дастаўляў у паўстанцкі атрад. Быў арыштаваны і адбываў пакаранне ў Гродне (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2511, а. 4, 11, 25).

**ТУКАЛА ВАЛЕРЫЯН**, 30 гадоў, шляхціц в. Перстунь Гродзенскага павета. Зняволены ў Гродзенскай турме за забеспячэнне паўстанцаў харчаваннем (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 82).

**ТЫШКЕВІЧ ІОСІФ-СТАНІСЛАЎ АДАМАВІЧ**, 36 гадоў у 1863 г. Вучыўся ў Гродзенскай гімназіі, з 1854 г. — паштальён Гайсінскай паштовай канторы, з 1858 г. — сарціроўшчык у Брэсцкай памежнай паштовай канторе, калежскі рэгістратар. Падазраваўся ў рассылцы паўстанцкай карэспандэнцыі. Быў арыштаваны 25.11.1863 г. і прыцягнуты да следства ў Брэсце. 29.04 вызвалены, але 14.06 ізноў арыштаваны і высланы ў Гродна. Вызвалены пад даручальніцтва і нагляд паліцыі (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 11; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 1320, ч. 2, а. 332-334, 459 адв.; 496-498).

**ФЕДАРОВІЧ ВІНЦЭНЦІ ЯКУБАВІЧ**, шляхціц з Грандзіч, 66 гадоў, арыштаваны ў лютым 1864 г. па падазрэнні ў зборы складак для паўстанцаў (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 166. — S. 3).

**ФЕДЗЮШКА ФРАНЦІШАК КАЗІМІРАВІЧ**, чыноўнік, 32 гады, арыштаваны ў снежні 1863 г. па падазрэнні ў зборы складак для паўстанцаў (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 166. — S. 3).

**ХАДАКЕВІЧ ЛЮДВІГ МАРТЫНАВІЧ**, дваранін, сядзеў у Слонімскай турме з 1 жніўня 1863 г., абвінавачваўся ў забеспячэнні паўстанцаў харчаваннем і іншымі сродкамі (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 58 адв.).

**ХЛЕЛЬ СЦЯПАН ВІКЕНЦЕВІЧ**, селянін, у 1863 г. меў 60 гадоў, абвінавачваўся ў забеспячэнні паўстанцаў харчаваннем, сядзеў у Слонімскай турме з 26 жніўня 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 61 адв.).

**ХОМІЧ ЮЗЭФ СТЭФАНАВІЧ**, 42 гады, надворны дарадца, чыноўнік Гродзенскай будаўнічай камісіі, цесць Ягалкоўскага (гл. артыкул пра ваяводскую арганізацыю). Быў арыштаваны ў чэрвені 1863 г. па падазрэнні ў збіранні падаткаў на карысць паўстання (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 38 адв.; Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 162. — S. 3; Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 181).

**ЦЕЛЬШЭЎСКІ А.І.**, у 1844 г. скончыў Маскоўскі ўніверсітэт. З 1844 г. працаваў старшым урачом Слонімскага акруговага ўпраўлення Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў. У 1846 г. прызначаны штатным урачом Дзярэчынскай бальніцы, але праз тры гады вярнуўся на былую пасаду. У 1863 г. арыштаваны за «забеспячэнне паўстанцаў у Мілавідскіх лясах харчаваннем і іншымі рэчамі». Сасланы на жыхарства ў Арэнбургскую губерню (Игнатович Ф.И. Врачи Слонимщины — участники восстания 1863 года... — С. 210).

**ЦЕРАСКОЎНА ФРАНЦІШКА**, удава адстаўнога салдата, 30 гадоў. Прыцягнута да следства ў жніўні 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за дастаўку харчавання (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 184).

**ЦЫНГЕР**, урач са Свіслачы, быў павешаны царскімі карнікамі за тое, што не выдаў месцазнаходжання лагера паўстанцаў (Грицкевич В.П. С факелом Гиппократа... — С. 204).

**ЧАЦВЯРЦІНСКІ ГЕОРГІЙ (ЮРЫ) КАНСТАНЦІНАВІЧ**, князь, 31 год, нарадзіўся ў Гродне, атрымаў хатняе выхаванне, служыў у Сумскім гусарскім палку з 1853 па 1862 г., выйшаў у адстаўку штабс-ротмістрам. Арыштаваны па падазрэнні ў прысутнасці пры раскладцы 10 % збору з памешчыкаў на карысць рэвалюцыйнай арганізацыі. Гэтае абвінавачванне было пад час следства знята, але Ч. прызнаўся, што даў Багатку (гл.) 120 рублёў срэбрам. Пад час вобыска знайшлі спісаную ім пастанову варшаўскіх цэхаў «возмутительного содержания»: «Да шаноўнай дэлегацыі горада прадстаўленне цэха бронзавага, сталярскага, катлярскага і іншых майстроў і чаляднікаў». У пастанове ўтрымліваўся заклік любіць Айчыну, бо без яе будзе дрэнна. Загадам гродзенскага губернатара ад 13.05.1863 г. у яго быў канфіскаваны маёнтак. Прыгавораны да высылкі на пасяленне ў аддаленыя месцы Сібіры і штрафу ў суме 360 рублёў (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 74; с. 2, 415, 418 адв., 422-425; с. 1, а. 556; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917, ч. 1, а. 126; Jodkowski J. Sylwety z roku 1863 // Echo Grodzienski. — 1926. — № 8. — S. 3).

**ШАРШУН ВОСІП**, селянін, ляснік, у 1863 г. меў 30 гадоў, абвінавачваўся ў забеспячэнні харчаваннем паўстанцаў. Сядзеў у Ваўкавыскай турме з 10 верасня 1863 г. Яго два браты-ляс-

нікі таксама прынялі ўдзел у паўстанні: той, хто жыў каля Глыбокага Кута, адвозіў запіскі з атрада да памешчыка Казярадскага (гл.), другі завёз у атрад вала (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 14 адв., 33 адв.; Восстание в Литве и Белоруссии 1863—1864 гг. ... — С. 383, 384).

**ШМІГЕРА ЮЗЭФ**, 57 гадоў, аканом у маёнтку Л. Валіцкага Гродзенскага павета. Зняволены ў Гродзенскай турме за забеспячэнне паўстанцаў харчаваннем і фуражом (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 83).

**ШМІДТ АДОЛЬФ ІВАНАВІЧ**, 28 гадоў, арандатар аптэкі Адамовіча ў Гродне, шляхціц Аўгустоўскага павета. Прымаў удзел у антыўрадавых маніфестацыях у 1861 г. у Плоцку і таму знаходзіўся пад паліцэйскім наглядам да 5.04.1862 г. Магчыма, таму пераехаў у Гродна разам з жонкай і пасяліўся ў пакоі пры аптэцы. Арыштаваны ў красавіку 1863 г. за дапамогу паўстанцам медыцынскімі прэпаратамі (гімназістам, якія паспрабавалі выехаць у атрад Л. Нарбута). 28.04.1863 г. быў звольнены з-пад арышта пад паручыцельства 2 благанадзейных асоб і нагляд паліцыі. А 9.06.1863 г. быў ізноў затрыманы і дапытваўся Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй. 10.10.1863 г. па канфірмацыі камандуючага войскамі Віленскай ваеннай акругі быў пазбаўлены ўсіх правоў і маёмасці. Прыгавораны да ссылкі ў Сібір і 8.11.1863 г. адпраўлены ў Томскую губерню. За ім паехала жонка. (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 175. — S. 3; Игнатович Ф. Аптека провизора Адамовича и восстание 1863 г. // Город Святога Губерта: альманах локальной истории. — Вып. VII. — Гродно: Гродненская библиотека, 2013. — С. 129-131).

**ШОБАТАЎ БАЗЫЛІЙ МІХАЙЛАВІЧ**, 18 гадоў, селянін Гродзенскага павета, конюх графа Леапольда, пастаўляў харчаванне ў партызанскія атрады. Арыштаваны ў маі 1863 г. (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 175. — S. 3).

**ШУКАЙЛА АНТОНІ ТАМАШАВІЧ**, гродзенскі селянін, 50 гадоў, арыштаваны ў верасні 1863 г. за дастаўку паўстанцам фурманак (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 175. — S. 3).

**ШЫМБОРСКІ АБРАМ АНДРЭЕВІЧ**, 32 гады, мешчанін м. Сапоцкін. Вырабляў боты для паўстанцаў. Пакараны штрафам, узяты жыхарамі на парукі (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 83).

**ШЫМКОЎСКІ АЛАІЗЫ**, сын Фелікса, 41 год. Прыцягнуты да следства ў жніўні 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за дастаўку харчавання (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 184).

**ШЫМКОЎСКІ ФЕЛІКС**, памешчык Беластоцкага павета, 75 гадоў. Прыцягнуты да следства ў жніўні 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за дастаўку харчавання (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 184).

**ЭЙСМАНТ МАТЭВУШ АНДРЭЕВІЧ**, 40 гадоў, шляхціц в. Эйсманты Надтабольскія. Прывозіў паўстанцам харчаванне. Узяты жыхарамі на парукі (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 83).

**ЭЙСМАНТ САМСОН ІВАНАВІЧ**, 38 гадоў, шляхціц з Эйсмантаў Надтабольскіх. Заклікаў сялян да паўстання. Арыштаваны і адвезены ў Маскву (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 83). Менавіта Масква была перасыльным пунктам у Сібір.

**ЭЙСЫМОНТ МІХАЛ МІКАЛАЕВІЧ**, чыноўнік, 47 гадоў, арыштаваны ў Гродне ў 1863 г. па падазрэнні ў зборы складак для паўстанцаў (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 166. — S. 3).

**ЭЙСЫМОНТ ЮЗЭФ ЭЛІЯШЭВІЧ**, шляхціц, 24 гады, арыштаваны ў ліпені 1864 г. за вярбоўку ахвотнікаў у партызанскія атрады. У снежні гэтага самага года быў высланы ў Томскую губерню (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 166. — S. 3).

**ЭЛЬСКАЯ САФІЯ БАГУСЛАВАЎНА**, памешчыца, сядзела ў Слонімскай турме з 1 жніўня 1863 г., абвінавачвалася ў забеспячэнні паўстанцаў харчаваннем і іншымі сродкамі (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 11, а. 58 адв.).

**ЮНГ ЮЗЭФ**, 50 гадоў, кіраўнік маёнтка Л. Валіцкага Вільянова. Прывозіў паўстанцам харчаванне. Зняволены ў Гродзенскай турме (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 83).

**ЮРОЎСКІ МІХАІЛ**, 52 гады, памешчык-уладальнік маёнткаў Закрэўшчына і Струпін. Адпраўлены на катаргу за дапамогу паўстанцам. Маёнткі канфіскаваны (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 83).

**ЯВАРОЎСКІ АНТОН**, уладальнік маёнтка Мішнікі, які быў канфіскаваны за дапамогу паўстанцам (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 83).

**ЯДКОЎСКІ ВІНЦЭНТЫ**, 45 гадоў, шляхціц з Гродзенскага павета, дастаўляў паўстанцам харчаванне. Арыштаваны ў верасні 1863 г. (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 167. — S. 3).

**ЯДКОЎСКІ ЮЛІЯН ІВАНАВІЧ**, дваранін, у 1863 г. меў 25 гадоў, абвінавачваўся ў забеспячэнні паўстанцаў харчаваннем, сядзеў у Ваўкавыскай турме з 15 лістапада 1863 г. (НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 14, а. 25 адв.).

**ЯДКОЎСКІ ЯН АТАНАЗЕВІЧ**, чыноўнік у адстаўцы, 44 гады, арыштаваны ў першыя дні паўстання, калі вяртаўся з Грандзіч, дзе збіраў складкі для паўстанцаў (Jodkowski J. Rok 1863... // Echo Grodzienski. — 1921. — № 167. — S. 3).

**ЯЖЭЎСКІ ФРАНЦ ФАМІЧ (ТАМАШАВІЧ)**, у 1863 г. меў 47 гадоў, мешчанін з в. Бендугі Бельскага павета. Збіраў з Паэўскім грошы і вопратку ў навакольных вёсках і завозіў 2 разы ў тыдзень у партызанскі атрад (НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 705, а. 77 адв.).

**ЯКАВЕЦ ІВАН**, селянін Беластоцкага павета, 23 гады. Прыцягнуты да следства ў жніўні 1863 г. Гродзенскай ваенна-следчай камісіяй за дастаўку харчавання (Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»... — С. 184).

**ЯКУБЕЛЬСКІ ВОЙЦЭХ**, 32 гады, дваранін Аўгустоўскай губерні, сакратар бургамістра м. Сапоцкін. Зняволены ў Гродзенскай турме ў лютым 1863 г. за агітацыю ўступаць у паўстанцкія атрады і супраціўленне рэкруцкаму набору (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 83; Смалянчук А. Гарадзенскія «мяцежнікі»...— С. 177).

**ЯТКОЎСКІ ВІКЕНЦІЙ**, 45 гадоў, шляхціц в. Грандзічы. Зняволены ў Гродзенскай турме за дастаўку правіянту паўстанцам (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 83).

**ЯЦУНСКІЯ, сям'я: ІОСІФ** (58 гадоў), ЮЗЭФА (54 гады), АЛЯКСАНДР (18 гадоў), сяляне в. Грабяні. Прывозілі паўстанцам харчаванне і фураж. Узяты сельскай грамадой на парукі (Буднік І. Да падзеяў 1863-64 гадоў... — С. 83).

# ДЭПАРТАВАНЫЯ СА ШЛЯХЕЦКІХ ВАКОЛІЦ У «АДДАЛЕНЫЯ ГУБЕРНІ РАСІІ»

Жыхары ваколіцы Шчукі Гродзенскага павета (знаходзілася ў Камянецкай воласці, недалёка ад Скідзеля) за дапамогу паўстанцам былі выселены з месца жыхарства, ваколіца спалена 24-25.07.1863 г., а зямля аддадзена ў казну згодна з прапановай гродзенскага губернатара ад 14(29).09.1863 г. Арыштаваных жыхароў Шчук трымалі пад вартай у Рубалаўскай карчме, а потым саслалі ў расійскія губерні[239]. Ніжэй прыводзіцца спіс дэпартаваных з выяўленымі на дадзены момант біяграфічнымі дадзенымі.

1. Шчука Іван (ці Ян), высланы ў Томскую губерню разам з сям'ёй. У 1875 г. атрымаў дазвол вярнуцца на Радзіму. Пераехаў спачатку ў Варшаву, праз паўтара гады — у маёнтак Дамакаўшчызна Гродзенскага павета, працаваў у Пуслоўскага. У 1891 г. жыў з 4 сынамі ў маёнтку Зарубічы Гродзенскага павета[240].

239 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 257; Радзюк А. Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў… – С. 156.

240 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 668; Радзюк А. Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў на Гродзеншчыне ў 1863 – 1864 гг. // Arche. – 2010. – № 12. – С. 173.

2. Шчука Сцяпан (Сямён), шляхціц, высланы ў Кастрамскую губерню разам з жонкай, 2 сынамі і 2 дачкамі. У 1874 г. атрымаў дазвол вярнуцца на радзіму. У наступным годзе жыў у Сувалкаўскай губерні[241].
3. Шчука Тадэвуш (Фадзей) Карлавіч, шляхціц, высланы ў Тамбоўскую губерню з жонкай, сынам і дачкой. Служыў на Гразе-Царыцынскай чыгунцы бар'ерным ахоўнікам. Трапіў пад пасажырскі цягнік 1.10.1870 г. каля Токараўскай станцыі Тамбоўскага павета[242].
4. Шчука Мікалай, высланы з жонкай, сынам, ягонай жонкай і дачкой у Арэнбургскую губерню.
5. Шчука Восіп, высланы з жонкай, 3 сынамі і 2 дачкамі ў Пермскую губерню.
6. Шчука Вікенці, высланы з сынам і дачкой у Аланецкую губерню. Жонка, бацька, брат і сястра, верагодна, збеглі.
7. Шчука Восіп Міхайлавіч, высланы з жонкай, 2 сынамі і дачкой у Наўгародскую губерню. У 1874 г. дазволена вярнуцца, але ў 1876 г. яшчэ знаходзіўся на месцы пасялення.
8. Шчука Станіслаў, высланы з жонкай і 2 сынамі ў Валагодскую губерню. Верагодна, пра гэтую сям'ю ўзгадваў Паўловіч, калі пісаў пра высылку бацькоў з двума сынамі 13-ці і 16-ці гадоў у вёску, якая знаходзіцца ў 40 км ад Тацьмы Валагодскай губерні[243].
9. Шчука Ігнат Францавіч, высланы з жонкай, 2 сынамі і дачкой у Самарскую губерню. Памёр у чэрвені 1864 г.
10. Шчука Вінцэнт, высланы з жонкай, 3 сынамі і дачкой у Саратаўскую губерню. Памёр 16.07.1879 г. у слабадзе Альхова Царыцынскага павета Саратаўскай губерні.
11. Шчука Мартын Восіпавіч, высланы з жонкай і сынам (яшчэ двое былі «ў адлучцы») у Пензенскую губерню. Памёр у 1871 г.
12. Шчука Станіслаў, высланы з жонкай, 2 сынамі і 2 дачкамі ў Кастрамскую губерню.
13. Шчука Разалія, удава, выслана з 2 сынамі і 4 дачкамі ў Самарскую губерню, нягледзячы на тое, што звар'яцела. Памерла пад час перасылкі ў г. Сурган Ніжагародскай губерні.

241 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 668; Радзюк А. Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў..., с. 173.

242 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 659.

243 Pawlowicz E. Wspomnienia. Nowogródek, więzienie – wygnane. Lwów, 1887. – S. 270.

14. Амбрусевіч (Амбрушэвіч) Ігнат, высланы з жонкай Мартынай у Арэнбургскую губерню. У 1880 г. яму было 70 гадоў, жыў у Арэнбургу і займаўся рамяством. У ліпені яму дазволілі вярнуцца дамоў, ён пасяліўся з жонкай у маёнтку Будоўля Гродзенскай губерні.
15. Амбрусевіч Антон, высланы з жонкай, сынам і дачкой, жонкай і дзецьмі старэйшага сына Сцяпана (сын і 2 дачкі) у Пермскую губерню[244].

Усяго з ваколіцы вёскі Шчукі выселілі 63 чалавекі ў складзе 12 сем'яў[245].

Ваколіца Яваpaўка Беластоцкага павета была спалена 18 жніўня 1863 г. за актыўнае садзейнічанне жыхароў паўстанцам. Яны арганізавалі сховішча на лодках, якія хаваліся на востравах рэк Супрасль і Нарва, перавозілі інсургентаў з Каралеўства Польскага ў Гродзенскую губерню і назад. Сяло мела 27 шляхецкіх двароў, 61 мужчынскую і 80 жаночых асобаў. Узяты пад арышт і ўтрымліваліся ў намётах у ваколіцах Беластока. Жывёла і рухомая маёмасць былі вывезены ў Беласток для продажу на аўкцыёне[246]. Экзэкуцыю ажыццяўлялі 3 узводы Новаінгерманландскага палка і 2 сотні казакоў. Яваpaўцы былі выселены ў Заходнюю Сібір, дзе на р. Енісей збудавалі Яваpaўку. Пазней іх перасялілі ў Краснаярск, а вёску залілі вадой.

На месца выселеных мясцовых жыхароў прывезлі рускіх пасяленцаў, у 1868 і 1869 гг. ім выдаткавалі грошы ў суме 1013 рублёў 14 S капеек для закупкі хлеба (верагодна, зярна для пасева). Была прадстаўлена да 1869 г. ільгота ў падатках, а 15.04.1870 г. з'явіўся ўказ Сената аб новых ільготах для рускіх перасяленцаў у паўночна-заходніх губернях[247].

У спісе высланых было 198 чалавек. В. Сліўоўска прыводзіць дакумент, у якім падаецца іншая лічба — 144 чалавекі ў складзе 33 сем'яў[248].

---

244 Радзюк А. Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў на Гродзеншчыне ў 1863-1864 гг // ARCHE. – 2010. – 12 (99). - С. 157, 169-172 (для № 4-15).

245 Powstanie styczniowe, 1863-1864. Walka i uczstnicy. Reprresje i wygnanie. Historiografja i tradycja. – Kelce: Wyd-wo Akademii Swietokrzyckiej, 2005. – S. 17.

246 Восстание в Литве и Белоруссии 1863–1864 гг. – М., 1965. – С. 378-379; Powerza P. Wspomnienia z Powstania Styczniowego 1863 roku. Testament moralny autora. – Białystok, 1996. – S. 103.

247 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 533; Радзюк А. Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў... – С. 157.

248 Powstanie styczniowe, 1863-1864. Walka i uczęstnicy. Represje i wygnanie. Historiografja i tradycja. – Kielce: W-wo Akademii Świetokrzyskiej, 2005. – S. 17.

1. Антановічы — 4 чал.
2. Багінскія — 11 чал.
3. Брасоўскія — 2 чал.
4. Хвейабвейнаўскія — 2 чал.
5. Яворскія — 117 чал.
6. Яруйскія — 3 чал.
7. Кулешы — 5 чал.
8. Лянчэўскія — 5 чал.
9. Плонскія — 6 чал.
10. Семяняка — 1 чал.
11. Сінільскія — 8 чал.
12. Вайнароўскія — 3 чал.
13. Войны — 8 чал.
14. Врачынскі — 1 чал.[249]

Некаторыя падрабязнасці даюць матэрыялы Гістарычнага архіва Омскай вобласці[250]. У спісе, прадстаўленым С. Мулінай, знаходзім наступныя прозвішчы.

1. Плонскі Павел, 56 гадоў, жонка Людвіка, 50 гадоў, 2 сыны і 1 дачка паселены ў Каінскай акрузе.
2. Явароўскі Матэвуш, 44 гады, жонка Юстына, 27 гадоў, сын і дачка паселены ў Томскай акрузе.
3. Явароўскі Станіслаў, 48 гадоў, жонка Мар'яна, 48 гадоў, 3 сыны і 1 дачка паселены ў Марыінскай акрузе.
4. Яварoўская Кацярына, удава, 50 гадоў, сын і 2 дачкі паселены ў Каінскай акрузе.
5. Кулеш Ян, жонка Разалія, 40 гадоў, сын і 2 дачкі паселены ў Томскай акрузе.
6. Багінскі Ян, 62 гады, жонка Францішка, сын і 3 дачкі паселены ў Марыінскай акрузе.
7. Явароўскі Юзэф, 55 гадоў, сын Пётр, 25 гадоў, паселены ў Каінскай акрузе.
8. Явароўскі Антоні, 55 гадоў, жонка Ганна, 40 гадоў, 3 дачкі

249 1863. Katalog miejsc pamieci powstania styczniowego w wojewodstwe Podlaskim. – Bialystok, 2013. – S. 35.

250 Муліна С. Удзельнікі паўстання 1863 г. з Заходняга краю ў заходнесібірскай ссылцы //Arche. – 2010. – № 12. – С. 265–266.

паселены ў Омскай акрузе.

9. Яվароўская Францішка, удава, 50 гадоў, сын і дачка паселены ў Ялатураўскай акрузе.
10. Яվароўскі Андрэй, 60 гадоў, жонка Мар'яна, 50 гадоў, 2 сыны і 2 дачкі паселены ў Томскай акрузе.
11. Яվароўскі Матэвуш, 43 гады, жонка Мар'яна, 33 гады, 2 сыны паселены ў Тарскай акрузе.
12. Яվароўскі Франц, 52 гады, жонка Альжбета, 40 гадоў, сын і дачка паселены ў Марыінскай акрузе.
13. Яվароўская Тэафіля, 50 гадоў, 2 сыны паселены ў Марыінскай акрузе.
14. Яվароўскі Станіслаў, жонка Разалія, 60 гадоў, дачка Магдалена, зяць Пётр Аншанаў, унук і 2 унучкі.

Згодна з рапартам вайсковага начальніка г. Пружан, з уездам маёра фон Кремера 8 (20) верасня 1863 г. ён акружыў ваколіцу Пеняшкі цепам пяхоты з казакамі яшчэ да світанку і прастаяў так да 9 гадзін. Калі прыйшлі сагнаныя з навакольных вёсак шляхта, памешчыкі і сяляне, тады вывелі гаспадароў ваколіцы і прачыталі ім прадпісанне вайсковага губернатара горада Гродна і Гродзенскага цывільнага губернатара № 3416. У ім гаварылася, што жыхары Пеняшкаў спачувалі паўстанцам, давалі ім харчаванне, неабходныя рэчы, не данеслі ўладам на паўстанцкі атрад, які на працягу двух тыдняў базаваўся каля Глыбокага Кута. За гэта яны падлягаюць арышту, а іх маёмасць і жывёла — канфіскацыі, зямля будзе падзелена паміж суседнімі сялянамі, а ваколіца будзе спалена[251].

Так і было зроблена. Ваколіцу падпалілі з усіх бакоў адначасова, маёмасць прадалі з аўкцыёнаў на месцы і ў Пружанах, зямлю аддалі сялянскаму Сухапольскаму таварыству, жыхароў трымалі пад арыштам у Пружанах. У імянным спісе жыхароў ваколіцы Пеняшкі налічвалася 40 чалавек[252].

251 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 31, с. 57, а. 3-3 адв., 10-11.
252 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 31, с. 57, а. 6-6 адв.

| Прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост | Месца высылкі |
|---|---|
| 1. Мілюшчук (Меляшчук) Юльян Матвееў, 45<br>*У яго сямействе:*<br>2. Канстанцін Матвееў, 40<br>3. Жонка яго Юзэфа, 30<br>4. Маці Юльяна Анэля, 65<br>5. Шпачанка Дамініка Кандрацьева, служка з сялян в. Явалава Сухапольскай воласці, 22<br>6. Сын яе Касьян, 6<br>7. Кавалевіч Якім Іванаў, батрак, селянін в. Слопілшчаў Ліпоўскай воласці, 20 | У Астраханскую губерню |
| 1. Бурачэўскі Андрэй Раманаў, 60<br>2. Жонка яго Францішка Францава, 40<br>3. Дачка Анэля, 3 тыдні<br>4. Брат Андрэя Марцін, 64 | У Самарскую губерню |
| 1. Цэбрусінскі Франц Францавіч, дваранін, 27<br>2. Жонка яго Францішка, 25<br>3. Сын Баляслаў, 5<br>4. Дачка Мальвіна, 2<br>5. Брат яго Іосіф Францаў, 25<br>6. Малюска Антон, батрак, селянін в. Гараднян Літоўскай воласці, 18<br>7. Міхаіл, пастух, селянін таго самага грамадства, 13<br>8. Маўрося, дзяўчына з Літоўскай воласці, 20 | У Самарскую губерню |
| 1. Сапер Мотэль, яўрэй, 49<br>2. Жонка яго Эстэрка Моўшаўна, 42<br>3. Сын Абрам, 17<br>4. Сын Шмуйло, жыве ў Пружанах з жонкай, 20<br>5. Дачка Перна, 8<br>6. Маці Таўба, 62 | У Томскую губерню |
| 1. Лерман Рахмель Беркавіч, 35<br>2. Жонка яго Сара, 35<br>3. Сын Янкель, 11<br>4. Сын Рэнок, 6<br>5. Дачка Хана, 13<br>6. Дачка Фейга, 3 тыдні | У Томскую губерню |

| Прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост | Месца высылкі |
|---|---|
| 1. Найман Гершка Беркавіч, 42<br>2. Жонка яго Златка, 40<br>3. Сын Засел, 5<br>4. Сын Гдал, 8<br>5. Дачка Гершка Рыўка, 23<br>6. Дачка Ромна, 20<br>7. Дачка Раана, 10<br>8. Дачка Лея, 8<br>9. Цацыпка Фоль Аранавіч, зяць Гершка, муж Рыўкі, 17 | У Табольскую губерню |

Названыя вышэй асобы трох першых па спісе сямействаў былі адасланы ў Гродна. Яўрэйскія сем'і пакінулі на месцы для высвятлення абставінаў — з прашэння свіслацкага яўрэя Шамеля Левіна стала вядома, што яўрэі ваколіцы Пеняшкі пасылалі сваіх да расійскіх вайскоўцаў з папярэджваннем пра паўстанцаў. З дакументаў больш позняга паходжання вядома, што сям'ю Мелешчука саслалі не ў Астраханскую, а ў Томскую губерню. Яўрэі Нейман і Лерман пасланы ва Уладзімірскія арыштанцкія роты Грамадзянскага ведамства на 2 гады з наступным пасяленнем на казённыя землі ў Сібіры. Сем'і Бурачэўскага і Цэбрусінскага пасяліліся ў Пермскай губерні. У 1868 г. апошні жыў ужо ў Царстве Польскім і прасіў дазволу прыехаць у Пружанскі павет для продажу сваёй зямлі (якая, як высветлілася, яму ўжо не належала)[253].

У верасні 1863 г. збіраліся выселіць жыхароў ваколіцы Фалькі. Прывядзем вытрымку з рапарта вайсковага начальніка Бельска і павета Барэйшы: «Знаходзячы зусім неабходным зрабіць прыклад высялення шляхты ваколіцы Фалькі, дзе безупынна фарміруюцца і хаваюцца больш ці менш значныя шайкі, пытаюся дазволу Вашага Правасхадзіцельства (вайсковага губернатара г. Гродна і Гродзенскага цывільнага губернатара. — В.Ш.) аб перасяленні ўсёй шляхты гэтых ваколіц у аддаленыя губерні, аб канфіскацыі прыналежачых гэтай шляхце зямель і перадачы часткі іх сямействам адстаўных салдат і сялянам, пацярпеўшым за адданасць ураду». У Фальках-Старых у той час было 1 цягла, 2 душы; у Фальках-Гадзебы — 2 цягла, 8 душаў; у Фальках-Філіпках — 2 цягла, 6 душаў[254].

253 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 31, с. 57, а. 15, 16, 47, 52, 62-62 адв., 69, 72.

254 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 372, а. 1а., 2а.

Адзін з жыхароў ваколіцы Лукавіца Бельскага павета, паўстанец, быў пасланы камандзірам атрада Б. Эйтміновічам да рускіх, як бы з даносам пра месцазнаходжанне атрада. Паўстанцы зрабілі засаду і 19.09.1863 г. знішчылі да 150 расійцаў. Вайсковы начальнік Бельскага павета Барэйша ў рапарце ад 11.09.1863 г. вайсковаму губернатару г. Гродна і гродзенскаму цывільнаму губернатару пісаў: «Неабходным лічу прасіць Вашага Правасхадзіцельства дазволу на спаленне ваколіцы Лукавіц, бо яна складае галоўную крыніцу густой крамолы ў давераным мне павеце, адкуль разліваецца па цэламу Бельскаму павету»[255].

Дазвол быў атрыманы, і Барэйша загадаў спаліць вёску. 30 казакоў з атрадаў палкоўніка Барэйшы і маёра Банецкага акружылі ваколіцу Лукавіца 20 верасня (2 кастрычніка) 1863 г., пяхота падышла ў 15 гадзін. Жыхары былі арыштаваны, пачалася канфіскацыя маёмасці. 23 верасня (5 кастрычніка) у 19 гадзін ваколіца была спалена ў прысутнасці памешчыкаў, шляхты, сялянства. Ад полымя было светла нават у Бельску, а спалоханыя сяляне в. Малешы сабраліся вакол свайго прыходскага святара, які патлумачыў ім ганебнасць учынкаў жыхароў Лукавіцы[256]. Каля тыдня жыхары былі пад арыштам у Бельску, куды звозілі і маёмасць жыхароў, а потым у Гродне. Адсюль па чыгунцы іх дастаўлялі ў Санкт-Пецярбург (усяго 130 чалавек), Вільню (усяго 21 чалавек)[257].

З Беластока палкоўнік Мантэнфельд дакладваў 9.10.1863 г. гродзенскаму губернатару генералу Скварцову: «Палкоўнік Барэйша паведаміў мне для данясення вам, што бельскі павятовы правадыр прыедзе ў Гродна 28 верасня (па новаму стылю 10 кастрычніка. — В.Ш.). Ваколіца Лукавіцы спалена. Вясковыя караўлы выстаўлены ў Пяткове, Войтках і Нараве»[258]. Маёмасць высланых жыхароў прадавалася з аўкцыёна[259]. У НГАБ у Гродне захаваўся дакумент пра продаж на аўкцыёне маёмасці жыхароў спаленай ваколіцы.

255 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 372, а. 2.
256 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 372, а.10 адв.-11.
257 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 372, а.115.
258 Powerza P. Wspomnienia z Powstania… – S. 103.
259 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 507, а. 1, 7, 8, 58.

## Торговый лист

### На продажу разного скота, хлеба и движимости, принадлежащей жителям Бельского уезда дер. Луковицы

Составлена 27 сентября 1863 года[260]

| № | Название предметов | На какую сумму продано | |
|---|---|---|---|
| | | серебром | |
| | | руб. | коп. |
| 1 | Лошадей пятнадцать штук | 225 | |
| 2 | Рогатого скота сто одиннадцать штук | 979 | 50 |
| 3 | Овец двести сорок пять штук | 245 | |
| 4 | Свиней сто тридцать штук | 339 | |
| 5 | Гусей двадцать девять штук | | |
| 6 | Ржи в зерне четырнадцать с половиной корца | 29 | |
| 7 | Пшеницы в зерне восемь корцов | 32 | |
| 8 | Ячменя в зерне три с половиной корца | 7 | |
| 9 | Овса в зерне один с половиной корцов | 9 | |
| 10 | Гороху два корца | 5 | |
| 11 | Льняного семени пять с половиной корцов | 22 | |
| 12 | Конопляного семени полукорца | 1 | |
| 13 | Чечевицы один корец и два гарнца | 1 | |
| 14 | Картофеля пятнадцать с половиной корца | 26 | |
| 15 | Капусты две тысячи головок | 15 | |
| 16 | Сала свиного два пуда | 8 | |
| 17 | Фасоли один корец | 3 | |
| 18 | Полотна семь кусков | 11 | |

260 Дата па старому стылю; НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 507, а. 32-32 адв.

| № | Название предметов | На какую сумму продано | |
|---|---|---|---|
| | | серебром | |
| | | руб. | коп. |
| 19 | Сена двадцать один воз | 63 | |
| 20 | Разной мебели | 89 | 84 |
| 21 | Разные хозяйственные снаряды | 146 | 48 |
| 22 | Сем кож | 23 | 70 |
| 23 | Овечьей шерсти | 19 | 50 |

А всего выручено с продажи 2306 78

На подлинном написано: Торги производил помощник Бельского уездного исправника Соболевский. При продаже находились Артиллерии Прапорщик Судзинский, Корнет Шишмаров.

С подлинным верно:

Судебный следователь (подпіс неразборлівы)

Акрамя таго, у іншай ведамасці паказаны продаж 4 кароў і 8 быкоў на суму 174 рублі. Разам гэта складае 2480 рублёў 78 капеек, але, па дадзеных гродзенскага губернатара, якія ён прадставіў у Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў, агульная сума з продажу на аукцыёне дасягала 3740 рублёў 65 j капеек[261]. Гэтыя грошы адпраўляліся ў Першы дэпартамент Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў, а пазней — губернатарам, на тэрыторыі якіх жылі дэпартаваныя, і раздаваліся ім пароўну. Пра тое, што грошы не заўсёды і не так хутка даходзілі да былых гаспадароў маёмасці, сведчыць перапіска чыноўнікаў розных расійскіх установаў, а таксама просьбы высланых аб прызначэнні ім дзяржаўнай дапамогі з прычыны беднасці.

Канфіскоўваліся ў дэпартуемых таксама землі:

- сядзібная — 17 дзес. 1957 саж.;
- ворная — 185 дзес. 1850 саж.;
- сенакосная — 16 дзес. 1328 саж.

261 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 507, а. 33, 82.

Усяго прыдатнай зямлі — 220 дзес. 335 саж.

- Лес — 186 дзес. 705 саж.
- Пад вуліцай і дарогай — 2 дзес. 1638 саж.
- Пад ракой — 850 саж.

Усяго прыдатнай і непрыдатнай — 409 дзесяцін 1128 сажняў, якія былі ў валоданні шляхты. Землі памерам у 10 дзесяцін былі выдзелены батракам маёнтка Пёткава, якія ліквідавалі пажар у мясцовым цэхгаўзе, падпаленым паўстанцамі: Ф.А. Свідэрскаму, А.П. Кушальчуку, Ф.Л. Астржыгала, мешчаніну г. Бельска О.П. Паплаўскаму, кучару В.К. Ігнатоўскаму. Кожнаму далі яшчэ па 4 дзесяціны лесу. Зямлю далі таксама сялянам суседніх вёсак Топчава, Валокі, Асаўкі, Лізы. Захаваўся толькі спіс асоб в. Топчава і Лізы, якім далі па 5 ці 10 дзесяцін зямлі: адстаўныя салдаты П.В. Карпіс, Л.С. Карпяшук, К.Я. Прыгода, П.Ф. Бараноўскі, М.А. Апушка, агароднікі А.М. Пржэсняк, В.В. Матысюк, К.В. Сідаровіч, В.І. Давыдзюк, К.В. Асташэўскі, Ф.І. Давыдзюк, П.І. Ксенжык, А.М. Аляшчук, удава А.Ф. Апушка (мужа Паўла паўстанцы павесілі)[262].

У імянным спісе высланых 13(25), па іншых дадзеных, 14(26) кастрычніка 1863 г. было 42 сям'і (29 дваранскіх, 1 салдатка, 1 служанка, 9 сялянскіх, 2 служачых памежнай аховы па акцызу)[263].

| 1-е сямейства выслана ў Самарскую губерню: | 2-е сямейства выслана ў Самарскую губерню: |
|---|---|
| 1. Плонская Паўліна, 30 | 1. Плонская Апалонія, 29, у шпіталі |
| 2. Плонскі Іосіф, 46 | 2. Плонскі Station |
| 3. Дачка Ганна, 12 | 3. Сыны: Аляксандр, 8, у шпіталі |
| 4. Сыны: Іван, 5 | 4. Рыгор, 2, у шпіталі |
| 5. Фердынанд, 3 | 5. Дачка Багуміла, 10 |
| 6. Сцяпан, 1 | |

262 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 372, а. 33, 34, 39.

263 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 507, а. 41-44; с. 372, а. 14-17 адв., 40, 60-62, 66, 115, 264.

| | |
|---|---|
| 3-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Шымборскі Шымон, 37<br>2. Шымборская Паўліна, 30, у шпіталі (нарадзіла 12.01 сына Франца)<br>3. Маці Малгажата, 55, у шпіталі<br>4. Сын Іван, 3, у шпіталі | 4-е сямейства пакінута ў павеце:<br>1. Удава Мар'яна Пекатоўская (Пекутоўская), 64<br>2. Дачка Анэля |
| 5-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Алендскі Франц Матвееў, 48<br>2. Жонка Тэафілія (Феафілія), 32<br>3. Сыны Уладзіслаў, 16<br>4. Карл, 3, у шпіталі<br>5. Фама, 1, у шпіталі<br>6. Дачка Елізавета, 6 | 6-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Пекутоўскі Сільверст, 60<br>2. Жонка Магдаліна, 58<br>3. Сын Іван, 28<br>4. Жонка яго Іосіфата, 29<br>5. Дачкі іх Ганна, 3<br>6. Кацярына, 1,5<br>7. Дачка Сільвестра Разалія, 10 |
| 7-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Шымборскі Іосіф, 59<br>2. Жонка яго Магдаліна, 46<br>3. Сыны: Іван, 18, у шпіталі<br>4. Антон, 15, у шпіталі<br>5. Дачкі: Пелагея, 21<br>6. Мар'яна, 12, у шпіталі | 8-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Тржэшчкоўская Дамініка, 35<br>2. Сын Міхаіл, 2<br>3. Дачка Брыгіда, 4 |

| | |
|---|---|
| 9-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Лучай Павел, 25<br>2. Маці яго Іасіфата, 50<br>3. Сястра Мар'яна, 12 | 10-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Алендскі Варфаламей, 60<br>2. Жонка Мозэлька (Маніла), 55<br>3. Сын Антон, 17 |
| 11-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Залеская Іасіфата, 32<br>2. Сыны: Міхаіл, 10<br>3. Баляслаў, 6<br>4. Рамуальд, 3<br>5. Дачкі: Багуміла, 14<br>6. Зоф'я, 12 | 12-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Алендскі Павел, 45<br>2. Жонка Апалонія, 35<br>3. Сын Уладзімір, 4 |
| 13-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Алендскі Франц, 42<br>2. Жонка Мар'яна, 40<br>3. Сын Іван, 12<br>4. Дачка Паўліна, 1 | 14-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Алендскі Міхаіл, 34<br>2. Жонка Паўліна, 25<br>3. Дачкі: Мар'яна<br>4. Ганна<br>5. Брат Міхаіла Іосіф, 30 |

| | |
|---|---|
| 15-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Плонскі Антон, 65<br>2. Жонка Антаніна, 60 | 16-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Алендскі Мар'ян, 32<br>2. Жонка Эмілія, 27<br>3. Сын Войцэх, 4<br>4. Дачкі: Караліна, 5<br>5. Багуміла, 1 |
| 17-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Залескі Іван, 70<br>2. Жонка Зузана, 60 | 18-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Маркоўскі Вікенці, 50<br>2. Жонка Кацярына, 40<br>3. Сыны: Іван, 22<br>4. Франц, 18<br>5. Матэўш, 16<br>6. Іосіф, 14<br>7. Аляксандр, 7<br>8. Дачка Багуміла, 4 |
| 19-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Пяркоўскі Міхаіл, 57<br>2. Жонка Мар'яна, 60<br>3. Сын Іван, 18 | 20-е сямейства выслана ў Астраханскую губерню:<br>1. Бржэзоўскі Іосіф, 70<br>2. Жонка Ганна, 50<br>3. Сын Валенцій, 20<br>4. Дачка Сабіна, 16<br>5. Пароўская Кацярына, удава, 35<br>6. Сын Фабіян, 1<br>7. Дачка Ганна, 4 |

| | |
|---|---|
| 21-е сямейства выслана ў Астраханскую губерню:<br>1. Фалькоўскі Іван, 47<br>2. Жонка Караліна, 40<br>3. Сыны: Андрэй, 16<br>4. Франц, 9<br>5. Дачкі: Мар'яна, 14<br>6. Эмілія, 4 | 22-е сямейства выслана ў Астраханскую губерню:<br>1. Алендскі Іван, 50<br>2. Жонка Элеанора, 35<br>3. Сыны: Іосіф, 13<br>4. Вікенцій, 4<br>5. Дачкі: Мар'яна, 0,5<br>6. Ганна, 7<br>7. Маці Івана Кацярына<br>8. Дачка Кацярыны Мар'яна, 20 |
| 23-е сямейства выслана ў Астраханскую губерню:<br>1. Дрангоўскі Франц, 69, у шпіталі<br>2. Жонка Кляра, 70 | 24-е сямейства выслана ў Астраханскую губерню:<br>1. Залескі Аляксандр, 25<br>2. Маці яго Тэкля (Фёкла), за яе хадайнічаў перад гродзенскім губернатарам Барэйша – 75- гадовую жанчыну прасіў аддаць сыну Францу ў Драгічын<br>3. Служанка Францішка |
| 25-е сямейства выслана ў Астраханскую губерню:<br>1. Маркоўскі Франц, 25<br>2. Брат Вікенцій, 20 | 26-е сямейства выслана ў Астраханскую губерню:<br>1. Лапінскі Андрэй, 36<br>2. Жонка Іосіфа (Юзэфа), 40<br>3. Дачкі: Аляксандра, 9<br>4. Ганна, 1<br>5. Маці Анэля, 57 |

| | |
|---|---|
| 27-е сямейства выслана ў Астраханскую губерню:<br>1. Хмялкоўскі (Ямялкоўскі) Кляменцій, 37<br>2. Брат Фама, 35<br>3. Маці іх Кацярына, 65<br>4. Сястра Ганна, 24 | 28-е сямейства выслана ў Астраханскую губ.:<br>1. Хмялкоўскі (Ямялкоўскі) Канстанцін, 33<br>2. Маці яго Вераніка, 67<br>3. Сёстры: Амелія (Анэля), 23<br>4. Міхаліна, 10 |
| 29-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Фалькоўскі Сцяпан, 83<br>2. Жонка Елісавета, 65<br>3. Сын Віктар,<br>4. Дачка Ганна, 23 | 30-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Урублеўскі Іван, 52<br>2. Жонка Мар'яна, 35<br>3. Сыны: Мацей, 9<br>4. Марцін, 0,5<br>5. Дачкі: Кацярына, 9<br>6. Багуміла |
| 31-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Завацкая Кацярына, удава, 60<br>2. Сын Іван, 10<br>3. Дачкі: Мар'яна, 24<br>4. Апалонія, 29<br>5. Сын апошняй Аляксандр, 5 | 32-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Завацкі Іван, 55<br>2. Жонка Францішка, 63<br>3. Сын Франц, 13 |
| 33-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. 1Завацкі Антон, 67<br>2. Жонка Кацярына, 61<br>3. Дачкі: Іосіфа<br>4. Ганна, 22<br>5. Сын Іосіфа – Фама | 34-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Бржэствіцкая Анастазія, удава, 52<br>2. Сын Ігнацій, 20 |

| | |
|---|---|
| 35-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Багінскі (Сашынскі) Іван, 57<br>2. Жонка Кацярына, 48<br>3. Сын Баніфацый, 16 | 36-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Свідэрскі Лаўрэнцій, 67<br>2. Жонка Мар'яна, 43 |
| 37-е сямейства, салдатка пакінута ў Бельскім павеце<br>1. Петрунчыкова (Петрынчыкова, Петрушчак) Кляра, 65<br>2. Сястра (? дачка) Аляксандра, 22<br>3. Дачка Аляксандры Тэафіля, 2 | 38-е сямейства пакінута ў краі:<br>1. Пржэбыльска Магдалена, у шпіталі<br>2. Служанка Міхала Будлеўскага, які ў Лукавіцах не быў і невядома дзе цяпер знаходзіцца |
| 39-е сямейства, дваранка пакінута ў краі<br>1. Васілеўская Петрунэля, дваранка, 23 | 40-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Руткоўская (Рушкоўская) Анастазія, сялянка, 40<br>2. Сыны: Фама, 10<br>3. Рыгор, 9<br>4. Дачка Анастазія, 5 |
| 41-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Міхалоўскі Адам, 55, казённы аб'ездчык памежнай аховы, калі на дзеючай службе, дык пакінуць у павеце<br>2. Жонка Ганна, 40<br>3. Сястра яе Кунігунда | 42-е сямейства выслана ў Самарскую губерню:<br>1. Сляднюк (Слядзюк) Фама, 43, адстаўны ўнтэр-афіцэр, казённы аб'ездчык памежнай аховы, калі на дзеючай службе, дык пакінуць у Бельску<br>2. Жонка Тэкля, 40<br>3. Сястра Тэклі Юзэфа, 25<br>4. Сын Юзэфы Іосіф |

У справе, з якой мы прывялі матэрыялы пра высланых, гаворыцца, што на падставе Высачайшага павялення ад 17.05.1867 г.

І. Бжэзоўскі, К. Пароўская, І. Фалькоўскі, І. Алендскі, Ф. Дрангоўскі, Ф. Маркоўскі, А. Лапінскі, К. Хмялкоўскі перасяліліся ў Царства Польскае (Ломжынская і Аўгустоўская губерні). У Самарскай губерні ў 1864 г. знаходзіліся І. Плонскі, Ст. Плонскі, Ш. Шымборскі, Ф. Матвееў, Алендскі, С. Пекутоўскі, І. Шымборскі, Д. Тракацоўская, П. Лучай, В. Алендскі, Ф. Алендскі, М. Алендскі, А. Плонскі, М. Алендскі, І. Залескі, М. Пяркоўскі, А. Руткоўскі, А. Міхалоўскі. Іх перасялілі потым у Пермскую губерню. У Енісейскай губерні жыў Ф. Алендскі[264].

Каб напалохаць мясцовае насельніцтва ў час новага пад'ёма паўстання, вясной 1864 г. у Каралеўстве Польскім 24.05.1864 г. была спалена вёска Прушанка-Баранка Бельскага павета, а жыхары высланы ў Сібір. На іх месца пасялілі рускіх каланістаў (на 1.09.1869 г. іх было 11 сем'яў — 64 чалавекі)[265]. Маёмасць высланых жыхароў прадавалася з аўкцыёна[266]. Выслалі наступных.

1. Боржым Рох Янавіч, шляхціц.
2. Война Казімір Янавіч, шляхціц.
3. Палятыла Пётр Францавіч, шляхціц.
4. Прушынская Агата, аднадворка, удава.
5. Прушынская Апалонія, шляхцянка, удава.
6. Прушынскі Войцэх Аўгустынавіч, аднадворац.
7. Прушынскі Тамаш Мартынавіч, шляхціц.
8. Прушынскі Ігнаці Вайцэхавіч, шляхціц.
9. Прушынскі Леанард Францавіч, шляхціц.
10. Прушынскі Пётр Якаўлевіч, шляхціц.
11. Прушынскі Францішак Янавіч, шляхціц.
12. Прушынскі Францішак Казіміравіч, шляхціц.
13. Прушынскі Ян Ігнацьевіч, шляхціц.
14. Прушынскі Ян Яцэнцавіч, аднадворац.
15. Умінскі Вікенці Янавіч, аднадворац.
16. Шмурло Міхал Варфаламеевіч, аднадворац.
17. Яблонскі Ян Мартынавіч, шляхціц[267].

264 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 507, а. 52, 53 аб., 85 адв.-86.

265 Радзюк А. Знішчэнне шляхецкіх ваколіцаў на Гродзеншчыне… – С. 166, 168; Powerza. – S. 103.

266 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 507, а. 7.

267 Муліна С. Удзельнікі паўстання 1863 г. з Заходняга краю ў заходнесібірскай ссылцы //Arche. – 2010. – № 12. – С. 265-268; НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 6, с. 22, а. 383.

Такім чынам выконвалася «сістэма Мураўёва». Спальванне шляхецкіх ваколіц і дэпартацыя жыхароў павінны былі вырашаць бліжэйшыя і перспектыўныя задачы. Спачатку запалохаць іншы шляхецкі элемент і адарваць яго ад паўстанцкага руху, а такім чынам пагасіць паўстанне. А на перспектыву ад шляхты адбіралі зямлю, маёмасць — падрывалі эканамічны стан («залезлі ў кішэню», як гаварыў Мураўёў), каб яна не магла фінансаваць будучыя паўстанні. Да таго ж на шляхецкія землі меркавалі завесці расійскіх землеўладальнікаў для таго, каб узмацніць «рускі элемент» у «Заходнім краі».

# ГРОДЗЕНСКІЯ АДРАСЫ ПАЎСТАНЦАЎ

Складзены па паказаннях паўстанцаў у Гродзенскай і Віленскай следчых камісіях (асабліва Э. Заблоцкага, Ю. Стравінскага, А. Гофмайстра)[268] і на падстве іншых крыніцаў і літаратуры, пазначанай у спасылках. Прадстаўлены на тэрыторыі Гродзенскай губерні (сённяшнія Гродзенская і Брэсцкая вобласці, Падляскае ваяводства Рэспублікі Польшча). Спіс утрымлівае толькі асобаў з кіруючага складу Гродзенскай цывільнай і вайсковай ваяводскай рэвалюцыйнай арганізацыі, камандзіраў паўстанцкіх атрадаў. Указаны месцы баёў, знаходак «Мужыцкай праўды».

## I. Горадня

**Месца нараджэння:**

- Пакубята Пётр Пятровіч — азёрскі акруговы начальнік у Гродзенскім павеце.
- Ягалкоўскі З. К. — акруговы начальнік Слонімскага павета.

**Аптэка Адамовіча, фарная** (Парадная пл., дом Фарнага касцёла, цяпер Савецкая пл., 4). Яе арандатар, гродзенскі аптэкар Шмідт Адольф быў удзельнікам падзеі 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначнай станцыі Гродна. На другім паверсе была падпольная друкарня.

268 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, воп. 1, с. 40; с. 40 а.

**Аптэка Дзічкоўскага.** Куроўскі Станіслаў Адамавіч, аптэкарскі вучань, быў удзельнікам падзеі 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначнай станцыі Гродна.

**Брыгіцкі мост праз чыгунку** ў раёне стыкоўкі сённяшніх вуліц Маркса і Будзёнага. Месца сустрэчы гімназістаў-паўстанцаў перад выхадам на чыгуначны вакзал 14 сакавіка 1863 г.

**Вуліца Ажэшкі, 19.** Месца жыхарства Людаміра Абрэмскага, ваяводскага касіра Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі[269].

**Вуліца Замкавая, д. Собаля.** Месца жыхарства ЛеакадзііВаліцкай у студзені 1862 г., якая знаходзілася пад сакрэтным паліцэйскім наглядам за спяванне польскіх патрыятычных песен і гімнаў[270].

**Вуліца Савецкая, 14.** У сённяшнім будынку Адміністрацыі Ленінскага райвыканкама ў 1863 г. знаходзіўся прытулак для жабракоў пры кляштары Св. Духа. Яго супрацоўнікаў абвінавацілі ў дапамозе паўстанцам і канфіскавалі будынак.

**Гатэль Ромера (вул. Савецкая, 23) на вул. Дамініканскай.** У красавіку ці маі (па новаму стылю) 1863 г. адбыўся сход чальцоў Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі па раскладцы падаткаў на памешчыкаў пад кіраўніцтвам С. Солтана. Спачатку сабраліся ў нумары Юндзіла, які тут жыў: Солтан, Камінскі, Багатка, князь Чацвярцінскі, Э. Заблоцкі. Юндзіл здаў сабраныя 3000 рублёў срэбрам ваяводскаму касіру Багатцы, Мілевіч схадзіў у сваю кватэру і прынёс 10-ы нумар газеты «Рух». Потым у другім нумары снедалі. За сталом сядзелі, акрамя вышэйназваных, Мілевіч, Каліноўскі, Ромер, Рэдых, Вайсятыч, Дашкевіч, Сільвястровіч. Прачыталі ўсім інструкцыі чальцоў арганізацыі і 10-ы нумар газеты «Рух»[271].

**Гімназія (вул. Савецкая, 6)** — месца вучобы ўдзельнікаў дэманстрацый, паўстанцаў, кіраўнікоў Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі:

---

269 Госцеў А. Спіс мемарыяльных мясцін горада Гродна, якія звязаны з жыццём і дзейнасцю выдатных асобаў // Гарадзенскі гадавік. – II нумар. – Гродна, 2013. – С. 110.

270 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1143, а. 20.

271 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 4-4 адв., 50, 80, 86, 88.

- Бріерэ дэ Мартэрэ Уладзіслаў Аляксандравіч, перапісчык у рэвалюцыйным ваяводскім бюро І. Геніўша;
- Жалкоўскі Уладзіслаў Людвігавіч, рэвалюцыйны начальнік Гродна пасля Ю. Руткоўскага;
- Заблоцкі Баляслаў Карлавіч, камісар Гродзенскага ваяводства пасля арышта брата Эразма;
- Заблоцкі Эразм Карлавіч, камісар Гродзенскага ваяводства;
- Каліноўскі Віктар-Атон, аказаў значны ўплыў на брата Кастуся[272];
- Лебель Віктар-Леў Севярынавіч, скончыў гімназію ў 1857 г., 10.08.1861 г. спяваў польскі гімн і пагражаў прыватнаму прыставу пальцам[273];
- Пансэт дэ Сандон Сабяслаў Восіпавіч, рэвалюцыйны начальнік Ваўкавыскага павета пасля Гліндзіча;
- Руткоўскі Юзэф Юзэфавіч, начальнік Гродна пасля арышта Цэханоўскага (30.07.1863 г.);
- Урублеўскі Сігізмунд Казіміравіч, перапісчык рэвалюцыйных папер пры Сільвярстовічу, начальніку Гродзенскага павета, з чэрвеня 1863 г. ваяводскаму.



*С. Урублеўскі*

14 сакавіка 1863 г. узброеныя гродзенскія гімназісты (да следства прыцягнуты 25 чалавек) на чале з начальнікам станцыі Л. Кульчыцкім няўдала спрабавалі выехаць на цягніку ў Парэчча, дзе іх чакаў брат Нарбута Баляслаў для таго, каб адвесці іх у атрад (прозвішчы гімназістаў глядзі ў нарысе «Паўстанцы Гродзенскай гімназіі»)[274].

Месца працы Навакоўскага Станіслава Максімільянавіча, настаўніка польскай мовы, які сярод гімназістаў праводзіў агітацыю да іх удзелу ў паўстанні і быў арыштаваны пасля падзеі 14 сакавіка 1863 г.

Гродзенскае губернскае праўленне (Дварцовая пл., 2), дзе ў розныя часы працавалі:

272 Кісялёў Г. Героі і музы: гісторыка-літаратурныя нарысы. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1982. – С. 119.

273 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 4, а. 1162, а. 7-8 адв., 11 адв.

274 Падрабязнасці гл.: Швед В.В. Слава пераможаным! / Швед В.В. Губернскі Гродна. – Гродна: РУПП "Баран. узбуйн. друк.", 2003. – С. 81-88.

- Баяроўскі Адам Цэлясфоравіч, памочнік начальніка Гродзенскага павета Я. Каменскага;
- Заблоцкі Эразм Карлавіч, служыў бухгалтарам будаўнічай і дарожнай камісіі, камісар Гродзенскага ваяводства;
- Ізбіцкі Баляслаў Якубавіч, удзельнік падзеі 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначнай станцыі Гродна;
- Лебель Віктар-Леў Севярынавіч, канцылярскі служачы з 11.1857 г., чына не меў. 10.08.1861 г. спяваў польскі гімн і пагражаў прыватнаму прыставу пальцам[275];
- Савашкевіч Канстанцін Іванавіч, агент рэвалюцыйнага начальніка Гродна Э. Заблоцкага;
- Сержпутоўскі Юзэфат Людвікавіч, рэферэнт касы (касір) Сакольскага павета;
- Уластоўскі Аляксандр Якаўлевіч,Ківаціцкі[276] акруговы ў Пружанскім павеце;
- Хамічэўскі Сільверст Вікенцьевіч, удзельнік падзеі 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначнай станцыі Гродна;
- Шыдлоўскі Адольф Андрэевіч, удзельнік падзеі 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначнай станцыі Гродна.

**Гродзенская казённая палата** (вул. Ажэшкі, 3, палац К. Максімовіча), дзе працавалі:

- Геніўш Ігнаці Ігнацьевіч, начальнік Гродзенскага рэвалюцыйнага бюро;
- Панятоўскі Міхаіл, захоўваў порах і кулі. Высланы ў Пензенскую губерню;
- Талочка Адольф Іванавіч, памочнік ваяводскага Э. Заблоцкага;
- Чачот Эдвард Ксавер'евіч, удзельнік падзеі 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначнай станцыі Гродна;
- Ягалкоўскі Захарый Купрыянавіч, акруговы начальнік Слонімскага павета.

**Гродзенская палата грамадзянскага суда**, дзе працавалі:

- Баяроўскі Юліян, удзельнік падзеі 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначнай станцыі Гродна;

275 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 4, а. 1162, а. 7-8 адв, 11-12.

276 Ківацічы – маёнтак у Пружанскім павеце.

- Белакоз Адольф Сцяпанавіч, начальнік Беластока;
- Кярсноўскі Эдвард, камандзір партызанскага атрада;
- Пакубята Пётр Пятровіч, азёрскі акруговы начальнік у Гродзенскім павеце;
- Руткоўскі Юзэф Юзэфавіч, начальнік Гродна пасля арышта Цэханоўскага (30.07.1863 г.);
- Юндзіл Франц Уладзіслававіч, паўстанцкі начальнік Слонімскага павета.

**Гродзенская палата дзяржаўных маёмасцяў** (у 1880 г. вул. Сенная, дом Каўфмана, 15), дзе працавалі:

- Абрэмскі Людамір (Любамір), касір рэвалюцыйнай арганізацыі Гродзенскага ваяводства;
- Высоцкі Міхаіл, удзельнік падзеі 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначнай станцыі Гродна;
- Галконд Антоній Янавіч, удзельнік падзеі 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначнай станцыі Гродна;
- Казімерскі Ян Мацэевіч, удзельнік падзеі 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначнай станцыі Гродна;
- Сянкевіч Рамуальд, у яго шафе, у гаспадарчым аддзяленні, знайшлі 37 экзэмпляраў «Мужыцкай праўды» (№ 3 і 5)[277].

**Гродзенская палата крымінальнага суда** (у 1880 г. пл. Сенная, дом Каўфмана, 15), дзе працавалі:

- Ляскоўскі Ігнацій Яцкавіч, парафіяльны начальнік Ваўкавыскага павета;
- Сержпутоўскі Юзэфат Людвікавіч, рэферэнт касы (касір) Сакольскага павета;
- Чачот Людвіг Ксавер'евіч, удзельнік падзеі 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначнай станцыі Гродна;

**Гродзенскі акруговы шпіталь** (вул. Ажэшкі, 9), дзе працаваў Маркевіч Іосіф Іванавіч, зборшчык падаткаў для Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі ў Гродзенскім павеце.

277 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 175.

**Гродзенскі губернскі будаўнічы камітэт.**

Тут працаваў Хаецкі Ю., які спяваў польскі гімн у Фарным касцёле 10.08.1861 г.



*Былы акружны шпіталь у Гродне*

**Гродзенскі дваранскі дэпутацкі сход** (вул. Савецкая, 19), дзе працавалі:

- Калупайла Фердынанд Ігнацьевіч, рэферэнт касы (касір) пры рэвалюцыйным начальніку Ваўкавыскага павета;
- Камінскі (Каменскі) Ян Юзэфавіч, Лунненскі акруговы начальнік і рэферэнт надзялення сялян зямлёй, затым начальнік Гродзенскага павета пасля Сільвястровіча;
- Ляскоўскі Ігнацій Яцкавіч, парафіяльны начальнік Ваўкавыскага павета;
- Пакубята Пётр Пятровіч, азёрскі акруговы начальнік у Гродзенскім павеце;
- Талочка Казімір Тамашавіч, удзельнік падзеі 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначнай станцыі Гродна.



*П. Пакубята*

**Гродзенскі прыказ грамадскай апекі** (Дварцовая пл., цяпер пл. Тызенгаўза), дзе працавалі:

- Багатка Франц, рэферэнт апекі і касіра Гродзенскага паўстанцкага ваяводства;
- Касмоўскі Канстанцін, сакратар апекі, які падазраваўся ў зборы грошай на карысць паўстання[278].

**Гродзенскі турэмны замак** (або астрог). З 1820 г. новы 2-павярховы будынак на тэрыторыі былога езуіцкага кляштара, а старая турма прыстасавана для патрэб новай[279] (цяпер вул. Кірава, 1). Тут сядзела большасць паўстанцаў, дапытваемых Гродзенскімі следчымі камісіямі па палітычных справах. Напрыклад, у ліпені-жніўні 1864 г. колькасць зняволеных дасягала 380 чалавек[280].

278 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 33, а. 9.
279 НГАБ у Гродне, ф. 8, воп. 13, с. 329, а. 7 адв.
280 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 13, с. 1399, а. 160 адв.

Тут былі зняволены наступныя асобы з кіраўніцтва паўстаннем:

- Абрэмскі Людамір (Любамір), касір рэвалюцыйнай арганізацыі Гродзенскага ваяводства;
- Ромер Севярын, рэвалюцыйны касір і рэферэнт казны Гродзенскага павета;
- Рэдых Емяльян Восіпавіч, індурскі акруговы начальнік;



*С. Урублеўскі*

- Сільвястровіч Станіслаў Янавіч, начальнік Гродзенскага павета, з чэрвеня 1863 г. — ваяводскі на 4 паветы: Гродзенскі, Сакольскі, Ваўкавыскі і Слонімскі;
- Урублеўскі Сігізмунд Казіміравіч, чалец рэвалюцыйнага бюро;
- Цэханоўскі Цэлясцін Міхайлавіч, у сакавіку (ці студзені) — ліпені 1863 г. быў паўстанцкім начальнікам Гродна;
- Ягалкоўскі Захарый Купрыянавіч, акруговы начальнік Слонімскага павета[281].

**Дом Абрэмбскіх** (вул. Ажэшкі, 19). Гаспадар — Максімільян Абрэмбскі — сын Людаміра Абрэмбскага, буйнога землеўладальніка, які падтрымаў паўстанне, за што быў высланы ў Сібір.



*Дом Абрэмбскіх у Гродне*

**Дом Э. Ажэшкі** (вул. Ажэшкі, 17). Тут яна жыла ў 1894-1910 гг., а дом пабудаваў яе муж С. Нагорскі ў 1860-1870 гг. Была звязана з атрадам Р. Траўгута, які дзейнічаў на тэрыторыі Гродзенскай губерні.



*Дом Элізы Ажэшкі ў Гродне*

**Дом брыгітак на вул. Купецкай** (вул. К. Маркса), тут жыў У.Л. Жалкоўскі, рэвалюцыйны начальнік Гродна пасля Ю. Рут-коўскага.Жылы корпус далучаны да паўночна-заходняй сцяны касцёла. У 1842 г. выйшаў загад аб касацыі кляштара Св. Брыгіты ў Гродне[282].

281 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 13, с. 1399, а. 159 адв.

282 Вашкевіч, А. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы // Гарадзенская бібліятэка. – Гродна- Вроцлаў: Wroclawska drukarnia naukowa PAN, 2012. – С. 223-224.

**Дом Дзінясевіча** — апошняе гродзенскае месца жыхарства Солтана Станіслава Станіслававіча, актыўнага дарадцы кіраўніцтва рэвалюцыйнай арганізацыі. Тут бываў В.-К.С. Каліноўскі[283].

**Дом земскага суда.** Адно з гродзенскіх месцажыхарстваў Солтана Станіслава Станіслававіча, актыўнага дарадцы кіраўніцтва рэвалюцыйнай арганізацыі.

**Дом Кузміцкіх на вул. Дамініканскай**, жыў Штарк Ян Антоніевіч, рэдактар «Гродненских губернских ведомостей», сябра Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі, магчыма, друкар «Мужыцкай праўды»[284].

**Дом прытулка для жабракоў пры кляштары Св. Духа** (вул. Савецкая, 14). Работнікаў прытулка абвінавацілі ў дапамозе паўстанцам і канфіскавалі будынак. Сёння тут знаходзіцца Адміністрацыя Ленінскага раёна горада[285].

**Дом Сакалоўскага на вул. Палявой**, жыў Штарк Ян Антоніевіч, рэдактар «Гродненских губернских ведомостей», сябра Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі, магчыма, друкар «Мужыцкай праўды».

**Дом Сідранскага на вул. Брыгіцкай** (К. Маркса). 3 мая 1863 г. жыў К.М. Дашкевіч, крынскі акруговы начальнік у Гродзенскім павеце[286].

**Дом Стасюлевіча на Раскошы**, жыў Штарк Ян Антоніевіч, рэдактар «Гродненских губернских ведомостей», сябра Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі, магчыма, друкар «Мужыцкай праўды».

**Дом Стоцкага на вул. Гараднічанскай**, 20. Жыў Маркевіч Іосіф Іванавіч, зборшчык падаткаў у Гродзенскім павеце.

---

283 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 50.

284 Тут і ніжэй прыведзены адрасы Штарка, дадзеныя па: ЛДГА, ф. 1248, с. 1240, а. 31.

285 Крой А., Буднік І., Хільмановіч У. Шляхамі паўстанцаў 1863-1864 гг. // Горад Святога Губерта: альманах локальной истории. – Вып. VII. – Гродно: Гродненская библиотека, 2013. – С. 139.

286 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 145.



Дом Фукса ў Гродне

**Дом Фукса на вул. Дамініканскай**, ці з 1864 г. Саборнай (вул. Савецкая, 5, 7), насупраць гімназіі, у двух пакоях на другім паверсе жыў да пачатку мая 1862 г. і са снежня 1862 г. па верасень 1863 г. Мілевіч Ільдэфонс Юр’евіч, перапісчык рэвалюцыйных папер пры ваяводскім начальніку Э. Заблоцкім, а з верасня — пры камісары Літвы Каліноўскім. Тут жылі «ў адных сенях» Сільвястровіч, начальнік Гродзенскага павета, а пазней ваяводскі, і Геніўш, начальнік рэвалюцыйнага бюро. Яшчэ адзін жыхар — Талочка Адольф Іванавіч, памочнік ваяводскага Э. Заблоцкага. У двары гэтага дома жыў пад час працы ў Гродне Ягалкоўскі Захары Купрыянавіч, будучы акруговы начальнік Слонімскага павета. У чэрвені 1863 г. Каліноўскі сустракаўся тут з Заблоцкім.

**Дом Цвікевіча на вул. Брыгіцкай**, жыў Штарк Ян Антоніевіч, рэдактар «Гродненских губернских ведомостей», сябра Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі, магчыма, друкар «Мужыцкай праўды».

**Дом Янкоўскіх на вул. Ржонсніцкай**, жыў Штарк Ян Антоніевіч, рэдактар «Гродненских губернских ведомостей», сябра Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі, магчыма, друкар «Мужыцкай праўды».

**Друкарня губернскага праўлення** (Дварцовая плошча, дом казённы, 2). Тут працавалі друкары Блашынскі Станіслаў Кантаравіч і Янкоўскі Караль Станіслававіч, удзельнікі справы 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначным вакзале Гродна. Рэдактар «Гродненских губернских ведомостей» Ян Антоніевіч Штарк падазраваўся ў друкаванні «Мужыцкай праўды».

**Заезны дом каля кляштара на вул. Маставой.** Тут часам спыняліся С. Сангін і В.-К. Каліноўскі. Напрыклад, у студзені 1863 г., калі прызначылі Геніўша на пасаду начальніка бюро арганізацыі.

**Кандытарская Кантляра.** Адбываліся сустрэчы чальцоў канспірацыйнай арганізацыі для перадачы карэспандэнцыі[287].

**Канцылярыя гродзенскага губернатара** (Дварцовая пл., 1, знаходзілася ў палацы Тызенгаўза, на месцы якога ў гарадскім парку стаіць помнік і гарыць Вечны агонь). Тут працавалі:

- Высоцкі Юзэф Міхайлавіч, удзельнік падзеі 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначнай станцыі Гродна;
- У.Л. Жалкоўскі, рэвалюцыйны начальнік Гродна пасля Ю. Руткоўскага.

**Канцылярыя гродзенскага правадыра дваранства** (магчыма, Савецкая, 19). Тут працаваў Тарасовіч (Тарасевіч) Уладзіслаў Геранімавіч, рэферэнт апекі ў Ваўкавыскай рэвалюцыйнай арганізацыі. Правадыром дваранства Гродзенскага павета з 12.08.1862 г. быў Севярын Ромер, рэвалюцыйны касір і рэферэнт казны.

**Касцёл Бернардзінскі.** Настаяцелем у 1860-х гг. быў Аляксандр Гінтаўт, які ўзяў на парукі арыштаванага ксяндза Т. Гадлеўскага.

**Касцёл Святога Францішка Ксаверыя (Фарны).** Сімвалічны помнік паўстанцам — мемарыяльная дошка, прысвечаная братам Зыгманту і Эдварду Урублеўскім. У дворыку паміж Фарай і аптэкай на другім паверсе знаходзілася канцылярыя Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі.

**Кляштар кармелітаў** (вул. Маставая, 37). Тут утрымліваліся арыштаваныя паўстанцы, іх сваякі.


*Былы кармеліцкі кляштар*

**Кляштар Пабернардзінскі** (вул. Парыжскай Камуны, 1). У 1853 г. кляштар быў зачынены дзяржаўнай уладай з прычыны малой колькасці манахаў. Жылыя карпу-

287 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 156.

сы знаходзіліся пры паўднёвай сцяне касцёла[288]. Відаць, іх здавалі пад жыллё. Тут жыў Руткоўскі Юзэф Юзэфавіч, начальнік Гродна пасля арышта Цэханоўскага (30.07.1863 г.). Вось як выглядала месцажыхарства па паказаннях У.Л. Жалкоўскага: «...уваход унізе са двара ў калідор прама, пасля направа лесвіца, праз якую ўваход таксама і на хоры, з лесвіцы калідорам налева, пасля іншым калідорам таксама налева, на якім па правай руцэ першыя дзверы ў прыбіральню, другія не ведаю куды, а ў трэціх дзвярах кватэра Руткоўскага, якая складаецца з трох невялікіх пакояў, адзін з увахода з калідора, і адзін направа, а другі налева, у правым пакоі была гасціная, дзе стаяла канапа, стол перад канапай і чатыры крэслы, у левым пакоі была спальня, стаялі ложак, шафа і вешалка для вопраткі..». Верагодна, тыя другія дзверы вялі ў кватэру Ц.М. Цэханоўскага. А ў названую прыбіральню Жалкоўскі выкінуў пячатку Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі[289].

**Кляштар францысканцаў** (вул. Агародная, 2). Тут сядзелі арыштаваныя святары, якіх падазравалі ў падтрымцы паўстання.

**Мост брыгіцкі праз чыгунку** (вул. К. Маркса, Будзёнага). Адзін са зборных пунктаў гімназістаў, якія збіраліся 12.03.1863 г. выехаць у паўстанцкі атрад Л. Нарбута.

**Мост чыгуначны праз Нёман** (вул. Падольная). У паўстанні прымалі ўдзел многія чыгуначнікі, будаўнік маста — С. Шпольц.

**Пабернардзінскія могілкі** (вул. Прыгарадная). Па праваму боку ад увахода знаходзіцца магіла з надмагільнай плітой Элізы Ажэшкі, удзельніцы паўстання. Яна прызнавалася, што падзеі 1863-1864 гг. аказалі значны ўплыў на станаўленне яе як пісьменніцы.107

**Паезуіцкі комплекс пабудоў** (вул. К. Маркса, Кірава, Савецкая пл.). У нейкім будынку на другім паверсе засядалі ваенна-следчыя камісіі па палітычных справах[290]. У доме паезуіцкага касцёла ці будынку насупраць (аптэцы) на дру-

288 Вашкевіч, А. Біяграфія гарадзенскіх вуліц… – С. 254-255.

289 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 164, 164 адв.; воп. 3, с. 1, а. 554 адв.

290 Радзюк А. Чалавек за кратамі: гарадзенскія турмы і вязні ў XIX ст. // Гарадзенскі палімпсэст. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI-XX ст. – Мн.: Выдавец З. Колас, 2011. – С. 299.

гім паверсе знаходзілася падпольная канцылярыя Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі[291].



*Фарны касцёл у Гродне*

**Пакармеліцкі кляштар** (вул. Мастовая, 37). У 1843 г. кляштар кармелітаў быў скасаваны і перададзены вайсковаму ведамству, часта выконваў ролю пенітэнцыярнай установы. 3.03.1863 г. з турэмнага замка сюды перавялі 48 цывільных арыштантаў, а пазней пераводзілі і палітычных[292]. Тут знаходзіліся пад следствам Баяроўскі Адам Цэлясфоравіч, памочнік начальніка Гродзенскага павета Я. Каменскага і Дашкевіч Конрад Міхайлавіч, крынскі акруговы начальнік у Гродзенскім павеце.

**Палац Чацвярцінскага** (вул. Ажэшкі, 20). Князь Чацвярцінскі Георгій (Юры) Канстанцінавіч дапамагаў паўстанцам: у ходзе следства прызнаўся, што даў касіру Гродзенскага паўстанцкага ваяводства Ф. Багатку 120 рублёў срэбрам. Прысутнічаў на сходзе ў гатэлі Ромера па раскладцы падатка на памешчыкаў для падтрымкі паўстання.



*Стары Замак у Гродне*

**Стары замак.** Губернскі архітэктар Хярсонскі рапартам ад 13(25).1864 г. даносіў аб зробленых прыстасаваннях у Старым замку і ў летнім шпіталі для ўтрымання там палітычных злачынцаў. Былі пабелены столь і сцены, устаўлены шыбы ў вокны[293]. У часовы астрог былі ператвораны казармы. У іх утрым-

291 Дрозд С. Нашы гістарычныя карані: па слядах К. Каліноўскага // Гарадзенскія запісы. – Вып. 1. – Гародня, 1993. – С. 92.

292 Вашкевіч, А. Біяграфія гарадзенскіх вуліц… – С. 234.; Радзюк А. Чалавек за кратамі… – С. 297.

293 НГАБ у Гродне, ф. 8, воп. 1, с. 1041, а. 3-3 адв.; ф. 1, воп. 1, с. 1374, а. 7.

ліваліся паўстанцы, якія чакалі суда, або перасыльныя з іншых губерняў. Напрыклад, 1 лістапада 1863 г. тут размясцілі 136 чалавек з Аўгустоўскай губерні[294].

**Чыгуначны вакзал.** Каля 100 чалавек (да следства прыцягнуты 73 чалавекі) 14 сакавіка 1863 г. на чале з начальнікам станцыі Л. Кульчыцкім няўдала спрабавалі выехаць на цягніку ў Парэчча, дзе іх чакаў брат Нарбута Баляслаў для таго, каб адвезці іх у атрад. Выехаць здолелі толькі 7-8 чалавек[295]. У 1994 г. была адчынена драўляная мемарыяльная табліца з крыжам (аўтары У. Панцялееў, Ю. Мацко, А. Капцюга).

## II. Гродзеншчына

**Азёры, мястэчка Гродзенскага павета.** 22 кастрычніка 1861 г. у касцёле мястэчка пад час свята Ружанцовага служачыя чыгункі спявалі гімн[296].

Гаспадар мястэчка Валіцкі Леапольд Янавіч аказваў дапамогу паўстанцам харчаваннем, вопраткай, фуражом, купляў зброю для атрада Лянкевіча.

25 мая 1863 г. тут адбыліся баявыя сутычкі паміж паўстанцамі на чале з А. Лянкевічам і ўрадавымі войскамі. 25 ліпеня — новы бой паўстанцаў А. Лянкевіча і А. Парадоўскага. На старых каталіцкіх могілках знаходзіцца месца пахавання паўстанцаў. Тут стаяць 5 драўляных крыжоў і мураваны пастамент у выглядзе алтара, на якім ёсць надпіс на польскай мове «Магіла паўстанцаў 1863 г.». Пастаўлены ў 1889 г., адрэстаўраваны ў 2012 г.[297]

**Алекшыцы,** вёска ў Ваўкавыскім павеце І.С. Завістоўскага, у якой яго пляменнік Люцыян Дамінікавіч Завістоўскі ў маі 1863 г. прымаў К. Каліноўскага і Э. Заблоцкага, якія інспектавалі Гродзенскую арганізацыю[298].

---

294 Радзюк А. Чалавек за кратамі: гарадзенскія турмы і вязні ў XIX ст. // Гарадзенскі паімпсэст. 2010. Дзяраўныя і сацыяльныя струтуры XVI – XX ст. Мн.: Зміцер Коласб 2011. – С. 299.

295 Падрабязнасці гл.: Швед В.В. Слава пераможаным! // Губернскі Гродна. – Гродна: РУПП "Баран. узбуйн. друк.", 2003. – С. 81-88.

296 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1111, а. 40-40 адв.

297 Pozecki J. Gloria Victis. 1863-1864. W 150-ta Rocznice Powstania Styczniowego. – Grodno, 2013. – S. 19-20.

298 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 53 адв.-54.

**Багатырэвічы.** Побач вёскі, на ўзвышшы ў Мінавіцкім лесе, знаходзіцца агульная магіла 1863 г.

**Баяры,** вёска ў Ваўкавыскім павеце. Баявая сутычка паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі 15 чэрвеня 1863 г. Бой 7 жніўня.

**Беласток,** цэнтр павета. У 1861-1862 гг. у Беластоцкім касцёле адбываліся жалобныя малебны і спевы патрыятычных песен. Месцажыхарства Баляслава Шварцэ — арганізатара Беластоцкай рэвалюцыйнай арганізацыі. Пэўны час пад прозвішчам «Чарнецкі» тут жыў і дзейнічаў Каліноўскі. У доме доктара Зубербіра на вул. Баярскай, у доме паміж казначэйствам і вул. Млыновай, жыў вайсковы ваявода Духінскі. У ім бывалі Урублеўскі, Гафмайстар, Каліноўскі. Некаторыя даследчыкі лічаць, што ў Беластоку знаходзілася паўстанцкая друкарня, у якой выдаваліся беларускія газеты і адозвы (у тым ліку «Мужыцкая праўда»[299]). У горадзе кватараваў Лібаўскі пяхотны полк, з якога 12.04.1863 г. збеглі да паўстанцаў і сталі камандзірамі атрадаў: Баранцэвіч Антоній Казіміравіч, Брант Уладзіслаў Казіміравіч, Роман Апалінарый Францавіч, Эйтміновіч Багуслаў Антон Францавіч, Эйтміновіч Юліян Францавіч. У Беластоку быў расстраляны Ян Канопка[300].

У Беластоцкай гімназіі вучыліся:

- Алдакоўскі Напалеон Паўлавіч, рэвалюцыйны начальнік Беластоцкага павета (павятовы);
- Бірфрэйнд Юліян Вільгельмавіч, урач у партызанскіх атрадах Урублеўскага, Эйтміновіча, Акінчыц Station Станіслаў Тадэвушавіч, камандзір стралецкай роты ў атрадзе Стравінскага;
- Казлоўскі Ян-Ігнацій, адзін з кіраўнікоў патаемнай рэвалюцыйнай арганізацыі ў Вялікай Бераставіцы;
- Лапінскі Ян Францавіч, які займаўся перасылкай паўстанцкай карэспандэнцыі;
- Канстанцін Магільніцкі, Цэзары Война, Леапольд Дамброўскі, Карл Рыхтар, Дамінік Паплаўскі, Каспер Слуцкі выключаны з гімназіі за антыўрадавыя патрыятычныя дзеянні 21 красавіка (3 мая) 1862 г.[301]

299 Кісялёў Г. Каліноўскі знаёмы і незнаёмы // Полымя. – 1993. – № 6. – С. 222.

300 Радзюк А. Рэпрэсіўная палітыка царызму на беларускіх землях у 1863-1864 гг. // ARCHE. – 2010. – № 12. – С. 146.

301 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1135, а. 46, 46 адв.

**Белін**, вёска і маёнтак Кобрынскага павета. Баявыя сутычкі паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі 26 мая 1863 г.

**Берасцянка**, вёска Бельскага павета. 3 мая 1863 г. адбылася сутычка паміж паўстанцамі і ўрадавым войскам.

**Божыдар**, маёнтак у Кобрынскім павеце (цяпер Драгічынскі раён). Эліза Ажэшка і Стэфанія Жук стварылі часовы шпіталь для паўстанцаў[302].

**Боркі**, вёска Кобрынскага павета (Баландзічы, Бялінскі лес, Боркі, Дзярэвін, Адрыжын). Баявыя сутычкі паміж партызанамі і ўрадавымі войскамі 17, 21 і 25 мая, 26 чэрвеня, 7 кастрычніка 1863 г.

**Боцкі**, мястэчка Бельскага павета. Баявая сутычка паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі 20 верасня 1863 г.

**Брэст**, цэнтр павета. У 1861-1862 гг. у мясцовым касцёле адбываліся патрыятычныя спевы. Места нараджэння Апалона Паўлавіча Гафмайстра, які кіраваў Брэсцкім, Кобрынскім, Пружанскім і Бельскім паветамі, якія ўтваралі Паўднёвае ваяводства. Ваявода знаходзіўся ў Брэсце[303]. У карчме купца Глухоўскага ў красавіку 1863 г. адбылася сустрэча А. Гафмайстра з гродзенскім камісарам Чарноцкім (В.-К. Каліноўскім), які спыняўся часам у гатэлі Пажэжынскага[304]. 23.12.1863 г. у крэпасці Брэст-Літоўск былі павешаны сяляне А. Чарко, Ю. Баліч, а 28.12.1863 г. — мешчанін Я. Корсак за ўдзел у паўстанні[305].

Пасля Гафмайстра ваяводам быў Пянькоўскі. 10.12 — баявая сутычка паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі. Сакратаром Брэсцкага магістрата служыў Бартноўскі Франц, зборшчык грошай па Брэсцкім павеце.

302 Мельнікава З. “Універсітэты майго жыцця”: Эліза Ажэшка і Берасцейшчына // Славянскія мовы, літаратуры і культуры: этнас у святле гісторыі і сучаснасці: зб. навук. прац / рэд. С. Мусіенка. – Гродна: ГрДУ, 2003. – С. 67.

303 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 103; Ковкель И.И. Гродненская революционно-демократическая организация // Гродно: энцикл. справочник. – Минск: БелСЭ, 1989. – С. 158-159.

304 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40 а, а. 49, 68.

305 Русско-польские революционные связи: материалы и документы. – Т. II. – М.: АН СССР, 1963. – С. 511-512.

**Бяроза**, мястэчка. 12 мая 1863 г. паўстанцы напалі на заставу, зьнішчылі шлагбаўм, забралі казённыя грошы, дакументы, затрымалі абоз з 40 фурманак. 20.06 адбылася баявая сутычка паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі.

**Бярозавае Балота**, урочышча Слонімскага павета. Баявая сутычка паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі 20 ліпеня 1863 г.

**Валілы**, вёска Беластоцкага павета. Вялікая сутычка атрадаў В.Урублеўскага і А. Духінскага з моцным урадавым войскам 29 красавіка 1863 г. На месцы бою знаходзяцца брацкая магіла і каменны абеліск.

**Ваўкавыск**, павятовы горад, цэнтр гарадской і павятовай рэвалюцыйнай арганізацыі. Начальнік горада Ваўкавыска, а затым — ваўкавыскі павятовы начальнік — Мушынскі Юзэф. Начальнікамі Ваўкавыскага павета былі ўрачы М. Гліндзіч і С.В. Пансэт дэ Сандон. Вайсковым начальнікам Ваўкавыскага павета быў Станіслаў Завістоўскі, якога пакаралі ў Ваўкавыску 10(22).07.1864 г. На вайсковых могілках, справа ад помніка польскім вайскоўцам, забітым пад час ваенных падзей 1918-1920 гг., у 1995 г. усталявалі драўляны крыж з косамі, на якім стаіць дата «22.01.1863 г.» Падобны крыж быў на магіле Завістоўскага на вул. Гродзенскай (цяпер скрыжаванне вуліц Панковай і Чкалава). З левага боку знаходзіцца пахаванне паўстанца з атрада Крука Фелікса Бердэцкага[306].

**Вайнавец**, вёска Сакольскага павета. Казённы селянін Казімір Станкевіч распаўсюджваў «Мужыцкую праўду»[307].

**Віцькі**. Цяпер Гродзенскі раён. У «Канюхоўскім рове», які знаходзіцца каля вёскі, паўстанцы мелі кузню і кавалі коней. Пасля бітвы тут пахавалі забітых паўстанцаў. Мясцовае насельніцтва знаходзіла тут косткі[308].

306 Pozecki J. Gloria Victis. 1863-1864… – С. 28.

307 Кісялеў Г. З думаю. – С. 24, 27; Смирнов А.Ф. “Мужыцкая праўда” // Восстание 1863 г. и русско-польские революционные связи 60-х годов. М.: АН СССР, 1960. – С. 50; Гродно: энцикл. справ. – С. 280.

308 Дрозд С. Нашы гістарычныя карані: па слядах К. Каліноўскага // Гарадзенскія запісы. – Вып. 1. – Гародня, 1993. – С. 90.

**Высока-Літоўск**, мястэчка, у якім пражываў пасля выключэння з Беластоцкай гімназіі ўдзельнік выступлення 3 мая 1862 г. Карл Рыхтар[309].

**Вялікая Бераставіца**, маёнтак Гродзенскага павета. К. Каліноўскі пабываў тут праз два тыдні пасля Вялікадня ў 1862 г.[310] Тут нарадзіўся і працаваў землямерам Ф. Ражанскі, чалец Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі, выдавец «Мужыцкай праўды». Пасля вяртання з ссылкі памёр Жук Ян Юзэфавіч, удзельнік падзеі 14 сакавіка 1863 г. на чыгуначнай станцыі Гродна.

**Вялікае Балота**, Ваўкавыскі павет. Бой 27 ліпеня 1863 г.

**Вялікія Яшвілі**, вёска Беластоцкага павета. Бой 2 красавіка 1863 г.

**Вярэйкі**, маёнтак Біспінга Аляксандра Камільевіча ў Ваўкавыскім павеце, які прымаў Э. Заблоцкага і В.-К. Каліноўскага пад час іх паездкі ў маі 1863 г.[311]

**Гавенавічы**, маёнтак у Слонімскім павеце Свяжынскага Станіслава Антонавіча, які прымаў у сябе Э. Заблоцкага і Каліноўскага пад час іх паездкі па паветах у маі 1863 г., даў ім коней (май 1863 г.). У в. Заполле, якая належала маёнтку, наведвалі партызанскія атрады: адзін раз, калі збіраліся пад Мілавідамі, забралі 6 коней, а ў другі раз прывялі да прысягі сялян вёскі[312].

**Газна**, маёнтак у Бельскім павеце. Тут з сярэдзіны 1863 г. жыў і працаваў Вайсятыч Юзэф (Восіп) Цітавіч, вайсковы рэферэнт Гродзенскага павета.

**Гарадок (Грудэк)**, мястэчка Беластоцкага павета. Бой 2 жніўня 1863 г.

309 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1135, а. 69.
310 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 248.
311 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 53 адв.-54.
312 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40 а, а. 20-20 адв.

**Гарнастаевічы**, вёска (цяпер Свіслацкі раён). Адсюль пісар Сіркучэўскі распаўсюджваў «Мужыцкую праўду» па навакольных вёсках.

**Глыбокі Кут**, вёска ў Пружанскім павеце. Бой 30 жніўня 1863 г.

**Гожа**, маёнтак Сільвястровіча Станіслава Янавіча, начальніка Гродзенскага павета, з чэрвеня 1863 г. — ваяводскі на 4 паветы: Гродзенскі, Сакольскі, Ваўкавыскі і Слонімскі.

**Горнава**, вёска Бельскага павета. 2 мая 1863 г. генерал Беклемішаў напаў на невялікую групу паўстанцаў пад кіраўніцтвам Латкоўскага.

**Грандзічы**, вёска Гродзенскага павета. Пры ўездзе ў вёску з боку Гродна Мікола Таўрэль знайшоў «Мужыцкую праўду», а Антон Яроцкі раз'язджаў па вёсках і чытаў яе сялянам.

**Губінка**, маёнтак у Гродзенскім павеце Севярына Ромера, рэвалюцыйнага касіра і рэферэнта казны Гродзенскага павета. Тут ён нарадзіўся ў 1820 г. Пад час вобыску 1 красавіка 1864 г. знайшлі рэвальвер амерыканскай сістэмы з 20 зарадамі.

**Гуркі**, маёнтак П. Дашкевіча, які ўзяў у арэнду яго пляменнік Дашкевіч Конрад Міхайлавіч, крынскі акруговы начальнік у Гродзенскім павеце.

**Гута**, вёска і маёнтак Ваўкавыскага павета. Бой паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі 16 чэрвеня 1863 г.

**Дамачава**, мястэчка ў Брэсцкім павеце. Бой 11 ліпеня 1863 г.

**Дзераўна**, маёнтак Кобрынскага павета, месца нараджэння Ляскоўскага Ігнацыя Яцкавіча, парафіяльнага начальніка Ваўкавыскага павета.

**Дзеравянчыцы**, маёнтак у Слонімскім павеце Пятра Апалінарыевіча Орды, стацкага дарадцы. У маі 1863 г. тут бывалі Э. Заблоцкі

і К. Каліноўскі. Прымаў іх кіраўнік Андрэй Восіпавіч Калудскі. На следстве ён гаварыў, што прыняў прыехаўшых за чыноўнікаў МУС, як яны і прадставіліся, а таму даў ім коней для далейшага перасоўвання па дзяржаўных справах. Пад час размовы паўстанцы даведаліся, што К. — адстаўны вайсковец, пыталіся, ці бываюць у маёнтку паўстанцы і ці загадвалі яму нешта, а таксама як праехаць у маёнтак Гавенавічы Свяжынскага, распытвалі пра навакольных памешчыкаў, ці багатыя яны. К. адказаў, што такімі можна лічыць удаву Пуслоўскага, яе швагра Вандаліна Пуслоўскага і Завішу, а астатнія — альбо сярэдняга, або беднага стану. Ад яго паехалі ў Гавіновічы, а праз дзень ізноў былі праездам па дарозе ў казённую в. Сакалова (адсюль быў выезд на паштовую дарогу Слонім —Гродна)[313].

**Дзярэчын**, мястэчка Слонімскага павета, месца нараджэння Л.П. Абрэмскага, касіра рэвалюцыйнай арганізацыі Гродзенскага ваяводства.


*Дамініканскі касцёл у Дзярэчыне*

**Долабава**, маёнтак у Бельскім павеце Пянькоўскага Людвіка Дамінікавіча, ваяводы паўднёвай часткі Гродзенскага ваяводства пасля Гафмайстра.

**Друскенікі**. 12 жніўня 1861 г. жыхары адзначылі Дзень памяці аб'яднання Літвы і Польшчы.

**Дэмбрава**, цяпер Шчучынскі раён, радзіма знакамітага мастака і ўдзельніка паўстання Казіміра Альхімовіча[314].

**Жалудок**, мястэчка. Месца нараджэння Валерыя Урублеўскага, стваральніка Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі, аднаго з выдаўцоў «Мужыцкай праўды», камандуючага войскам Гродзенскага ваяводства. У касцёле Узнясення Найсвяцейшай Маці Божай

313 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 243-246, 249.

314 Крой А., Буднік І., Хільмановіч У. Шляхамі паўстанцаў 1863-1864 гг. // Город Святого Губерта: альманах локальной истории. – Вып. VII. – Гродно: Гродненская библиотека, 2013. – С. 137.

з правага боку ад алтара ёсць памятная дошка з надпісам па-польску: «Кс. Станіслаў Ішора. 12.04.1838 г.-03.06.1863 г., каплан-герой, вікары парафіі ў Жалудку, загінуў смерцю пакутніка, расстраляны ў Вільні за ўдзел у студзеньскім паўстанні. Парафіяне. Таварыства польскай культуры Лідскай зямлі. Студзень 2005 г.»[315]



*Касцёл у Жалудку*

**Жаркаўшчызна**, Ваўкавыскі павет. Тут былі разбіты рэшткі атрада Духінскага 21 чэрвеня 1863 г.

**Жупраны**. Перад паўстаннем жыў вандроўны хатні настаўнік Іосіф Клімашэўскі, які чытаў сялянам 5-ы нумар «Мужыцкай праўды».

**Жыдомля**, вёска і маёнтак Гродзенскага павета, месца нараджэння Савашкевіча Канстанціна Іванавіча, агента рэвалюцыйнага начальніка Гродна.

**Забалаць**, маёнтак у Гродзенскім павеце Пакубяты Пятра Пятровіча, азёрскага акруговага начальніка, які жыў тут пасля выхада ў адстаўку ў 1858 г.

**Ігнаткі**, вёска ў Бельскім павеце. Бой 31 ліпеня 1863 г.

**Індура**, мястэчка Гродзенскага павета. Вікарным Індурскага касцёла быў у 1861-14.01.1864 гг. ксёндз Ян-Ігнаці Казлоўскі. Адсюль ён ездзіў у Сакулку на ўстаноўчы сход Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі[316]. На парафіяльных могілках каля галоўнай алеі ў сярэдняй частцы, па правым боку, знаходзіцца магіла Аляксандра Казлоўскага, уладальніка Індуры, які дапамагаў паўстанцам грашыма[317].

315 Pozecki J. Gloria Victis. 1863-1864… – С. 46.
316 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 21, а. 304 адв.
317 Porzecki J. Gloria Victis… – S. 27.

**Ішчална**. Цяпер Шчучынскі раён. У касцёле Святой Тройцы з правага боку ад увахода ёсць памятная дошка з надпісам па-польску: «Кс. Адам Фалькоўскі, каплан-герой, пробашч парафіі ў Ішчалне, загінуў смерцю пакутніка, расстраляны ў Лідзе 24.06.1863 г. ва ўзросце 51 год за ўдзел у студзеньскім паўстанні. Парафіяне. Таварыства польскай культуры Лідскай зямлі. Студзень 2005 г.»[318]

**Кабякі**, маёнтак у Пружанскім павеце, належаў камандзіру партызанскага атрада Феліксу Улодэку.

**Кадыш**, цяпер Гродзенскі раён, бой 21 мая 1863 г. паўстанцкіх атрадаў Віктара Гласкі і Брандта з расійскімі карнікамі. У баі палеглі 14 чалавек, прозвішчы 4 з іх вядомы: Юзэф Гласка, Пранашка, Будкевіч, Верпахоўскі. За вёскай каля 500 м, на Лісяй гары, знаходзіцца брацкая магіла паўстанцаў. Стаяць два крыжы — металічны (з 1928 г.) і драўляны (новы з 1988 г., а стары перанеслі ў касцёл Сапоцкіна). На памятнай каменнай пліце ёсць надпіс па-польску: «Ваярам 1863 г.» У 2011 г. адбылася рэканструкцыя помніка, быў усталяваны яшчэ ўніяцкі крыж[319].

**Камянецк-Літоўск**, мястэчка. 30 чэрвеня ў касцёле жанчыны-памешчыцы спявалі польскія гімны пад акампанемент адной з іх на аргане. Спевы паўтарыліся 4 і 7 ліпеня 1861 г.

**Каралеўскі Мост**, Пружанскі павет. 11 лютага 1863 г. адбылася ўпартая бойка атрадаў Рагінскага, Левандоўскага, Рыльскага і Сангіна з урадавым войскам. У наступным баі з урадавымі войскамі, які адбыўся 9 чэрвеня 1863 г., былі забіты 22 паўстанцы.

**Каралін**, вёска ў Слонімскім павеце. Сутыкненне ў Мажаеўскім лесе,паблізу вёскі, паміж паўстанцамі і расійскім войскам 18 чэрвеня 1863 г.

**Карчын (Чорнае Возера)**, Слонімскі павет. У баі 13 чэрвеня 1863 г. паміж царскім войскам і паўстанцамі з абодвух бакоў загінула па два чалавекі.

---

318 Pozecki J. Gloria Victis. 1863-1864… – С. 47.

319 Pozecki J. Gloria Victis. 1863-1864…– С. 21-22.

**Кватары**, цяпер Бераставіцкі раён. Уладальнік маёнтка Антон Гліндзіч быў арыштаваны за ўдзел у паўстанні, памёр у 1864 г. у Ваўкавыскай турме.

**Келбасін (Калбасін)**, маёнтак у Гродзенскім павеце Свяржбінскай, адміністратарам якога быў Лапінскі Ян Францавіч, які займаўся перасылкай паўстанцкай карэспандэнцыі.

**Кобрын**. У 1861-1862 гг. у мясцовым касцёле адбываліся патрыятычныя спевы. Павешаны 5 кастрычніка 1863 г. тры паўстанцы: Ф. Трафімчук, Ф. Пятроўскі, Ф. Грушэўскі[320].

**Конна**, вёска Ваўкавыскага павета Тарасевіча Канстанціна Геранімавіча, які ў маі 1863 г. прымаў у сваім маёнтку К. Каліноўскага і Э. Заблоцкага, якія інспектавалі арганізацыю[321].

**Котра**, маёнтак у Гродзенскім павеце Ф. Багаткі, які ў Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі займаў пасады рэферэнта апекі і касіра Гродзенскага паўстанцкага ваяводства да Л. Абрэмскага.

**Красная Груда**, Ваўкавыскага павета Калупайлы Фердынанда Ігнацьевіча, рэферэнта касы (касіра) пры рэвалюцыйным начальніку Ваўкавыскага павета.

**Краснік**, маёнтак Дзяконскай у Гродзенскай губерні, дзе кіраўніком служыў Вайсятыч Юзэф (Восіп) Цітавіч, вайсковы рэферэнт Гродзенскага павета. Бацька Вайсятыча на следстве паказаў, што да сына прыязджалі Завістоўскі, Рэдых, Камінскі, Радавіцкі. У маі 1863 г. з паездкі па Ваўкавыскаму і Слонімскаму паветах вяртаўся ў Гродна Э. Заблоцкі.

**Курылы**, урочышча ў Сакольскім павеце, нарадзіўся Талочка Адольф Іванавіч, памочнік ваяводскага Э. Заблоцкага.

---

320 Радзюк А. Рэпрэсіўная палітыка царызму на беларускіх землях у 1863-1864 гг. // ARCHE. – 2010. – № 12. – С. 146.

321 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 53 адв.-54.

**Кусцін**, маёнтак у Сакольскім павеце, арандатарам якога быў Эйсымонт (Эйсмант) Адольф Станіслававіч, начальнік Сакольскага павета пасля Грынявіцкага.

**Кушляны**. Антон Ясевіч распаўсюджваў «Мужыцкую праўду». Тут прайшло дзяцінства Францішка Багушэвіча, удзельніка паўстання. Апорны пункт паўстанцаў часоў партызанскай барацьбы.

**Лапы**, чыгуначная станцыя. Па данясеннях царскіх чыноўнікаў лічылася перавалачным пунктам рэвалюцыйнай літаратуры, якая паступала з Каралеўства Польскага (пераважна з Варшавы). Перавозілася ў тэндарах паміж дровамі і вуглём, каб пры небяспецы было лёгка пазбавіцца ад яе, кінуўшы ў печ паравоза[322].




*Бітвы і сутыкненні на чыгунцы ў час паўстання 1863-1864 гг.*

**Ласосна**, 12 жніўня 1861 г. ва ўрочышчы Ласосна сабралося шмат людзей для таго, каб адзначыць Дзень памяці аб'яднання Літвы і Польшчы. У час паўстання ў мясцовай карчме быў сувязны рэвалюцыйнай арганізацыі, які накіроўваў людзей, прысланых ад начальніка горада, у паўстанцкія атрады[323]. Праз карчму перасылалася таксама карэспандэнцыя арганізацыі. Гаспадар маёнтка Леў Астраменскі дапамагаў паўстанцам харчаваннем.

**Лешна**, маёнтак у Ваўкавыскім павеце. Нарадзіўся Белакоз Адольф Сцяпанавіч, рэвалюцыйны начальнік Беластока.

**Ліда**. У гарадскім парку ўсталяваны памятны камень з выбітым крыжам, па абодвух баках якога размешчаны надпіс па-польску і па-беларуску: «Ксёндз Адам Фалькоўскі. 1812-24.06.1863 гг.» На старых каталіцкіх могілках, перад капліцай, знаходзіцца магіла ўдзельніцы паўстання Валерыі Цэхановіч. На гранітным помніку з крыжам ёсць надпіс па-польску: «Валерыя з Цыбульскіх Цэхановіч. Удзельніца паўстання 1863 г. Жыла 92 гады, памерла ў Лідзе

322 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 238.
323 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2887, а.17 адв.

23 студзеня 1933 г. У капліцы вісіць памятная дошка з надпісам на польскай мове: «Памяці ксяндзоў-пакутнікаў Лідскай зямлі. Кс. Адам Фалькоўскі, пробашч парафіі ў Ішчалне, кс. Раймунд Зямацкі, пробашч у парафіі Вавюрка, кс. Станіслаў Ішора, вікары ў парафіі ў Жалудку, якіх забілі ў чэрвені 1863 г. у Лідзе і Вільні царскія ўлады за ўдзел у студзеньскім паўстанні. Парафіяне, жыхары Граева, Таварыства польскай культуры Лідскай зямлі. Чэрвень 2003 г.» Каля касцёла піяраў, побач з дарогай, якая ідзе на Вільна, пабудаваны помнік Л. Нарбуту (першапачаткова ў 1938 г.).



*Касцёл у Ваверцы*

**Лосева**, вёска Гродзенскага павета. Браты Адам і Мацвей Мазюкі агітавалі сялян в. Парэчча прыняць удзел у паўстанні.

**Лукавіца**, ваколіца Бельскага павета. Бой 19 верасня 1863 г.

**Луконіца**, маёнтак у Слонімскім павеце мацеры Захарыя Купрыянавіча Ягалкоўскага. Па паказаннях Э. Заблоцкага, ён быў акруговым начальнікам Слонімскага павета, у яго ён начаваў з К. Каліноўскім у маі 1863 г. пад час паездкі па аднаўленню Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі пасля арыштаў. Тут атрымаў намінацыю на пасаду павятовага Слонімскага павета Юзэф Стравінскі. Яму даручылі наладзіць паштовую сувязь з Ваўкавыскім паветам, звязацца з лагерам паўстанцаў у Мілавідах[324].



*Пётра Сергіевіч. 'Кастусь Каліноўскі і Валерый Урублеўскі робяць агляд паўстанцаў'*

324 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 6 адв., 259-260.

**Лунна**. На каталіцкіх могілках пахаваны Камінскі Ян Юзэфавіч, лунненскі акруговы начальнік і рэферэнт надзялення сялян зямлёй, затым начальнік Гродзенскага павета пасля Сільвястровіча. Магіла знаходзіцца злева ад уvахода. На гранітнай пліце надпіс па-польску «Надмагілле сям'і Камінскіх. Камінскія Ян (+ 1896), Ляона з Сузінаў (+27.III.1903)»[325].

**Лыскава**, мястэчка Ваўкавыскага павета. 16 чэрвеня 1863 г. былі разбіты рэшткі атрада Духінскага.

**Львоўшчына**, маёнтак Слонімскага павета. Бой 18 ліпеня 1863 г. паўстанцкіх атрадаў Ізідора Лукашэвіча і Вітольда Міладоўскага з расійскімі войскамі. Былі забіты 7 паўстанцаў, у тым ліку Лукашэвіч.

**Людвінова**, маёнтак у Кобрынскім павеце (цяпер Драгічынскі раён) Пятра Феліксавіча Ажэшкі, мужа будучай пісьменніцы Элізы. 19.11.1862 г. тут адбыўся сход сяброў-шляхціцаў, на якім абмяркоўваліся праграмы «белых» і «чырвоных», спявалі патрыятычныя песні. Пётр быў сасланы ў Томскую губерню за дапамогу паўстанцам. Удзельнікам паўстання быў ягоны брат Фларыян, які стварыў у Л. падпольную групу. Тут хаваўся ў ліпені 1863 г. Рамуальд Траўгут (разам з Ваньковічам), якога адсюль Эліза Ажэшка адвезла ў брычцы пад выглядам хворага сваяка да межаў Каралеўства Польскага каля Брэст-Літоўска. 28 мая каля Л. адбыўся бой паўстанцаў з царскім войскам[326].

**Макраны**, сяло і маёнтак Кобрынскага павета. Бой 8 ліпеня 1863 г.

**Маркава Вялікае**, вёска Бельскага павета. Бой 30 ліпеня 1863 г.

**Мастаўляны**, маёнтак Гродзенскага павета. Месца нараджэння Вікенція Кастуся Каліноўскага, кіраўніка паўстання на тэрыторыі Беларусі і Літвы. На працягу двух тыдняў тут знаходзіўся перад боем у Валілах (29.04.1863 г.) партызанскі атрад Казіміра Кабылін-

325 Pozecki J. Gloria Victis. 1863-1864… – S. 38.

326 ЭГБ. – Т. 1. – Мн.: БелЭн, 1993. – С. 65-66; Jankowski E. Eliza Orzeszkowa. – Warszawa: PIW, 1966. – S. 68; Мельнікава З. Універсітэты майго жыцця… – С. 67.

скага[327]. На плошчы абвясцілі маніфест Нацыянальнага ўрада. У маі, напярэдадні свята Зялёных свёнт, праз маёнтак праходзілі паўстанцы[328].

**Масты**, мястэчка Ваўкавыскага павета. У выніку бою 23 чэрвеня 1863 г. паўстанцамі паранены два салдаты.

**Матыкі**, маёнтак у Брэсцкім павеце, належаў камандзіру партызанскага атрада Феліксу Улодэку.

**Мялейчыцы**, вёска Бельскага павета. 4 лютага 1863 г. атрад паўстанцаў вызваліў рэкрутаў, якіх везлі з Мялейчыц да Высока-Літоўска.

**Мерачоўшчына**, маёнтак Слонімскага павета (Бярозавае Балота, Ружаны, Ружанская пушча, Косава, Сярадоўскі лес, Мерачоўшчына). 13 паўстанцаў палеглі, 8 былі паранены ў баі з урадавымі войскамі 8 чэрвеня 1863 г.

**Мілавіды**, маёнтак і паштовая станцыя Слонімскага павета. З інспекцыяй сабраных партызанскіх атрадаў прыбылі 1 ці 2.06 Э. Заблоцкі і Каліноўскі. На лагер паўстанцаў (каля 800 чалавек), якія знаходзіўся ў лесе паблізу шашы Брэст — Бабруйск, напалі тры роты Стараінгерманландскага пяхотнага палка. Бой доўжыўся 3-4 чэрвеня 1863 г. У памяць аб гэтай падзеі ўсталяваны помнік.



*Паштовая станцыя ў Мілавідах. Збудавана ў 1863 г.*

**Мінявічы**, маёнтак Каменьскага Яна Юзэфавіча ў Гродзенскім павеце, Лунненскі акруговы начальнік і рэферэнт надзялення сялян зямлёй, затым начальнік Гродзенскага павета пасля Сільвястровіча. У маі 1863 г. тут пабываў Э. Заблоцкі, калі вяртаўся ў Гродна з паездкі па Ваўкавыскаму і Слонімскаму паветах. Месца адпачынку Э. Ажэшкі, удзельніцы паўстання і аўтаркі рамана «Над Нёма-

327 Zielinski St. Bitwy i potyczki… – S. 334; Революционный подъём в Литве и Белоруссии.. – С. 657.

328 Марошек Ю. Дворянское имение в Мостовлянах – место рождения К. Калиновского // Кастусь Каліноўскі (1838-1864): матэрыялы рэспубліканскай канферэнцыі. – Гродно: ГрДУ, 1988. – С. 72.

нам», дзе Каменьскі стаў прататыпам аднаго з герояў. Каля вёскі, у лесе, на насыпаным капцы, знаходзіцца брацкая магіла. На вялізным камяні, на шліфаваным баку, выгравіраваны польскі вайсковы крыж з арлом, надпіс па-польску «Памяці 40 паўстанцаў 1863. Землякі. 1993 г.». За камянем знаходзіцца металічны крыж з фігурай Хрыста і надпісам «Слава пераможаным».

**Міхалін**, вёска Слонімскага павета. 14 мая 1863 г. адбыўся бой паміж паўстанцамі і царскім войскам.



*Камень з выбітым надпісам у Мохавічах*

**Мохавічы** (12 км на паўднёвы захад ад Ліды). У 1 км ад вёскі, каля дарогі з Мохавіч на Раклёўцы, знаходзіцца месца пахавання паўстанцаў. Стаяць на ім два крыжы — каталіцкі і ўніяцкі, на якіх аднолькавыя надпісы, адпаведна, на польскай і беларускай мовах: «Ваярам незалежнасці. 1863-1995». На адным з камянёў выбіты крыж і надпіс «SP B 1863».

**Навасёлкі**, вёска Гродзенскага павета Спірыдовіча Уладзіслава Рыгоравіча. Прымаў Э. Заблоцкага і К. Каліноўскага ў маі 1863 г. пад час паездкі па аднаўленню Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі пасля арыштаў[329].

**Новы двор**, цяпер Шчучынскі раён, 11.04.1863 г. каля вёскі адбылася бітва паміж паўстанцкім атрадам Людвіка Нарбута і расійскім войскам.

**Нямірава**, мястэчка Бельскага павета, сюды адступіў ад в. Белая атрад Р. Рагінскага. Пры пераправе праз Буг атрад Р. Рагінскага 4 лютага 1863 г. быў абстраляны рускімі часцямі.

**Оўзічы**, маёнтак у Кобрынскім павеце Браніслава Ажэшкі (цяпер вёска ў Іванаўскім раёне), дзе яго брат Фларыян назапасіў зброю і боепрыпасы для паўстанцаў[330].

329 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 53 адв.-54.
330 Ігнатовіч Ф.І. Ажэшка Фларыян // ЭГБ. – Т. 1. – Мн.: БелЭн, 1993. – С. 65.

**Пагарэлае**, урочышча ў Слонімскім павеце. У Ружанскай казённай дачы 2 чэрвеня 1863 г. адбыўся бой паміж царскімі карнікамі і паўстанцкім атрадам А. Лянкевіча і А. Духінскага.

**Паканаева**, маёнтак у Бельскім павеце, Вытаноўскі лес па дарозе на Бельск. На транспарт з канфіскаванай расійцамі ў жыхароў маёмасцю 2 кастрычніка 1863 г. напалі паўстанцы.

**Панюкі**, маёнтак у Гродзенскім павеце, які належаў А.А. Лянкевічу (Ляндару), вайсковаму начальніку Гродзенскага павета.

**Папіна**, вёска і маёнтак Кобрынскага павета, дзе жыло сямейства Жукоў, з якім сябравала Э. Ажэшка. У студзені 1862 г. адбыўся сход чальцоў паўстанцкай арганізацыі палескіх паветаў, каб вырашыць, каму даручыць кіраванне паўстаннем на Палессі[331].

**Парэчча**, чыгуначная станцыя Гродзенскага павета. 14 сакавіка 1863 г. тут чакаў гродзенскіх паўстанцаў прадстаўнік атрада Л. Нарбута. Рота ўрадавых войск у пачатку ліпеня 1863 г. напала на вялікі атрад паўстанцаў, якія адышлі і разышліся дробнымі групамі.

**Паўловічы**, маёнтак Сакольскага павета, месца нараджэння Ю.К. Алендскага, які быў акруговым і зборшчыкам падаткаў у рэвалюцыйнай арганізацыі Сакольскага павета. У садзе маёнтка знайшлі рэвалюцыйныя паперы ад ваяводы і акруговага начальніка.

**Пацавічы**, 15 км на поўдзень ад Мастоў. Каля 2 км ад вёскі, пры лесе, у 1933 г. усталявалі, а ў 2011 г. адрэстаўравалі помнік паўстанцам — на капцы з каменя стаіць металічны крыж. На гранітнай табліцы напісана па-польску «У гонар паўстанцаў 1863 г. землякі. 2011», на каменнай табліцы наступны надпіс: «Паўстанцам 1863 г. Героям



*Адноўленая магіла паўстанцаў у Пацавічах*

331 Мельнікава З. Універсітэты майго жыцця… – С. 67.

бітваў за незалежнасць Айчыны пад Пескамі, Балаховым удзячныя землякі. 1933».

**Пашкаўшчызна**, урочышча ў Ваўкавыскім павеце. Бой 9 жніўня 1863 г.

**Пескі**, маёнтак і сяло Слонімскага павета. 9 мая 1863 г. адбылося сутыкненне паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі. Было знішчана. Знаходзілася на левым беразе Нёмана насупраць в. Коматава.

**Поразава** (22 км ад Свіслачы). На парафіяльных могілках знаходзяцца аднатыпныя помнікі паўстанцам Яну Дмухоўскаму і Казіміру Шалкевічу — капцы, складзеныя з камянёў, і гранітны крыж з надпісам, хто пахаваны[332].

**Правыя Масты**, уладальнік маёнтка Міхайлаўка Лавіцкі быў актыўным удзельнікам паўстання.

**Пружаны**, павятовы горад. 13 лютага 1863 г. былі захоплены паўстанцкімі атрадамі Б. Рыльскага, С. Сангіна, Р. Рагінскага. Паўстанцы захапілі ў цэйхгаўзе ўсю зброю, порах, амуніцыю, 1720 патронаў, а ў казначэйстве — 10 808 рублёў. У Пружанскім павятовым вучылішчы вучыўся Жукоўскі Міхаіл Сямёнавіч, які, верагодна, быў пружанскім павятовым начальнікам.

**Пясец**, урочышча Слонімскага павета. Бой паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі 26 чэрвеня 1863 г.

**Рагозніца**, цяпер Мастоўскі раён, сын уладальніка Шабаньскага ў 1863 г. загінуў у паўстанні.

**Рапаноўка**, фальварак у Слонімскім павеце. 5 ліпеня 1863 г. адбылася перастрэлка паміж паўстанцамі і расійскай часткай.

**Рудка**, маёнтак у Бельскім павеце. Бой 31 студзеня 1863 г. Паўстанцы занялі Рудку, жыхарам зачыталі маніфест аб неіснаван-

332 Pozecki J. Gloria Victis. 1863-1864… – S. 32.

ні расійскага ўрада, спалілі паперы з валаснога праўлення. У баі 9 чэрвеня 1863 г. загінулі 5 расійскіх салдат і некалькі былі паранены, страты паўстанцаў невядомы.

**Рудня**, вёска Ваўкавыскага павета. Бой 12 верасня 1863 г.

**Ружаны**, мястэчка Слонімскага павета. 16 чэрвеня 1863 г. група з 18 конных паўстанцаў заняла мястэчка, забрала з пошты зброю, грошы, коней і колы. Пераначавала і пайшла на Слонім.

**Рыхлы**, Бельскі павет. Бой 5 жніўня 1863 г.

**Рэпля**, мястэчка Ваўкавыскага павета. Месца нараджэння і хрышчэння бацькі К. Каліноўскага — Сямёна Стэфанавіча. Схаваў ад следства, што меў зносіны з сынам пад час паўстання 1863 г.[333]

**Рэчыца**, сяло Пружанскага павета (Каменскі раён). Моцны расійскі аддзел падпалкоўніка Вімберга 15 лютага 1863 г. напаў на атрад Сангіна-Рыльскага (38 чалавек). У баі загінуў Сангін, Рыльскі трапіў у палон.

**Саботка**, маёнтак Бельскага павета, месца нараджэння Алдакоўскага Напалеона Паўлавіча, рэвалюцыйнага начальніка Беластоцкага павета.

**Сакулка**, мястэчка, павятовы цэнтр і чыгуначная станцыя. У 1861-1862 гг. у мясцовым касцёле адбываліся патрыятычныя спевы. У доме пры егерскім вучылішчы жылі Ш. Гутакоўскі і Урублеўскі. У ім адбыўся сход пасля варшаўскага расстрэла дэманстрантаў (27.02.1861 г.). Прысутнічалі В. Урублеўскі, Э. Заблоцкі, К. Каліноўскі, С. Сангін, ксёндз Я.-І. Казлоўскі. Пакладзены пачатак фарміравання Гродзенскай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі. Начальнікам пісарска-егерскага вучылішча ў Сакулцы быў Валеры Урублеўскі, рэвалюцыйны начальнік Сакольскага павета, а потым гродзенскі ваяводскі. Пасля яго павятовым быў Грынявіцкі Ян Вайцэхавіч. Тут жыў Алендскі Юлій Ксавер’евіч,

333 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 247-248.

акруговы і зборшчык падаткаў у рэвалюцыйнай арганізацыі Сакольскага павета. Публічна расстраляны ў Сакулцы 6.06.1863 г. Мацвей Цюхна, распаўсюджвальнік «Мужыцкай праўды».

**Свадбічы**, вёска і паштовая станцыя Пружанскага павета. 2 мая 1863 г. атрад паўстанцаў захапіў 18 коней і казённую зброю.

**Свіслач**, мястэчка Ваўкавыскага павета. Тут жыў Серпучэўскі (Сіркучэўскі), пісар Гарнастаевіцкай воласці, які чытаў Антонію Асвейну і сялянам у валасным праўленні «Мужыцкую праўду». 27.10.1862 г. настаяцель Свіслацкага касцёла пахаваў на «публічных прыходскіх могілках» Віктара Каліноўскага, старэйшага брата Кастуся, які аказаў значны ўплыў на яго духоўнае і палітычнае станаўленне.

У ноч з 14 на 15 красавіка 1863 г. з прагімназіі збеглі ў партызанскія атрады 13 вучняў (6 чалавек з 5-га класа, па 2 чалавекі з 2-4-га класаў, 1 чалавек з 1-га класа)[334].

У Свіслацкай гімназіі (з 1851 г. — 5-класнае павятовае вучылішча) вучыліся:

- Абрэмскі Людамір (Любамір), касір рэвалюцыйнай арганізацыі Гродзенскага ваяводства;
- Баяроўскі Адам Цэлясфоравіч, памочнік начальніка Гродзенскага павета Я. Каменскага;
- Белакоз Адольф Сцяпанавіч, рэвалюцыйны начальнік Беластока;
- Каліноўскі Вікенцій Кастусь, кіраўнік паўстання на Беларусі і Літве;
- Каліноўскі Віктар, аказаў значны ўплыў на брата Кастуся;
- Калупайла Фердынанд Ігнацьевіч, рэферэнт касы (касір) пры рэвалюцыйным начальніку Ваўкавыскага павета;
- Камінскі (Каменскі) Ян Юзэфавіч, лунненскі акруговы начальнік і рэферэнт надзялення сялян зямлёй, затым начальнік Гродзенскага павета пасля Сільвястровіча;
- Ляскоўскі Ігнацій Яцкавіч, парафіяльны начальнік Ваўкавыскага павета;
- Пяньkоўскі Людвік Дамінікавіч, пасля Гафмайстра ваявода паўднёвай часткі Гродзенскага ваяводства;

334 НГАБ, ф. 3, воп. 1, с. 16, а. 10 адв.



*Помнік Р. Траўгуту*

- Серпучэўскі (Сіркучэўскі), распаўсюджвальнік «Мужыцкай праўды»;
- Стравінскі Юзэф, начальнік Слонімскага павета;
- Траўгут Рамуальд, кіраўнік Кобрынскага паўстанцкага атрада, з кастрычніка 1863 г. — кіраўнік Нацыянальнага ўрада ў Варшаве;
- Уластоўскі Аляксандр Якаўлевіч, ківаціцкі[335] акруговы ў Пружанскім павеце;
- Штарк Ян Антоніевіч, былы рэдактар «Гродненских губернских ведомостей», сябра Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі, магчыма, друкар «Мужыцкай праўды».

У сучаснай гімназіі № 1, якая працягвае традыцыі былой гімназіі Тышкевіча, створаны музей, экспанаты якога ўзгадваюць выдатных навучэнцаў. На плошчы Свіслачы знаходзіцца ўсталяваны ў 1980-я гг. адзіны на Беларусі помнік К. Каліноўскаму. У скверы знаходзіцца помнік Р. Траўгуту, усталяваны ў 1928 г. (праект Паўла Бялка і Збароўскага), адноўлены ў 1989 г. (скульптар Міхаіл Анціпін).

**Свіслач**, маёнтак у Гродзенскай губерні памешчыка Вандаліна Пуслоўскага. Кіраўніком служыў Рэдых Емяльян Восіпавіч, індурскі акруговы начальнік. У маі 1863 г. тут пабываў Э. Заблоцкі, калі вяртаўся ў Гродна з паездкі па Ваўкавыскаму і Слонімскаму паветах.

**Святое Балота**, урочышча ў Гродзенскай пушчы, непадалёку м. Азёры, Гродзенскі павет. На сённяшняй карце яго няма, бо балота асушана і ператварылася ў тарфянік. Знаходзілася на месцы азёрскага ляснога масіва ў напрамку Котры і Шкленска[336]. 3 мая 1863 г. адбыўся бой урадавых войск з паўстанцкім атрадам А. Лянкевіча. На месцы брацкай магілы ўсталяваны помнік.

335 Ківацічы – маёнтак у Пружанскім павеце.

336 Дрозд С. Нашы гістарычныя карані: па слядах К. Каліноўскага // Гарадзенскія запісы. – Вып. 1. – Гародня, 1993. – С. 91.

**Серадава**, фальварак у Слонімскім павеце (Боркі, Папялярня). Бой партызанскага атрада з урадавымі войскамі 10 чэрвеня 1863 г.

**Скарынкі**, маёнтак і вёска Кярсноўскага Апалінара Восіпавіча, які прымаў Э. Заблоцкага і В.-К. Каліноўскага пад час іх паездкі па Слонімскім павеце ў маі 1863 г.

**Скідзель**, тут ксяндзом быў Чаповіч, спачатку акруговы начальнік, а потым памочнік пры ваяводскім камісары Э. Заблоцкім.

**Скраблякі**, маёнтак і ваколіца Сакольскага павета (цяпер Адэльскі с/с), знаходзіўся пад наглядам паліцыі Гарчак Юзэф, распаўсюджвальнік «Мужыцкай праўды».

**Слонім**, павятовы горад. У 1861-1862 гг. у мясцовым касцёле адбываліся патрыятычныя спевы. Месца дзеяння падпольнай арганізацыі (сустрэчы сяброў адбываліся ў памяшканнях публічнай бібліятэкі і самадзейнага тэатра)[337]. Месца нараджэння і хрышчэння ў 1817 г. Стравінскага Юзэфа Маўрыкіевіча, рэвалюцыйнага начальніка Слонімскага павета пасля арышта Уладзіслава Генрыхавіча Сымановіча, які працаваў вольна практыкуючым урачом[338]. У Слонімскім 5-класным вучылішчы вучыўся З.К. Ягалкоўскі — акруговы начальнік Слонімскага павета.

**Смалярня**, Слонімскі павет. 12 мая 1863 г. адбылася сутычка ўрадавых войск з паўстанцамі.

**Солы**, цяпер Смаргонскі раён, 3.02.1863 г. адбыўся бой паміж паўстанцамі і расійскімі войскамі.

**Стары Двор**, маёнтак у Гродзенскім павеце Андржэйкавіча Тадэвуша Уладзіслававіча, камісара Ваўкавыскага павета.

**Супрасль**, у 1840 г. павятовае для духоўных выхавальнікаў

337 Кісялёў Г. Радаводнае дрэва. Каліноўскі – эпоха – наступнікі. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1994. – С. 256.

338 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 249.

вучылішча, якое скончыў Савашкевіч Канстанцін Іванавіч, агент (памочнік) рэвалюцыйнага начальніка Гродна Э. Заблоцкага.

**Сураж**, заштатны горад Беластоцкага павета. Адбыўся бой 23 студзеня 1863 г., а 8 лютага адзін з атрадаў паўстанцаў, вырваўшыся пасля паражэння ў Сямятычах, напаў на казацкі патруль і забіў 6 чалавек.

**Сутна**, маёнтак Бельскага павета, месца нараджэння Пянькоўскага Людвіка Дамінікавіча, пасля Гафмайстра — ваявода паўднёвай часткі Гродзенскага ваяводства.

**Сцярпейка**, маёнтак у Сакольскім павеце Церпілоўскага Уладзіслава Іванавіча, рэферэнта касы (касіра) Сакольскага павета.

**Сялец**, мястэчка Пружанскага павета. Баявая сутычка паміж паўстанцамі і ўрадавымі войскамі 7 чэрвеня 1863 г.

**Сямяцічы**, мястэчка Бельскага павета. 10 дзён стаяў моцны атрад

**Ціхорскага**, да якога сцякаліся мясцовыя паўстанцкія атрады С. Сангіна і Б.

**Рыльскага**. Царская артылерыя 6 лютага 1863 г. бамбавала мястэчка, але расійцы вымушаны былі адысці. 7.02 падцягнуліся атрады Р. Рагінскага, Левандоўскага і А. Чарняўскага (400 чалавек), у 6 вярстах ад мястэчка стаяў У. Ябланоўскі (800 чалавек). На гэты раз перамагло царскае войска. За дапамогу паўстанцам жылыя і гаспадарчыя пабудовы жыхароў Сямяцічаў былі спалены.

**Топчава**, вёска Бельскага павета. Бой 15 ліпеня 1863 г.

**Туравічы**, вёска Слонімскага павета. Сутыкненне 9 чэрвеня 1863 г. на р. Мышанцы ў 12 км ад Мілавідаў паміж царскім войскам і паўстанцамі.

**Тымянка**, вёска Брэсцкага павета. Парабак Павел Мацюк распаўсюджваў № 1 і 3 «Мужыцкай праўды» ў лістападзе 1862 г.[339]

**Улісоўшчызна**, маёнтак Ваўкавыскага павета. Перастрэлка паміж царскім войскам і паўстанцамі 16 верасня 1863 г.

**Харабровічы**, вёска і маёнтак Слонімскага павета. Бой 18 ліпеня 1863 г., у якім загінуў І. Лукашэвіч. Пахаваны каля месца бою[340].

**Харошча**, мястэчка Беластоцкага павета, месца нараджэння Лебядзінскага Антона Іванавіча, зборшчыка грошай па Сакольскім павеце, затым рэвалюцыйнага начальніка Саколкі.

**Хомікі**, вёска Сакольскага павета. Непісьменны селянін Міхась Зянцюк, праслухаўшы «Мужыцкую праўду», пераказваў яе сялянам.

**Цэханавец**, мястэчка Бельскага павета. Баявая сутычка паміж паўстанцаміі ўрадавымі войскамі 23 жніўня 1863 г.

**Цымлева**, урочышча ў Ваўкавыскім павеце. Адбылося сутыкненне 8 жніўня 1863 г.

**Чарнавесь**, вёска Сакольскага павета. Атрад Парчэўскага 1 сакавіка 1863 г. напаў на каманду інвалідаў, забраў 40 ружжаў. Пасля гэтага атрад быў распушчаны, а яго камандзір паехаў у Вільню.

**Чэрск**, сяло і фальварак Брэсцкага павета. У баі 27 мая 1863 г. былі забіты 11 паўстанцаў, 17 трапілі ў палон.

**Шарашова**, мястэчка Пружанскага павета. З 1862 г. пастаянна жыў Аляксандр Акінчыц, акруговы лекар, які дапамагаў паўстанцам[341]. 12 лютага 1863 г. атрад паўстанцаў (200 чалавек) захапіў мястэчка. Пасля закупкі вопраткі і канфіскацыі ў сель-

---

339 Кісялёў Г. З думаю. – С. 33.

340 Кісялёў Г. Радаводнае дрэва… – С. 257.

341 Радзюк А. Спасылкі да ўспамінаў І. Арамовіча “Мары” // ARCHE. – 2010. – № 12. – С. 29.

скім праўленні 93 рублёў казённых грошай выехалі ў напрамку Пружан.

**Шастакова**, вёска Брэсцкага павета (Камянецкі раён). Месца нараджэння Рамуальда Траўгута. Маёнтак Шастакова належаў А.П. Гафмайстру, які ў рэвалюцыйнай арганізацыі быў памочнікам, а потым гродзенскім ваяводам.

**Шэйпякі**, вёска, праз якую праязджаў Каліноўскі ў Ваўкавыск, раскідваючы па дарозе № 3 «Мужыцкай праўды» ў кастрычніку 1862 г.

**Шкленск**, вёска Гродзенскага павета (12 км ад Азёр). 4 мая 1863 г. дзве роты Калужскага палка і 22 казакі пад камандаваннем падпалкоўніка Мантэйфеля атакавалі паўстанцаў на чале з А. Лянкевічам.

**Шчукі**, цяпер Шчучынскі раён. Гэтая вёска была спалена расійскімі карнікамі 12.07.1863 г., а яе жыхары (16 сямействаў) высланы ў розныя губерні Расіі.

**Шылавічы**, Слонімскі павет. У мясцовай царкве Казанскай Божай Маці ў маі 1863 г. зачыталі паўстанцкі маніфест і прынялі прысягу мясцовых сялян паўстанню[342].

**Югалін**, фальварак Слонімскага павета (цяпер Івацэвіцкі раён), месца нараджэння Юндзіла Францішка Уладзіслававіча, начальніка Слонімскага павета, камандзіра партызанскага атрада (каля 300 чалавек), які фарміраваўся ва ўрочышчы Старынка паблізу Югаліна.

**Юзэфатава** (былое Храптоўцы), маёнтак у Сакольскім павеце, які купіў Сержпутоўскі Юзэфат Людвікавіч, рэферэнт касы (касір) Сакольскага павета.

**Эйсымонты** (Надтабольскія), Гродзенскі павет. Высылкай у Сібір пакараны 8 сямействаў мясцовых жыхароў[343].

342 Акудовіч Ц., Юрчык Д. Паўстанне 1863 г. на Слонімшчыне // Город Святого Губерта: альманах локальной истории. – Вып. 8 (2014). – Гродно, 2014. – С. 134.

343 Крой А., Буднік І., Хільмановіч У. Шляхамі паўстанцаў 1863-1864 гг. // // Горад Святого Губерта: альманах локальной истории. – Вып. 7 (2013) / рэдкал. А. Смалянчук [і інш.]. – Гродна, 2013. – С. 135.

**Явар**. Каля вёскі знаходзіцца месца пахавання загінуўшых паўстанцаў.



*Рэканструкцыя сядзібы Каліноўскіх у Якушоўцы*

**Якушоўка**, маёнтак у Ваўкавыскім павеце бацькі К. Каліноўскага — Сямёна Стэфанавіча і мачахі Лазарэвіч. Тут В.-К. Каліноўскі жыў пасля вяртання з Пецярбургскага ўніверсітэта ў 1861 г. і займаўся гаспадаркай. У сакавіку 1862 г. выехаў у Гродна, а сюды прыязджаў некалькі разоў: на Вялікдзень; праз два тыдні пасля яго; у кастрычніку, каб атрымаць 25 рублёў на жыццё. 22 ці 23 мая (3 ці 4 чэрвеня) 1863 г. Каліноўскі заязджаў да бацькі не больш як на тры гадзіны[344]. Пад час раскопак на месцы дома Каліноўскіх гісторык М.А. Ткачоў знайшоў пячатку фабрыкі Сямёна Сцяпанавіча Каліноўскага, фрагменты посуду, мэблі, цвікі[345]. 24.10.1999 г. пад час Дня памяці паўстанцаў 1863 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнага крыжа.



*Падмурак сядзібы Каліноўскіх у Якушоўцы*

**Ялаўка**, мястэчка ў Беластоцкім павеце. У мясцовым касцёле 6 лютага і 4 красавіка 1838 г. быў ахрышчаны Вікенці-Канстанцін Каліноўскі[346].

**Янін** (Янава), Слонімскі павет. 10 мая 1863 г. адбылася сутычка ўрадавых войск з паўстанцамі. У выніку бою 15 чэрвеня 1863 г. сярод паўстанцаў адзін забіты, сярод урадавых салдат — 3 забітых і 2 параненых.

344 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 7, 248.

345 Полубинский А.С. Памятные места и памятники, связанные с жизнью и деятельностью К. Калиновского // Кастусь Каліноўскі (1838-1864): материалы республиканской конференции. – Гродно: ГрГУ, 1988. – С. 72.

346 Полубинский А.С. Памятные места и памятники…. – С. 74.

**Яцвеск**, маёнтак у Ваўкавыскім павеце (цяпер Свіслацкі раён) Ляскоўскага Ігнація Яцкавіча, парафіяльнага начальніка Ваўкавыскага павета. У яго спыняліся ў маі 1863 г. В.-К. Каліноўскі і Э. Заблоцкі. Адсюль паехалі да бацькі Каліноўскага ў Якушоўку (у 5 вярстах ад Яцвеска). Бываў партызанскі атрад К. Кабылінскага[347].

Прадстаўлены матэрыял, на думку аўтара, могуць выкарыстаць краязнаўцы і настаўнікі школ, якія будуць займацца больш паглыбленым пошукам сведчанняў пра сваіх паўстанцаў-землякоў. Мясцовая ўлада можа прычыніцца да ўшанавання адшуканых герояў — усталяваць помнікі і знакі, мемарыяльныя дошкі. Мясцовая прэса зверне ўвагу на сапраўдных патрыётаў Беларусі. А турыстычным фірмам матэрыял дае падказку для стварэння новых эксклюзіўных экскурсійных маршрутаў.

347 НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 1, с. 40 а, а. 11, 13.

*- Каго любіш?*
*- Люблю Беларусь.*
*- Так узаемна!*
*Пароль, які ўжывалі паўстанцы*
*на канспіратыўнай кватэры*
*Баневічаў на вул. Дамініканскай у Вільні*

# ПАСЛЯСЛОЎЕ

У звароце «Да мужыкоў зямлі Польскай» Каліноўскі пісаў: «Браты мае, мужыкі родныя. З-пад шубеніцы маскоўскай даводзіцца мне пісаці, і можа, раз астатні. Горка пакінуць зямельку родную і цябе, мой народзе. Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, але не шкада загінуць за тваю праўду»[348]. Так, напэўна, мог бы напісаць кожны з герояў прачытаных вамі нарысаў.

Па нашых няпоўных падліках, у Гродне і Беластоку ўдзельнічалі ў маніфестацыях («провады» гродзенскага губернатара Шпеера, рэлігійная працэсія ў Ружаны Сток), спевах забароненых песен 435 чалавек. У кнізе дадзены біяграмы 26 распаўсюджвальнікаў газеты «Мужыцкая праўда».

Даследчыкі падаюць колькасць Гродзенскай рэвалюцыйна-дэмакратычнай ваяводскай арганізацыі каля 300 чалавек. У нас напісаны біяграмы 79 сяброў «урада для народа».

Вы пазнаёміліся з 75 асобамі, якія былі камандзірамі паўстанцкіх атрадаў або займалі ў іх камандную пасаду. Каля 70 гімназістаў спрабавалі выехаць з Гродна ў паўстанцкі атрад Людвіка Нарбута — частка з іх мае хаця б кароткія біяграмы.

Нельга вызначыць дакладную колькасць тых, хто дапамагаў чальцам падпольнай арганізацыі і партызанскіх атрадаў. Біяграмы складзены толькі на тых, хто трапіў пад арышт і следчы працэс Гродзенскіх следчых камісій — 344 чалавекі.

Выселены са спаленых шляхецкіх ваколіц і вёсак Шчукі, Яваоаўка, Пеняжкі, Лукавіца, Прушанка-Баранка 429 чалавек (многія з іх названыя ў кнізе). Мы паспрабавалі скласці спіс агульных страт па Гродзенскай паўстанцкай губерні. Спіс змясціў 74 асобы.

Усё напісанае патрэбна для таго, «каб краіна памятала сваіх герояў», ушанавала іх памятнымі дошкамі, помнікамі, памятнымі

348 Каліноўскі К. За нашую вольнасць. Творы, дакументы / уклад., прадм., паслясл. і камент. Г. Кісялёва. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1999. – С. 46.

знакамі на месцах баёў і пахаванняў. Таму быў напісаны нарыс «Гродзенскія адрасы паўстанцаў». Ён аблегчыць працу па ўсталяванню вехаў памяці рыцараў 1863 г.

Бывай здаровы, мужыцкі народзе,
Жыві ў шчасці, жыві ў свабодзе.
І часам спамяні пра Яську свайго,
Што загінуў за праўду для дабра твайго.
(К. Каліноўскі)

# Дадаткі

## Дадатак 1

### Спіс удзельнікаў патрыятычных спеваў у гродзенскіх касцёлах з 12 чэрвеня па снежань 1861 г.

1. Абрамовіч, пісар губернскага праўлення
2. Адамовіч, дачка муляра
3. Адамовіч, сын каваля
4. Астрамецкая, жыла на Падоле, удава
5. Астроўскі, паверены кнігагандляра Загаеўскага
6. Багушэвіч Міхаіл, чыноўнік губерні
7. Баран, сын рыбака
8. Белакоз, чыноўнік грамадзянскай палаты
9. Бенкіс, мадыстка
10. Беразоўскі, настаўнік польскай мовы ў гімназіі, падбухторваў гімназістаў да спявання гімнаў
11. Блавецкія, дзеці кіраўніка справамі Ляхіцкага (верагодна, Ляхніцкага)
12. Будрык Антоні
13. Будрэвіч, пісар палаты дзяржаўных маёмасцяў
14. Буткевіч, з Дэпутацкага схода
15. Быхоўскі, чыноўнік грамадзянскай палаты

16. Валіцкая
17. Вайтушка, утрымлівае пансіён
18. Вайшчаловіч (Вашчаловіч), жонка
19. Вашчаловіч, малады (ён жа ? «выхаванец старога»)
20. Верпахоўскі
21. Вольмар, дырыжор
22. Выганоўская, сястра музыканта
23. Выганоўская, сястра чыноўніка казённай палаты
24. Выганоўскі, памочнік Гродзенскага павятовага казначэйства
25. Высоцкі, чыноўнік канцылярыі губернатара
26. Вярбіцкі, таварыш (намеснік) старшыні грамадзянскай палаты
27. Вяржбіцкі, шавец
28. Вяржбіцкі, сын шаўца?, распаўсюджвае чуткі
29. Гарбачэўская, жонка чыноўніка крымінальнай палаты
30. Гарбачэўскі, настаўнік яўрэйскага вучылішча
31. Гарбачэўскі, чыноўнік крымінальнай палаты
32. Генуш (Геніўш), чыноўнік казённай палаты
33. Генуш (Геніўш), брат
34. Германскі, страпчы
35. Гільберт, жанчына
36. Горак, настаўнік музыкі
37. Горак, жонка настаўніка
38. Далецкі, адстаўны юнкер
39. Далячка, чыноўнік казённай палаты
40. Данкоўскі
41. Дарота, служанка («дзяўчына») Касцялкоўскіх
42. Дзенісевіч, чыноўнік казённай палаты
43. Дзяржынская
44. Дзітрых, сям’я
45. Жалкоўскі, сын, граў на аргане
46. Жалкоўскага сям’я
47. Забельскі, мешчанін
48. Заблоцкі, урач

49. Загаеўскі, кніжны гандляр
50. Загароўскі, настаўнік
51. Заельскі, чыноўнік грамадзянскай палаты
52. Заельскі, сын чыноўніка грамадзянскай палаты
53. Залескі, дваранін, уладальнік казённай фермы
54. Зах, сакратар губернскага праўлення
55. Зданкевіч
56. Зданкевіч
57. Здановіч, чыноўнік грамадзянскай палаты
58. Зуброўская, дачка чыноўніка
59. Зуброўскі, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў
60. Івашкевіч, ротны камандзір гарнізоннага батальёна
61. Ізбіцкі, чыноўнік казённай палаты
62. Казярацкі, былы памочнік пачмайстра
63. Каменскі, чыноўнік грамадзянскай палаты
64. Камінскі, чыноўнік Гродзенскага павятовага суда
65. Касоўскі
66. Касцялкоўскага сям'я
67. Кашубы сям'я
68. Квінта, былы кіраўнік канцылярыі
69. Квяткоўскі, чыноўнік грамадзянскай палаты
70. Кімбар, століначальнік губернскага праўлення
71. Кімбар, настаўнік
72. Клімашэўскія, сям'я
73. Коймер, жонка
74. Кржывіцкі, слуга
75. Круповіч, былы губернскі дарадца
76. Круповіч, сын
77. Кулакоў, з казённай палаты
78. Кульвіца (Кульвіча, Кульвеца) сям'я, чыноўнік дваранскага схода
79. Курыевіч, чыноўнік казённай палаты
80. Кушалеўскія, дачкі кухара
81. Лазоўскі Ігнаці, служачы чыгункі

82. Лапінскі, студэнт
83. Латвенскі, памочнік губернскага праўлення
84. Лебель, чыноўнік губернскага праўлення
85. Лебель, жонка чыноўніка губернскага праўлення
86. Левандоўскі
87. Лечыцкая, дачка ўрача
88. Ліманоўскі, лясны афіцэр
89. Лота, жонка чыноўніка казённай палаты
90. Малевічы, траіх
91. Матушэвіч, жыла ў доме Кружалеўскіх
92. Матысевіч, бабуля
93. дэ Метры, студэнт
94. Мілевіч, чыноўнік губернскага праўлення
95. Місевіч, збіраў грошы ў касцёле
96. Міхалоўскі, сын
97. Міхалоўскага сям'я
98. Міхальскі
99. Міхневіч, жанчына
100. Мудровіч, чыноўнік грамадзянскай палаты
101. Мушынская, вучыць дзяцей спяванню забароненых гімнаў
102. Надольскі, пісар грамадзянскай палаты
103. Немчыноўскі, чыноўнік казённай палаты
104. Пакубята, сям'я
105. Палубінская, удава
106. Панехвіцкі, пісар павятовага суда
107. Петрашкевіч, пісар?
108. Петрашкевіч, дачка
109. Пілюткевіч, былы студэнт
110. Піматкевіч, вучань
111. Піятроўскі, столаначальнік павятовага суда
112. Пратасевіч, з казённай палаты
113. Пржабычак, утрымлівае пансіён
114. Пруневіч, пісар палаты дзяржаўных маёмасцяў
115. Пятроўскі, чыноўнік канцылярыі губернатара

116. Пяцельчыц, чыноўнік павятовага суда
117. Руткоўскі, чыноўнік грамадзянскай палаты
118. Руцкі, малодшы чыноўнік страхавой кампаніі
119. Рэзліцкі
120. Рэзніцкая, дачка
121. Савашынскі, асэсар губернскага праўлення
122. Савіцкая, мадыстка
123. Савіцкая, дачка мурара
124. Савіцкая, другая дачка мурара
125. Саковіч, былы правадыр дваранства
126. Самуліцкі, з дваранскай апекі
127. Сангін, з губернскага праўлення
128. Саросек, столаначальнік павятовага суда
129. Сасуліч (? жонка пісьмавадзіцеля павятовага правадыра дваранства), спявала пад фартапіяна
130. Скальскі, чыноўнік крымінальнай палаты
131. Скідзінскі, чыноўнік з казначэйства
132. Скідзінскія, сёстры
133. Славінская, з Саколкі
134. Смікевіч, былы столаначальнік магістрата
135. Стоцкі, былы бургамістр
136. Стралкоўскі, малодшы
137. Стралкоўскі
138. Стромскі, правізар аптэкі Адамовіча
139. Сузін, былы настаўнік
140. Сухадольскі, чыноўнік казённай палаты
141. Сухадольскі, другі чыноўнік казённай палаты
142. Сцыпіён, землямер
143. Тамашэўскі
144. Тамашэўская, дачка
145. Тамашэўская, другая дачка
146. Тамашэўская, бабуля
147. Толкін
148. Толкін, дэпутат кватэрнай камісіі

149. Тонін, друкар
150. Траяноўскі, з магістрата
151. Трускуляўскі, чыноўнік павятовага правадыра дваранства
152. Трускуляўскі, чыноўнік павятовага правадыра дваранства
153. Трайша, чыноўнік губернскага праўлення
154. Турк, жонка
155. Уластоўскі, чыноўнік камеры пракурора
156. Федзюшка, чыноўнік губернскага праўлення
157. Філіповіч, вартаўнік Бернардзінскага касцёла
158. Фок, карэтнік
159. Хадзікевіч (Хадакевіч), чыноўнік камеры губернскага пракурора
160. Хлявінскі, чыноўнік губернскага праўлення
161. Хоміч, абавязковы сябра
162. Хоміч, сын
163. Цыбульскі, эмігрант
164. Цэханоўскі, настаўнік музыкі
165. Цэханоўская, сястра настаўніка
166. Чачот, чыноўнік казённай палаты
167. Чачот, чыноўнік крымінальнай палаты
168. Шантар, брат павятовага суддзі
169. Шэметы, сваякі Пятрова, некалькі чалавек
170. Шнэля сям'я
171. Шчука, чыноўнік павятовага суда
172. Эйсымонт, чыноўнік казённай палаты
173. Эйсымонт, студэнт, брат чыноўніка
174. Юнг, чыноўнік грамадзянскай палаты
175. Юндзіл
176. Яблонскага сям'я
177. Ядкоўская, жонка чыноўніка грамадзянскай палаты
178. Ядкоўскі, чыноўнік грамадзянскай палаты
179. Якімовіч (Яхімовіч), з казначэйства
180. Якубевіч (? Якубовіч), чыноўнік губернскага праўлення

181. Янкоўскі, вучань гімназіі, сын арганіста

182. Янкоўскі, чыноўнік губернскага праўлення[349]

## Дадатак 2
## Імянны спіс удзельнікаў спявання гімна «Boze, cos Polska...» у Беластоку

**Асобы жаночага полу**

1. Аземблава, удава палкоўніка, памешчыца, жыве ў Беластоку
2. Аземблава Ефрасіння, швагерка ўдавы палкоўніка, жыве ў Беластоку
3. Акштуль, жонка мешчаніна Антона
4. Алдакоўская Браніслава, служанка аптэкара Гансеўскага
5. Алдакоўская Паўліна з дачкой, памешчыца Бельскага павета, удава правадыра дваранства, жыве ў Беластоку
6. Анасінская, жонка настаўніка гімназіі
7. Андржэеўская, жонка ўрача з дачкой
8. Апончык Ганна, мяшчанка
9. Бальбашэўская, жонка настаўніка гімназіі
10. Бальшая, жонка інспектара гімназіі
11. Багінская Канстанцыя, дваранка, удава, жыве ў Беластоку
12. Бародзіч, удава
13. Беліцкая Мар'я, крамніца
14. Бяляўская Аўрэлія, пляменніца калежскай дарадцы Бяляўскай
15. Бяляўская, дачка калежскай дарадцы, жыве ў Беластоку
16. Брандт, дачка ўдавы чыноўніцы
17. Брандт, дачка ўдавы чыноўніцы
18. Буржынская Анэля, жонка мешчаніна Войцэха Буржынскага
19. Бялкоўская Марыя, мяшчанка
20. Бялкоўская Ганна, дачка Марыі
21. Блажэвічава Вераніка, дачка двараніна
22. Бярнацкая, удава, мяшчанка

349 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 3.

23. Бірфрэйнд, мяшчанка

24. Балбашэўская, жонка настаўніка гімназіі

25. Бернекер Камілія, мяшчанка

26. Бернекер Сафія, мяшчанка

27. Вайткоўская Тэафілія, жонка адстаўнога капітана

28. Вінская, дзяўчына, сястра настаўніка інстытута Граўерта

29. Ваенская, удава з прытулка, жыве ў Беластоку

30. Вольская, жонка акругоВага начальніка

31. Вольская, дзяўчына, дваранка

32. Вайцыцкая Юзэфа, жыхарка г. Варшавы

33. Вайцыцкая Элеанора, сястра вышэйназванай Юзэфы

34. Вільчынская, мяшчанка, удава

35. Грынявіцкая Амалія, дваранка

36. Гарткевіч, памешчыца, удава

37. Горская Елісавета, удава засядацеля

38. Граўерт, жонка настаўніка гімназіі

39. Дашкевіч, памешчыца м. Орля

40. Дамброўская, памешчыца

41. Жэлязоўская, дачка памерлага паштовага чыноўніка

42. Загорская з дачкой, дваранка Бельскага павета

43. Ёмеліта, жонка століначальніка магістрата

44. Касінская, дзяўчына, дваранка

45. Касінская Вікторыя, памешчыца

46. Касінская, жонка тытулярнага дарадцы

47. Кашчынская з дачкой, удава

48. Карповіч Элеанора, сястра памешчыка Беластоцкага павета, праваслаўная, жыве ў маёнтку Беласточак

49. Кабылінская, памешчыца Беластоцкага павета

50. Качаноўская Вікторыя, дваранка

51. Красота Антаніна, мяшчанка

52. Кардзіналоўская Юзэфа, удава надворнага дарадцы, жыве ў Беластоку

53. Кардзілоўская Амалія, унучка Юзэфы, дзяўчына, жыве ў Беластоку

54. Кржэпоўская Амалія, дачка памерлага чыноўніка

55. Крас, жонка мешчаніна

56. Крас Вікторыя, жонка мешчаніна

57. Крапіўніцкая, удава мешчаніна

58. Кярсноўская Амалія, пляменніца губернскага сакратара Снарскага

59. Лубава, крамніца

60. Лімнкоўская з дачкой Антанінай, памешчыца Ваўкавыскага павета

61. Лясевічавая, жонка бельскага мешчаніна

62. Ляўковіч Мар'яна, дачка памерлага арганіста

63. Лукашынская Юзэфа, удава, мяшчанка

64. Манюшка Сафія, удава, дваранка, утрымлівае ў Беластоку вучняў

65. Магільніцкая, удава тытулярнага дарадцы

66. Матушэвіч, удава бухгалтара казначэйства, закройшчыца пры Інстытуце высакародных дзяўчын

67. Матусевіч, дачка вышэйназванай удавы

68. Мергардава, удава, мяшчанка

69. Навіцкая з дачкой, удава, памешчыца, жыве ў Беластоку

70. Пянькоўская, удава памешчыка Бельскага павета, жыве ў Беластоку

71. Піятроўская Юліяна, удава сакратара, жыве ў Беластоку

72. Павятоўская, памешчыца Ваўкавыскага павета, жыве ў Беластоку

73. Пякарская Ганна, мяшчанка, кравец інстытута, жыве ў Беластоку

74. Плюта Соф'я, дачка губернскага сакратара, жыве ў Беластоку

75. Плюта ??, сястра Сафіі, дачка губернскага сакратара, жыве ў Беластоку

76. Паеўская Юзэфа, дваранка

77. Пуцята, жонка ўрача гімназіі

78. Піятроўская Антаніна, дваранка

79. Пілінчуковая Кацярына, салдатка, служачая ў аптэкара Гансеўскага

80. Румель, памешчыца

81. Румель, дачка памешчыцы

82. Румель, дачка памешчыцы

83. Рушкоўская, жонка служачага на чыгунцы

84. Сырэвіч, удава штабс-лекара, жыве ў Беластоку

85. Сржэдзінская, жонка дваравіна

86. Сарнацкая, дачка надворнага дарадцы

87. Снарская, жонка губернскага сакратара

88. Снарская, дачка губернскага сакратара

89. Садоўская Ганна, удава настаўніка, калежскага сакратара, жыве ў Беластоку

90. Садоўская, дачка Садоўскай Ганны

91. Садоўская, дачка Садоўскай Ганны

92. Тачыская Антаніна, дачка настаўніка музыкі

93. Тапальская Мар'яна, дваранка, жыве ў Беластоку

94. Трусава, жонка памешчыка Беластоцкага павета

95. Хухлінская Ганна, дачка тытулярнага дарадцы, жыве ў Беластоку

96. Хухлінская ??, дачка тытулярнага дарадцы, жыве ў Беластоку

97. Цэлятыцкая, дачка дваравіна Бельскага павета

98. Шыманоўская Ганна, дачка падпалкоўніка, жыве ў Беластоку

99. Шыманоўская Сафія, дачка падпалкоўніка, жыве ў Беластоку

100. Шымкевіч Амалія, дзяўчына, дваранка, утрымлівае ў Беластоку вучняў

101. Шукевіч Апалонія, дзяўчына, дваранка

102. Шчыгельская, удава, дваранка, жыве ў Беластоку

103. Эльснер, удава, дваранка

104. Элерт, удава, кравец інстытута, жыве ў Беластоку

105. Юхневічавая, жонка губернскага сакратара

106. Юхніцкая Мар'яна, мяшчанка

107. Юхніцкая Пелагея, мяшчанка

108. Янчэўская, дзяўчына, дваранка

109. Яневіч, жонка маёра[350].

350 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1110, а. 8-11; с. 1241, а. 201-202.

**Асобы мужчынскага полу**

1. Анасінскі, настаўнік гімназіі
2. Андзялевіч Матэвуш, мешчанін, жыве ў Беластоку
3. Асташэўскі Іван, мешчанін
4. Бароўскі, адстаўны настаўнік
5. Брушэўскі, адстаўны калежскі сакратар
6. Буржынскі Войцэх, мешчанін
7. Бялкоўскі Якаў, мешчанін
8. Бялкоўскі Франц, мешчанін, жыве ў Беластоку
9. Бярнадскі Восіп, жыве ў Беластоку
10. Вайткоўскі, адстаўны капітан, без правай нагі, жыве ў Беластоку
11. Весалоўскі, наглядальнік прытулка камітэта дапамогі жабракам
12. Вільчынскі Іван, мешчанін, жыве ў Беластоку
13. Высокалаўскі Вікенцій
14. Выражэмскі Якаў, селянін, лакей Скірмунта
15. Ганіцкі, утрымальнік аптэкі
16. Ганкерт Восіп, мешчанін, жыве ў Беластоку
17. Грахоўскі Антон, аднадворац
18. Грэгатовіч Антон, губернскі сакратар, у Беластоку, адстаўны сельскі засядацель
19. Грузінскі, чыноўнік грамадзянскай палаты
20. Гундзіўс Ігнацій, дваранін, жыве ў Беластоку
21. Жэлязоўскі, тытулярны дарадца
22. Жульен, старэйшы з братоў, тэлеграфіст на чыгунцы
23. Зімнох Франц, дваранін
24. Емеліта Фаўсцін, століначальнік магістрата
25. Карповіч, міравы пасярэднік, памешчык Беластоцкага павета, маёнтак Беласточак
26. Красота Марцін, мешчанін, жыве ў Беластоку
27. Кржыжаноўскі, адстаўны вайсковец
28. Курдзікоўскі Міхал, дваранін, повар Лемера
29. Лавіцкі, беластоцкі павятовы ўрач

30. Лесевіч Каспер, мешчанін

31. Лейс

32. Ліноўскі Іосіф, мешчанін, жыве ў Беластоку

33. Лукашынскі Людвік, мешчанін, жыве ў Беластоку

34. Лянчэўскі, канцылярыст у канцылярыі правадыра дваранства

35. Лясевіч Каспер

36. Маеўскі, выкладчык музыкі ў Інстытуце высакародных дзяўчын

37. Маневіч Іван

38. Міхалоўскі Франц, адстаўны інвалідны салдат, сталяр, жыве ў Беластоку

39. Панкевіч Восіп (Іосіф), мешчанін, жыве ў Беластоку

40. Паплаўскі ?, наглядальнік пры гімназіі

41. Паплаўскі Войцэх, мешчанін

42. Паплаўскі Якаў, мешчанін

43. Патрынкевіч Валенцій, прускі падданы, утрымлівае карчму

44. Паўлоўскі Іосіф

45. Пякарскі Іван, жыве ў Беластоку

46. Пякарскі Франц

47. Пякарскі Пётр

48. Петрашкевіч, маці

49. Петрашкевіч, дачка

50. Пільніцкі, чыноўнік грамадзянскай палаты

51. Пісанка, дваранін

52. Плюта, губернскі сакратар, сакратар думы

53. Плюта, сын губернскага сакратара, жыве з бацькам

54. Пуцята, урач гімназіі

55. Радзіванавіч Іван, канцылярыст казначэйства

56. Руковіч Іван, настаўнік Беластоцкай гімназіі

57. Рэўцкі Ігнацій, мешчанін, жыве ў Беластоку

58. Сакалоўскі, фельчар

59. Снарскі, губернскі сакратар, пісар Беластоцкага акруговага ўпраўлення дзяржаўнай маёмасці

60. Суплікоўскі Казімір

61. Тачыскі, настаўнік музыкі
62. Тачыскі, сын настаўніка музыкі
63. Трубачык Іван, камердынер француза Лемера
64. Урублеўскі, селянін, каваль
65. Фалькоўскі Франц, дваранін Бельскага павета, сталяр у Беластоку
66. Хржаноўскі, адстаўны вайсковец, жыве ў Беластоку
67. Шайба Іосіф, дваранін, жыве ва ўрочышчы Антанюк
68. Шварц, дваранін, знаходзіўся пад наглядам паліцыі
69. Шымкевіч, бухгалтар казначэйства
70. Элерт Людвік, мешчанін, жыве ў Беластоку
71. Юхніцкі Казімір, мешчанін, жыве ў Беластоку
72. Юшкевіч, дваранін, сталяр у Беластоку
73. Якаў, лакей Скірмунта
74. Янікоўскі Іосіф, дваранін, жыве ў 10 вярстах ад Беластока
75. Ярашэвіч Матэўш, мешчанін, жыве ў Беластоку[351]

## Дадатак 3

## Спіс удзельнікаў працэсіі з Гродзенскага Фарнага касцёла ў Ружаны Сток 14(26) жніўня 1861 г.

1. Абрэмскі, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў
2. Абухоўскі
3. Аляхновіч, пячнік
4. Аніхімовіч, чыноўнік канцылярыі губернатара
5. Ахратановіч, шавец
6. Будрык Антон, мешчанін
7. Будрык, жонка мешчаніна
8. Валкавіцкі, чыноўнік губернскага праўлення
9. Велігорскі, памешчык
10. Вірыён, кандыдат на пасаду павятовага суддзі
11. Вольскі, пісьмавадзіцель акруговага шпіталя

351 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1241, а. 200-202, 252-254.

12. Габіх, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў
13. Габрылеўскі, чыноўнік павятовага суда
14. Дзяметры, студэнты, колькасць невядома
15. Заблоцкі Баляслаў, урач
16. Завістоўскі, памешчык
17. Зуброўская, дачка чыноўніка (у дакуменце напісана «Зуброўскія»)
18. Зуброўскі, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў
19. Кайшэрава, жонка чыноўніка чыгункі
20. Квяткоўскі, шавец
21. Кімбар, чыноўнік губернскага праўлення
22. Контрым, з магістрата
23. Круповіч (? жонка былога губернскага дарадцы)
24. Кузьміцкая, патрыётка
25. Лапінскі (? чыноўнік губернскага праўлення)
26. Лапіцкі (? чыноўнік земскага суда)
27. Лапіцкі, столаначальнік губернскага праўлення
28. Лебель, чыноўнік губернскага праўлення
29. Маеўскі, ксёндз
30. Маневіч, кантралёр казённай палаты
31. Маразоўскі, чыноўнік казённай палаты
32. Немчыноўскія («трое» па дакументах, двух магчымых мы ўказваем ніжэй)
33. Немчыноўская, маці чыноўніка казённай палаты
34. Немчыноўскі, чыноўнік казённай палаты
35. Пакубята, брат засядацеля
36. Пілюткевіч (? былы студэнт)
37. Плацінскі, чыноўнік чыгункі
38. Плішчанка, чыноўнік губернскага праўлення
39. Пятроўскі, чыноўнік канцылярыі губернатара
40. Радавіцкі, сакольскі памешчык
41. Руткоўскі, мяснік
42. Руткоўскі, чыноўнік грамадзянскай палаты
43. Савіцкая, дачка мурара

44. Савіцкая, другая дачка мурара
45. Самуліцкі, з дваранскай апекі, нёс харугву
46. Саросек, столаначальнік павятовага суда
47. Сасуліч, пісьмавадзіцель павятовага правадыра дваранства
48. Сасуліч, жонка (? пісьмавадзіцеля павятовага правадыра дваранства)
49. Стралкоўскі, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў
50. Тамашэўская «с дочерьми» (па іншых дадзеных, 2 дачкі)
51. Тамашэўская, дачка
52. Тамашэўская, другая дачка
53. Трускуляўскія, некалькі чалавек
54. Тукала, памешчык з Вільні
55. Федзюшка, чыноўнік прыказа грамадскай апекі
56. Цэханоўскі Цялесцін, урач
57. Цэхановіч, настаўнік
58. Чарноцкі, чыноўнік канцылярыі губернатара
59. Чачот, чыноўнік казённай палаты
60. Чачот, чыноўнік крымінальнай палаты
61. Эйсымонт, у доме яўрэек (?)
62. Юнзель, засядацель грамадзянскай палаты
63. Яблонскі, чыноўнік казённай палаты
64. Яблонскі (у дакуменце напісана «Яблонскія», імя аднаго з іх мы ўзгадваем)
65. Янкоўскі, чыноўнік губернскага праўлення[352].

## Дадатак 4

## Спіс удзельнікаў «провадаў» гродзенскага губернатара Шпеера 2(14).10.1861 г.

1. Абніскі, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў
2. Абрамовіч, пісар губернскага праўлення
3. Адамовіч, жанчына з Падольнай вуліцы

352 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 3.

4. Астраменцкая, удава

5. Бапрэвіч, чыноўнік канцылярыі губернатара

6. Баран, сын рыбака

7. Будрык, старэйшы

8. Бурбекл, акцёр

9. Бурэвіч, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў

10. Бялаблоцкі Аляксандр, чыноўнік дэпутацкага схода

11. Вашчыловіч, чыноўнік грамадзянскай палаты

12. Высоцкі, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў

13. Вяржбіцкі, таварыш (намеснік) старшыні грамадзянскай палаты

14. Генуш (Геніўш), чыноўнік казённай палаты

15. Генуш (Геніўш), брат чыноўніка казённай палаты

16. Гільберт, жанчына

17. Гільберт, сястра

18. Главецкі, з будаўнічай камісіі

19. Грыневіч

20. Дабравольскі, з будаўнічай камісіі

21. Далецкі, адстаўны юнкер

22. Далячка, чыноўнік казённай палаты

23. Далячка, чыноўнік канцылярыі губернатара

24. Дзенісевіч, чыноўнік казённай палаты

25. Дзянтовіч

26. Дзіетрых, былы чыноўнік губернскага праўлення

27. Жалкоўскі, чыноўнік канцылярыі губернатара

28. Забела, інспектар

29. Заблоцкі, урач

30. Заржэцкі, чыноўнік казённай палаты

31. Зах, сакратар губернскага праўлення

32. Зубраўскі, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў

33. Зубраўскі, чыноўнік з прыказа

34. Івашкевіч, адстаўны афіцэр (? ротны камандзір гарнізоннага батальёна)

35. Ізбіцкі, чыноўнік казённай палаты

36. Ізерскі, століначальнік палаты дзяржаўных маёмасцяў
37. Кажанеўскі, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў
38. Камінскі, чыноўнік грамадзянскай палаты
39. Касмоўскі, былы карчэмны засядацель
40. Касоўскі
41. Каспалянскі, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў
42. Кімбар, століначальнік губернскага праўлення
43. Клапатоўская, жонка таварыша (намесніка) старшыні крымінальнай палаты
44. Клапатоўскі, таварыш (намеснік) старшыні крымінальнай палаты
45. Кулеўскі, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў
46. Куляўскі, адстаўны паручнік
47. Курневіч, чыноўнік казённай палаты
48. Лазоўскі Ігнаці, служачы чыгункі
49. Ламінскі, чыноўнік губернскага праўлення
50. Лапінскі, чыноўнік губернскага праўлення
51. Лапіцкі, чыноўнік земскага суда
52. Лебель, звольнены чыноўнік губернскага праўлення
53. Матусевіч, удава
54. Міраповіч Аляксандр, чыноўнік губернскага праўлення
55. Мізер Леанар, чыноўнік павятовага суда
56. Міхалоўскі, століначальнік
57. Міхалоўскі, сын
58. Мысліцкі, чыноўнік казённай палаты
59. Матыс, малады сын чыноўніка казённай палаты
60. Надольскі, пісар грамадзянскай палаты
61. Надольскі, чыноўнік грамадзянскай палаты
62. Некчынская, удава
63. Нелюбовіч, чыноўнік казённай палаты
64. Нелюбовіч, чыноўнік казённай палаты
65. Немчыноўская, маці чыноўніка казённай палаты
66. Немчыноўскі, чыноўнік казённай палаты
67. Нілабенскі, чыноўнік земскага суда

68. Паняквіцкі, чыноўнік павятовага суда
69. Петрашкевіч, пісар
70. Пратасевіч, чыноўнік казённай палаты
71. Пржыбычак, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў
72. Радзевіч, чыноўнік канцылярыі губернатара
73. Ржансніцкі, былы прыватны прыстаў
74. Рэйнгард, столаначальнік
75. Руцкі (? малодшы чыноўнік страхавой кампаніі)
76. Руцкі, брат ці сын папярэдняга
77. Савіцкая, старэйшая дачка
78. Сангін, сакратар казённай палаты
79. Саросек, чыноўнік казённай палаты
80. Сасуліч, пісьмавадзіцель павятовага правадыра дваранства
81. Сасуліч, жонка пісьмавадзіцеля павятовага правадыра дваранства
82. Сікорскі, чыноўнік земскага суда
83. Сікорскі, чыноўнік павятовага суда
84. Станевіч, па мытнай частцы
85. Стэфаноўскі, чыноўнік губернскага праўлення
86. Сухадольскі, чыноўнік казённай палаты
87. Сухадольскі, чыноўнік казначэйства
88. Сцыпіён, землямер
89. Такаржэўскі, чыноўнік канцылярыі губернатара
90. Талочка, чыноўнік казённай палаты
91. Тамашэўская
92. Тамашэўская, дачка
93. Тамашэўская, другая дачка
94. Транчынскі, чыноўнік казённай палаты
95. Трашынскі, сакратар губернскага праўлення
96. Трускоўскі, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў
97. Трускуляўскі, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў
98. Трускуляўскі, чыноўнік палаты дзяржаўных маёмасцяў
99. Трушынскі, чыноўнік крымінальнай палаты
100. Уганоўскі, чыноўнік дэпутацкага схода

101. Хаецкі, чыноўнік будаўнічай камісіі
102. Хоміч, сын
103. Цэханоўскі, урач
104. Чахоцкі, чыноўнік грамадзянскай палаты
105. Чачот, чыноўнік казённай палаты
106. Чачот, чыноўнік крымінальнай палаты
107. Штарк (Старк), друкарня губернскага праўлення
108. Шчука, чыноўнік павятовага суда
109. Юндзель, засядацель грамадзянскай палаты
110. Яблонскі, чыноўнік казённай палаты
111. Янкоўскі, друкарня губернскага праўлення
112. Яхімовіч, чыноўнік грамадзянскай палаты
113. Яцунскі, чыноўнік губернскага праўлення[353].

## Дадатак 5

## Спіс гімназістаў — удзельнікаў выступлення ў Гродзенскай гімназіі 25 лістапада (12 снежня) 1861 г.

1. Букраба, гімназіст 6-га класа
2. Выганоўскі
3. Гнявоўскі, гімназіст 6-га класа
4. Дзітрых, гімназіст 5-га класа
5. Жалкоўскі, гімназіст 6-га класа, на ўроку французскай мовы свістаў «кашачую музыку», выключаны з гімназіі
6. Жук, гімназіст 6-га класа
7. Зальскі, гімназіст 6-га класа, на ўроку французскай мовы свістаў «кашачую музыку», выключаны з гімназіі
8. Карась
9. Клейматовіч
10. Кржывіцкі, гімназіст 5-га класа
11. Лавіцкі, гімназіст 5-га класа
12. Марскі

353 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 3.

13. Маслевіч, гімназіст 5-га класа
14. Паланевіч
15. Пачобут, гімназіст 6-га класа
16. Саковіч, гімназіст 5-га класа
17. Тыкцін, гімназіст 5-га класа
18. Урублеўскі, гімназіст 5-га класа[354].

## Дадатак 6

## Спіс партызан з атрада Ануфрыя Духінскага[355]

1. Акінчыц Станіслаў Тадэвушавіч, вайсковец
2. Арамовіч Ігнаці Мікалаевіч, настаўнік
3. Асічынскі, аграном
4. Бабінскі Густаў, гімназіст
5. Бадынскі Мечыслаў
6. Баранцэвіч Антоні Казіміравіч
7. Баркоўскі, шляхціц
8. Бароўскі, шляхціц
9. Бартноўскі, студэнт
10. Бразе Сіманс, чыноўнік
11. Брандт Уладзіслаў Пётр Казіміравіч, памешчык
12. Вага Казімір, дваранін, адстаўны вайсковец, арандатар мызы Лубянкі памешчыцы Гундзіўс
13. Горскі, шляхціц
14. Грыневіч, настаўнік
15. Гундзіўс Ян, студэнт
16. Дамкевіч Густаў, памешчык
17. Дзямянка, ляснік
18. Дубенскі
19. Духінскі Ануфры
20. Зарэмба
21. Зарэмба
22. Засуліч Ксаверы, памешчык

354 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 3.

355 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 697, а. 266-267; с. 697, а. 83-86.

23. Здзяхоўскі, памешчык
24. Ізбіцкі, ляснік
25. Кабылінскі Канстанцін Казіміравіч, памешчык (сын)
26. Кабылінскі Казімір Віктаравіч, памешчык (бацька)
27. Кабылінскі Адольф Казіміравіч (сын), памешчык
28. Казярадскі
29. Каліноўскі Іван Юр’евіч, лекар
30. Калупайла Уладзіслаў
31. Калупайла Генрык
32. Каспяровіч, збройнік
33. Каспяровіч, каморнік
34. Крынскі, шляхціц
35. Кулеша, шляхціц
36. Лайінскі
37. Лайінскі
38. Манюшка, ксёндз
39. Мілевіч Восіп (Юзэф), памешчык
40. Міляшчук Вікенці, сын лясні́чага
41. Міцкевіч
42. Мылкоўскі, памешчык
43. Навіцкі
44. Нелюбовіч, чыноўнік
45. Паеўскі
46. Радавіцкі Пётр, памешчык
47. Ражанскі Фелікс, каморнік
48. Ражкоўскі, ляснічы
49. Роман Апалінары Францавіч
50. Саросек, урач
51. Сінкевіч
52. Сладушэвіч, вайсковец
53. Снежка
54. Стравінскі Густаў, памешчык
55. Трэмбіцкі, памешчык
56. Уладычанскі Тэафіл Тадэвушавіч

57. Ульскі Ян, памешчык
58. Урублеўскі Валеры (Валяр'ян), вайсковец-ляснік
59. Хадакоўскі Ільдэфонс, вайсковец
60. Цыдзік
61. Цыдзік
62. Чарняк, чыноўнік
63. Шадурскі, студэнт
64. Шырма, памешчык
65. Шкутнік
66. Шумоўскі, шляхціц
67. Эйтміновіч Юльян Марк Францавіч
68. Эллерт
69. Юндзіл Франц, памешчык
70. Юркоўскі, шляхціц
71. Юр'евіч, шляхціц
72. Юшкевіч, шляхціц, чыноўнік

## Дадатак 7

## Спіс партызан атрада Казіміра Нарбута[356]

1. Альчук, селянін
2. Астраменцкі Лукаш, памешчык
3. Бартноўскі, чыноўнік
4. Берэнт Юзэф, аднадворац
5. Бянткоўскі, чыноўнік
6. Высоцкі, памешчык
7. Грозман
8. Гутоўскі, памешчык
9. Даноўскі Бенедыкт, памешчык
10. Дзюба
11. Карповіч Людвіг, дваранін
12. Карчэўскі, памешчык
13. Корчыц Эдуард, памешчык

356 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 362, а. 6-9; с. 297, а. 1213, 59-76.

14. Кухановіч, святар
15. дэ Ларгон, памешчык
16. Лясноўскі, дваранін
17. Мараўскі, чыноўнік
18. Мілеўскі, дваранін
19. Нарбут Казімір Казіміравіч, памешчык
20. Паеўскі, дваранін
21. Паліроўскі Альбін, дваранін
22. Палхоўскі Людвік, памешчык
23. Палхоўскі Ян, памешчык
24. Парыс Ціт, дваранін
25. Радавіцкі, памешчык
26. Станішэўскі Яўген, памешчык
27. Станкевіч, памешчык
28. Тржэцяк Юліян, памешчык
29. Улодак Каміль, памешчык
30. Шалкоўскі, памешчык
31. Ягмін Фелікс Станіслававіч, памешчык
32. Ягалкоўскі, памешчык

## Дадатак 8

### Спіс партызан з атрада Людвіка Нарбута[357]

1. Альшанскі Ігнат, дваранін
2. Бароўскі Міхал, дваранін
3. Беразоўскі Эдуард, студэнт
4. Бразоўскі Аляксандр, медык
5. Бярнацкі Усцін, дваранін
6. Валаховіч Тэафіл, дваранін
7. Гарбачэўскі Юзэф, святар
8. Губарэвіч Сцяпан, вайсковец
9. Ёдка Станіслаў, памешчык

357 НГАБ, ф. 1416, воп. 6, с. 274, а. 2-4; Восстание в Литве и Белоруссии 1863-1864 гг.: материалы и документы. – М.: Наука, 1965. – С. 148; Laniec S. Litwa i Bialorus w dobie konspiracji i powstania zbrojniego, 1863-1864. – Olsztyn, 2002. – S. 84.

10. Ёдка Ян, памешчык
11. Жэлягоўскі Юзэф, гімназіст
12. Жукоўскі Вандалін, дваранін
13. Жукоўскі Уладзіслаў, дваранін
14. Жукоўскі Ян, дваранін
15. Канапацкі Антон, гімназіст
16. Клімантовіч Уладзіслаў, дваранін
17. Коркуць Кіпрыян
18. Косман, медык
19. Краінскі Адольф, памешчык
20. Краінскі Леан, памешчык
21. Ланеўскі Іосіф, селянін
22. Лявіцкі Нікадым, гімназіст
23. Лявіцкі Уладзіслаў, гімназіст
24. Лукашэвіч Рудольф, дваранін
25. Маргевіч Ігнат, дваранін
26. Маргевіч Пётр, дваранін
27. Навахонскі Андрэй, гімназіст
28. Навіцкі Уладзіслаў, афіцэр-інжынер
29. Нарбут Войцэх, дваранін
30. Нарбут Людвік Тэадоравіч, адстаўны вайсковец, памешчык
31. Нікалай Уладзіслаў, вайсковец
32. Пакямпновіч Юзэф, памешчык
33. Паплаўскі Уладзімір, дваранін
34. Патрыкоўскі Анзельм, дваранін
35. Пацямкевіч, студэнт
36. Пачобут, дваранін
37. Пілецкі, студэнт
38. Пісецкі Кіпрыян, медык
39. Рошча Фелікс, памешчык
40. Скавінскі Аляксандр, памешчык
41. Скірмунт Тамаш, памешчык
42. Тарашкевіч Ігнаці, медык
43. Тубялевіч Юзэф, дваранін

44. Хмялеўскі Юзэф
45. Цымерман, гімназіст
46. Чакоўскі Валерыян, дваранін
47. Юрэвіч Ануфры, дваранін
48. Янкоўскі Аляксандр, дваранін
49. Янкоўскі Пётр, дваранін
50. Ястржэмбскі Сільверст, дваранін
51. Яцунскі Пётр, дваранін



*П. Янкоўскі*

## Дадатак 9
## МАРТЫРАЛОГ
### страчаных паўстанцаў Гродзенскага рэвалюцыйнага ваяводства

У навуковай літаратуры распаўсюджана лічба паўстанцаў, павешаных і расстраляных на тэрыторыі Беларусі і Літвы — 128 чалавек[358]. Такая лічба пададзена ў апошняй справаздачы М. Мураўёва[359]. У. Ігнатоўскі лічыў, што гэтыя дадзеныя зменшаны прыкладна ў 2 разы — пакарана смерцю было 243 чалавек[360]. Змяншэнні лічбы пакараных было ў той час, калі Пецярбургская адміністрацыя і цар ставіліся да яго не вельмі прыязна, на карысць Мураўёву. А.Ф. Смірноў, акрамя таго, адзначаў, што смяротныя пакаранні адбываліся не толькі па прыгаворах, якія зацвярджаў Мураўёў.

У крыніцах звычайна падаецца колькасць забітых у баях паўстанцаў, але зрэдку ўказваюцца прозвішчы. Па нашых падліках, у ваенных сутычках на тэрыторыі Гродзенскай губерні былі забіты не менш за 1256 чалавек. Нам удалося высветліць 74 прозвішчы забітых у баях на тэрыторыі Гродзенскага рэвалюцыйнага ваяводства і пакараных царскай уладай.

1. Адамовіч Станіслаў Адамавіч, былы радавы Мурамскага палка, расстраляны ў Брэст-Літоўску 3 (15).06.1863 г. за ўдзел у рабаванні пошты на Пінскім тракце, спаленні маста на р. Ясельда, забойства 2 салдат з інваліднай каманды.

358 Біч М. Паўстанне 1863-1864 гг. у Польшчы, Беларусі і Літве // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 5. – Мн.: БелЭн, 1999. – С. 450; Смирнов А.Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. – М.: Изд-во АН СССР, 1963. – С. 319.

359 Чарэвін П. Паўночна-Заходні край (Успаміны) // Спадчына. – 1998. – № 3. – С. 61.

360 Ігнатоўскі У. 1863 год на Беларусі. Нарыс падзей. – Мінск, 1930. – С. 254.

2. Александровіч Франц, дваранін, пакараны ў Ашмянах 5 (17).11.1863 г. за ўдзел у павешанні аднадворца Яна Насевіча.
3. Апановіч Франц, дваранін, пакараны ў Смаргоні 6 (18).11.1863 г. за ўдзел у павешанні аднадворца Яна Насевіча.
4. Баліч Юзэф, селянін, пакараны ў Брэст-Літоўску 23.12 (3.01).1864 г. за ўдзел у допытах асоб, аддадзеных ураду.
5. Белакоз, сасланы ў Сібір, па дарозе ў Табольск перарэзаў сабе горла ў красавіку 1863 г., меў каля 35 гадоў.
6. Бейда Дамінік, шляхціц, народжаны ў в. Маркава Балка Аўгустоўскай губерні, павешаны ў Бельску 2.12.1863 г.
7. Бржазоўскі Аляксандр, 35 гадоў, з Гурнофеля, забіты ў баі з карнікамі пад Дубічамі (недалёка ад Ліды, цяпер у Летуве).
8. Бугельскі Палікарп, шляхціц, пакараны смерцю ў Шчучыне 2 (14).05.1864 г. за кіраўніцтва паўстанцкім атрадам і баі з рускімі войскамі.
9. Булгарын, паўстанец з атрада Урублеўскага, забіты ў баі 9.08.1863 г. ва ўрочышчы Пашкоўшчызна ў Тышкевічскіх лясах, Ваўкавыскі павет.
10. Вянцкоўскі Тамаш, паўстанец з атрада Кярсноўскага. Забіты ў баі пад Крулёвым Мостам 9.06.1863 г.
11. Владычанскі Антон, 1843 года нараджэння, студэнт універсітэта, камандаваў аддзелам у атрадзе Г. Стравінскага, у баі пад Гутай Міхалінскай быў паранены і памёр у чэрвені 1863 г.
12. Владычанскі Тэафіл (Феафіл), 1834 года нараджэння, з Ваўкавыскага павета, выпускнік Генеральнага штаба (С-Пб.), ваяваў на Каўказе, дзе дaслужыўся да падпалкоўніка, ваяваў у атрадзе А. Духінскага і быў забіты 30.09 (12.10).1863 г. у баі пад Мяльховым у раёне Кракава.
13. Высоцкі Эдвард, земскі гаспадар з Брэсцкага павета, сасланы ў Сібір, памёр у 1864 г. па дарозе ў Казань.
14. Гардоцкі, пакараны ў Шчучыне 27.04.1864 г.
15. Гзоўскі Вінцэнт, аднадворац, пакараны ў м. Азёры Гродзенскага павета 30 (11.01).1864 г. за павешанне селяніна Франца Камароўскага, камандаванне атрадам «жандараўвешальнікаў».

16. Гліндзіч Антон, брат Мечыслава (кіраўніка Ваўкавыскай рэвалюцыйнай арганізацыі), муж Тэадоры з Ажэшкаў (сястра Пятра Ажэшкі — мужа пісьменніцы Элізы). Разам з жонкай удзельнічаў у паўстанні. Памёр пасля двух гадоў заключэння ў Ваўкавыскай турме.
17. Глінскі, паўстанец з атрада Кярсноўскага. Забіты ў бai пад Крулёвым Мастом 9.06.1863 г.
18. Грушэўскі Фелікс Янавіч, селянін в. Лясковічы Пружанскага павета, павешаны ў м. Кобрынка 5 (17).10.1863 г. за ўдзел у павешанні двух жыхароў Кобрынскага павета.
19. Грыневіч Тамаш, адстаўны штабс-ротмістр, памешчык, пакараны ў Рагачове Магілёўскай губерні 28.07.1863 г. за стварэнне і кіраўніцтва паўстанцкім атрадам.
20. Грынчык Ян, мешчанін, пакараны ў м. Шэрашава Пружанскага павета 8 (20).12.1863 г. за ўдзел у паўстанні ў якасці жандара-вешальніка.
21. Грэмза Казімір, 25 гадоў, селянін з Ліпкунцаў, забіты ў бai з карнікамі пад Дубічамі (недалёка ад Ліды, цяпер Літва).
22. Губарэвіч Стэфан, 35 гадоў, з Галавічполля, забіты ў бai з карнікамі пад Дубічамі (недалёка ад Ліды, цяпер Літва).
23. Дзерамер, паўстанец-кавалярыст з атрада Кабылінскага. Быў забіты ў бai з расійцамі пад в. Гута Ваўкавыскага павета 16.06.1863 г.
24. Жэласкі Станіслаў, паўстанец з атрада Кярсноўскага. Забіты ў бai пад Крулёвым Мастом 9.06.1863 г.
25. Завістоўскі Станіслаў Карлавіч, дэмабілізаваны штабс-капітан, з дваран Ваўкавыскага павета Гродзенскай губерні, пакараны ў Ваўкавыску 10 (22).07.1863 г. за камандаванне атрадам «жандараў-вешальнікаў».
26. Залескі Станіслаў, забіты ў бітве пад Каралёвым Мастом 9.06.1863 г.
27. Здзітавецкі Віктар, паўстанец з атрада Урублеўскага, забіты 21.06. 1863 г. ва ўрочышчы Пясец і Кацюхова каля Жаркаўшчыны Ваўкавыскага павета.
28. Зэльміц Уладзімір, дваранін, пакараны ў м. Азярніцы Слонімскага павета 7 (19).08.1863 за знаходжанне ў паўстанцкім атрадзе са зброяй і ўдзел у павешанні старасты названага мястэчка.

29. Ількоўскі Антоні, дваранін, пакараны ў Шэрашава Пружанскага павета 8 (20).12.1863 г. за ўдзел у паўстанцкім атрадзе ў якасці жандара-вешальніка.

30. Йёч Людвіг, дваранін, пакараны ў м. Азярніцы Слонімскага павета 7 (19).08.1863 г. за знаходжанне ў паўстанцкім атрадзе са зброяй і ўдзел у павешанні старасты названага мястэчка.

31. Кабылінскі Казімір Віктаравіч, загінуў у баі з расійскім войскам 4.11.1863 г. пад Ліцкам (ці Медняй ?) Люблінскай губерні.

32. Каліноўскі Вікенці Канстанцін Сямёнавіч, 22.03.1864 г. павешаны ў Вільні. На месцы казні ўсталявана памятная пліта.

33. Каліноўскі Іван Юр'евіч, стрыечны брат Кастуся Каліноўскага, урач, паўстанец, забіты ў баі 2.06.1863 г. ва ўрочышчы Пагарэлае Слонімскага павета, у Ружанскай казённай дачы. Па іншай версіі расійскіх уладаў, быў забіты ў баі пры р. Сцэрцеж 8.07.1863 г.

34. Каргальскі Іван, радавы Данскога казачага палка, пакараны ў Кобрыне за забойства яўрэя і рабаўніцтва.

35. Корсак Ян, мешчанін, пакараны ў Брэст-Літоўску 28.12 (8.01).1864 г. за допыты асоб, адданых ураду.

36. Ксенжапольскі, паўстанец з атрада Кярсноўскага. Забіты ў баі пад Крулёвым Мастом 9.06.1863 г.

37. Кульчыцкі Леан Францэвіч, былы ротмістр расійскага войска, камандзір паўстанцкага атрада, 9.04.1863 г. цяжка паранены ў бітве пад вёскай Павелайцы Ковенскага павета і памёр у вайсковым ковенскім шпітале

38. Ласінскі Вінцэнт, аднадворац, пакараны ў Альшанах 18.11.1863 г. за ўдзел у паўстанцкім атрадзе і ўдзел у павешанні аднадворца Яна Насевіча.

39. Ласкоўскі Антоні, кобрынскі чыноўнік, паўстанец з атрада Траўгута, забіты ў баі 21.05.1863 г. пад сялом Горкі Кобрынскага павета.

40. ЛукашэвічІсідар, камандзір атрада, сфарміраванага ім у Мілавідах Слонімскага павета. Загінуў 18 ліпеня 1863 г. у баі ля мызы Харабровічы.

41. Макарэвіч Ян, паўстанец з атрада Урублеўскага-Духінскага, забіты ў баі 29.04.1863 г. пад в. Валілы (інакш пад Пілатаўшчызнай) Беластоцкага павета.

42. Маліноўскі, былы клерык, паўстанец з атрада Урублеўскага-Духінскага, забіты ў баі 29.04.1863 г. пад в. Валілы (інакш пад Пілатаўшчызнай) Беластоцкага павета.
43. Масальскі Караль Ксавер'евіч, шляхціц, расстраляны 5 (17).08.1863 г. у Слоніме за ўдзел ва ўзброеных сутычках з расійскімі войскамі, павешанне старасты м. Азярышча Макарэвіча.
44. Мацкевіч Генрык, расстраляны ў Слоніме ў 1863 г.
45. Міконскі Тэафіл, павешаны ў Шчучыне ў 1864 г.
46. Мікуцкі, павешаны ў Шчучыне 27.04.1864 г.
47. Навакоўскі, сталяр са Свіслачы, захоплены ў сваім доме за тое, што не данёс пра лагер паўстанцаў, вывезены ў Пружаны, дзе яму адрэзалі рукі, а потым павесілі 14.07.1863 г.
48. Нарбут Людвіг, у баі 4.05.1863 г. кулі трапілі ў яго нагу і сэрца. Захаваны ў агульнай магіле пад Дубічамі 8.05.1863 г.
49. Парэмбскі, паўстанец з атрада Кярсноўскага. Забіты ў баі пад Крулёвым Мастом 9.06.1863 г.
50. Паўловіч Багуслаў Сямёнавіч, былы харунжы 13 артылерыйскай брыгады, расстраляны ў Брэст-Літоўску 19(31).07.1863 г. за тое, што добраахвотна пакінуў службу і ўступіў у паўстанцкі атрад.
51. Паўлоўскі Рудольф, забіты 13 мая 1863 г. у бітве каля Горак (90 км ад Кобрына на паўночны ўсход).
52. Пахнеўскі, паўстанец з атрада Урублеўскага, забіты 21.06.1863 г. ва ўрочышчы Пясец і Кацюхова каля Жаркаўшчыны Ваўкавыскага павета.
53. Піятроўскі Фелікс Феліксавіч, шляхціц, не зацверджаны Герольдыяй, павешаны ў Кобрыне 5(17).10.1863 г. за ўдзел ва ўзброеных сутычках з расійскімі войскамі і павешанне двух салдат.
54. Пухальскі, паўстанец з атрада Урублеўскага-Духінскага, забіты ў баі 29.04.1863 г. пад в. Валілы (інакш пад Пілатаўшчызнай) Беластоцкага павета.
55. Радавіцкі Пётр, паўстанцкі афіцэр. Забіты ў баі пад Лыскава Ваўкавыскага павета 16.06.1863 г.
56. Радзевіч Ксаверы, паўстанец з атрада Урублеўскага, забіты ў баі 9.08.1863 г. ва ўрочышчы Пашкоўшчызна ў Тышкевічскіх лясах, Ваўкавыскі павет.

57. Радзівіновіч Ян, паўстанец з атрада Урублеўскага-Духінскага, забіты ў баі 29.04.1863 г. пад в. Валілы (інакш пад Пілатаўшчызнай) Беластоцкага павета.

58. Радоўскі Апалінары, паўстанец з атрада Траўгута, забіты ў баі 21.05.1863 г. пад сялом Горкі Кобрынскага павета.

59. Расянтоўскі, расстраляны ў Брэст-Літоўску ў жніўні 1863 г.

60. Рачкоўскі Тэафіл, каталіцкі святар, расстраляны ў Слоніме ў 1863 г.

61. Саламон Аўгуст, падданы Прусіі, пакараны ў Шэрашава Пружанскага павета 20.12.1863 г. за ўдзел у паўстанцкім атрадзе ў якасці «жандара-вешальніка» і асабісты ўдзел у забойстве некалькіх жыхароў Гродзенскай губерні.

62. Сангін Станіслаў Юзэфатавіч, 45 гадоў, забіты 15.02.1863 г. у баі каля мястэчка Рэчыца (зараз Камянецкі раён).

63. Свентажэцкі Ян Вінцэнтавіч, павешаны 23.01.1865 г. у Байцы Беластоцкага павета.

64. Сілевіч Уладзімір, расстраляны ў Слоніме 11 (23).08.1863 г. за ўдзел ва ўзброеных сутычках з расійскімі войскамі.

65. Талінскі Дамянік, паўстанец-селянін в. Жулткі, расстраляны ў Гродне 11 (23).10.1863 г. за ўдзел у павешанні лясніка Юлпановіча.

66. Траўгут Рамуальд, павешаны ў Варшаве 5.08.1864 г. за стварэнне ў Гродзенскай губерні «мяцежнай шайкі», забойства паўстанца Квяткоўскага для падтрымкі дысцыпліны ў атрадзе, намер застраліць з гэтай прычыны Макоўскага, за кіраўніцтва Нацыянальным урадам у Варшаве, неданясенне аб сваіх паплечніках.



*Запіска аб расстрэле Д. Талінскага*

67. Трафімчык Тэадор Навіч, селянін Бельскага павета, павешаны ў Кобрыне 5 (17).10.1863 г. за ўдзел ва ўзброеных сутычках з расійскімі войскамі і ўдзел у павешанні адстаўнога салдата ў Пінскіх лясах.

68. Урбановіч Юзэф Якубавіч, былы радавы Капорскага Яго Каралеўскай Вялікасці караля Саскага пяхотнага палка, расстраляны ў Гродне 14 (26).03.1864 г. за тое, што пакінуў

службу і ўступіў у паўстанцкі атрад, удзельнічаў у павешанні праваслаўнага святара Данііла Канапасевіча.

69. Цюхна Мацвей, селянін Слонімскага павета, расстраляны ў Саколцы 18 (30).06.1863 г. за распаўсюджванне «Мужыцкай праўды».

70. Чарко Аляксандр, селянін, пакараны ў Брэст-Літоўску 23.12 (3.01).1864 г. за ўдзел у паўстанцкім атрадзе ў якасці «жандара-вешальніка».

71. Чарняўскі, паўстанец атрада Урублеўскага, забіты ў баі 30.08.1863 г. у Глыбокім Куце, Пружанскі павет.

72. Ятаўт Марцін Восіпавіч, камандзір атрада, складзенага з беластоцкіх гімназістаў. Забіты ў бітве з расіянамі 11.02.1863 г. пад Крулёвым Мастом Ваўкавыскага павета Гродзенскай губерні[361].

361 Быхаўцаў, М. Паўстанне 1863-1864 гадоў у Ваўкавыскім павеце. – Гародня: б.в., 2014. – 343 с.

Карпович О. «Невинные жертвы» Муравьёва, или за что казнили участников польского восстания 1863-1864 гг. (рукапіс).

Радзюк А. Смяротныя пакаранні ў Горадні ў 1863-1864 гг. // Город Святого Губерта: альманах локальной истории. – Вып. VII. – Гродно: Гродненская библиотека, 2013. – С. 112-123.

Cederbaum H. Powstanie styczniowe. Wyroki Audytoriatu Polowego z lat 1863, 1864, 1865, 1865, 1866. – Warszawa, 1917. – S. 145-146.

Kolumna Z. [Nowolecki A.]. Pamiatka dla rodzin polskich/ Krotkie wiadomosci ostraconych na rusztowaniach, rozstrelanych, poleglych i zmarlych na wygnaniu syberyjskiem i tuliactwie, ofiar z 1861-1866 roku: ze zrodel urzedowych, dziennikow, jak niemniej z ustnych podan osob wiarogodnych i towarzyszy broni. – Krakow, 1868. Cz. 1. – S. 2-196; Cz. 2. – S. 2-312.

Pawlowicz E. Wspomnienia. Nowogródek, więzienie – wygnane. – Lwów, 1887. – S. 240-241.

Stupnicki H. Spis poleglych i zmarlych w 1863/64 r. – Lwow, 1865.

Stupnicki H.Imiona spis poleglych i straconych ofiar powstania w r. 1863 – 1864. – Lwow, 1865. – S. 102.

Studnicki W. Rok 1863. Wyroki smierci. – Wilno, 1923.

Wsiedemdziesiata rocznice Powstania styczniowego na Litwe, na osloniecie pomnika L. Narbutta i towarzyszy w Dubiczach Ziemi Lidskiej. – Grodno, 1933. – 25 s.

Гл. таксама літаратуру, якая паказана ў спісе пасля нарыса “Кроў, якая льецца за Нёманам, заклікае і нас да зброі!”.

Аўтар выказвае шчырую падзяку камандзе і амбасадарам праекта па збору сродкаў на выданне кнігі: Вользе Сямашка, Максіму Шведу, Кацярыне Сарока, Анатолю Новікаву, Аляксандру Сямашку, Дзмітрыю Матвейчыку, Алесю Кіркевічу, Андрусю Такіндангу, Зміцеру Дашкевічу, Усеваладу Сцебураку, Алегу Трусаву, Алесю Мазаніку, Уладзіміру Арлову, Аляксандру Фядуце, Алегу Хаменку, Глебу Лабадзенку, Аляксею Братачкіну.

Дзякуем Зьміцеру Кузьменку і сайту “Сьвіслацкія аркушы” за інфармацыйную падтрымку збораў.

Асобная падзяка платформе Talaka.by і асабіста Яўгену Клішэвічу за мажлівасць правядзення дабрачыннага збору сродкаў на выданне кнігі.

**Нашы спонсары культуры:**

**Прыватнае прадпрыемства “Majstar Web Programming Services”**

Баранавіцкі пейнтбольны клуб "B-ZONE": *b-zone.by*

“Цесляры” (Мінск, мэбля): *cesliary.by* (ІП Дашкевіч Дз.В.)

Прыватнае вытворчае прадпрыемства “СеНіРа” (Брэст, мэбля): *senira.by*

**Нашы партнёры:**

Творчае згуртаванне “А4”: *http://a4games.by*

Інтэрнэт-крама symbal.by: *https://symbal.by*

Этнакрама “РАГНА”: *http://ragna.by*

**Нашы мецэнаты культуры:**

1. А. Вольга
2. Ананім
3. Ананім
4. Агрэніч Аліна
5. Азарка Настасся
6. Аксёнцаў Фелікс
7. Аляшкевіч Алена
8. Андронава Даша
9. Андрэйчанка Анастасія
10. Аруцюнян Ануш
11. Арцём Дабро
12. Аўлас Міхаіл
13. Бабок Юры
14. Баравы Аляксандр
15. Бараноўскі Яўген
16. Бараш Петэр
17. Бартош Зоя
18. Баскін Яўген
19. Бобчанка Міхаіл
20. Бондараў Юры
21. Будзько Рыгор
22. Буцько Юры
23. Васецкі Аляксандр
24. Віцько Валер
25. Вячорка Воля
26. Галубей Марына
27. Гальцоў Ігар
28. Ганчар Павел
29. Грабеннік Юльяна
30. Грышановіч Андрэй
31. Гуменік Уладзіслаў
32. Гурская Ілона
33. Дабравольскі Яўген
34. Дарашэнка Кірыл
35. Дашкевіч Зьміцер
36. Даўжэнка Наталья
37. Дземка Воля
38. Дзешчанка Марыя
39. Дзялоў Ігар
40. Дзяўго Міхаіл
41. Дуброў Алег
42. Дудар Алсь
43. Ждановіч Кірыл
44. Жыгуноў Яўген
45. Жэлабоўскі Сяргей
46. Загарэц Таццяна
47. Зыкаў Віктар
48. Ерамееў Андрэй
49. Казак Святлана
50. Казялецкі Андрэй
51. Камароўскі Андрэй
52. Каранец Ільля
53. Карнейчык Марыяна
54. Карэлін Мікалай

55. Касцілье Аляксандр
56. Касьцюк Зьмітро
57. Кемежук Сяргей
58. Клімаў Кірыл
59. Клімянкоў Аляксандр
60. Князеў Віталь
61. Колас Павел
62. Коўзель Янак
63. Кошалеў Павел
64. Ксеневіч Дзмітрый
65. Кулагіна Вольга
66. Кунцэвіч Яраслаў
67. Лабада Станіслаў
68. Лагуціна Марына
69. Ласончык Эла
70. Лойка Кірыл
71. Лугавы Сяргей
72. Лукашык Ядвіга
73. Мархель Цімафей
74. Марыкін Кірыл
75. Мастыка Таццяна
76. Мілы Уладзімір
77. Міхайлоўскі Уладзімір
78. Міхальчанка Ірына
79. Міхасёў Аляксандр
80. Мудрачэнка Сяргей
81. Мяшкоў Аляксей
82. Н. Людміла
83. Небераў Алесь
84. Новікава Даша
85. Новікаў Андрэй
86. Новікаў Анатоль
87. Нямцоў Аляксандр
88. Пархомчык Кацярына
89. Петухоў Алесь
90. Пісарэнка Вераніка
91. Плакса Улад
92. Платонава Вольга
93. Пляхневіч Міхаіл
94. Прэдка Зьміцер
95. Пятроўскі Аляксей
96. Радомскі Андрэй
97. Радыёнаў Вячаслаў
98. Радыёнаў Дзмітрый
99. Ранцэвіч Андрэй
100. Ратнікава Таццяна
101. Рахуба Сяргей
102. Рыбалка Аляксей
103. Саланевіч Анатоль
104. Самафалаў Мікалай
105. Саўко Павел
106. Смаляк Аляксей
107. Сойка Юрась
108. Сокал Лявон
109. Стальчынскі Ігар
110. Стрыжэўская Таццяна

111. Сціксаў Віктар
112. Суднік Таццяна
113. Сухадолаў Алесь
114. Суша Уладзіслаў
115. Сяргееў Аляксандр
116. Сяргееў Сяргей
117. Табалевіч Юры
118. Трацдяк Вячаслаў
119. Трычык Карына
120. Трашчынскі Зміцер
121. Тушкін Вячаслаў
122. Тысляцкі Павел
123. Удалоў Юрый
124. Урбановіч-Саўка Ілона
125. Філонаў Кірыл
126. Флерко Арцём
127. Хаданёнак Валер
128. Харытонаў Павел
129. Хацук Яўген
130. Хведзьковіч Алег
131. Холін Аляксандр
132. Цітоў Ягор
133. Цумараў Алекс
134. Чубат Аляксей
135. Шаверда Алена
136. Шамрэй Настасся
137. Швед Зміцер
138. Швед Кацярына
139. Шышакоў Міхаіл
140. Шышкоў Зьміцер
141. Шэпелюк Ігар
142. Ягораў Зьміцер
143. Якшук Ірына
144. Ялашэвіч Аляксей
145. Янушэўскі Віталь
146. Яфрэмаў Андрэй

Навукова-папулярнае выданне

**Швед** Вячаслаў Вітальевіч

РЭКВІЕМ ПАЎСТАНЦАМ 1863–1864 гг.
(Гродзенская губерня)

Рэдактар Н. П. Дудко
Кампутарная вёрстка Е. А. Хоміч
Карэктар: Н. І. Грышчук

Падпісана да друку 26.06.2017. Фармат 60×84/16.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 18,14. Улік.-выд. арк. 19,76.
Наклад 400. Заказ 524.

ТАА «Альфа-кніга».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/480 ад 30.09.2015.
Вул. Смалячкова, 9, оф. 329, 220005, г. Мінск.

Аддрукавана у друкарні ТАА «Юстмаж».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў №2/68 ад 19.03.2014.
Вул. Каліноўскага, д. 6, Г4/К, пакой 201, 220013, г. Мінск.



**Швед Вячеслав Вітальевіч**, выпускнік Белдзяржуніверсітэта, прафесар, доктар гістарычных навук. Навуковыя інтарэсы – развіццё гаспадаркі Беларусі ў першай палове XIX ст., палітычнае жыццё на землях Беларусі ў 1772-1863 гг., гісторыя Гродна і Гродзеншчыны (X-XXI ст.). Усіх публікацый па стану на 1.01.2017 г. – 348, у тым ліку: 169 навуковых, 28 навукова-папулярных, 132 энцыклапедычных, 19 папулярных. Аўтар кніг – «Кронан. Летапіс горада над Нёманам (1116-1990)» (у сааўтарстве), «Падзеі і постаці гродзенскай даўніны», «Масоны і ложы на землях Беларусі», «Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў», «Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772-1863 гг.)», «Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў» (у сааўтарстве), «Гродзенскія губернатары» (у сааўтарстве), «Гродназнаўства» (у сааўтарстве), 3 кнігі ў серыі «Мой горад» і іншыя.



*Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг. Гродзенская губерня*